Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Інстытут журналістыкі
Кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання

ЖЫЦЦЁМ І СЛОВАМ ПРЫСЯГАЮЧЫ...

**Да 90-годдзя
заслужанага работніка адукацыі
Рэспублікі Беларусь,
доктара філалагічных навук, прафесара
Міхася Яўгенавіча
ЦІКОЦКАГА**

***Зборнік
навуковых прац***

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2012

УДК 80/81(476)(082)
ББК 81(4Беи)я43
Ж94

Пад агульнай рэдакцыяй
доктара філалагічных навук прафесара *В. І. Іўчанкава*

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук прафесар кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
І. І. Сачанка;
доктар філалагічных навук, загадчык кафедры культуры маўлення і міжкультурных камунікацый Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, прафесар
І. П. Кудраватых;
доктар філалагічных навук галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
В. П. Жураўлёў

Ж94 **Жыццём і словам прысягаючы...** : да 90-годдзя заслуж. работніка адукацыі Рэсп. Беларусь, д-ра філал. навук, праф. Міхася Яўгенавіча Цікоцкага : зб. навук. прац / пад агул. рэд. д-ра філал. навук праф. В. І. Іўчанкава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 608 с.
ISBN 978-985-471-486-8.

Зборнік навуковых прац прысвечаны праблемам стылістыкі беларускай і рускай моў, стылістыкі публіцыстычных жанраў, эстэтыкі слова і стылістычнай абумоўленасці газетных тэкстаў, лінгвастылістыкі публіцыстычнага тэксту і дыскурснага аналізу СМІ, тэорыі і практыкі рэдагавання, медыярыторыкі, гісторыі, тэорыі і метадалогіі журналістыкі, літаратурна-мастацкай крытыкі.

Прызначаецца для філолагаў, студэнтаў факультэтаў журналістыкі, магістрантаў, аспірантаў, журналістаў і рэдактараў.

УДК 80/81(476)(082)
ББК 81(4Беи)я43

ISBN 978-985-471-486-8

Шаноўныя ўдзельнікі канферэнцыі!
Паважаныя калегі!
Дарагія госці!

Прыміце сардэчныя вітанні з нагоды правядзення III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Жыццём і словам прысягаючы…», прысвечанай 90-годдзю заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктара філалагічных навук, прафесара Міхася Яўгенавіча Цікоцкага. Сама назва канферэнцыі паказвае, наколькі цесна спалучаюцца лёсы людзей навукі з высакароднай справай служэнню роднай Беларусі. Яскравым узорам гэтага ёсць плённая дзейнасць нашага юбіляра, жыццё якога цалкам прысвечана Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту.

Дарагі Міхась Яўгенавіч! З Вашым імем звязана станаўленне на Беларусі навукі, якая, па трапным вызначэнні сучасніка, з'яўляецца «душой кожнай развітай мовы», – айчыннай стылістыкі. Ваша эрудыцыя, захапленне новым, тонкае адчуванне і бачанне перспектыў філалагічнай навукі арганічна з'ядналіся з прафесарскай спагадлівасцю, ветлівасцю і інтэлігентнасцю. Без Вашых манаграфій, падручнікаў, метадычных распрацовак не было б якаснага выкладання мовазнаўчых дысцыплін ні на журфаку, ні на філалагічных факультэтах краіны. Вы заўсёды стаялі і стаіце ў фарпосце беларускай навукі: і калі стваралі стылістыку публіцыстычных жанраў, і калі выдалі манаграфію «Сугучнасць слоў жывых...», і калі падарылі навуковай грамадскасці і студэнтам стылістыку тэксту. Ваша навуковая спадчына сёння атрымае працяг і паспяховае развіццё ў выступленнях удзельнікаў канферэнцыі, іх ідэях, навуковых здабытках.

Паважаныя калегі! Славянскае мовазнаўства ў працах такіх вучоных, як Міхась Яўгенавіч, засведчвае грунтоўную распрацаванасць праблем функцыянавання і ўладкавання моў свету, сярод якіх беларуская вылучаецца сваёй мілагучнасцю, сістэмнай уладкаванасцю і вытанчанай густоўнасцю.

Інстытуту журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта належыць асаблівая роля ў даследаванні грамадазнаўчых праблем, праблем эвалюцыі інфармацыйнай прасторы, дынамікі маўленчых працэсаў СМІ. Навуковы і творчы патэнцыялы прафе-

сарска-выкладчыцкага калектыву інстытута дазваляюць рабіць гэта на высокім навуковым узроўні. Вашы дзеянні і памкненні накіраваны на мабільнае ўключэнне ў даследаванне сусветнай і айчыннай медыяпрасторы, на выпрацоўку новых методык і практык арганізацыі медыйнай вытворчасці.

Заўважу, што такога чыну канферэнцыі яскрава паказваюць, наколькі мы падрыхтаваны да дынамічна зменлівых умоў жыццеўладкавання, да актыўнага ўваходжання ў сферу інфармацыйных тэхналогій, да фарміравання новай парадыгмы камунікатыўных зносін. І наколькі мы шануем, памятаем пра тых, хто побач з намі шчыраваў і шчыруе дзеля сваёй альма-матар, дзеля сваёй Бацькаўшчыны.

Сардэчна жадаю вам, паважаныя калегі, плёну, выніковай даследчай размовы, творчага натхнення, здароўя і дабрабыту!

Сяргей Абламейка,
рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,
акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар

СЛОВА ЮБІЛЯРУ

МОЎНЫ ВОБРАЗ АПАВЯДАЛЬНІКА Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА «НОВАЯ ЗЯМЛЯ»

Адной з найважнейшых праблем мастацкай стылістыкі з’яўляецца праблема моўнага вобраза аўтара або вобраза апавядальніка. У вобразе аўтара, у яго моўнай структуры аб’ядноўваюцца ўсе якасці і асаблівасці стылю мастацкага твора: размеркаванне моўных сродкаў у апісанні персанажаў, іх учынкаў і думак, пераходы ад аднаго стылю выкладу да другога, пералівы і спалучэнні фарбаў у апісаннях прыроды, характар ацэнак пры дапамозе адпаведных слоў і выразаў. «Вобраз аўтара, – адзначае акадэмік В. У. Вінаградаў, – гэта не проста суб’ект мовы... Гэта – канцэнтраванае ўвасабленне сутнасці твора, якое аб’ядноўвае ўсю сістэму моўных структур персанажаў у іх адносінах з апавядальнікам... і цераз іх з’яўляецца ідэйна-стылістычным асяродкам, фокусам цэлага» [4, с. 122].

Падыходзячы з адзначанымі вышэй крытэрыямі ацэнкі моўнага вобраза апавядальніка да паэмы Якуба Коласа «Новая зямля», мы можам адзначыць, што яна са стылістычнага пункту гледжання ўяўляе вельмі складаную і шматпланавую маўленчую структуру. Мы чуем у ёй ярка выражаны голас самога аўтара, які часта нават перабівае ход апавядання асабістымі звароткамі, напрыклад:

Я тут спыню апавяданне,
Каб значны крок ступіць назад,
Зрабіць уважлівы агляд
Прычын, імкнення, парывання...

Мы чуем галасы іншых шматлікіх персанажаў паэмы, у першую чаргу Міхала, Ганны, Антося, а таксама шматлікіх вяскоўцаў, леснікоў, шляхціцаў, земляробаў і іншых асоб, з якімі давялося мець справу герою паэмы – палясоўшчыку Міхалу.

Разгледзім першую, уступную главу паэмы «Леснікова пасада», якая з розных бакоў характарызуе асаблівасці аўтарскага маўлення, моўны вобраз апавядальніка. Паэма пачынаецца з уступных строф, у якіх аўтар звяртаецца ў форме маналога-звароткa да сваіх родных мясцін, дзеліцца з чытачом сваімі думкамі і пачуццямі, што вы-

клікаюць у яго душы ўспаміны аб мінулым жыцці. Першыя дзве страфы, як і, уласна кажучы, першая глава паэмы, задаюць тон усяму далейшаму апавяданню.

Нагадаем гэтыя важныя ў стылістычных адносінах страфы, якія можна назваць ключавымі, вызначальнымі і якія вельмі ярка характарызуюць маўленча-стылістычную палітру аўтара.

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае ўбогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.
О, як бы я хацеў спачатку
Дарогу жыцця па парадку
Прайсці яшчэ раз, азірнуцца,
Сабраць з дарог каменні тыя,
Што губяць сілы маладыя, –
К вясне б маёй хацеў вярнуцца.

Гэтыя пачатковыя страфы паэмы вельмі характэрныя сваёй рытмічна-кампазіцыйнай зладжанасцю. Дзякуючы лірычнай прачуласці яны пакідаюць уражанне крылатых, інтэртэкстуальных выслоўяў, выклікаюць у кожнага беларускага чытача глыбокае пачуццё нацыянальнай гордасці і сыноўняй любові да роднага краю. Аб гэтым вельмі добра сказаў Янка Брыль у сваёй кнізе «Мой родны кут». У ёй пісьменнік распавядае, як да вязняў гітлераўскага канцлагера трапіла паэма Якуба Коласа «Новая зямля». Пісьменнік так узгадвае пра гэту падзею:

«І вось у рукі яго, якраз у тыя дні, калі мы, маладыя сябры, забаранілі яму прыніжаць сваю чалавечую годнасць, трапіла неяк бывалая кніга без вокладкі, якая пачыналася адразу з самых блізкіх, у сэрцы вынашаных слоў: “Мой родны кут, як ты мне мілы!” Бачыў я тады – пакуль што адзін раз у жыцці, – як самы просты чалавек плакаў над кнігай паэзіі. Не забыцца пра той журботны, цьмяны перадвясновы дзень, пра прасветлены воблік шэрага рабацягі, які, чытаючы ўголас, па складах, трымаўся, як дзіця за бацькаву руку, парэпаным пальцам за кожны радок – каб не дай бог не разлучыцца з тым родным светам, без якога так патамілася, так збалела яго

шчырая душа... І я тады думаў. Не, спачатку я выйшаў у барак, сарамліва застаўся адзін. Мне зноў адкрылася, маю душу па-свойму ўразіла непаўторная беларуская прыгажосць, абаяльная сіла паэзіі – народнай і зараз вялікай» [3, с. 11–12].

Так у новым кантэксце цудоўныя коласаўскія радкі ўзбагаціліся новым патрыятычным зместам і глыбокім лірычным пачуццём.

Заканчваючы свой уступны лірычны маналог, Якуб Колас будуе страфу, якая ўзмацняецца выкарыстаннем сродку паэтычнага сінтаксісу – кальца страфы, калі паўтараюцца першы і апошні радок аўтарскага маўлення, напрыклад:

Вясна, вясна! Не для мяне ты!
Не я, табою абагрэты,
Прыход твой радасны спаткаю, –
Цябе навек, вясна, хаваю.
Назад не прыйдзе хваля тая,
Што з быстрай рэчкай уплывае.
Не раз яна, зрабіўшысь парам,
На крыллях сонца дойдзе к хмарам.
Ды зноў дажджом на рэчку сыдзе –
Ніхто з граніц сваіх не выйдзе,
З законаў, жыццем падпісаных,
Або на дол спадзе ў туманах,
Але хто нам яе пакажа?
На дол вадой ці снегам ляжа?
Не вернешся, як хваля тая
Ка мне, вясна ты маладая!..

Пасля гэтых лірычна-рытарычных уступных строф аўтар пераходзіць да падрабязнага апісання родных мясцін, выкарыстоўваючы розныя вобразна-выяўленчыя сродкі: ад простых ацэначных эпітэтаў да разгорнутых метафар і параўнанняў. Пры гэтым адзначым, што створаныя аўтарам вобразныя малюнкі родных мясцін падаюцца ў своеасаблівай аб'ектыўнай манеры без падкрэсленага аўтарскага «я». Нагадаем наступныя прыклады:

Як дзве старэнькія кабеткі,
К каторым старасць неўзаметкі
Падкраўшысь злодзеем срэдзь ночы,
Як смачны сон закрые вочы,

Красу і крэпасць забірае
І ўсю іх жывасць выкрадае
Ды кіне іх адных, старэнькіх,
Адных як перст, і чуць жывенькіх
І непатрэбных анікому
На цягасць жыццю маладому, –
Так каля хаты, у садочку,
Схіліўшысь цяжка ў куточку,
Стаялі дзве вярбы старыя,
А навакола маладыя
Дзярэўцы пышна красавалі,
На свет вясёла пазіралі...

Або:

Расла тут грушка з тонкім станам;
Па-над парканам пышным валам
Стаяў вішняк густы, прыўдалы.
Садок быў, праўда, невялічкі:
Дзве верабіны ды тры дзічкі
Ды між верб ліпка маладая,
Бы іх унучка дарагая.
Але як весела і міла
Тут пчолка ў вуллях гаманіла!
І як прыемна пахла мёдам!

Гаворачы пра асаблівасці моўнага вобраза аўтара ў «Новай зямлі», нельга не спыніцца на маўленча-кампазіцыйнай, метрычнай структуры паэмы. Як вядома, «Новая зямля» напісана ў традыцыйнай метрычнай форме ямба. Але самае галоўнае – аўтар выдатна выкарыстоўвае для апавядання парную, сумежную рыфму, што надае яго маўленню своеасаблівы каларыт, дае неабсяжныя магчымасці для моўнага эксперыментатарства, стварэння разнастайных лексіка-семантычных і сінтаксічных спалучэнняў афарыстычнага характару, напрыклад:

А для дзяцей найбольша свята
Абы наесціся багата.

Або:

І так, бывала, наясіся,
Што хоць на пуціку круціся.

Адзначым, што афарыстычныя выслоўі Якуба Коласа не толькі адлюстроўваюць побытавыя з'явы, але і выкарыстоўваюцца як сродак выражэння важных сацыяльна-ацэначных значэнняў. Напрыклад:

Як ты ні падай, ні гайсай,
Не пападзеш да пана ў рай.

Або:

Зямля дзяцей сваіх не кіне,
Зямля – аснова ўсёй айчыне.

Больш падрабязна аб гэтым у нас будзе сказана далей. Галоўнай, цэнтральнай тэмай паэмы з'яўляецца тэма новай зямлі, якая выразна сфармулявана ў главе «Смерць ляснічага»:

Так смерць ляснічага старога
Міхала моцна ўскалыхнула
І ўсё ўверх дном перавярнула.
І тут у першы раз Міхала
Вось гэта думка напаткала:
Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,
Каб з панскіх выпутацца пут.
І там зажыць сабе нанова:
Зямля свая – вось што аснова.

Гэта галоўная, цэнтральная думка паэмы развіваецца, разгортваецца ў далейшым апавяданні. Адзначым, што аўтар выдатна выкарыстоўвае такія фігуры паэтычнага сінтаксісу, як рытарычнае пытанне і анафара. Вось што піша паэт у главе «Агляд зямлі», распавядаючы пра пакутлівыя пытанні Міхала:

А дзе ж той выхад? Дзе збавенне
З няволі цяжкай, з паланення?
Адзін ён ёсць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ралля:
То – наймацнейшая аснова
І жыцця першая умова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,

Зямля дзяцей сваіх не кіне,
Зямля – аснова ўсёй айчыне.

Усе працытаваныя намі радкі маюць глыбока змястоўны, афарыстычны характар.

У «Новай зямлі», як і ва ўсіх мастацкіх творах геніяльнага аўтара, пануе магутная стыхія жывога народнага маўлення. Яна выяўляецца не толькі ў мове самога аўтара, але і ў маўленні ўсіх персанажаў паэмы.

Гаворачы пра сюжэт і змест паэмы, можна адзначыць, што ўвесь твор Коласа – гэта апавяданне пра вялікую, дружную, працавітую сям'ю лесніка Міхала.

Паэт закранае ў творы ўсе найважнейшыя, яркія падзеі ў жыцці сям'і Міхала. Тут і апавяданне пра раніцу ў нядзельку, калі маці пякла блінцы на сняданне, і пра гутарку аб новай зямлі, і пра смерць старога ляснічага, пра пярэбары на новае месца, пра зіму ў Парэччы, пра Каляды, Вялікдзень, пра паездку дзядзькі Антося ў Вільню і, нарэшце, пра трагічную падзею – заўчасную смерць Міхала.

Асаблівасці жывога народнага маўлення вельмі ярка выяўляюцца ў багатым выкарыстанні элементаў гутарковага, размоўнага стылю – маналогаў, рэплік, дыялогаў, простай і няўласна-простай мовы, гутарак, размоў і спрэчак персанажаў. У розных главах паэмы мы сустракаемся з вельмі частым ужываннем элементаў палілога – сумеснай гутаркі-размовы некалькіх асоб. Нагадаем, напрыклад, главы «За сталом», «На першай гаспадарцы» і іншыя, у якіх сямейнікі дзеляцца думкамі па галоўнай праблеме – куплі новай зямлі. Вось як пачынае апавяданне пра гэта аўтар:

І бацька ў вольныя часіны
Расказваў дома ўсе навіны
І чуткі ўсе наконт зямелькі.
Так і цяпер, у час нядзелькі,
Аддаўся бацька светлым марам
І вёў размову з такім жарам,
Што бацьку ў хаце ўсе дазвання,
Як бы ксяндза таго казанне,
Так шчыра слухалі, маўчалі,
Што й нос абцерці забывалі.
– Пытаўся я ў людзей, брат, сёння

Наконт зямлі каля Заблоння, –
Так бацька мову расчынае
І вочы весела ўскідае
На ўсіх, хто толькі быў у хаце: –
Там, брат, гароды – чуеш, маці?
(Ён гэтым жонку падкупляе)...

Далей аўтар перадае слова ўсім удзельнікам размовы:

І бацька моўкне і чакае,
Што скажа дзядзька або маці,
І ціха стала ўраз у хаце:
Чутно, як муха пралятае.
– Пасада, кажаш, вельмі ўдатна,
Усяго там родзіцца аж надта.
Чаму ж яе там не купляюць?
На нас, ці што, людцы чакаюць? –
Пытае маці: – Каб такая
Была зямля гэта прыўдала,
Яна б дагэтуль не гуляла,
Або аб ёй ніхто не знае?

Потым у гутарку ўступае дзядзька Антось, які вось такім чынам падсумоўвае важную размову:

– Вядома, бацькаўшчыны шкода, –
Сказаў Антось у тоне згоды: –
Але ж і трэба меркавацца
І аднаго таго трымацца;
І не чужым, а сваім вокам
Агледзець трэба ненарокам,
Як мае быць, Заблонне тое;
А можа выйдзе што-якое.
Рабіць тут трэба – адно слова,
Не то што – цуп-луп! – і гатова,
Бо гэта справа – не пустая;
Людскі ж язык касцей не мае.
Я так бы раіў: выбраць час
І аглядзець усё зараз,
А там сама пакажа справа,

Ці варта шуму ўся аблава,
Бо мо ваўкі ўсе пасхадзілі, –
На тым яны і парашылі.

Акрамя розных відаў маналогаў і дыялогаў Якуб Колас выкарыстоўвае ў паэме багата рэплік, выслоўяў, рытарычных зваротаў і іншых характэрных моўных адзінак. Рэплікі ў паэме выконваюць як вобразна-стылістычную, так і сюжэтна-кампазіцыйную функцыю. Яны могуць выступаць не толькі ў якасці зачынаў апавяданняў, але і ў якасці экспрэсіўных канцовак. Нагадаем прыклады моўных рэплік-зачынаў:

– Ну, небажаты, будзем снедаць –
Ў людзей садзяцца ўжо абедаць.
Цягні мачанку, маці, з печы!
За стол малы, за стол старэчы!

«За сталом»

– То як жа быць? – спытаў Антоні: –
Давай, брат, думаць хоць сягоння
Ці так ці сяк, каб даць параду
І к аднаму ўжо прыйсці ладу.

«На першай гаспадарцы»

– Міхал! Міхале! О, Міхале! –
Пачуўся голас як бы здаля
Каля зямлянкі ранічкою...

«Смерць ляснічага»

Вялікую кампазіцыйную функцыю выконваюць рэплікі-канцоўкі, напрыклад:

– Ну, што ж? Цяпер, маўчы зацята,
Бо так выходзіць, небажаты: –
Наняўся, кажуць, як прадаўся! –
Міхал зласмешна адазваўся.

«Новы ляснічы»

Ляснічы зразу ўзад падаўся...
– Чаго пан гэтак раскрычаўся?
Завошта пан мяне так лае?
Згарыць яна няхай такая
І служба гэта, і пасада,

І гэта крыўда, й гэта здрада,
І гэта панская адплата!..
Няхай яна будзе праклята!.. –
Міхал тут плюнуў, завярнуўся –
Хоць раз, ды добра агрызнуўся.

«На панскай службе»

– Ну, дзядзька, як мы тут стаіма?
– А так, як цюцькі за дзвярыма! –
Ім бацька з хаты дзесь азваўся,
І раптам дружны смех падняўся.

«Вечарамі»

А хочаш ты, каб было ціха,
На чым сядзіш, таго глядзі ты!
Казаў Міхал не раз сярдзіта:
– Маўчы, калі ёсць хлеб у роце! –
І што сказаць на гэта проці?

«Раніца ў нядзельку»

Нідзе не бачылі зайцоў,
І дзядзьку стрэліць не прыйшлося,
Але пачулі ад Антося:
– Забілі зайца, не забілі,
Але ж, брат, гуку нарабілі.

«Зіма ў Парэччы»

А тут Алесь як зарагоча!
За ім адзін, другі паехаў.
Такіх было тут жартаў, смехаў,
Што ўсіх трасло і калаціла
І дзядзьку смехам захваціла.
– Ну, дзядзька, як на смак, прызнайся?
– Паскудства, брат, і не пытайся.

«Дзядзька кухар»

Мінута важная, цяжкая.
І ціха, ціха стала ў хаце.
– Няхай так будзе, пане-браце! –
Гукнуў Хадыка канчаткова.
Яны рукамі крэпяць слова,

Антось ім рукі разнімае.
– Няхай жа Бог вам памагае!
– Панамі будзеце, панамі,
Ядзяць вас мухі з камарамі!

«Агляд зямлі»

У главе «Раніца ў нядзельку» моўны вобраз апавядальніка набывае зусім іншы характар. Як вядома, кожны пісьменнік у залежнасці ад творчай задумы выбірае той ці іншы структурны прынцып арганізацыі моўнага матэрыялу, які і вызначае спецыфіку вобраза апавядальніка. У адных выпадках апавяданне вядзецца адкрыта ад імя аўтара або ад імя героя твора. Гэта так званы суб'ектыўны метад апавядання. У другіх выпадках аўтар прама не выражае свайго стаўлення да апісаных падзей, апавяданне вядзецца ад трэцяй асобы. Але які б сродак апавядання не выбіраў пісьменнік, чытач заўсёды адчувае пазіцыю аўтара, характар яго стаўлення да персанажаў і падзей.

Глава «Раніца ў нядзельку» пачынаецца апісаннем звычайнай вясковай сцэнкі, якое ствараецца пры дапамозе апавядання ад трэцяй асобы.

Дзень быў святы. Яшчэ ад рання
Блінцы пякліся на сняданне,
І ўжо пры печы з чапялою
Стаяла маці... Пад рукою
Таўкліся дзеці, заміналі,
Або смяяліся, спявалі.
Услон заняў сваё ўжо месца,
На ім стаяла дзежка цеста,
І апалонік то і дзела
Па дзежцы боўтаў жвава, смела
І кідаў цеста ў скавародкі.
Давала піск яно караткі,
Льючыся з шумам на патэльні,
І ў жар стаўлялася пякельны;
І там з яго ўжо ўвачавідкі
Пякліся гладзенькія пліткі
Блінцоў, спаднізу наздраватых,

Угору пышна, пухла ўзнятых,
І ўжо адтуль рукою маткі
На ўслон шпурляліся аладкі,
А дзеці іх даўно сачылі
І на ляту блінцы лавілі,
Заядла мазалі іх здорам.
Стаяў асобна ў місцы скорам
Сяго-таго для верашчакі.
Хоць невялікія прысмакі –
Цыбуля, перчык, ліст бабкоў,
Ды сальца некалькі брускоў,
Мука і квас – і ўся прыправа,
Але ўсё ж снеданне цікава...

Яркасць і экспрэсіўнасць гэтага малюнка дасягаецца не толькі ўжываннем вобразна-выяўленчых, ацэначных сродкаў мовы, але і самім характарам аўтарскага апавядання, яго асаблівым «пахам» і «смакам», аб якім пісаў у адной з эпіграм Максім Танк: «Начытаўся я “охаў” і “ахаў” пра красу нашых ніў і лясоў. Ах, каб столькі было ў одах паху, як ад коласаўскіх блінцоў, што ў нядзельку ад самага рання яго маці пякла на сняданне».

Але самае галоўнае – гэта пачуццё гумару, якім насычана ўся паэма. Яно ярка адчуваецца і ў апісанай намі главе:

А для дзяцей найбольша свята
Абы наесціся багата.
І звон аб прыпек скавародкі,
Так блізкі сэрцу, так ім родны,
У нейкім радасным настрою
Спяваў ім песняю святою
І лашчыў сэрца іх і вушы...
Недарма ж дзядзька іх, бывала,
Каб пабудзіць каго з іх жвава,
Пагнаць каровак ранічкою
У прыпек біў скаварадою.

Трэба адзначыць, што Якуб Колас у сваёй паэме адводзіць багата месца апісанню сялянскага застолля. Дастаткова ўзгадаць главы «За сталом», «Падгляд пчол», размову пра Каляды і Вялікдзень і інш. Так, напрыканцы главы «За сталом» аўтар вельмі выразна апавядае

пра завяршэнне ранішняга снядання, калі маці прыносіць вялікую міску тварагу, запраўленага смятанай. Характарызуючы гэту міску, Колас трапна выкарыстоўвае гіпербалічнае параўнанне – метафару: «Другая міска, міска-яма, апаражнялася таксама», што вельмі адпавядае характару паэтавага апавядання, скрозь якое пастаянна свеціцца аўтарская ўсмешка.

Такім чынам, адзначым яшчэ раз, што Якуб Колас у сваёй паэме адводзіць шмат месца падрабязнаму апісанню сялянскага застолля, як сам пісаў паэт – «банкетаванню», што вельмі ярка адлюстроўваецца ў такіх главах паэмы, як «За сталом», «Падгляд пчол», а таксама ў главах, прысвечаных святкаванню Каляд і Вялікадня.

Міхась Цікоцкі,
доктар філалагічных навук, прафесар
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

СЛОВА ПРА ЮБІЛЯРА

ЖЫЦЦЁ, ПРЫСВЕЧАНАЕ СЛОВУ…
Да 90-гадовага юбілею прафесара Міхася Цікоцкага

Плеяда беларускіх філолагаў XX ст. заклала годны падмурак для развіцця айчыннага і славянскага мовазнаўства. Служачы навуцы, дбаючы пра роднае слова, вучоныя перадалі пакаленню сучасных лінгвістаў спадчыну, якая патрабуе сёння адмысловай працы, удумлівых крокаў па развіцці дасягнутага. Адным з класікаў беларускага мовазнаўства з'яўляецца доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, заслужаны журналіст Рэспублікі Беларусь, заслужаны работнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Міхась Яўгенавіч Цікоцкі. Пра выдатнага стыліста Цікоцкага калегі, вучні, журналісты гаварылі і гавораць з асаблівай цеплынёй і гонарам: «Без усялякай рысоўкі і перабольшання прызнаюся: я мераў свой рост па Цікоцкаму. Але гэткай, як у яго, інтэлектуальнай глыбіні не дамогся. Ён для нас – прызнаны лідар, узор інтэлігентнасці» (Барыс Стральцоў); «Міхаіл Яўгенавіч – даследчык дапытлівы, уважлівы да галоўнага ў нашай журналісцкай працы – багацця зместу і культуры слова. Ён сам чалавек шырока адукаваны і інтэлігентны ў лепшым сэнсе гэтага слова. Я не памятаю, каб ён сказаў каму-небудзь са сваіх калег грубае слова, абразіў каго ці аказаўся няўважлівым» (Ефрасіння Бондарава). Існасць Міхася Яўгенавіча Цікоцкага перадае прафесар Іван Сачанка: «Ён мне многім нагадвае святара, таго святара, які спаўна аддае сваё жыццё Богу. Для Міхаіла Яўгенавіча, можна сказаць, наша роднае слова стала сэнсам усяго жыцця, імкненняў».

Жыццё, прысвечанае слову...

Нядаўна ў выдавецтве «Адукацыя і выхаванне» выйшла кніга прафесара М. Я. Цікоцкага «Урокі моўнага майстэрства. Стылістычныя назіранні над паэзіяй і мастацкай прозай Янкі Купалы і Якуба Коласа». Міхась Яўгенавіч з асаблівай любоўю, руплівасцю і чаканай даступнасцю ў ёй праводзіць усебаковы стылістычны аналіз паэтычных і празаічных твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа, падрабязна разглядае такія характарыстыкі, як моўны вобраз

аўтара-апавядальніка, асаблівасці абмалёўкі персанажаў, сістэму вобразна-выяўленчых сродкаў, кампазіцыйныя прыёмы. Так, гаворачы пра Купалу, аўтар кнігі вынікуе: «...Яго паэтычны геній вельмі ярка праяўляўся ў незвычайнай лёгкасці, свабодзе пры выкарыстанні моўнага матэрыялу – як лексічнага, так і граматычнага. Усе моўныя сродкі, як традыцыйныя, так і індывідуальныя, вельмі арганічна ўпляталіся ў тканіну твора. І гутаркова-размоўныя словы, і словы кніжнага стылю, і нечаканыя скарачэнні і наватворы – усё гэта прасякнута нейкай асаблівай паэтычнай свежасцю, трапнасцю, арганічнасцю ў кантэксце кожнага твора. Талент Купалы перапаўняў душу паэта, – яго лірычнае хваляванне шукала выхаду, маладыя сілы імкнуліся праявіцца адразу ў шматлікім багацці напісаных вершаў». Пасля такіх слоў і ўвогуле прачытання кнігі шматлікім руплівцам роднага слова стане лягчэй глядзець на свет, яны больш упэўнена будуць крочыць па абраным шляху, бо светлыя промні напісанага не адпусцяць, заварожаць лёгкасцю і адчуваннем жыццёвай гармоніі, спавітай з думак і памкненняў класікаў айчыннай літаратуры і дасведчана мудрага доследу прафесара Цікоцкага. Міхась Яўгенавіч перакананы: «...Сапраўднае мастацкае слова заключаецца ў своеасаблівым, “дзіцячым” поглядзе на рэчаіснасць... Дзіця кожны дзень адкрывае заманлівы свет, які даўно надакучыў дарослым. Гэта якасць – бачыць усё як быццам упершыню, без цяжару даўніх звычак, быццам у новым святле, – уласціва дзецям і мастакам. Сапраўды, толькі мастак і дзіця здольны бачыць жыццё заўсёды ў незвычайнай свежасці кожнай з’явы, якой бы малой яна не здавалася. Гэта зоркасць погляду, які ўспрымае ўсе фарбы, уменне жывапісаць словамі, каб ствараць рэчы наглядныя, якія б не апісвалі, а паказвалі рэчаіснасць, дзеянні і стан людзей. Гэта веданне вялікіх магчымасцей слова, уменне адкрываць схаваныя моўныя багацці, адчуваць і перадаваць паэзію, багата рассеяную вакол нас».

Невычэрпная моц жыцця, натхненне, спагадлівае сэрца і сяброўскае стаўленне да людзей, дасведчанасць і высакародная інтэлігентнасць сышліся ў асобе сённяшняга юбіляра – арыстакрата па навуковым духу і вытанчанага ў філалагічным гусце стыліста. Навуковая грамадскасць нашай краіны адзначае важную ў філалагічным жыцці падзею – 90-гадовы юбілей слыннага вучонага, таленавітага журналіста, здольнага арганізатара беларускай навукі, які стаіць ля вытокаў класічнай беларускай стылістыкі і стылістыкі публіцыстычных жанраў, Міхася Яўгенавіча Цікоцкага.

Імя беларускага вучонага непарыўна звязана з гісторыяй роднай Беларусі. Асаблівы клопат М. Цікоцкага – родная мова. З болем і нават адчаем Міхась Яўгенавіч гаворыць пра выпадкі абыякавага стаўлення да яе, духоўнай занядбанасці і недалёкасці ва ўсведамленні, што значыць тытульная мова народа. Здараецца так, што сучаснікі здзіўляюцца ўзрушэннямі прафесара. Маўляў, як «выхадзец з такой вядомай, славутай сям'і мог з'яднацца ў адзіным моцным ланцугу з родным словам!». Адказ на гэтае пытанне, відаць, можна знайсці ў творчасці бацькі – народнага артыста БССР Яўгена Карлавіча Цікоцкага – аднаго з заснавальнікаў беларускіх оперы і сімфоніі, чые творы, напісаныя ў класічнай і рамантычнай манерах, маюць моцны ўплыў народных матываў. Сыну ж наканавана было стаць заснавальнікам айчыннай стылістыкі – навукі, вызначальнай у мовазнаўстве ХХ ст.

М. Я. Цікоцкі нарадзіўся 20 лютага 1922 г. у Бабруйску. У 1933 г. сям'я пераехала ў Мінск, дзе ў 1941 г. Міхась Яўгенавіч закончыў сярэднюю школу. Да 1943 г. знаходзіўся на часова акупаванай тэрыторыі, а затым перапраўлены партызанамі на самалёце ў Маскву. Увосень 1943 г. малады Цікоцкі ў складзе супрацьтанкавага знішчальнага батальёна пайшоў на фронт, ваяваў на 1, 2 і 3-м Беларускіх франтах. Летам 1944 г. пад Кобрынам быў паранены. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, двума медалямі «За адвагу».

Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. М. Я. Цікоцкі паступіў на аддзяленне журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Выбар прафесіі журналіста для Міхася Яўгенавіча стаў не выпадковым. Па ўспамінах, у знакамітага бацькі было моцнае захапленне: сабраць калекцыю нумароў усіх газет, што выдаваліся ў Савецкім Саюзе, ад цэнтральных да нізавых – шматтыражак. Такая ўвага да друку не магла не адбіцца на лёсе Міхася Яўгенавіча. Трэба прыгадаць, што і Яўген Карлавіч меў літаратурныя здольнасці.

З творчым запалам журналіст Міхась Цікоцкі працаваў у рэдакцыях газет «Савецкі селянін» і «Калгасная праўда», у часопісе «Вожык». Адначасова вучыўся ў завочнай аспірантуры пры кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, а праз тры гады паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Публіцыстыка Якуба Коласа».

Асаблівае адчуванне беларускага слова, яго мілагучнасці, нюанснага зместавага напаўнення вяртаюць вучонага ва ўніверсітэт.

З 1953 г. М. Я. Цікоцкі працуе на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта спачатку ў якасці выкладчыка, дацэнта кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку, а з 1965 г. і яе загадчыка. Але ж Міхась Яўгенавіч у навуковым пошуку знаходзіць для сябе свой прыярытэт – стылістыку, якой прысягае на ўсё жыццё. М. Я. Цікоцкі ў кастрычніку 1969 г. засноўвае кафедру стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, якой кіруе дваццаць гадоў.

У 1972 г. М. Я. Цікоцкі абараняе доктарскую дысертацыю на тэму «Праблемы публіцыстычнага стылю», а праз год атрымлівае вучонае званне прафесара. Трэба сказаць, што абраная вучоным навука ў той час набыла асаблівую прывабнасць, якая прарасла буйным зернем творчага пошуку і замацавалася ў набытках XX ст. Удала спалучыўшы веды ў галіне журналістыкі і мовазнаўства, малады Цікоцкі пранікнёна даследуе паэтыку журналісцкага слова. Даказвае, пераконвае, дыскутуе і дамагаецца прызнання за публіцыстычным словам эстэтычнай вартасці.

Пад клапатлівым і дбайным вокам даследчыка пачала фарміравацца стылістыка публіцыстычных жанраў – сімбіёз філалагічнай навукі, у якой арганічна спалучыліся набыткі лінгвістыкі, літаратуразнаўства і журналістыкі. Сімвалічна, што аўтарам «Стылістыкі публіцыстычных жанраў» стаў прафесар М. Цікоцкі, кнігі, якая і па сёння застаецца адзінай у сваім родзе і якую, нягледзячы на мову напісання, вывучалі ў свой час нават у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце.

Фарміруецца новы навуковы напрамак – стылістыка тэксту. І зноў прафесар М. Цікоцкі стаў першым на Беларусі: выдаў падручнік «Стылістыка тэксту», у якім увасобіў мару любога стыліста – з'яднаць у адно цэлае элементныя складнікі тэксту праз асобу яго ствараьніка.

Прафесар М. Цікоцкі і сёння трымае сваю дбайную руку на пульсе часу. Рупліва назапашанае ва ўласнай навуковай і творчай скарбонцы перадае наступным пакаленням, перакідае масток да спасціжэння моўных таямніц, адкрывае шлях да творчага пошуку. Бо менавіта валоданне густоўным словам сёння вызначае аблічча сучаснага чалавека, акрэслівае яго прафесійную годнасць, робіць яго мабільным і паспяховым.

Віктар Іўчанкаў,
загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі БДУ, доктар філалагічных навук, прафесар

ЭТЫКА МУДРАСЦІ...
Ганаровы залп жыцця гарматы Цікоцкага

«Батарея, к бою!» – жорсткая каманда вырвала салдат з акопаў і ... пачалася хвалюючая музыка жыцця воіна, грамадзяніна, вучонага, прафесара.

Суровая нота вайны гучала хоць і страшна, але ўсё ж ніжэй урачыстай і шматкаляровай сімфоніі жыцця. Гарматныя залпы рвалі сэрца, білі страшэнным громам па галаве, дымам засцілалі юнацкія вочы і смяротнай маланкай знікалі ў небе. Снарад за снарадам. Залп за залпам. І ўзрыў неба…

Салдат тварыў смерч. Ён не цэліў у чалавека. Ён ставіў завесу супраць смяротнага зла, выпаленай зямлі, расстрэлаў, пажараў, знішчэння ўсяго жывога. Снарад за снарадам. Залп за залпам…

У віхуры бою наступаў момант, калі, здавалася, што сілы не ставала. Тады ў грукат гармат уключалася нейкая звышмагутная сіла. І снарад нібыта ўзлятаў у неба з рук салдата, а ствол гарматы, як вулкан агню, грозна трубіў ваяўнічы кліч перамогі. На дапамогу богу вайны, маладому артылерысту, прыйшоў наш усёмагутны Творца. Святы Бог быў разам з салдатам, каб захаваць яго жыццё і жыцці мільёнаў людзей, якія стаялі супраць пякельнага ваеннага пажару.

Салдат Цікоцкі змагаўся за прыгожае жыццё. За вясновы квяцісты ранак, гарэзлівых прыгажунь-дзяўчат, за нас і нашых дзяцей, цудоўных анёлаў-немаўлят. У яго душы гучала бясконца захапляльная музыка шчаслівай будучыні. На далёкай змрочнай вайне салдат Цікоцкі ствараў светлую ахоўную сферу для сябе і для нас, хто толькі прыйшоў ці толькі збіраўся прыйсці ў гэты свет. Яна, духоўная сфера Цікоцкага, поўнілася любоўю і надзеяй і была настолькі магутнай, што ні куля, ні бомба не заляталі ў яе абсяг. Каб не тое раненне пад Кобрынам…

Воін Цікоцкі дараваў нам будучыню без вайны і смерці. А такая будучыня, як вядома, неўміручая.

Удзячнае грамадства і дзяржава пажыццёва прысвоілі Міхаілу Яўгенавічу высокае ганаровае народнае званне – салдат Перамогі, галоўнага героя Вялікай Айчыннай вайны, які быў апорай непераможнай Савецкай Арміі. На яго гімнасцёрку геройскім крылом двойчы ўзлятала зорка медаля «За адвагу».

У пераможны час М. Цікоцкі не зачахліў сваёй жыццёвай гарматы. У маладога чалавека, які вярнуўся з вайны, раскрыўся твор-

чы талент. Яго юнацкім натхненнем, духоўным боепрыпасам, захапляльным матывам жыцця сталі культура, асвета і навука.

У гэтай цудоўнай духоўнай скарбонцы выкрышталізаваліся самыя яскравыя рысы характару Міхася Цікоцкага. Былы франтавік выдатна вучыўся ў БДУ. З асалодай працаваў у журналістыцы. Незвычайны факт: прафесійны артылерыст, які ўсю вайну быў пад аховай зямельных траншэй і акопаў, працаваў карэспандэнтам рэдакцый хлебаробскіх выданняў «Савецкі селянін» і «Калгасная праўда». Гэта асаблівая рыса тонкага таленту чалавека, непазнавальна шырокі і каштоўны арсенал магчымасцей журналісцкай прафесіі.

Ён першы з франтавікоў абараніў кандыдацкую дысертацыю на аддзяленні журналістыкі ў 1953 г. З таго часу талент маладога вучонага і педагога стаў неад’емнай часткай душы і творчасці многіх-многіх пакаленняў беларускіх студэнтаў, журналістаў і пісьменнікаў.

На фронце ён быў богам вайны, а ва ўніверсітэце стаў майстрам слова. Гэта самая моцная зброя ў арсенале, асабліва творцы, які адкрывае душу чалавека. Гэта адлюстравана ў многіх навуковых творах прафесара Міхаіла Цікоцкага, які стаў мэтрам журналісцкай адукацыі, маэстра беларускай журналістыкі і эстэтыкі публіцыстычнага слова. Ён заснаваў навуковы напрамак у беларускай лінгвістычнай навуцы, стварыў комплекс вучэбнай літаратуры, як аснову засваення журналісцкага вопыту і публіцыстычнага майстэрства.

Міхаіл Яўгенавіч – прафесар ад Бога. У яго педагагічным арсенале захапляльная экспрэсія і непераўзыдзеныя духоўныя адносіны са студэнцкай аўдыторыяй. Эстэтыка выхавання і навучання ў яго педагогіцы знітаваны ў высокую маральную каштоўнасць, якая ўздымае будучага журналіста на самую высокую вяршыню аб’ектыўнай ацэнкі рэчаіснасці. Сярод усіх пакаленняў універсітэцкіх выкладчыкаў Міхаіл Яўгенавіч вылучаецца выключнай інтэлігентнасцю і інтэлектуальнасцю. Ён застрахаваны сваім інтэлектам ад супярэчнасцей і канфліктаў між людзьмі і калегамі. Гэта адна з найгалоўнейшых каштоўнасцей універсітэцкага супольніцтва. Ні крыўднага слова, ні хцівасці, ні косага погляду, ні зайздрасці, ні карыслівасці, ні знявагі. Ні, ні, ні… як асабістае забароненае і абароннае крэда, як жыццёва высакароднае правіла чалавечых паводзін. Праўда, дар такі вельмі рэдкі, і толькі такім прафесарам, як Цікоцкі Міхаіл Яўгенавіч, ён дараваны лёсам і Богам.

Міхаіл – воін, Яўгенавіч – грамадзянін, Цікоцкі – прафесар! Шчаслівае, арганічнае спалучэнне эстэтычна мілагучных вызначэнняў, высакародных слоў-паняццяў для нашага героя і для нас, хто жыве з такім зямным цудоўным чалавекам.

Хвала Госпаду за падарунак беларускаму народу Чалавека-стваральніка, які ўкладвае талент і душу ў развіццё нашага супярэчлівага грамадства.

Хвала Міхаілу Яўгенавічу за маральны і духоўны прыклад мінулага, сучаснага і будучага. Пажадаем, каб эстэтыка жыццёвай мудрасці і чысціні пад крылом таленту Міхаіла Яўгенавіча дазволіла і нам стаць бліжэй да Бога.

Алег Слука,
прафесар кафедры гісторыі журналістыкі
Інстытута журналістыкі БДУ, доктар гістарычных навук,
дэкан факультэта журналістыкі (1986–1996 гг.)

НА ДИСТАНЦИИ ДОВЕРИЯ

У каждого студенческие годы оставляют свои воспоминания. У меня студенчество ассоциируется с представителями поколения преподавателей БГУ, которых с полным правом можно назвать «шестидесятниками» – словом, которое вошло в широкий оборот, когда наше общество в середине 1980-х годов выбрало путь демократических преобразований. Хотя сегодня принято критически оценивать те или иные этапы советской истории, тем не менее именно в 1960-е годы, в так называемую оттепель, были заложены основы нынешних преобразований, пусть болезненных и мучительных, но неизбежных при развитии демократии в ее современной форме.

Среди фигур, которые в этом смысле уже тогда намного опередили свое время, выделялся Михаил Евгеньевич Тикоцкий. Он занимал высокое положение в университетской среде, будучи заведующим кафедрой стилистики и литературного редактирования. Но лингвист и языковед по призванию, Михаил Евгеньевич в общении со студентами вовсе не был суховатым педантом. Занятия он проводил живо и интересно, доходчиво и просто рассказывал о стилистических нюансах устной и письменной речи, учил вслушиваться в слово и творчески работать с ним.

Вспоминая сегодня лекции Михаила Евгеньевича, понимаешь, какую большую роль они сыграли в том, чтобы привить нам, будущим журналистам, чувство языка. Если говорить честно, студенты и тогда не отличались большой грамотностью, начитанностью, эрудицией. Да и по наивности многие считали, что журналисты не столько «читатели», сколько «писатели». Правда, впоследствии оказалось, что в ряды писателей кое-кто из однокурсников все-таки выбился. Это Леонид Дайнеко, Степан Бородовский. Известными журналистами республиканской, а затем и всесоюзной прессы вскоре стали Леонид Легоньков, Александр Градюшко, Николай Латыш. Не так уж мало, если учесть, что на отделение журналистики филологического факультета БГУ в те годы принималось только 25 человек. Причем условия набора были достаточно жесткими. Необходимо было иметь трудовой стаж не менее двух лет. Для парней это означало, что на студенческую скамью они попадали, отслужив положенные тогда три года в армии. Кроме того, при поступлении обязательно требовалось представить публикации и характеристику-рекомендацию от газеты. Такая суровая «школа жизни» рано формировала сознание

собственной значимости в профессии. Поэтому с первого курса большинство из нас видело себя уже «состоявшимися» журналистами, стремилось, не дожидаясь летней практики, больше бывать в редакциях, чем сидеть в аудитории, в библиотеке, за книгой.

Непросто было преподавателям работать с таким «контингентом»: с одной стороны, взрослые люди, с другой – как школьники не прочь на экзамене исподтишка вытащить шпаргалку. Михаил Евгеньевич в таких случаях предпочитал этих детских уловок не замечать. Человек до мозга кости интеллигентный, он с известной долей иронии относился к ситуации всяких экзаменов вообще. Это редкое качество сохранилось у него до сих пор. Накануне защиты моей докторской диссертации с Михаилом Евгеньевичем мы столкнулись в коридоре факультета. У нас состоялся любопытный диалог. К этому времени он нечасто бывал в университете. На вопрос, как он себя чувствует, он вместо ответа сказал мне:

– Что-то вы неважно выглядите.

– Боюсь, Михаил Евгеньевич, защиты. Все-таки докторская…

– Ну что вы, Ниночка, – прозвучало в ответ. – Вы ведь были такой хорошей студенткой!

В этом Михаил Евгеньевич весь. С его доверием к возможностям человека. С его проницательностью увидеть в студентах нечто большее, чем они в юности думают сами о себе. С его джентльменским отношением к женщине-коллеге, с которой на факультете бок о бок работает много лет.

Когда сегодня приходится слышать о том, что лучшие традиции отечественной профессуры безвозвратно уходят в прошлое, хочется возразить – это не так. Такие профессора, как Михаил Евгеньевич Тикоцкий, служат для нас, его бывших студентов, посвятивших себя журналистике и научно-педагогической деятельности, неизменным примером. Поздравляя Михаила Евгеньевича с очередным юбилеем, хочется пожелать ему от всего сердца оставаться по-прежнему оптимистом и не терять бодрости духа.

Нина Фрольцова,
профессор кафедры теории и методологии журналистики
Института журналистики БГУ, доктор филологических наук

А СПАКУШАЛА Ж ГІСТОРЫЯ ЖУРНАЛІСТЫКІ...

Мне, як і многім маім калегам, напрыканцы 50-х – пачатку 60-х гг. мінулага стагоддзя выпала вучыцца на аддзяленні журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, у часы, калі існавала адзіная кафедра журналістыкі. На ёй працавалі Р. В. Булацкі, М. С. Зярніцкі, Е. Л. Бондарава, М. Я. Цікоцкі, Н. А. Сніцарава, А. І. Апелінская. З намі таксама займаліся літаратуразнаўцы-філолагі С. Х. Александровіч, Д. Я. Бугаёў, І. І. Зазека, Б. П. Міцкевіч, Д. Я. Фактаровіч, Н. І. Лапідус, гісторыкі Г. М. Трухноў, А. П. Ігнаценка, выкладчык эстэтыкі М. Р. Крукоўскі, філосаф А. А. Бірала. Усе яны ўжо мелі ступені і навуковыя званні, былі вядомымі ў Беларусі навукоўцамі. Але было ў іх нешта большае, што аб'ядноўвала, – неабыякавасць, сваё меркаванне наконт праблем палітычнага жыцця, нацыянальнай гісторыі, культуры, мовы, літаратуры і мастацтва. Гэта было новае пакаленне беларускіх творцаў, якое карэнным чынам адрознівала іх ад многіх схаластаў, зашораных заскарузлымі догмамі, навукоўцаў 20–30-х гг. накшталт С. Х. Агурскага, для якіх К. Каліноўскі, беларускія народнікі, «нашаніўцы», З. Х. Жылуновіч (Ц. Гартны), У. М. Ігнатоўскі, А. Р. Чарвякоў і інш. з'яўляліся беларускімі буржуазнымі нацыяналістамі, а простыя беларусы – ніякімі не беларусамі, а тутэйшымі з былога Паўночна-Заходняга краю са сваёй заходнерускай гаворкай.

І вось насталі 50-я гг. У журналістыку прыйшло новае пакаленне, многія зведалі трагедыю Другой сусветнай вайны. І сярод іх быў Міхаіл Яўгенавіч Цікоцкі. БДУ ён скончыў у 1950 г., стаўшы дыпламаваным спецыялістам другога выпуску. Папрацаваў у практычнай журналістыцы, а ў 1953 г. перайшоў на выкладчыцкую працу, вырас да прафесара, загадчыка кафедры – спачатку тэорыі і практыкі журналістыкі, а затым – стылістыкі і літаратурнага рэдагавання. Гэтай працы ён аддаў некалькі дзясяткаў гадоў.

Але вернемся да вытокаў. У 1954 г. пры БДУ было адкрыта выдавецтва, потым з'явілася і свая друкарня. Гэта паспрыяла актывізацыі навукова-даследчай працы, што, у сваю чаргу, паўплывала на падрыхтоўку падручнікаў, дапаможнікаў і іншай вучэбнай літаратуры, манаграфій, у тым ліку і па дысцыплінах нацыянальнай тэматыкі, якіх дагэтуль не было. Ужо ў 1960 г. выдавецтва выпусціла дзве кнігі па журналістыцы – зборнік артыкулаў «Из истории партийно-советской печати» і аўтарскі зборнік М. Я. Цікоцкага «З гісторыі беларускай журналістыкі XIX стагоддзя». У некалькіх раздзелах

працы аўтар, які дасканала вывучыў і прааналізаваў тэматыку «Губернских ведомостей» у Беларусі, публіцыстычную спадчыну этнографа і журналіста П. М. Шпілеўскага, «Мужыцкую праўду» К. Каліноўскага, часопіс беларускіх рэвалюцыйных народнікаў «Гомон», першую прыватную газету ў Паўночна-Заходнім краі «Минский листок», а таксама публікацыі беларускіх карэспандэнтаў у агульнарасійскіх легальных і нелегальных выданнях «Современник», «Колокол» і сатырычным часопісе «Искра», зрабіў выдатны ўнёсак у гістарыяграфію беларускай журналістыкі. У зборніку М. Я. Цікоцкі змясціў публікацыі, прысвечаныя важнейшым падзеям у гісторыі Беларусі XIX ст. і важнейшым тагачасным перыядычным выданням. Кніга, такім чынам, на працяглы тэрмін стала, так бы мовіць, падручнікам па гісторыі беларускай журналістыкі, якім карысталіся студэнты і выкладчыкі кафедры. Заўважым, што першы дапаможнік «Гісторыя беларускай журналістыкі», аўтарамі якога былі Р. В. Булацкі, І. І. Сачанка, С. В. Говін, выйшаў толькі ў 1979 г.

Каштоўнасць кнігі М. Я. Цікоцкага «З гісторыі беларускай журналістыкі XIX стагоддзя», якой, дарэчы, карыстаюцца і сённяшнія студэнты Інстытута журналістыкі, заключалася і ў тым, што яе аўтар выступіў супраць вульгарызатарскіх характарыстык многіх беларускіх выданняў XIX ст., публіцыстаў, што друкаваліся ў іх, і аб’ектыўна расказаў аб палітычным жыцці Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. Пасля выхаду кнігі адразу было заўважана, што ў беларускую журналісцкую навуку прыйшоў таленавіты, бліскуча падрыхтаваны, эрудзіраваны педагог і даследчык, які з часам стане ў ёй прыкметнай асобай.

Так і сталася. Але тады, у 60-я гг. XX ст., Міхаіл Яўгенавіч, можа, крыху і задумваўся над пытаннем: чаму аддаць перавагу – гісторыі журналістыкі, дзе ён ужо меў пэўны поспех, ці вывучэнню стылістыкі беларускай мовы, таксама пакуль што недаследаванай праблемы. І вось цуд! Чалавек, для якога роднай мовай з’яўлялася руская, выбраў другі накірунак – вывучэнне мяккай, прыгожай, меладычнай беларускай мовы, яе стылістыкі. М. Я. Цікоцкі стаў не толькі захавальнікам скарбаў беларускай мовы, але і адным з самых яскравых і знакамітых яе распрацоўшчыкаў. За гады працы на пасадзе загадчыка кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Міхаіл Яўгенавіч напісаў і выдаў некалькі падручнікаў, манаграфій – «Практычная стылістыка беларускай мовы», «Стылістыка публіцыс-

тычных жанраў», «Стылістыка тэксту», «Сугучнасць слоў жывых…» і інш. Па яго падручніках вучацца многія пакаленні студэнтаў-журналістаў, філолагаў.

У Міхаіла Яўгенавіча Цікоцкага выдатны юбілей. Тысячы выпускнікоў, студэнты, выкладчыкі Інстытута журналістыкі БДУ, усе тыя, хто слухаў яго лекцыі, жадаюць выдатнаму настаўніку, цудоўнаму сціпламу чалавеку яшчэ многіх светлых гадоў жыцця на нашай роднай зямлі!

Сцяпан Говін,
дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі
Інстытута журналістыкі БДУ, кандыдат гістарычных навук

М. Я. ЦІКОЦКІ: «ПАМЯЦЬ – ГЭТА ВЯЛІКАЯ ПАДМАНШЧЫЦА…»

Студэнцкія гады ўразаюцца ў памяць на ўсё жыццё, асабліва, калі твае выкладчыкі – людзі высокага інтэлекту, шырокага кругагляду і незвычайнай прыгажосці душы. Да такіх выкладчыкаў мы, студэнты факультэта журналістыкі 70-х гг. XX ст., без сумнення адносім і Міхася Яўгенавіча Цікоцкага. Знаёмства нашага курса, на якім вучылася, як высветлілася пазней, цэлая кагорта таленавітых журналістаў і арганізатараў айчынных СМІ, з Міхасём Яўгенавічам пачалося дзесьці на другім курсе, калі ў паточную аўдыторыю старога журфакаўскага корпуса ва ўніверсітэцкім гарадку літаральна ўварваўся высокі, інтэлігентны прафесар, які чытаў у нас лекцыі па стылістыцы газетных жанраў, вёў спецкурс «Праблемы мастацкага і публіцыстычнага стылю».

Лекцыя тады складалася з дзвюх палавінак (кожная па 45 хвілін), паміж якімі быў невялікі перапынак. Бадай, ці не кожны студэнт вёў больш-менш падрабязны канспект, па якім можна было падрыхтавацца да заліку ці экзамену, іншы раз нават не наведваючы бібліятэку. Саміх канспектаў з таго часу не захавалася, а вось у тоўстыя блакноты і нататнікі, дзе сотнямі назапашваліся нейкія крылатыя фразы, трапныя выказванні класікаў і сучаснікаў, пасля лекцый М. Я. Цікоцкага заўсёды хоць нешта трапляла. Аднойчы, выкладаючы нейкі мудрагелісты раздзел па стылістыцы газетных жанраў, Міхась Яўгенавіч заўважыў: «Памяць – гэта вялікая падманшчыца, здаецца, вось нешта цікавае ты пачуў і да дэталей запомніў ледзь не назаўсёды. Але гэта чыстай вады ілюзія, таму вазьміце за звычку адразу запісваць самае каштоўнае на паперу».

Заняткі, якія праводзіў М. Я. Цікоцкі, не заўсёды былі падобнымі да тых класічных лекцый, якія чыталі нам выкладчыкі па замежнай літаратуры, філасофіі, палітэканоміі. Гаварыў М. Цікоцкі крыху прыглушаным голасам, часам адрывіста, але тэкст лекцыі, як я зразумеў ужо значна пазней, з'яўляўся адаптаваным для нашага ўспрымання, а тэорыя адразу ж дапаўнялася прыкладамі з практыкі. Нават праз дзесяцігоддзі згадваецца яго хітраватае пытанне-загадка пра стылістычную недасканаласць радка з твора антычнага паэта, дзе гаворка вялася пра «извилисторогую лань».

Маючы за плячыма вялікую ваенную біяграфію, М. Я. Цікоцкі вельмі неахвотна дзяліўся ўспамінамі ваеннага часу са студэнтамі.

На факультэце журналістыкі (вул. Свярдлова, 7) непадалёку ад кабінета дэкана ў мінулыя дзесяцігоддзі знаходзіўся сціплы стэнд з фотаздымкамі нашых выкладчыкаў, якія былі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. Вось з гэтай крыніцы мы ў асноўным і атрымалі звесткі, што Міхась Яўгенавіч быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, двума медалямі «За адвагу». А што М. Я. Цікоцкі да 1943 г. знаходзіўся на часова акупаванай тэрыторыі, потым на самалёце быў перапраўлены ў Маскву, уступіў у рады Савецкай Арміі і вызваляў родную Беларусь, быў паранены летам 1944 г. пад Кобрынам, – пра гэта можна было прачытаць толькі ў скупых радках біяграфічных даведнікаў і шматтомных энцыклапедый.


А для нас, студэнтаў 1979 г. выпуску, Міхась Яўгенавіч Цікоцкі – выдатны педагог і вучоны, чалавек шчодрай душы, па-народнаму мудры і такі свой, родны, беларус-беларус…

Пятро Дарашчонак,
загадчык кафедры гісторыі журналістыкі
Інстытута журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук,
дацэнт, дэкан факультэта журналістыкі (1996 г.)

Стылістыка беларускай
і рускай моў

Лінгвістыка публіцыстычнага тэксту
і дыскурсны аналіз СМІ

Стылістыка публіцыстычных
жанраў



Гісторыя, тэорыя
і метадалогія журналістыкі

Тэорыя і практыка
рэдагавання

Культура маўлення
журналіста

Медыярыторыка

Ольга Абакумова
Орловский государственный университет
(Россия)

ПОСЛОВИЦА В ДИСКУРСЕ СМИ

В данной статье предлагается рассмотреть проблемы функционирования пословиц в дискурсе СМИ с учетом положений современной риторики. Для анализа реализации смысла пословицы в тексте/дискурсе предлагается коммуникативная модель исследования актуализации смысла пословицы в дискурсе [1].

Пословица понимается как оценочное высказывание, практическое суждение, ведущее к действию. Чтобы правильно использовать пословицу в речи, говорящий должен:

1) оценить коммуникативную ситуацию и выбрать коммуникативную стратегию;

2) оценить референтную ситуацию и отнести ее к определенному типу стандартных ситуаций;

3) выбрать из арсенала средств подходящую пословицу, которая соответствующим образом называет и моделирует ситуацию и дает ей нужную оценку, способную выразить отношение говорящего и вызвать необходимую эмоциональную реакцию;

4) рекомендовать (скрываясь за авторитетом народной мудрости), как следует поступать в подобной ситуации, опираясь на социальные нормы, принятые в данной культуре.

В статье будут показаны реализации двух коммуникативных стратегий с применением пословиц: *собственно коммуникативной*, нацеленной на взаимопонимание, которое должно привести к соответствующему действию, и *социально ориентированной инструментальной стратегии*, которая имеет целью оказать влияние на социум, преследуя свои интересы, то есть стратегии, направленной на успех.

Мы рассмотрим пословицу в газетном тексте, который представляет собой результат и дальнейший стимул обсуждения определенной темы в сфере массовой коммуникации с применением традиционно принятых или официально разрешенных дискурсивных практик и связанных с ними языковых средств. Традиционное понятие «текст» ассоциируется в современной коммуникативной лингвистике с уже основополагающим термином «коммуникативный акт». Дискурс в

таком случае состоит из разъяснения и аргументации. «Коммуникативный разум находит для себя масштаб и меру в способе аргументации в процессе прямой или косвенной реализации претензий на пропозициональную истину, правильность нормативов, субъективную правдивость и эстетическую достоверность» [8].

Типология речевых актов Ю. Хабермаса получает в нашей модели новое наполнение. Анализ употребления пословиц в разных типах дискурса (медийном тексте, бытовом диалоге, художественном и поэтическом тексте) дал возможность выделить дополнительные виды коммуникативной стратегии, точнее, детализировать предложенную Хабермасом дихотомию. Так, для художественного дискурса характерна интрасубъектная коммуникация (разговор с самим собой), которая также может быть манипулятивной. На материале поэтических текстов нами была выявлена коммуникация с неодушевленными объектами [1]. Медийные тексты в основной своей массе представляют социально-ориентированную инструментальную стратегию [2]. Бытовой диалог может включать оба типа коммуникативных стратегий.

Наибольшим изменениям подвергается констативная составляющая типологии Хабермаса, связанная с когнитивным использованием языка – Konstativa. Этот тип речевого акта, в основе которого лежит анализ пропозициональной семантики, углубляется и расширяется, с одной стороны, за счет введения аппарата референциально-ролевой грамматики (РРГ) [3], с другой – за счет использования теории метафоризации окказиональных фреймов [4], поскольку РРГ не предназначена для описания переносных значений пословиц.

Через операторы, модифицирующие структуру клаузы (модальность и иллокутивную силу), осуществляется связь с третьим типом речевого акта – Representativa, в котором реализуются личностные оценки и отношения, личный опыт говорящего и его система ценностей.

Последний аспект напрямую связан с четвертым типом РА по Хабермасу – Regulativa, который мы расширяем через введение понятия деонтической нормы, имеющей культурную детерминированность и национальную специфику.

При анализе реализации семантики пословиц в тексте мы опираемся на законы диалога, выявленные в рамках риторики. Как утверждает Ю. В. Рождественский [7, с. 126], этос диалогов разделяет-

ся на три категории: диалектику, эристику и софистику. Диалектика предполагает такое условие ведения диалога, при котором стороны согласились совместно искать истину. Эристика – условие, при котором обе стороны стремятся к личной выгоде. Софистикой называется условие, при котором стороны прибегают к диалектическим аргументам, но имеют в виду свои интересы.

В данной статье мы рассмотрим два примера реализации этоса диалогов, в которых актуализуются разные коммуникативные стратегии и, соответственно, смыслы пословиц в разных контекстах.

Пример 1.

Статья африканского журналиста Фуншо Балогуна в газете «Новости» от 2 марта 2009 года описывает события в Нигерии, связанные со снятием с поста губернатора штата Ондо Олусегуна Кокумо Агагу, который получил этот пост в результате фальсификации результатов выборов в апреле 2007 года. Правление Агагу продлилось 21 месяц. В феврале 2009 года суд признал избрание его на пост недействительным, так как это произошло в результате сговора с бывшим президентом и нарушения закона о выборах. Ему также пришлось отвечать на вопросы по поводу большой суммы денег, которую он истратил, находясь на посту губернатора и министра авиации.

Kommunikativa. Претензии на понятность. Журналист использует пословицу *Truth never grows old*, которая хорошо известна англоговорящему миру, чтобы показать: правда о скрытых преступлениях всегда выходит наружу, и мошенники получают по заслугам. Но статья выходит не в апреле 2007, а в марте 2009 года, когда сменился президент и суд отстранил Агагу от должности. Журналист действует в интересах правящей власти и выполняет социальный заказ, хотя и выглядит борцом за справедливость. Это социально-стратегическое действие.

Konstantiva. Претензии на истину. Журналист претендует на истину и в то же время выполняет задание редакции, работая на свой профессиональный авторитет, так как сенсации, громкие публичные разоблачения всегда привлекают внимание читателей, общественности. Пропозиция пословицы передается одноместным предикатом grow old .

Логическая структура: кто/что? никогда не стареет.

Семантический класс глагола: *grow (old*) – 5.(fml or lit) to become gradually (grow rich, less); 4) to increase in amount, size or degree; (fig) diminish (COD) – не-локативное состояние качества [10].

Тематические отношения: truth – тема, которая на уровне внутренней формы (образного фрейма) переосмысляется как экспериенсер.

Макророли: truth – актор, участник, контролирующий ситуацию.

Пословичный сценарий представляет собой наложение фреймов:

Образный фрейм: моделируется ситуация, в центре которой находится объект, который обладает свойством не изменять свои качества с течением времени в сопоставлении с другими, одушевленными или просто материальными объектами, которые теряют свои свойства, свою ценность, постепенно устаревают. Ср. 1 тип инвариантов пословичных ситуаций по Г. Л. Пермякову [6]. Если какая-то вещь обладает свойством *x*, то она обладает и свойством *y*. (Если это правда, то она не меняется со временем.)

Окказиональный фрейм: моделируется ситуация, в центре которой находится тщательно скрываемый факт мошенничества при подсчете голосов на выборах, который имел место почти 2 года назад, но не потерял своей актуальности и был разоблачен.

Обобщенный фрейм: истина о фактах и событиях не зависит от времени их осуществления, ее ценность неизменна.

Оператор времени: The Present Simple Tense используется в гномическом предикате для выражения общих истин.

Оператор модальности: алетическая и деонтическая модальность.

Иллокутивная сила: ассертив с выражением общей истины (Правда неизменна) и косвенный директив (Нельзя руководить, не имея на это права. Нельзя приходить к власти путем мошенничества).

Representativa. Претензии на искренность. Журналист претендует на искренность, хотя знает, что выполняет социальный заказ. Он репрезентирует себя как профессионал, переживший разные политические режимы, представитель «четвертой» власти, массмедиа, который знает больше, чем обычный гражданин, и имеет право критиковать и оценивать действия политических деятелей. Но делает это только после смены руководства. Он не предлагает обсуждать существующие в стране проблемы фальсификации выборов, а просто очень эмоционально излагает факты, приводя много цитат и афоризмов, используя развернутую метафору и прецедентные тексты, которые делают статью яркой и убедительной и создают нужное отношение и оценку ситуации.

Regulativa. Претензии на правильность. Пословица имплицирует смыслы, связанные с деонтической модальностью, заложенной в ее семантике. Она передает основную мысль текста: *Нельзя руководить, не имея на это права* (нормы контроля). Это социальные нормы общественного поведения, которые нельзя нарушать тем, кто стоит у власти.

Такой диалог с читателем больше соответствует софистическому этосу, поскольку автор статьи использует диалектические средства, но преследует свои цели. Функция пословицы моделирующая и регулятивная.

Пример 2.

Автор другой статьи музыкант Вернон Рейд делится своими воспоминаниями о лидере группы Living Colour, одном из основателей «черной» коалиции рока Секои Сандиата, авторе песен о любви. Статья написана непрофессиональным журналистом, у автора нет цели заработать авторитет в медийном бизнесе.

Kommunikativa. Претензии на понятность. Музыкант использует пословицу *Truth never grows old*, желая быть понятым читателями газеты, когда он говорит о том, что отношения между мужчиной и женщиной всегда привлекают поэтов, поскольку они полны тайн и взаимного непонимания, непредсказуемы и в то же время вечны, как сама истина. Это вечная тема, которая не умирает и всегда будет интересовать людей. Его цель – достижение взаимопонимания с читателем. Это собственно коммуникативный акт, в котором реализуется диалектический этос.

Konstativa. Претензии на истину. Говорящий претендует на истину, так как считает, что пословица отражает реальное положение дел, отношения полов – это вечная тема жизни и искусства.

Пословичный сценарий как наложение фреймов:

Образный фрейм: моделируется ситуация, в центре которой находится объект, обладающий качеством устойчивости, неизменности, не поддающийся влиянию времени. Абстрактное явление переосмысляется через сопоставление с одушевленным и/или конкретным объектом, теряющим свои качества со временем.

Окказиональный фрейм: описывается ситуация отношений между полами, которая не меняется со временем.

Обобщенный фрейм: истина, факт, реальное положение дел не меняется с течением времени.

Импликация (пословичный сценарий) в виде косвенного директива: *Следует знать правду, думать об интересах других людей, признавать свои ошибки, нельзя причинять вред своим.*

Representativa. Претензии на искренность. Говорящий искренен в своем отношении к погибшему другу – коллеге по ремеслу и его творчеству и хочет поделиться с читателем горечью утраты талантливого поэта-романтика.

Regulativa. Претензии на правильность. Деонтические нормы в семантике пословицы дают возможность имплицировать рекомендации к поведению людей в данной типовой ситуации: *следует знать правду* (нормы реализма), *следует думать об интересах других людей* (нормы контакта), *нельзя причинять вред своим близким* (нормы взаимодействия) (о классификации норм см. [5]).

Функции пословицы — моделирующая и орнаментальная, так как она украшает речь и подводит итог рассуждениям, высказанным в части текста.

В данной статье мы рассмотрели модель анализа реализации смысла пословицы в дискурсе на материале газетных текстов с применением разных коммуникативных стратегий, с опорой на диалектический и софистический этос ведения диалога. Как показал материал, профессиональный журналист в своем тексте как коммуникативном акте преследует социально-ориентированную инструментальную стратегию, используя фигуры софистики, а непрофессиональный автор газетной статьи может быть ориентирован на бескорыстное взаимопонимание, тогда диалог ведется диалектически.

Литература

1. Абакумова, О. Б. Правда как красота в пословице и поэтическом тексте: коммуникативная модель исследования / О. Б. Абакумова // Живодействующая связь языка и культуры. Том 2. Дискурс. Текст. Культура. – М. – Тула: Изд-во ТГУ, 2010. – С. 29–34.

2. Абакумова, О. Б. Пословица в медийном дискурсе / О. Б. Абакумова // Вестник Томского государственного университета. – Томск, 2010. – С. 7–11.

3. Ван Валин, Р. Референциально-ролевая грамматика / Р. Ван Валин, У. Фоли // Новое в зарубежной лингвистике. – Вып. XI. – М. : Прогресс, 1982. – С. 376–411.

4. Зевахина, Т. С. Метафора мертвая и живая / Т. С. Зевахина // Труды Международного семинара «Диалог. 2002» – www.dialog-21.ru.

5. Карасик, В. И. Ценностный аспект языковой личности / В. И. Карасик. Языковой круг: личность, концепты, дискурс. – М. : Гнозис, 2004. – 390 с.
6. Пермяков, Г. Л. К вопросу о структуре паремиологического фонда / Г. Л. Пермяков // Типологическое исследование по фольклору : сб. статей. – М., 1975. – С. 247–273.
7. Рождественский, Ю. В. Законы диалога / Ю. В. Рождественский // Принципы современной риторики. – М., 2005. – 176 с.
8. Хабермас, Ю. Философский дискурс о модерне / Ю. Хабермас. – М. : Изд-во «Весь мир», 2008. – 416 с.
9. Habermas, J. Reason and the Rationalization of Society / J. Habermas // The Theory of Communicative Action. – Boston: Beacon Press, 1987. – 870 p.
10. Van Valin, R. D. Jr. A Synopsis of Role and Reference Grammar / Van Valin // Advances in Role and Reference Grammar. – Amsterdam: Benjamins, 1993. – P. 1–166.

Дзмітрый Аўчароў
Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

ТЭКСТ. КАНОН. ПАДЗЕЯ. КАРЭЛЯЦЫЯ МАСТАЦКАГА І РЭЛІГІЙНАГА ДЫСКУРСАЎ У ЛІТАРАТУРНЫМ ТВОРЫ

Тэорыя інтэртэкстуальнасці, распрацаваная ў апошняй трэці мінулага стагоддзя Ю. Крысцевай, дае падставы разглядаць тэкст як мазаіку цытацый. «...Любы тэкст, – піша даследчыца, – ёсць прадукт убірання і трансфармацыі якога-небудзь іншага тэксту» [3, с. 429]. Інтэртэкст, такім чынам, з'яўляецца механізмам перадачы сацыяльнага, культурнага, экзістэнцыяльнага досведу і, адпаведна, базавай адзінкай для стварэння камунікатыўнай прасторы, дзе спалучаюцца дыскурсы.

Дыверсіфікацыя культурнай прасторы натуральна прыводзіць да ўзнікнення шматлікіх мадэлей інтэрдыскурсіўнага ўзаемадзеяння. Адной са старэйшых і ў той жа час перспектыўных мадэлей з'яўляецца спалучэнне мастацкага і рэлігійнага дыскурсаў у межах літаратурнага твора.

Пісьменнікі XX ст. часта звярталіся да біблейскіх вобразаў і сюжэтаў, асабліва да жыцця Ісуса Хрыста. Амерыканская даследчыца Эліс Бірні налічыла ў літаратуры мінулага стагоддзя больш за 370 тэкстаў, якія ўяўляюць сабой мастацкую біяграфію засна-

вальніка хрысціянства. Па меркаванні Аляксея Татарынава, расійскага спецыяліста па літаратурных апокрыфах, актуальнасць біблейскай тэматыкі тлумачыцца відавочнай супярэчнасцю паміж тым «рэлігійна-сацыяльным ратаваннем», якое, паводле Новага Запавету, здзейсніў Хрыстос, і адсутнасцю «яўнага ператварэння свету», у цэнтры якога каля дзвюх тысяч гадоў знаходзіцца фігура Збавіцеля [5, с. 25–27].

Сучасныя беларускія пісьменнікі (Васіль Быкаў, Янка Брыль, Барыс Пятровіч, Уладзімір Арлоў, Леанід Дранько-Майсюк, Сяргей Рублеўскі, Анатоль Кудравец, Віктар Казько, Сяргей Астравец, Таццяна Лаўрык і інш.) у сваёй творчасці таксама звартаюцца да Бібліі: пераасэнсоўваюць з пазіцый сучаснасці прадстаўленыя ў Святым Пісанні архетыпічныя калізіі, праз што адбываецца ўключэнне Бібліі ў семантычную прастору айчыннай літаратуры.

Праблема інтэрдыскурсіўнасці ў дачыненні да спецыфікі ўзаемадзеяння мастацтва і рэлігіі характарызуецца тым, што біблейскі тэкст як аб'ект дыскурснага аналізу не можа адасабляцца ад хрысціянскага веравучэння, дэсакралізавацца, прафанавацца. Падобнае скажэнне мела нарматыўны статус у савецкім літаратуразнаўстве. Тагачасныя даследчыкі (напрыклад, Ю. Бабічава, Л. Іезуітава) у сваёй працы абапіраліся на прынцыпы навуковага атэізму. Вынікам ідэалагічнага ўплыву на літаратуразнаўства сталася тое, што не толькі тагачасныя, але і сучасныя даследчыкі пазбягаюць непажаданых складанасцей і нярэдка разглядаюць Святое Пісанне выключна як літаратурны помнік*.

Мы лічым такі падыход рэдукцыйным.

Тэксты, з якіх складаецца Біблія, маюць відавочныя прыкметы літаратурнай формы: сюжэт, кампазіцыю, вобразную сістэму і г. д., у іх можна вылучыць наратыўны, сюжэтна-канфліктны і прасторава-часавы ўзроўні. Іншымі словамі, Біблія ёсць сукупнасць тэкстаў, мастацкія якасці і структурныя асаблівасці якіх могуць стаць прадметам філалагічнага даследавання. Аднак у межах інтэрдыс-

---

* Гл. Ефимова, Д. А. Библейские мотивы и образы в романах У. Голдинга «Повелитель мух» и «Шпиль» : дис. ... канд. филол. наук : 10.01.03 / Д. А. Ефимова. – СПб., 2009. – 228 л.; Ремпель, Е. А. Библейские речения, сюжеты и мотивы в творчестве М. Е. Салтыкова-Щедрина: «История одного города», «Господа Головлевы», «Пошехонская старина» : дис. ... канд. филол. наук : 10.01.01 / Е. А. Ремпель. – Саратов, 2004. – 143 л.

курсіўнага аналізу разуменне Бібліі як літаратурнага помніка спараджае шэраг супярэчнасцей.

Калі ў якасці прэтэксту выступае мастацкі, *нерэлігійны* твор, інтэртэкстуальная карэляцыя ўзнікае паміж самадастатковымі адзінкамі. Маецца на ўвазе, што полісемантычная прырода мастацкага маўлення дапускае варыятыўнасць трактовак літаратурнага твора. Кожная з іх пры ўмове лагічнай паслядоўнасці мае права на існаванне. У літаратурным творы з адсылкамі да Бібліі сітуацыя кардынальна адрозніваецца. Актуалізуецца не самадастатковы мастацкі тэкст, напісаны пэўным аўтарам, нават не сакральны тэкст, створаны ў рэчышчы пэўнай рэлігійнай традыцыі, а частка хрысціянскага *канона* і – апасродкавана – хрысціянская традыцыя. Гаворка ідзе аб прынцыпова розных аб'ектах, у дачыненні да Бібліі – аб'ектах з розным генетычным і анталагічным статусам.

Хрысціянскі канон – устаноўленыя царквой кнігі Святога Пісання – быў прыняты толькі ў 393 г. на Гіпонскім саборы. Гэта азначае, што больш за тры стагоддзі пасля Галгофы нараўне з тэкстамі, якія сёння называюць кананічнымі, ствараліся і актыўна чыталіся падобныя да іх тэксты (сучаснай біблеістыцы вядома каля 50 ранніх (II–III стст.) апакрыфічных Евангелляў), якія сёння называюць класічнымі апокрыфамі.

Істотна тое, што апошнія не з'яўляліся імітацыяй канона, другараднымі тэкстамі. Як сцвярджае Н. Мячкоўская, гэтыя творы былі аўтарытэтныя «прыкладна ў той жа ступені, што і творы, прызнаныя пазней кананічнымі». «Аўтары апокрыфаў пісалі не варыяцыі на евангельскія тэмы, яны пісалі Евангелле, кожны сваё, з вялікай літары» [4, с. 242]. Менавіта таму ў кожным з Евангелляў апавядальнік усведамляе сябе як сведку *рэальных падзей*, якія адбыліся ў нядаўнім мінулым, і ў той жа час прыніжае сябе як носьбіта індывідуальных меркаванняў настолькі, што нібыта *адмаўляецца* ад напісанага. Гэта можна прасачыць па тым, як адбываецца «атрыбуцыя» кананічных і большасці апакрыфічных Евангелляў. У назве кожнага з іх падкрэсліваецца не пэўнае аўтарства, а непрадузятасць, аб'ектыўнасць, указанне на тое, што так і было насамрэч. Напрыклад, не Евангелле Марка, а Евангелле ад Марка, даслоўна «паводле Марка».

Чатырох'евангелле вылучаецца з ліку рэлігійных тэкстаў, у якіх апісваецца зямное жыццё Хрыста, не мастацкімі якасцямі, не факта-

лагічнай бездакорнасцю, а *трактоўкай вобразаў і падзей*, апісанню якіх прысвечаны Новы Запавет, і *статусам кананічнасці* гэтай трактоўкі, якую яна набыла напрыканцы IV ст.

Дыялог літаратуры і хрысціянства ў значнай ступені дэтэрмінуецца асаблівасцямі мастацкага мыслення. Адна з такіх асаблівасцей праяўляецца ў еднасці ўсіх відаў духоўнай работы і характарызуецца сваёй універсальнасцю, іманентнасцю мастацкага спосабу пазнання. Мы называем яе *апакрыфічным пачаткам* у мастацтве і ў дачыненні да Святога Пісання разумеем як індывідуальнае ці калектыўнае пераасэнсаванне біблейскіх вобразаў і падзей.

Развіццё апакрыфічнага пачатку ў мастацтве праходзіла паралельна генезісу хрысціянскай традыцыі. Рэпрадуктаваная кожным пакаленнем, яна была сфарміравана і існавала як складаны, да пэўнай ступені статычны комплекс уяўленняў, які, між тым, кожны чалавек, прапускаючы праз сябе, асіміляваў, перапрацоўваў, каб стварыць новы элемент культурнай і сакральнай прасторы – персанальную традыцыю. Няспынная змена носьбітаў персанальнай традыцыі забяспечвала дынамізм хрысціянскай традыцыі ў цэлым. Зразумела, што сутнасць апакрыфічных адносін да ўбачанай праз прызму хрысціянства рэчаіснасці пачала фарміравацца не тады, калі ствараліся першыя апокрыфы, а ў той момант, калі хрысціянская свядомасць упершыню сутыкнулася з міфалагічнай і, што самае галоўнае, з індывідуальнай свядомасцю.

Мастацкае пераасэнсаванне – гэта заўжды палеміка з *прэтэкстам*, а калі гаворка ідзе пра мастацкае пераасэнсаванне Бібліі ў літаратурным творы – то палеміка з *канонам*, бо ўся мастацкая літаратура «прырэчана» да апакрыфічнасці з той прычыны, што яна *a priori* не ўваходзіць у спіс кніг Святога Пісання.

Праілюструем сказанае на прыкладзе двух твораў: апавядання «Елеазар» Леаніда Андрэева і прыпавесці «Мурашкі» Васіля Быкава.

У апавяданні «Елеазар» Л. Андрэеў узнаўляе эпізод уваскрашэння Лазара (Евангелля ад Іаана), які займае ў Чатырох’евангеллі выключнае становішча: па-першае, гэта падзея не апісана ў сіноптыкаў; па-другое, нягледзячы на тое, што Хрыстос уваскрасіў не толькі Лазара, – сіноптыкі паведамляюць пра ўваскрашэнне дачкі Іаіра (Мк. 5, 22–43; Мт. 9, 18–26; Лк. 8, 41–56) і сына Наінскай удавы (Лк. 7, 11–17) – менавіта ўваскрашэнне Лазара з сярэдзіны XIX ст. становіцца аб’ектам герменеўтычнай і літаратурна-мастацкай цікавасці.

Вера ва ўваскрашэнне плоці з'яўляецца краевугольным каменем хрысціянства, паколькі Хрыстос становіцца Збавіцелем толькі пасля таго, як прымае смерць на крыжы і ўваскрасае, перамагаючы смерць. У «Елеазары» галоўны герой з дапамогай Ісуса пераадольвае біялагічную смерць. Такім чынам Л. Андрэеў стварае ілюзію кананічнага разумення цуда ўваскрашэння, аднак ілюзія гэта з цягам часу знікае.

Канчатковасць, цяласнасць не дазваляюць Елеазару вытрымаць цяжар тагасветных ведаў, раздвойваюць яго прыроду. Галоўны герой належыць адразу двум сусветам, двум тэмпаральнасцям. Вярнуўшыся да жыцця, Елеазар – нявольнік «зямнога недасканалага свету», але яго трансцэндэнтны досвед нясе на сабе адбітак вечнасці, і таму ён ужо пры жыцці знаходзіцца ў іншым свеце. У Евангеллі ўваскрашэнне – радаснае абяцанне, цуд як аб'ект свабоднага акта веры, у Андрэева – гэта дар, які ніводны чалавек не здольны прыняць.

У прыпавесці «Мурашкі» В. Быкава «ачалавечаны» Бог-Айцец перажывае стварэнне чалавека як сваю найвялікшую няўдачу. Парафраз старазапаветных падзей, алюзіі на крывавыя эпізоды з гісторыі Заходняй Еўропы, Беларусі і Расіі разгортваюць перад чытачом летапіс чалавечай трагедыі – непазбежнай ад першага дня ў Эдэме. «Што і казаць: Сусвет, створаны Богам, яўна выпадаў з-пад ягонае ўлады» [2, с. 4].

Палемічны пафас Л. Андрэева і В. Быкава заключаецца ў тым, што дасканаласць боскай і бязгрэшнасць чалавечай прыроды Бога-Айца і Бога-Сына выключаюць магчымасць няўдачы, памылкі. Аўтараў цікавіць не магчымасць уваскрашэння *сама па сабе*, не каверны ў прыродзе чалавека *самі па сабе*, а сумнiўнасць бязгрэшнасці Бога, г. зн. сумніўнасць усяго існага з хрысціянскага гледжання.

Нягледзячы на розніцу ў жанры, аўтарскай манеры, спосабах актуалізацыі прэтэксту і г. д., творы маюць агульную рысу: іх адэкватнае прачытанне залежыць ад таго, як мы разумеем характар інтэрдыскурсіўных адносін паміж мастацкім і рэлігійным дыскурсамі, ці адрозніваем актуалізацыю *падзей*, якім прысвечана Біблія, і актуалізацыю *кананічнай трактоўкі* гэтых падзей.

Літаратура

1. Библия. Книги Священного Писания Ветхого и Нового Завета с иллюстрациями Гюстава Доре. – М. : АСТ, 2005. – 968 с.

2. Быкаў, В. У. Мурашкі / В. У. Быкаў [Электронны рэсурс] // Рэжым доступу: http://www.dziejaslou.by/inter/dzeja/dzeja.nsf/htmlpage/byk10?OpenDocument – Дата доступу: 17.01.12.

3. Кристева, Ю. Бахтин, слово, диалог и роман / Ю. Кристева // Французская семиотика: от структурализма к постструктурализму. – М. : Изд. группа «Прогресс», 2000. – С. 427–457.

4. Мечковская, Н. Б. Язык и религия : пособие для студентов гуманитарных вузов / Н. Б. Мечковская. – М. : Агентство «Фаир», 1998. – 352 с.

5. Татаринов, А. В. Художественные тексты о евангельских событиях: жанровая природа, нравственная философия и проблемы рецепции : дис. … д-ра филол. наук : 10.01.03 / А. В. Татаринов. – Краснодар, 2006. – Л. 5–112, 268–297, 316–337.

6. Birney, A. L. The Literature Lives of Jesus : An International Bibliography of Poetry, Drama, Fiction and Criticism / A. L. Birney. – New York : Garland Publishing Inc., 1989. – 187 p.

Вольга Бардзіян
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ДЫЯЛОГ І МАНАЛОГ У ТЭКСТАХ ЯНКІ СІПАКОВА

Мастацкі стыль займае ў літаратуры асобае месца. Разам з іншымі, не менш важнымі, ён выконвае спецыфічную, толькі яму ўласцівую эстэтычную функцыю. Усе моўныя сродкі асобнага твора спалучаюцца ў адзінае цэлае і зачастую адлюстроўваюць стыль аўтарскай творчасці ўвогуле. У тэкстах Янкі Сіпакова дыялагічныя і маналагічныя канструкцыі выступаюць ключавым элементам моўнай тканіны, эстэтычна апрацаванымі моўнымі формамі ў адпаведнасці з выражэннем аўтарскай задумы ў галіне раскрыцця светапогляду, унутранага псіхалагічнага стану людзей, прыгажосці свету, прыроды…

«Найбольш агульнае азначэнне гэтых тэрмінаў такое: дыялог – форма маўлення, калі адбываецца непасрэдны абмен выказваннямі паміж дзвюма або некалькімі асобамі; маналог – форма маўлення, звернутая да тых, хто гаворыць, да самога сябе і не разлічаная на слоўную рэакцыю іншай асобы» [1, с. 193].

Дыялог у тэкстах Янкі Сіпакова адыгрывае сюжэтную ролю, што дае магчымасць не проста паказаць канкрэтныя падзеі, а і ў пэўнай ступені паўздзейнічаць на думкі і пачуцці чытача: «Як толькі ён адышоўся, Шчыпі падсеў да старшыні:

– Раскажыце нам, як дзядзька Анісім ваяваў.

– А што ён сам не расказваў?

– Не, колькі ні просім – нічога не расказвае. Дык мы ўжо і сумнявацца пачалі, а ці сапраўдашні ён партызан? Вунь Мюд кажа, Шкрэд толькі коней лячыў, ды і ўсё…

– Вы што, карапузы! – зазлаваў старшыня. – Ды ці ведаеце вы, што нашага Шкрэда ўсе немцы ў наваколлі баяліся. Як толькі чулі адно слова “Шкрэд”, хто куды разбягаліся. За яго галаву тысячу марак абяцалі. Партрэты яго ўсюды віселі. Такога адважнага партызана трэба яшчэ пашукаць. А яны – “коней лячыў”… Бач ты іх – “коней”» [2, с. 394].

І такіх жывых, дынамічных дыялогаў мноства. Яны могуць, як назіраем, складацца з чаргавання рытарычных пытанняў са словамі «што», «хто» і г. д., якія патрабуюць адказаў, з пытальных або сцвярджальных сказаў, у якіх утрымліваецца нейкі факт.

Багатыя дыялогі празаіка і на няпоўныя сказы, якія выступаюць як рэплікі; на словы-сказы; далучальныя, пабочныя, устаўныя канструкцыі, што дапамагае больш яскрава перадаць сутнасць падзей, скласці вобраз чалавека:

«– … Ды ля аднаго хутара пасвіўся.

– Спутаны?

– Ага.

– Дык вы на спутаных і ехалі? – знарок, каб разварушыць хлапчукоў, спытаўся Верасоўскі.

– Што вы, – усміхнуўся Шчыпі. – Распуталі.

– Косцік, – павярнуўся ён да Шчыпі, – ты ўжо наеўся? Сыты? Ну тады вось што. Пакуль мы яшчэ недалёка адышліся, сядай на ўкрадзенага каня і гані яго зноў на хутар. Спутаеш там – і назад…» [2, с. 322].

Як бачым, пры дыялогах шырока выкарыстоўваюцца аўтарскія рэмаркі, а маналогу нярэдка папярэднічае дыялог: «А што, калі ўсе яны кінуцца на яго? Хіба ад іх абаронішся вось гэтаю дзіцячаю забаўкаю – пісталетам? Хацеў закрычаць, паклікаць на дапамогу, але ў горле ў яго перасела. Ды і так ён, відаць, не закрычаў бы – камандзір павінен сам выбірацца з любой сітуацыі, падначаленыя не павінны бачыць яго страх, каб потым насміхацца з гэтага…» [2, с. 303].

У прыведзеным маналогу першы сказ адлюстроўвае разважаннедумку героя Верасоўскага, а вось у наступных сказах думкі героя і

аўтара зліваюцца, хаця на першы план выступае аўтар, які перадае ад сябе пачуцці і перажыванні персанажа. Калі ж прасачыць пераход дыялога ў маналог у наступным кантэксце: «... Убачыўшы аднойчы гарэзнікаў, якія ўпрагалі ў фуру, яна ўсміхнулася:

– А каб на вас дождж! Мішка, Грышка і Шчыпі бегалі ля воза... "Мішка", "Грышка" прайшло міма вушэй, "Шчыпі" запомнілася.

З таго часу пайшло – Шчыпі ды Шчыпі"» [2, с. 309], то можна сказаць, што цяжка вызначыць, каму ў першую чаргу належыць меркаванне, выражанае ў двух апошніх сказах, бо яно належыць і аўтару, і герою, хаця на фоне макратэксту першы сказ больш адлюстроўвае думку персанажа, а другі – аўтара. Голас аўтара і голас персанажа зачастую ўзаемадзейнічаюць, даючы ацэнку таму ці іншаму факту рэчаіснасці.

Унутраны маналог таксама часта сустракаецца ў тэкстах празаіка. Гэта – размова ў думках, дыялог, спрэчка з самім сабой або з іншымі людзьмі пра набалелае: «І ўсё ж чаму яго цягнула да дзяўчыны? Вяслава была прыгажэйшая за яго жонку. А, можа, яму, стомленаму і ахаладаламу за вайну, жонка здавалася ўжо нібы нейкім сімвалам, нейкай святою, мадоннаю, недасяжнай, а Вяслава – яна была рэальная жанчына, да якой можна дакрануцца, якую можна пацалаваць, ад якой не ў трызненні, а наяве можна пачуць: "Родны мой..."» [2, с. 312].

Думкі на адзіноце часта і чула гучаць і трапна ўплятаюцца ў тканіну твораў мастака, даючы ацэнку падзеям і характарызуючы, як вышэй назіраем, аднаго або некалькіх персанажаў. Трэба зазначыць, што яшчэ часцей у тэкстах Я. Сіпакова маналог мяжуе з дыялогам.

У прозе пісьменніка дыялог і маналог выкарыстоўваюцца не толькі як сродак развіцця сюжэта мастацкага твора, а з'яўляюцца закончанымі кампазіцыйна і структурна аформленымі адзінкамі, якія могуць пачынаць ці заканчваць мастацкі твор.

Адна з асаблівасцей мастацкага стылю заключаецца ў тым, што ён, рэалізуючы функцыю ўзаемадзеяння, выкарыстоўвае ўсе сродкі агульнанароднай мовы. Дастаткова шырока тэксты Я. Сіпакова насычаны размоўнымі і прастамоўнымі лексічнымі адзінкамі: «Знайшлі дзе цiскацца! Вы ж у дазоры, а не на вечарынцы» [2, с. 297]. Нямала можна сустрэць і грубых, абразлівых слоў: «Страляй, я табе кажу, смаркач! – не стрымаўся камандзір. – Гэта ж ваўкі» [2, с. 303].

Значная роля ў пабудове дыялогаў і маналогаў адводзіцца фанетычным, семантычным і лексічным дыялектызмам, якія надаюць мове твораў празаіка асаблівы каларыт: «Па гэтым кашлі ўсе яго пазнавалі нават ноччу, а сам дзед жартаваў, што ў *“грудзёх”* мае нейкі *“струмант”*, які грае» [2, с. 299]; «… па абрабаванаму, галоднаму, толькі што вызваленаму краю, дзе яшчэ шнырають розныя банды, дзе па дарогах бадзяюцца паліцаі, … дзе табуняцца і гайнямі шостаюць асмялелыя і ачмурэлыя ад чалавечыны ваўкі…» [2, с. 302].

Эфектыўна ўключаюцца аўтарам у сістэму дыялогаў і маналогаў вобразныя адзінкі розных узроўняў: «Гэты іхні смех, нібы талісман які, засланяў яго ад куль, ад смерці і быў яму як усё роўна зарукаю, што пасля вайны яны абавязкова сустрэнуцца» [2, с. 302]; «“Дзе яны”, – спытаўся задыханы голас» [2, с. 303].

Сярод нацыянальных літаратурных моўных здабыткаў важнае месца займае самабытная спадчына Янкі Сіпакова.

Творчасць пісьменніка ўяўляе спецыфічны канцэнтрат моўных і структурных элементаў, які здзіўляе сваёй дакладнасцю і маляўнічай сілай.

Літаратура

1. Беларуская мова : энцыкл. / Беларус. энцыкл. / пад рэд. А. Я. Міхневіча; рэдкал. : Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – 655 с.

2. Сіпакоў, Я. Жанчыны сярод мужчын : апавяданні і аповесці / Я. Сіпакоў. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 342 с.

Анна Басова
Белорусский государственный университет

АНДРАГОГИЧЕСКАЯ КОНЦЕПЦИЯ ОБРАЗОВАНИЯ И ЛИЧНОСТЬ СОВРЕМЕННОГО ЖУРНАЛИСТА

Медиасфера в XXI столетии активно развивается и постоянно совершенствуется. Реальность показывает: востребованным будет тот, кто в совершенстве владеет коммуникативными технологиями, регулярно пополняет и обновляет знания и навыки, осваивает новые специализации в сфере медиа, постоянно учится, рассматривая учебу как непрерывный процесс, который сопровождает журналиста на протяжении всей его профессиональной карьеры. Отсюда возникает необходимость в дополнительном образовании. Востребованность

в дополнительном образовании объясняется и высокой социально-экономической динамикой современного общества в целом, существенными демографическими изменениями, увеличением свободного времени людей, ростом общей образованности населения.

Индустрия СМИ ставит вопрос о разнообразии специальностей и специализаций. При этом общество в целом четко формулирует потребность в грамотных, эрудированных, владеющих современными технологиями журналистах, обладающих соответствующим набором знаний и компетенций. Социально-политическая ситуация в мире диктует необходимость готовить конкурентоспособных, образованных специалистов, способных уверенно и эффективно участвовать в профессионально-деловом, социокультурном и повседневном общении с коллегами из других стран. Известно, что в системе белорусского образования общекультурное развитие обучающихся, повышение ранее приобретенного ими культурного уровня исторически рассматривается в качестве одного из приоритетных направлений. Готовность специалиста в области средств массовой информации использовать общекультурный фонд знаний, его потребность в продолжении личностного культурного развития, понимание основных ценностно-смысловых доминант современного мира, страны, общества – все эти характеристики составляют единую социально-профессиональную компетентность специалиста. Они взаимосвязаны и взаимообусловлены совокупностью функционирующих компетенций «как некоторых внутренних скрытых психологических новообразований (знаний, представлений, программ действий, систем ценностей и отношений» [1, с. 8]. Однако этот идеально заданный уровень может не достигаться человеком. Система ценностей, норм, идеалов, которая характерна для социальной общности, зафиксирована и закреплена в текстах, обычаях, традициях, обеспечивающих смысл существования человека и общества, вместе с культурой саморегуляции, предметной деятельности, культурой поведения и общения составляет общую культуру человека. Культура социального и межкультурного взаимодействия в условиях развивающихся интеграционных и глобализационных процессов играет такую же важную роль, как и все остальные компоненты общей культуры специалиста в области средств массовой информации, поскольку от нее зависит успешность его деятельности.

Вместе с тем на каждом этапе развития общества система образования претерпевает определенные изменения в соответствии с его

потребностями, идеологией, ценностями. Важность развития журналистского образования взрослых особенно ясна в контексте новых, утвердивших себя во всем мире педагогических идей – идей непрерывного образования и человекоцентризма, которые являются основой современной трактовки дополнительного образования взрослых. Как известно, в последнее время происходят существенные изменения в дополнительном образовании взрослых в связи с развитием андрагогической концепции, которая исследует и определяет закономерности деятельности взрослых, обучающихся и обучающих по организации и реализации процесса обучения, сущность которого заключается в следующем:

1. Обучающемуся принадлежит ведущая роль в процессе своего обучения.

2. Взрослый обучающийся стремится к самореализации, к самостоятельности, к самоуправлению.

3. Взрослый обучающийся обладает жизненным (бытовым, социальным, профессиональным) опытом, который может быть использован в качестве важного источника обучения как его самого, так и его коллег.

4. Взрослый человек обучается для решения важной жизненной проблемы и достижения конкретной цели.

5. Взрослый обучающийся рассчитывает на безотлагательное применение полученных в ходе обучения умений, навыков, знаний и качеств.

6. Учебная деятельность взрослого обучающегося в значительной степени детерминируется временными, пространственными, бытовыми, профессиональными, социальными факторами, которые либо ограничивают процесс обучения, либо способствуют ему.

7. Процесс обучения взрослого обучающегося организован в виде совместной деятельности обучающегося и обучающего на всех его этапах: планирования, реализации, оценивания и, в определенной мере, коррекции [2, с. 76].

Исходя из перечисленных посылок С. И. Змеёв сформулировал десять андрагогических принципов:

1) приоритет самостоятельного обучения;

2) совместная деятельность;

3) опора на опыт обучающегося;

4) индивидуализация обучения;

5) системность обучения;
6) контекстность обучения;
7) актуализация результатов обучения;
8) элективность обучения;
9) развитие образовательных потребностей;
10) осознанность обучения [2, с. 90–91].

Заведения, осуществляющие обучение взрослых, должны строить учебный процесс как на основе этих принципов, так и на необходимости андрагогической компетентности преподавателей, отказе от жестко регламентированной и закрытой модели образовательного процесса и авторитарной педагогики. Учебный персонал должен быть хорошо подготовлен психологически. Например, чтобы успешно осуществлять психолого-андрагогическую диагностику, включающую определение образовательных потребностей обучающегося, выявление объема и характера его жизненного опыта, физиологических и психологических особенностей, а также когнитивного и учебного стилей, преподаватель должен не только хорошо знать свой предмет, но и выступать в роли эксперта в области технологии самостоятельной учебной деятельности, наставника, вдохновителя слушателей, оказывать им прямую и косвенную поддержку в стремлении слушателей к новым знаниям. Большое значение имеет и создание благоприятных физических, психологических и учебно-методических условий учебного процесса, причем создаваемая учебно-методическая документация должна отвечать особым требованиям, вытекающим из андрагогических принципов обучения.

Структура такого сложного психологического акта, каковым является обучение взрослых, предполагает учет личностных потребностей слушателя – интересов, желаний, стремлений, установок, определяемых его жизненными планами и внешними стимулами мотивации личности. По мнению С. Г. Вершловского, основными побудительными причинами продолжения учебы являются следующие:

1) диспропорция между необходимым для той или иной специальности и наличным уровнем знаний (основным мотивирующим фактором в этом случае выступает статусный фактор);

2) противоречие между реальным и необходимым для освоения социальных условий деятельности, социальных отношений, социально одобряемых норм поведения уровнем знаний (в этом случае человек ориентируется на более дальние перспективы своего профессионального, общекультурного и нравственного самоутверждения);

3) противоречия саморефлексивного характера, неудовлетворенность собой, критическая переоценка себя;

4) противоречия между уровнем знаний человека и новыми проблемными познавательными задачами, выдвигаемыми не только потребностями практики, но и им самим (в этом случае мотив и цель деятельности совпадают) [3, с. 52–53].

Понятно, что чем большее значение имеют для индивида не внешние, а внутренние факторы, тем устойчивее его желание учиться. Что касается специфики запросов личности, принимающей решение о повышении своего образовательного уровня, она как раз определяется особым соотношением внешних и внутренних мотивов. Свобода приобщения к журнализму, безусловно, является величайшим общественным благом, гарантирующим сохранение демократических ценностей и обеспечивающим широким слоям населения право голоса и возможность участия в судьбе социума. Поэтому обучение взрослых, в частности, в области СМИ, должно быть практико-ориентированным, систематическим, недорогим, по возможности краткосрочным, должно проводиться известными и авторитетными в сообществе организациями, высококвалифицированными специалистами и ведущими преподавателями, учитывать специфику как видов СМИ, так и их региональные особенности, не должно использовать устаревшие методы обучения, но должно вовлекать обучаемых в процесс выработки решений. Последнее требование особенно показательно. На наш взгляд, именно его выполнение стимулирует как инновационное педагогическое мышление, так и процессы перехода на новое качество образовательных услуг, способное обеспечить эффективное функционирование институтов непрерывного образования в области журналистики. Часто говорят, что образование – это инвестиции в будущее, но при этом имеются в виду школьное и высшее образование. Однако у общества постоянно возникают новые образовательные потребности. В большинстве случаев пока этот вакуум заполняется тем, что человек занимается самообразованием, но его эффективность будет значительно выше, если это приобретет формы организованного дополнительного образования. Дополнительное образование взрослых имеет большое значение в установлении гармоничных взаимоотношений между обществом и индивидом на протяжении всей жизни человека и является социальной необходимостью любого цивилизованного общества.

Литература

1. Зимняя, И. А. Общая культура и социально-профессиональная компетентность человека / И. А. Зимняя // Высшее образование сегодня. – 2005. – № 11.

2. Змеёв, С. И. Андрагогика: основы теории и технологии обучения взрослых / С. И. Змеёв. – М. : ПЕР СЭ, 2003.

3. Вершловский, С. Г. Общее образование взрослых: стимулы и мотивы / С. Г. Вершловский. – М. : Педагогика, 1987.

Сяргей Берднік
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

УЛАСНА-ЛЕКСІЧНЫ ВЫБАР ВАСІЛЯ БЫКАВА Ў АПОВЕСЦІ «ЯГО БАТАЛЬЁН»

Творчасць кожнага пісьменніка звязана з індывідуальным аўтарскім бачаннем свету, з яго жыццёвым вопытам, з асаблівасцямі эпохі і характарам тых падзей, што сталі вызначальнымі для яго на ўсім жыццёвым шляху. Для Васіля Уладзіміравіча Быкава такой падзеяй была Вялікая Айчынная вайна, якая гартавала і разбурала, жахала і выпрабоўвала, знішчала і давала надзею, прыніжала і ўзносіла. Выжыць і перамагчы – дзве асноўныя задачы, што вырашалі ўдзельнікі той глабальнай катастрофы, вырашалі кожны па-рознаму, канцэптуальна пранізваюць шматлікія творы на ваенную тэматыку. Для Васіля Быкава было важным, у першую чаргу, як выжыць, за кошт чаго альбо каго, як перамагчы, чым і кім ахвяруючы, што адбываецца з людзьмі пад цяжарам вайны і пагрозай знішчэння. Глыбокі псіхалагізм і высокая маральнасць надалі яго творчасці сусветную вядомасць і папулярнасць.

Пісьменнік сам прайшоў дарогамі ваеннага ліхалецця, таму вобраз аўтара прысутнічае ў кожным яго творы. «У вобразе аўтара, у яго маўленчай структуры аб’ядноўваюцца ўсе якасці і асаблівасці стылю мастацкага і публіцыстычнага твора: размеркаванне моўных сродкаў у апісанні герояў, іх учынкаў і думак, пераходы ад аднаго стылю выкладу да другога, пералівы і спалучэнні фарбаў у апісанні прыроды, характар ацэнак пры дапамозе адпаведных слоў і выразаў, асаблівасці сінтаксічнага ладу маўлення і г. д.» [2, с. 82]. Між тым як дзеючая асоба, як крыніца экспрэсіўна-сэнсавага асвятлення падзей вобраз аўтара выключаны са свету апавядання твораў Васіля Быкава, хоць ён не перастае мысліцца і прысутнічаць у мастацкім

творы, у яго стылі. Апавяданне вядзецца ў пераважнай большасці ад імя персанажа, і менавіта праз яго мы адчуваем адзнакі пэўнай аўтарскай індывідуальнасці. «Канцэнтрацыя апавядання вакол персанажа, паглыбленне ва ў яго ўнутраны свет карэнным чынам мяняе спосабы выражэння аўтарскай пазіцыі, моўны вобраз апавядальніка ў мастацкай прозе. Аўтарскае ўмяшанне ў апавяданне абмяжоўваецца. Пункт гледжання персанажа становіцца дамінуючым, ён распаўсюджваецца на ўсё, пра што гаворыцца ў творы. Усё, што трапляе ў поле зроку героя (пейзаж, знешнасць іншых персанажаў, іх учынкі, іх перажыванні, мова), адлюстроўваецца праз яго ўспрыманне. Адначасова з гэтым развіваецца і другая тэндэнцыя – сутыкненне *пунктаў гледжання* розных персанажаў, пашырэнне колькасці *пунктаў гледжання* на падзеі, што адлюстроўваюцца ў творы, і гэта дае магчымасць пісьменніку паказаць адну і тую ж з'яву ў розных ракурсах, пашырыць рамкі адлюстравання» [2, с. 83].

Аповесць «Яго батальён» была напісана ў 1975 г. Яна ўвайшла ў кнігу пад назвай «Пайсці і не вярнуцца», што пабачыла свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 1979 г. Менавіта паводле гэтага выдання (Быкаў, В. Пайсці і не вярнуцца : аповесці / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1979. – 264 с.) разгледзім некаторыя асаблівасці лексічнай сістэмы аповесці «Яго батальён». Да гэтых асаблівасцей адносіцца, перш за ўсё, **уласна-лексічны выбар пісьменніка**. Гэта тыя словы і выразы, што характарызуюць творчую індывідуальнасць пісьменніка, дапамагаюць стварэнню яркіх мастацкіх вобразаў як у плане іх індывідуальнай моўнай характарыстыкі, так і ў плане раскрыцця іх светапогляду, псіхалагічнага стану. У кнізе «Стылістыка тэксту» прафесар М. Я. Цікоцкі адзначае: «Пад сродкамі лексічнай (або слоўнай) выразнасці трэба разумець уласна-лексічны выбар пісьменніка, а таксама фанетычныя, граматычныя і словаўтваральныя асаблівасці мовы. Яны выкарыстоўваюцца для характарыстыкі персанажа ў сацыяльных, псіхалагічных або характаралагічных адносінах» [2, с. 131].

Адна з прыкмет лексічнага складу аповесці «Яго батальён» – наяўнасць шэрагу русізмаў. Абумоўлена гэта шматлікімі экстралінгвістычнымі і інтралінгвістычнымі фактарамі. Васіль Быкаў пачынаў сваю літаратурную дзейнасць як рускамоўны пісьменнік. Пазней у яго беларускамоўных творах адлюстраваліся і моўная сітуацыя ў краіне, і ўзровень развіцця, распрацаванасці тагачаснай беларускай літаратурнай мовы. Апавядаючы пра падзеі вайны, у якой

удзельнічалі ўсе народы Савецкага Саюза, аўтар выкарыстоўвае русізмы і з пэўнай стылістычнай мэтай для характарыстыкі персанажаў. Так, у грубаватым камандзірскім тоне маўлення маёра Гунько «праскокваюць» словы: *пачаму, саізволілі, палучыш*; у мове параненага генерала – *харашо, убяры*. У мове іншых персанажаў сустракаем яшчэ і такія рускамоўныя словы: *блажэнства, давольствіе, у аўражку, сястронкі, палучаецца, хацят, плахой, всягда пажаласта, здраствуйце, безабразіе, уравень, панялі, абучыць, па сумясціцельству, распалажыліся, не замячалася, упраўленне, хазяйства* і некаторыя іншыя. Асобныя лексемы выступаюць у аповесці як варыянты намінацыі адных і тых жа рэалій: *рэмень – рамень – дзяга; пёс – сабака; паўшубак – кажушок*. Даволі часта сустракаецца прыметнік *трудны* і вытворнае ад яго прыслоўе *трудна*, хаця вышэйшая ступень параўнання выступае ў форме *цяжэй*.

У аповесці «Яго батальён» Васіль Быкаў індывідуалізуе маўленне сваіх герояў і паводле нацыянальнай прыналежнасці. Прывядзём дыялог галоўнага героя камбата Валошына з лейтэнантам Муратавым, татарынам па нацыянальнасці:

– Як вы размеркавалі папаўненне? – напаўголасу запытаў камбат.

– Усіх у адын узвод.

– Усіх? А камандзір узвода?

– Сам буду камандыр узвода. Буду под рукой дэржаць.

– Ну і які настрой у новенькіх?

– А, какой настрой! Прысталі, спаць хацят. Акапываца не хацят.

– Акапацца трэба.

– Я сказал: одын ячэйка на два чалавек.

А вось дыялог камбата з параненым радавым Аўдзюшкіным:

– Аўдзюшкін, ты?

– Я, таварыш камбат.

– Ты што, паранены?

– Раніты, таварыш камбат. Во ногі ў мэнэ прастрэленыя.

– А Нагорны?

– Нагорны вбіты. Ёго гранатай вбіла. Тут, у траншэйцы.

– Раніцай?

– Ранкам, ну, – з натугай стрымліваючы стогн, казаў Аўдзюшкін. – Як мы сунуліся, ну ён і навалівся. Всех пэрэбілы. Тількы я остався.

Значная колькасць рускамоўных слоў у аповесці класіка тлумачыцца і асаблівасцямі развіцця і функцыянавання сучаснай бела-

рускай літаратурнай мовы. Прафесар В. І. Іўчанкаў у сувязі з гэтым падкрэслівае: «Мова беларускага народа грунтуецца на традыцыі вуснага маўлення. Гісторыя распарадзілася так, што пісьмовая форма беларускай мовы доўгі час была пад забаронай, і яе носьбіт вымушаны быў карыстацца пісьмовай формай польскай, рускай, калі трэба было напісаць паперу ва ўправу, да чыноўніка. Аднак ён не мог аддаць ёй перавагу ў маўленні, бо гаварыў так, як яго навучылі бацькі – на роднай гаворцы. Гэты экстралінгвістычны факт паўплываў на перспектыву фарміравання сучаснай беларускай мовы» [1, с. 41]. Другі немалаважны экстралінгвістычны чыннік – моўная палітыка ў СССР, скіраваная на другасную ролю нацыянальных моў ва ўмовах руска-нацыянальнага білінгвізму. Гэтыя фактары пэўным чынам адбіліся на лексічным складзе першых беларускамоўных аповесцей Васіля Быкава. Аднак большасць русізмаў і слоў гутарковай лексікі ў мове таленавітага мастака мае пэўную стылёвую нагрузку.

Яшчэ адной адметнай рысай уласна-лексічнага выбару пісьменніка з'яўляецца шырокае ўжыванне назоўнікаў са значэннем зборнасці. У аповесці «Яго батальён» налічваецца больш за 30 іх ужыванняў. Толькі назоўнік *кустоўе* ўжываецца восем разоў. Згушчанасць фарбаў, адметнасць пейзажаў, напружанасць момантаў вызначаюць у тэксце аповесці гэтыя словы. Некаторыя сказы ўтрымліваюць адразу два назоўнікі са значэннем зборнасці. Напрыклад: *Боты хрустка ламалі леташні змерзлы* ***быльнёг*** *на ўзмежку, нейкае нябачнае калючае* ***суччо*** *ў доле чаплялася за халявы, полы шыняля, вецер надакучліва сцёбаў па твары незавязанымі матузамі шапкі. Паранейшаму было цёмна, напорысты паўночны вецер шапацеў у* ***быльнягу*** *і рэдкім, па ўзмежках,* ***кустоўі.*** *Сотні сталёвых асколкаў гарачай віхурай абдалі* ***кустоўе,*** *зразаючы* ***голле*** *і наскрозь прапякаючы тоўсты, да самага дна, лёд.* У першым сказе словы *быльнёг* і *суччо* сваёй семантычнай кандэнсацыяй падкрэсліваюць перашкоды, з якімі сутыкнуўся герой аповесці, складанасць іх пераадолення. У другім сказе словы *быльнёг* і *кустоўе* дапамагаюць намаляваць адметны пейзаж эканомнымі моўнымі сродкамі. У апошнім сказе словы *кустоўе і голле* ў звязку з іншымі словамі раскрываюць дынамізм сітуацыі, напружанасць моманту. Адзначым іншыя лексемы са значэннем зборнасці ў аповесці: *клочча, хмызняк, шчацінне (шчэць), хмыззё, куп'ё, грымоцце, веццё, правалле.* Найбольшай ацэначнасцю з іх вызначаюцца *грымоцце* і *правалле*: *Сцяўшыся ў бліндажы, ён [Валошын] пільна ўслухоўваўся ў ашалелае*

грымоцце *бою і думаў, што неўзабаве павінен наступіць пералом у той або іншы бок. Перачакаўшы серыю мінных разрываў, калі, здавалася, усё на свеце вось-вось абрынецца ў* ***правалле****, ён зноў узняў галаву і ўбачыў байца, які то заміраў ля самай зямлі, напэўна, чакаючы, калі скончацца блізкія выбухі, то, зноў ліхаманкава перабіраючы рукамі, поўз у яго бок.*

Наше исследование не ограничивается рамками собственно лингвистического анализа медиатекстов общенациональных ежедневных медиа, так как экономический текст, в особенности текст международной экономической тематики, является результатом журналистской деятельности в определенном социальном контексте и характеризуется не только лингвистическими, но и экстралингвистическими переменными. Следует обратить внимание и на терминологическую насыщенность внешнеэкономического дискурса: для него характерно широкое присутствие экономической лексики, сложных слов и акронимов, заимствованных терминов-словосочетаний, транслитерации, калькирования, преимущественно с английского языка, порой излишней аббревиарности, увлечение различными индексами, что также не упрощает задачу донесения информации до аудитории.

К экстралингвистическим (прагмалингвистическим, социолингвистическим, психолингвистическим и т. п.) факторам необходимо отнести тематический контекст (соседство других медиатекстов), политико-экономический вектор как конкретного медиатекста, так и направленность издания в целом. Далее следует принимать во внимание контингент его читателей, взаимоотношения данного печатного органа с учредителями, другими медиа, т. е. позицию и роль издания в общественно-политической жизни страны. Также следует учитывать корреляцию темы, раскрытой или затронутой в медиатексте, с современными экономическими и социально-политическими реалиями общества. И, наконец, необходимо принимать во внимание личность автора статьи, его биографию и уровень профессиональной подготовки, религиозные и политические взгляды, все те моменты, которые оказывают заметное влияние на содержание и жанровую реализацию медиатекстов международной экономической проблематики.

Литература

1. Антонова, В. И. Трансформации типологической и жанровой систем в современной журналистике (по материалам печатных изданий Поволжского региона) : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.01.10 / В. И. Антонова. – Казань, 2006. – 34 с.

2. Ворошилов, В. В. Журналистика : учебник для вузов / В. В. Ворошилов. – СПб. : 2006. – 336 с.

3. Дискурс. 2011. [Электронный ресурс] Сайт Википедия. Режим доступа: http:// <ru.wikipedia.org/wiki/Дискурс> Дата доступа: 12.12.2011.

4. Зимина, Е. А. Оценочные стратегии информационных статей и комментариев в немецкоязычном газетном дискурсе : дис. ... канд. филол. наук. – М., 2005. – 179 с.

5. Іўчанкаў, В. І. Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В. І. Іўчанкаў. – Мінск : БДУ, 2003. – 257 с.

6. Исследования СМИ: методология, подходы, методы : учеб.-метод. пособие. Материалы лекций для аспирантов факультета журналистики МГУ имени М. В. Ломоносова. – М. : Изд-во Моск. ун-та; Факультет журналистики МГУ имени М. В. Ломоносова, 2011. – 236 с.

7. Кетова, А. Ю. Жанр аналитической статьи на экономическую тему в дискурсивном аспекте. 2011. [Электронный ресурс] Сайт журнала Медиаскоп. Режим доступа: http://<www.mediascope.ru/taxonomy/term/7> Дата доступа: 10.08.2011.

8. Кройчик, Л. Е. Система журналистских жанров. Основы творческой деятельности журналиста / Л. К. Кройчик; ред.-сост. С. Г. Корконосенко. – СПб. : Знание : СПб. : ИВЭСЭП, 2000. – 272 с.

9. Кройчик, Л. По существу ли эти споры? По существу! («МТ», «ВЖТ», «ВПТ»… Далее – что?) / Л. Е. Кройчик. – Новое в массовой коммуникации : альманах. – Воронеж, 2006. Вып. 3–4 (58–59). – С. 6–11.

10. Сабирова, Л. Р. Трансформация системы жанров в татарской журналистике / Л. Р. Сабирова // Информационное поле современной России: практики и эффекты : материалы VIII Междунар. науч.-практ. конф. Казань, 20–22 октября 2011 г. / под ред. В. З. Гарифуллина, Р. П. Баканова. – Казань : Казан. ун-т., 2011. – 628 с.

11. Стрельцов, Б. В. Основы публицистики. Жанры : учеб. пособие / Б. В. Стрельцов. – Минск : Университетское, 1990. – 239 с.

12. Тертычный, А. А. Жанры периодической печати : учеб. пособие / А. А. Тертычный. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : Аспект Пресс, 2006. – 319 с.

13. Тертычный А. А. Состояние и перспективы развития системы жанров российских СМИ. 2010. [Электронный ресурс] Сайт журнала Медиаскоп. Режим доступа: http://<mediascope.ru/node/675> Дата доступа: 5.01.2012.

14. Типология периодической печати / под ред. М. В. Шкондина, Л. Л. Реснянской. – М., 2007. – 46 с.

15. Типологические исследования в РФ: методологические подходы и способы. 2010. [Электронный ресурс] Режим доступа: http://<www.mediaspb.pu.ru/upload/files/doc_1231665048.doc> Дата доступа: 10.08.2011.

16. Третьяков, В. Т. Как стать знаменитым журналистом : курс лекций по теории и практике современной русской журналистики / В. Т. Третьяков. – М. : Ладомир, 2004. – 632 с.

17. Чернявская, В. Е. Дискурс как объект лингвистических исследований / В. Е. Чернявская // Текст и дискурс. Проблемы экономического дискурса : сб. науч. ст. – СПб. : Изд-во СПбГУЭФ, 2001. – 155 с.

Сергей Венидиктов

Могилевский высший колледж МВД Республики Беларусь

ПОЛИТИЧЕСКИЙ ПОТЕНЦИАЛ СТУДЕНЧЕСКИХ СМИ: МЕДИАПРОЕКТЫ УНИВЕРСИТЕТА ФРАНКЛИН ПИРС (США)

Современные средства массовой информации способны в корне менять содержание социального взаимодействия, оказывать влияние на поведенческие установки и ценностные ориентации граждан, обеспечивая устойчивость общества в целом и политической системы в частности. На общественную эффективность деятельности медиа напрямую влияют степень свободы и независимости СМИ, количество каналов коммуникации, конкуренция между различными СМИ, разнообразие их наполнения и величина аудитории, готовой к рецепции социальных, экономических, политических и культурных реалий. Наиболее перспективную позицию в современной медиасистеме занимают региональные СМИ, способные удовлетворять потребности локальной аудитории. К их числу правомерно отнести и медиаструктуры, существующие в высших учебных заведениях, при условии их активного взаимодействия с местным сообществом.

В 2011 г. в рамках Международной программы академического обмена имени сенатора Фулбрайта (США) нами был реализован проект «Система студенческого телевидения США и возможности ее адаптации к медиасфере Республики Беларусь». Объектом исследования выступили средства массовой информации университета Франклин Пирс. Содержание проведенного анализа предопределила гипотеза о доминирующей роли американских студенческих медиа в отраже-

нии потребностей локальных сообществ США (университетские городки и их окрестности), стимулировании гражданской активности аудитории и развитии политической культуры молодежи.

Университет Франклин Пирс представляет собой несколько подразделений-колледжей, расположенных в штатах Нью-Хэмпшир, Аризона и Массачусетс, в которых обучаются студенты из 30 штатов США и 15 стран мира. Франклин Пирс входит в Ассоциацию колледжей Новой Англии, агентством «Forbes» включен в перечень 600 лучших учебных заведений США. Одним из основных учебных подразделений университета является Центр массовой коммуникации имени Марлина Фитцвотера (Marlin Fitzwater Center for Mass Communication), основанный в 2002 г. в университетском городке Риндж (Нью-Хэмпшир) и названный именем бывшего пресс-секретаря Белого дома. Помимо обеспечения деятельности факультета массовой коммуникации центр занимается исследованием отношений президентской власти и прессы и представляет собой во многом «первичное» гражданское медиаобразование, удовлетворяя запросы локального сообщества.

Деятельность центра определяется, в первую очередь, наличием собственных медиаструктур: радиостанции студенческого городка «The Talon – WFPC-LP 105,3 FM», студенческой телестудии «FPTV–25» с собственным каналом вещания на территории университета, газеты «Pierce Arrow» с ее интернет-версией www.PierceArrowNews.com, общественного новостного интернет-ресурса. Все студенческие медиа университета объединены в составе «Медиагруппы Пирс» («The Pierce Media Group»), также включающей в себя подразделение спортивного вещания «Ravens Sports Network», отдел рекламы «Four Corners Marketing» и отдел интернет-вещания «The Fitz Online». Традиционно в работе «Медиагруппы Пирс» задействовано около 110 студентов, которые осваивают творческую и техническую стороны различных профессий в современных средствах массовой информации. Особое внимание уделяется медиаобразованию – совокупности компетенций, позволяющих студентам самостоятельно оценивать содержание контента СМИ, мыслить критично, анализировать культурные последствия общественного потребления медиапродукта. При этом акцент делается на роли журналистики в поддержании жизнеспособности американской демократии, а также на развитии политической культуры студентов.

Студенческие средства массовой информации в университете Франклин Пирс, с одной стороны, предлагают исчерпывающую информацию об университете, чем способствуют социализации обучаемых и оптимизации общественной жизни в кампусе. С другой стороны – и это крайне важно для университета, для демократического общества, для будущей карьеры выпускников – такие СМИ способствуют открытому обсуждению общих проблем (например, принципов образовательной политики, важных решений руководства учреждения), формированию общественного мнения. Вести гражданский диалог через студенческие медиа в США означает не просто «говорить о наболевшем», а тщательно взвешивать последствия возможных решений и действий, принимая во внимание позиции других.

Благоприятный общественный фон для деятельности студенческих СМИ формирует также традиционно насыщенная событиями жизнь штата Нью-Хэмпшир. Центр массовой коммуникации имени Марлина Фитцвотера служит академической лабораторией для изучения отношений между государственной властью и прессой, на региональном и национальном уровнях реализуя несколько значимых проектов. Основной вклад центра связан с политическими мероприятиями, в первую очередь, – президентскими выборами. Небольшие размеры учебного заведения создают оптимальные условия для усвоения студентами политических практик, максимально сокращая дистанцию между студентами и представителями политической сферы: кандидатами в президенты, сенаторами, общественными деятелями.

С 2008 г. студенты университета задействованы в освещении предвыборных дебатов кандидатов в президенты. В 2011 г. Центр массовой коммуникации был привлечен к информационному обеспечению дебатов, проходивших в соседнем городе Манчестер, в начале 2012 г. – предварительных выборов (т. н. праймерис) в штате Нью-Хэмпшир. Допуск к освещению политического события такого высокого уровня подтверждается лично кандидатами в президенты и их избирательными штабами (аккредитация гарантирует студентам свободный доступ на все события и возможность записи интервью с политиками), ведущими СМИ страны (студенты задействованы в их работе в качестве репортеров и технического персонала), а также интернет-СМИ, включая YouTube (в сети размещается видео,

предоставляемое студенческими творческими группами). Университет Франклин Пирс – единственный в штате Нью-Хэмпшир и один из немногих в США, который обеспечивает столь широкое участие своих студентов в политических мероприятиях национального масштаба.

В течение академического года, предшествующего праймерис, студенты следят за актуальными тенденциями в политической сфере США, участвуют в опросах общественного мнения и освещают деятельность групп поддержки кандидатов по штату Нью-Хэмпшир. Также молодежь участвует в освещении дебатов и получает возможность задавать «неудобные» вопросы кандидатам во время посещения последними университетского городка. Эта деятельность сопровождается многочасовыми видеосъемками, подготовкой разножанровых материалов для местной прессы, а также укреплением связей с участниками предвыборной кампании и местными СМИ.

Непосредственно во время проведения праймерис в 2008 и в 2012 гг. в одном из корпусов университета была оборудована новостная студия, из которой студенты выходили в телевизионный эфир каждые 15 минут. Здесь же располагалось оборудование для видеомонтажа, выгородка для оперативной записи интервью, студенческий координационный центр.

Во время праймерис 2008 г., когда Нью-Хэмпшир превратился в центральный пункт избирательных программ всех кандидатов и привлек внимание национальных средств массовой информации США, активность университетских медиа дала ощутимые результаты. Франклин Пирс был избран Общественным телевидением Нью-Хэмпшира для освещения предвыборных кампаний трех кандидатов в президенты. Студенты были задействованы в качестве корреспондентов и операторов при подготовке видеосюжетов для YouTube-страницы телеканала «WMUR–TV» – филиала телекомпании «ABC». Также студенты участвовали в работе экзитпулов в Бостоне, предоставляя результаты опросов национальным СМИ и политическим блогерам. YouTube–канал Франклин Пирс, который гарантировал общественный доступ к интервью с кандидатами в президенты, в день праймерис вошел в число ста наиболее востребованных каналов YouTube.

В июне 2011 г. медиагруппа Центра массовой коммуникации имени Марлина Фитцвотера вместе с представителями нескольких

сотен американских СМИ принимала участие в открытии серии предвыборных дебатов. Накануне выборов университет пригласил кандидатов в президенты выступить перед студентами; серия выступлений началась осенью и продолжалась вплоть до праймерис в Нью-Хэмпшире (начало 2012 г.). В организации встреч с кандидатами принимали участие все желающие студенты и преподаватели. Аудитория интернет-вещания также могла размещать свои вопросы на сайте мероприятия и получать ответы в интерактивном режиме.

Сориентироваться в сложных политических явлениях, правильно собрать данные, подвергнуть их затем беспристрастному анализу, наладить контакты с национальными СМИ, т. е. создавать качественный медиапродукт политической направленности студентам помогает известный в США политолог Р. Келли Майерс, с которым университет Франклин Пирс наладил тесное сотрудничество.

Таким образом, университет в полной мере использует уникальный образовательный потенциал предвыборных кампаний и самих выборов в развитии гражданской культуры студентов, максимально вовлекая последних в политический процесс.

С 2002 г. реализуется наиболее важный имиджевый проект Центра массовой коммуникации – «Брифинги по вторникам» («Tuesday Briefings»). Мероприятие представляет собой открытую для публичного посещения часовую телевизионную пресс-конференцию, на которой обсуждаются актуальные для американского социума вопросы. Выступить перед аудиторией имеет право абсолютно каждый, однако преимущественно в брифингах принимают участие известные ученые, политики, общественные деятели, журналисты, артисты. Аудиторию составляют студенты и преподаватели университета, а также представители местной общины, которые могут задавать выступающим любые вопросы. Студенты Центра массовой коммуникации работают в качестве модераторов мероприятия, они же отвечают за функционирование всего студийного оборудования (видеокамеры, свет, звук и т. д.). Брифинги в прямом эфире транслируются из учебной телестудии по локальному студенческому кабельному телеканалу «FPTV-25», также осуществляется интернет-вещание.

Проведение подобных открытых слушаний в университете Франклин Пирс основано на опыте Марлина Фитцвотера, который, будучи пресс-секретарем Белого Дома, регулярно по вторникам проводил утренние брифинги для прессы. Задачей брифингов в Центре

массовой коммуникации является налаживание связей с общественностью, привлечение студентов к обсуждению и решению проблем, имеющих национальное значение. Например, в первом брифинге 2011/12 учебного года принял участие Том Паукен, бывший глава республиканской партии Техаса, нынешний глава Техасской рабочей комиссии, который представил свою новую книгу «Как Америка потеряла свой путь и как на него вернуться». Тема второго брифинга была определена как «Взгляд на американскую экономику из-за рубежа». В преддверии проведения праймерис в штате Нью-Хэмпшир перед университетской аудиторией выступил Колин Ван Остерн – кандидат от демократической партии, работавший на нескольких избирательных кампаниях.

К числу наиболее масштабных образовательных программ политической направленности относится проект «Президентская власть и пресса», в рамках которого Центр массовой коммуникации ежегодно организует Национальную конференцию для школьных средств массовой информации. Среди задач мероприятия – развитие здорового и открытого диалога как важнейшего фактора укрепления национальной демократии. Целевой группой конференции являются руководители и сотрудники школьных СМИ из различных штатов. В течение пяти дней наиболее активной части американской молодежи предлагается ознакомиться с закономерностями современного политического процесса, ролью СМИ в его развитии, а также со сложными взаимоотношениями представителей власти и журналистов. Различные презентации, экскурсии, интервью, панельные дискуссии и иные мероприятия направлены на развитие в молодежной среде навыков, необходимых для сознательного участия в президентских выборах и иных политических событиях.

Во время конференции школьники работают в печатных и электронных СМИ университета в качестве репортеров, продюсеров, блогеров, фотографов, видеооператоров. В их задачу входит написание статей, подготовка и проведение интервью, верстка новостей под руководством студентов. Работы школьников размещаются в онлайн-газете и демонстрируются по университетскому телевидению. Посредством интернет-ресурса www.Fitzcast.com из любой точки мира можно увидеть итоговые программы «Президентская власть и пресса: недельное обозрение» («The Presidency and The Press: The Week Review»).

Совместно с Вартбургским колледжем (г. Уайверлай, штат Айова) Центр массовой коммуникации реализует политический проект «Первые в стране», в рамках которого молодежи предлагаются различные варианты участия в предвыборной кампании. Программа включает новые образовательные курсы, обмен студентами между учебными заведениями, что позволяет глубже понять специфику политического процесса в различных штатах.

Общенациональную известность получил проект «Награда имени Фитцвотера» – ежегодная премия, которая присуждается за достижения в области общественной коммуникации. Среди лауреатов в разные годы были Виктория Кларк – помощник государственного секретаря США по связям с общественностью, сенатор Чак Хэгель, Кеннет Уолш – корреспондент издания «U.S. New & World Report» в Белом доме, Стив Калли – директор политических проектов медиацентра «C-SPAN» и президент Ассоциации журналистов Белого дома и др.

В рамках «Программы экспертных визитов» аккредитованные для работы в Белом доме корреспонденты на базе университетского городка в Риндже в течение двух дней проводят встречи со студентами, во время которых обсуждают актуальные политические вопросы и делятся профессиональным опытом.

Кроме того, университетские СМИ приобретают особое значение во время общенационального празднования в США Дня конституции (15 сентября). Ежегодно в этот день «Медиагруппа Пирс» готовит специальный выпуск газеты «Стрела Пирс», посвященный конституции США и содержащий ее полный текст. Также информационная поддержка оказывается Национальному дню студента (6 октября), который направлен на развитие социальной ответственности молодежи на всей территории Северной Америки. В связи с этой датой студенческие СМИ публикуют материалы, посвященные волонтерскому движению, работе в приютах для бездомных и другим способам общественного участия.

Таким образом, медиаобразование в Центре массовой коммуникации университета Франклин Пирс имеет очевидную политическую направленность, что, на наш взгляд, обусловлено тремя основными факторами.

Во-первых, с момента своего основания Центр титульно связан с именем Марлина Фитцвотера – одной из наиболее авторитетных фигур в американской политической журналистике, пресс-секрета-

ря президентов США Рональда Рейгана и Джорджа Буша-старшего. Естественно, что в университете не ограничились использованием только имени Фитцвотера: его активное участие и личная заинтересованность в развитии системы образования помогли привлечь к участию в академическом процессе авторитетных политиков, общественных деятелей, представителей национальных средств массовой информации США. В этом мы усматриваем пример реализации маркетинговой стратегии в образовании, успешный опыт брендирования, которое изначально предопределило положительный имидж учреждения.

Во-вторых, нельзя не учитывать географическое положение университета: Франклин Пирс расположен в штате Нью-Хэмпшир, регион Новая Англия. Эта территория, с которой началось формирование современного политического облика США, традиционно известна высоким уровнем развития политической культуры, гражданской активностью населения, востребованностью различных форм общественного диалога. Центр массовой коммуникации поддержал данную тенденцию: направленность его академических программ отвечает запросам общества, удовлетворяет его историческую потребность в гражданском образовании.

В-третьих, свяжем деятельность факультета массовой коммуникации с общими тенденциями развития медиа в США: политическая журналистика представляет собой одну из наиболее сложных и востребованных областей деятельности СМИ. Поэтому, реализуя политические проекты и фокусируя внимание на гражданском образовании студентов, университет гарантирует последним получение квалификации, актуальной на рынке труда.

Таким образом, политическая направленность образовательных программ, реализуемых университетскими СМИ Франклин Пирс, способствует формированию коммуникативной и личностной компетентности студентов, усвоению образцов поведения в развитом гражданском обществе США. Фактически, модель распространения массовой информации в американском социуме воплощается в рамках отдельного медиацентра. При этом функционирование студенческих СМИ университета Франклин Пирс характеризуется следующими особенностями: а) структурное и организационное соответствие принятой в США модели массовой информации; б) максимальная интеграция теоретической подготовки и практической деятельности сту-

дентов; в) следование основным тенденциям развития современных СМИ в техническом плане, что делает практический опыт выпускников актуальным и востребованным; г) предоставление студентам возможности определять в процессе обучения преимущества каждой из медиаспециализаций.

На наш взгляд, для системы высшего образования Республики Беларусь перспективным является возможное использование американского опыта в следующих направлениях: а) моделирование взаимодействия студенческих СМИ с региональными и национальными СМИ; б) участие университетских СМИ в жизни локального сообщества (интеграция в общественную жизнь региона); в) максимальная открытость и доступность деятельности медиаструктур; г) включение студентов в систему управления структурами медиацентров; д) широкая специализация при обучении; е) опыт использования «титульного партнера», что расширяет возможности сотрудничества со СМИ, представителями политической власти, гражданских объединений и создает положительный имидж учебного заведения. Как показывает опыт университета Франклин Пирс, политический потенциал образовательных средств массовой информации может быть реализован исключительно при непосредственном участии студенческих медиаструктур в политической жизни региона и государства.

Таццяна Выскварка
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка

ПРЫМЕТНІКІ-КАМПАЗІТЫ Ў ДРАМАТЫЧНЫХ, КРЫТЫЧНЫХ І ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫХ ТВОРАХ МІХАСЯ ЗАРЭЦКАГА

Міхась Зарэцкі, выдатны прадстаўнік беларускай літаратуры 20–30-х гг. XX ст., найперш выявіўся творамі-водгукамі на вострыя, супярэчлівыя падзеі тагачаснай рэчаіснасці. Аднак такая падпарадкаваная часу скіраванасць не паўплывала на самабытна-рамантычны стыль пісьменніка. Пранікнёны, заглыблены, удумлівы ўнутраны голас Міхася Зарэцкага знайшоў сваё адлюстраванне ў мастацкіх тэкстах праз шматлікія моўныя сродкі, сярод якіх вядучае месца займаюць прыметнікі-кампазіты.

Складаныя прыметнікі атрымалі асаблівае пашырэнне ў мастацкай прозе Міхася Зарэцкага (981 адзінка з 1066, або 92 %). З мэтай акцэнтавання ўвагі на складаных прыметніках як эмацыянальных стымулятарах у мастацкіх тэкстах мы разгледзелі кадыфікаваныя і некадыфікаваныя прыметнікі-кампазіты. Так, кадыфікаваныя складаныя прыметнікі складаюць 10,9 % ад агульнай колькасці ўжытых пісьменнікам складаных ад'ектыўных слоў і ў першую чаргу выконваюць намінатыўную функцыю. Абсалютная большасць (89,1 %) названых вытворных адзінак прадстаўлена некадыфікаванымі прыметнікамі-кампазітамі, прызначанымі надаць рэальным аб'ектам характарыстыку з адценнем ірэальнасці.

У драматычных творах пісьменніка зафіксаваны адзінкавыя выпадкі звароту аўтара да прыметнікаў-кампазітаў. Так, у драматычнай аповесці «Сымон Карызна» ўжыты толькі два кадыфікаваныя складаныя прыметнікі (*малапісьменны* [3, с. 327], *уласнаручны* [3, с. 333]), а ў п'есе «Віхор на балоце» – 7 кадыфікаваных складаных ад'ектыўных лексем (*даўганосы* [4, с. 169], *доўгавалосы* [4, с. 184], *дробнабуржуазны* [4, с. 186], *жыватворчы* [4, с. 206], *самаўпэўнены* [4, с. 199], *тупагаловы* [4, с. 184], *чарнасотніцкі* [4, с. 184]) і адна некадыфікаваная, што выяўлена ў маналогу, які прадстаўляе сабой повязь думак, разваг гераіні, народжаных нервовай узбуджанасцю, трывожнасцю, запалёнай свядомасцю: *Там, дзе праносіцца гэты віхор, там астаюцца ахвяры. Часам бязвінныя, **трагічна-выпадковыя**, але неабходныя… Гэта немінуча…* [4, с. 206]. У п'есе «Белыя ружы» сустракаецца толькі адзін складаны прыметнік (ён жа – індывідуальна-аўтарскі), але не ў «жывым» маўленні персанажаў, а ў аўтарскай рэмарцы: *Ён становіцца на калені перад кветкамі, гаворыць дрыжачым, **урачыста-напружаным** голасам* [4, с. 271]. Аналагічная сітуацыя назіраецца і ў п'есе «Ная»: *Туды ж з **урачыста-важным** выглядам ідуць некалькі калгаснікаў* [4, с. 277]. Такое «размеркаванне» складаных ад'ектыўных лексем можна растлумачыць як асаблівасцямі мовы драматычнага твора (дыялагічная насычанасць і напружнасць, гутарковы стыль, вуснае маўленне, для якіх, як правіла, не характэрны няўласна-простая мова, філасафічнасць думкі і г. д.), так і асаблівасцямі канфліктаў, накіраваных, перш за ўсё, на сацыяльна-палітычныя праблемы.

У крытычных і публіцыстычных творах Міхася Зарэцкага зафіксавана 85 складаных прыметнікаў (8 % ад агульнай колькасці),

38 (44,7 %) з якіх – індывідуальна-аўтарскія. Гэтыя творы характарызуюцца праніклівым, гарачым імпэтам, імгненным водгукам на зменлівую тагачасную рэчаіснасць, ілюструюць відавочнае размеркаванне кадыфікаваных і некадыфікаваных складаных прыметнікаў па функцыях. Так, пры звароце да актуальных на той час сацыяльна-культурных праблем і звязаных з імі рэалій Міхась Зарэцкі ўжывае кадыфікаваныя складаныя ад'ектыўныя лексемы, якія намінатыўна «самавыяўляюцца»: *...Мне зноў чуваць, выяўна чуваць магутны, цвёрда размераны рытм вялікага будаўніцтва, смелага поступу на вяршыну **агульналюдскога** шчасця* [4, с. 355]; *Побач з удалымі, патрэбнымі словамі ён часта запазычвае і словы рэдкія, **малавядомыя**...* [4, с. 372]; *Пяройдзем цяпер да другой часткі **сацыяльна-бытавых** тэм, што будуць будавацца на матэрыяле вёскі* [4, с. 339]. Калі ж актывізуецца аўтарская ўзрушанасць і неабыякавасць, а мастацкі стыль заяўляе пра сябе ў межах публіцыстычнага на ўсю моц, побач з кадыфікаванымі складанымі прыметнікамі сустракаюцца некадыфікаваныя: *Але ж якая гэта яскравая ілюстрацыя да таго **няўхільна-магутнага** культурнага поступу, які ахапіў усю Савецкую Украіну!* [4, с. 345]; *...Трэба прызнаць, што гэта – **нязмерна-грандыёзная**, шырокая кампанія* [4, с. 345].

У крытычнай і публіцыстычнай спадчыне Міхася Зарэцкага сустракаюцца прыметнікі-кампазіты, якія, на наш погляд, займаюць прамежкавае становішча паміж некадыфікаванымі і кадыфікаванымі адзінкамі з ухілам у бок апошніх: *Ад гэтага можа зменшыцца значэнне данага твора, як **гістарычна-ілюстрацыйнага** дакумента, але мастацка-выхаваўчай значнасці твора гэта не пашкодзіць* [4, с. 332]; *Гэта, як і сказана ў плане, – **навукова-палітычная** фантастыка* [4, с. 340]; *Мэта гэтых заставак – даць агульны, што праходзіць праз усю кніжку, тон альманаха, звязаць яго адным настроем і часам адным аспектам успрымання тых вобразаў, якія даюць у сваіх творах пісьменнікі і паэты «Інтэрмедыі», заключаюць у сабе або каментарыі, або зусім вольныя **філасофска-лірычныя** разважанні...* [4, с. 351]. Вышэйпрыведзеныя пакуль некадыфікаваныя словы абазначаюць рэаліі найперш сацыяльнага і культурнага планаў у адрозненне ад «чыстых» некадыфікаваных прыметнікаў-кампазітаў, якія ў большасці сваёй ствараюцца пісьменнікам з мэтай паказаць унутраны свет асобнага чалавека ці «ачалавечаны» стан прыроды.

Такім чынам, суадноснасць кадыфікаваных і некадыфікаваных прыметнікаў-кампазітаў у драматычных, крытычных і публіцыстычных творах Міхася Зарэцкага складае 55,3 / 44,7 (у %), што абумоўлена скіраванасцю гэтых твораў пераважна на вострыя сацыяльна-палітычныя праблемы, неабходнасцю ўздзеяння на чытача-грамадзяніна, абагульненасцю вобразаў і г. д. Менавіта шматаспектны, усебаковы падыход да даследавання творчасці Міхася Зарэцкага дае магчымасць не толькі выявіць і апісаць моўна-стылёвыя пошукі і знаходкі пісьменніка, але і вытлумачыць іх.

Літаратура

1. Зарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Зарэцкі. – Мінск : Маст. літ. – Т. 1. – 1989. – 526 с.

2. Зарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Зарэцкі. – Мінск : Маст. літ. – Т. 2. – 1990. – 414 с.

3. Зарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Зарэцкі. – Мінск : Маст. літ. – Т. 3. – 1991. – 375 с.

4. Зарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Зарэцкі. – Мінск : Маст. літ. – Т. 4. – 1992. – 414 с.

Вольга Галай, Валянціна Трайкоўская
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

СЭНСАВЫЯ АНАЛОГІІ Ў ФРАЗЕАЛОГІІ НЯМЕЦКАЙ І СЛАВЯНСКІХ МОЎ

Фразеалагічны склад мовы з’яўляецца непасрэдным кампанентам культуры, крытэрыем духоўнасці народа. Існаванне трапных выразаў сведчыць пра шматвяковую творчасць народа, яго культуру і светапогляд. У іх адлюстравана фізічная карціна свету, сацыяльнае і побытавае жыццё чалавека, сам чалавек з яго эмоцыямі, унутраным светам. Як вядома, у фразеалогіі рэалізуюцца катэгорыі вобразнасці, метафарычны код мовы.

Вялікую цікавасць для лінгвістычнага даследавання ўяўляюць малавывучаныя фразеалагізмы з метэакампанентам, г. зн. уваходжанне ў склад фразем пэўных метэаралагічных адзінак. Лексіка нямецкай, беларускай, польскай і рускай моў мае шмат слоў, якія абазначаюць надвор’е, прыродныя з’явы. У спалучэнні з указанымі лексемамі ўтвараюцца некаторыя ўстойлівыя вобразы або фразеала-

гізмы. Іх з'яўленне ў мове сведчыць пра шматвекавую творчасць народа. Такія фразеалагізмы адлюстроўваюць не толькі фізічную карціну свету, але і розныя характарыстыкі самога чалавека, яго адносіны да іншых людзей і да навакольнага жыцця. Адзначым пры гэтым, што ў адпаведных устойлівых спалучэннях разглядаемых моў усе падобныя найменні фактычна губляюць сваё прамое значэнне, але тым не менш ускосна ўздзейнічаюць на агульную семантыку фразеалагізмаў, матывуюць яе, спрыяюць выдзяленню акрэсленых тэм іх ужывання.

Каб больш выразна ахарактарызаваць сабраны беларускі фразеалагічны матэрыял, мэтазгодна параўнаць яго з адпаведным матэрыялам польскай, рускай і нямецкай моў. Для параўнальнага аналізу фразеалагізмаў мы абралі наступныя слоўнікі:

Лепешаў, І. Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. I–II. – Мінск : БелЭн, 1993; Санько, З. Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991; Гюлумянц, Кира. Польско-русский фразеологический словарь. Т. I–II. – Минск : Экономпресс, 2004; Немецко-русский фразеологический словарь. – М. : Изд-во «Русский язык», 1975; Фразеологический словарь русского языка. – М. : Русский язык, 1986.

Сярод адабраных намі шляхам суцэльнай выбаркі фразеалагізмаў з метэакампанентамі ў беларускай мове адзначана 140 адзінак, рускай – 100, польскай – 110, нямецкай мове – 80 адзінак. Перавага беларускага матэрыялу тлумачыцца большай ужывальнасцю ў складзе фразеалагізмаў такіх слоў, як *вада*, *вецер, дождж, зорка, мароз, лёд, паветра, сонца* і інш. (у нямецкай мове абмежавана колькасць фразеалагізмаў з такімі лексемамі, як *мароз, дождж*).

Па сваім кампанентным складзе фразеалагічныя адзінкі розныя. Большая іх частка складаецца з трох кампанентаў у беларускай, рускай і польскай мовах: *ісці з ветрам; ад ветру валіцца; висеть в воздухе; сжигать свои мосты; yak po lodzie; pod otwartym niebem*.

Крыху менш фразеалагізмаў маюць у сваім складзе два кампаненты: *зорная гадзіна; напускаць туману; цыганскае сонца; тучи сгущаются; лёд тронулся; yak lody; pogoda ducha*. Трэба адзначыць, што ў польскай мове значна больш, чым у беларускай, фразеалагізмаў з двума кампанентамі. Гэтыя колькасныя разыходжанні, з аднаго боку, тлумачацца тым, што ў складзе польскіх фразеалагізмаў аўтары перакладных слоўнікаў уключаюць даволі шмат тэрміналагічных

двухкампанентных словазлучэнняў (параўн. *biały mróz, cęzka woda, punkt rosy* і інш.). З другога боку, укладальнік фразеалагічнага слоўніка І. Я. Лепешаў далучае да фразеалагізмаў некаторыя парэміі, якія звычайна маюць шматкампанентны склад (параўн. *па гары хадзіць і сонца не бачыць*).

У беларускай мове часцей сустракаюцца шматкампанентныя фразеалагізмы: *біцца як рыба аб лёд; як гром сярод яснага неба; макавай расінкі ў роце не было; каля студні хадзіць і вады прасіць*. Што ж датычыцца нямецкай мовы, то тут таксама назіраюцца часцей за ўсё шматкампанентныя фразеалагізмы: *sich den Wind um die Nase wehen lassen* 'набірацца вопыту'; *das Wasser läuft (lief) jemandem im Mund zusammen* 'у кагосьці пабеглі слюнкі'.

Словы, якія ўваходзяць у склад фразеалагізма, называюць «будаўнічым матэрыялам», які можна размеркаваць па лексіка-граматычных разрадах – часцінах мовы. Сярод іх найбольш значную групу ўтвараюць назоўнікі. Гэта сведчыць пра тое, што пэўная частка фразеалагізмаў матывуецца найменнямі рэчаў, прадметаў, рэчываў, фактаў, падзей і з'яў.

У залежнасці ад функцыі, якую яны выконваюць у сказе, усе назоўнікі размяркоўваюцца па склонах. Найбольшая колькасць ужываецца ў назоўным і вінавальным склонах; прычым назоўны склон выражае суб'ектыўнае значэнне, а вінавальны – аб'ектыўнае і акалічнаснае. Напрыклад: *лёд крануўся; на вецер гаварыць; знать цену; золотая середина; co zeszloroczny snieg; to woda na jego mlyn; jemanden auf Eis führen (locken); ein stilles Wasser* і інш.

Па колькасці адзінак дзеясловы займаюць другое месца, што і зразумела, бо большасць з адзначаных вышэй назоўнікаў таксама звязаны з выражэннем дзеяння (параўн. *вецер, бура, дождж* і інш.).

У залежнасці ад адносін працэсу да суб'екта ці аб'екта адзначаныя дзеясловы можна падзяліць на наступныя групы: дзеясловы перамяшчэння *(вецер у галаве гуляе; der Wind hat sich gedreht 'становішча памянялася'; ветер свистит в карманах)*; дзеясловы ператвараючага дзеяння *(з ветру вяроўкі віць; строить воздушные замки; (auf) gut Wetter machen 'паляпшаць настрой')*; дзеясловы са значэннем руху і значэннем зменнага стану *(мароз па скуры прабягае; ехать с ветерком; gegen den Wind segeln (schiffen)* 'ісці супраць ветру*;* плыць супраць цячэння'); дзеясловы працяглага нязменнага стану *(цягнуць як цэмент ваду; висеть в воздухе; in der Luft (noch) schweben).*

У пераважнай большасці выпадкаў у разглядаемых фразеалагізмах дзеясловы ўжываюцца ў форме інфінітыва: *хапаць зоркі з неба; туманы пускаць; воду возить; auf Eis legen (stellen)* 'часова адкласці што-небудзь (замарозіць)'.

Адзначаем адносна невялікую долю кампанентаў-прымет у складзе сабраных фразеалагізмаў, якія самі па сабе змяшчаюць і характарыстыку адпаведнай з'явы: *цыганскае сонца; звёздный час; ein(mein) guter Stern; unter einem glücklichen Stern geboren sein; gegen Wind und Wetter).*

З улікам значэнняў, зафіксаваных для адабраных фразеалагізмаў у слоўніках, усе ўстойлівыя словазлучэнні з метэакампанентамі нямецкай і славянскай моў дапускаюць сваё размеркаванне па аднолькавых семантычных сферах, або тэматычных групах, межы якіх, аднак, не заўсёды з'яўляюцца выразнымі і акрэсленымі. Тым не менш выдзеленыя тэматычныя групы даюць пэўнае ўяўленне пра найбольш абагульненыя семантычныя характарыстыкі фразеалагізмаў, матываваныя метэакампанентамі ў разглядаемых мовах.

Найбольшую семантычную разнастайнасць маюць фраземы з кампанентамі *вецер, вада, сонца, паветра, лёд, дождж,* напрыклад: *пляваць супраць ветру* 'рабіць што-небудзь сабе на шкоду'; *на сямі вятрах* 'самотна і на водшыбе'; *падбіты ветрам* 'несур'ёзны, легкадумны, пусты'; *куды вецер дзьме* 'без цвёрдых перакананняў і прынцыпаў', *ісці/пайсці/з ветрам* 'цярпець няўдачу; канчаткова разбурацца', *вецер у свірне гуляе* 'пустыя засекі, бедны хто-небудзь'.

У польскай і нямецкай мовах са словам *вецер* на нашым матэрыяле адзначана амаль у два разы менш фразеалагізмаў, аднак істотных рангавых адрозненняў пры іх размеркаванні па тэматычных групах не назіраецца: *вецер у галаве (сінонім: як у полі вецер) – ветер в голове – ma wiatr w głowie – jemand hat Flasen im Kopf* 'дурь в голове'; *трымае нос па ветры* 'беспрынцыпова мяняючы свае паводзіны, прыстасоўвацца да абставін, падладжвацца да каго-небудзь, чаго-небудзь' – *держать нос по ветру – den Mantel (die Fahne) nach dem Wind drehen (hängen)* даслоўна: 'паліто (сцяг) варочаць (вывешваць) па ветры'.

Самая вялікая група разгледжаных фразеалагічных адзінак (каля 30 % ад агульнай колькасці) выкарыстоўваецца ў нямецкай, беларускай, рускай і польскай мовах для адмоўнай, негатыўнай ацэнкі чалавека, яго паводзін, рыс характару, разумовых здольнас-

цей і да т. п. (параўн. *Stille Wasser sind tief* даслоўна: 'ціхая вада глыбокая' – *в тихом омуте черти водятся – у ціхім балоце чэрці растуць (яшчэ: хто ціха ходзіць, той густа месіць, ціхая свіння глыбока рые, ціхая вада грэблю рве) – cicha woda brzegi rwie; sieht aus wie 3 (7, 14) Tage Regenwetter – чернее тучи – хмара хмарай – jak chmura gradowa; ein Herz aus Eis – каменнае сэрца – каменное сердце – kamienne serce* і інш.).

У супрацьлегласць прыведзенай групе фразеалагізмаў значная частка ўстойлівых словазлучэнняў (прыблізна 11 %), хаця і меншая за папярэднюю колькасць, ужываецца ў даследуемых мовах для характарыстыкі дадатных, станоўчых уласцівасцей чалавека (параўн.: у беларускай мове *ў агні не гарыць і ў вадзе не тоне* 'нідзе не прападзе, выбіраецца з любых абставін'; у рускай – *в огне не горит и в воде не тонет*; у польскай – *czystej wody* 'сапраўдны, высокай якасці'; *зорка першай велічыні – звезда первой величины – gwiazda pierwszej wielkości – ein Stern erster Größe* і інш.).

Каля 15 % засведчаных фразеалагізмаў з метэакампанентамі нямецкай і славянскіх моў выкарыстоўваюцца для выражэння непасрэдных пачуццяў чалавека, яго фізіялагічных патрэб і да т. п. (параўн.: у беларускай мове *мароз па скуры прабягае* 'у каго-небудзь узнікае непрыемнае адчуванне ад раптоўнага страху, хвалявання'; у польскай – *mróz przechodzi po kościach*; у рускай – *мороз по коже (спине) дерет (идет)*; у нямецкай мове *esmit der Angst (zu tun) bekommen).*

На прыведзеныя фразеалагізмы трох разгледжаных тэматычных груп прыпадае ў мовах звыш палавіны ўсіх устойлівых словазлучэнняў з метэакампанентамі. Гэта значыць, што як мінімум кожны другі падобны фразеалагізм мае антрапацэнтрычнае значэнне, ужываецца для характарыстыкі чалавека, яго ўнутраных якасцей.

Самі прыродныя з'явы маюць такую прыдатную ім уласцівасць, як зменлівасць, рухомасць, непастаянства. Падобная ўласцівасць не можа не матываваць і агульнае значэнне адпаведных фразеалагізмаў з метэакампанентамі. Прыблізна шостая частка зазначаных намі ўстойлівых словазлучэнняў непасрэдна выражае менавіта рух або разнастайныя змены той ці іншай сітуацыі (параўн.: у беларускай мове *якая бура нясе* 'чаму, з якой мэтай ідзе, едзе хто-небудзь, куды-небудзь', 'хто-небудзь бясследна, імгненна знік, схаваўся' і інш.; у польскай – *przepędzić na cztery wiatry* 'ісці абы-куды, куды захо-

чацца’; у нямецкай – *Wo hat dich der Wind hergedreht? Aus welchem Loch pfeift der Wind* даслоўна: *‘з якой дзіркі вецер свішча’*; у рускай мове *каким ветром тебя сюда занесло?* і інш.).

Найменнямі прыродных з’яў, што здольныя праяўляцца з вялікай інтэнсіўнасцю, можа характарызавацца і суадноснае з такой інтэнсіўнасцю фразеалагічнае значэнне пэўных устойлівых выразаў. Максімальнае выражэнне той або іншай якасці, прыметы тэрміналагізавана ў сучасных даследаваннях па семантыцы лацінскім словам Magn і фіксуецца ў значнай частцы занатаваных фразеалагізмаў з метэакампанентамі (параўн.: *небу горача было* ‘пра самую высокую ступень інтэнсіўнасці якога-небудзь дзеяння або дзейнасці’ – *jak lodu* ‘вельмі шмат’ – wie Sand im Meer ‘як пяску марскога’).

Яшчэ адно тыповае значэнне вылучаецца ў разгледжаных устойлівых выразах і звязана з выражэннем нечага няпэўнага, ірацыянальнага, малавядомага (параўн.: *чакаць з мора пагоды* ‘заставацца ў пасіўным, вымушаным, няпэўна-доўгім чаканні каго-небудзь, чагонебудзь’ – *chodzic po chmurach* ‘марыць пра нерэальнае’ – *ждать у моря погоды* і інш.).

Вылучаныя семантычныя сферы, па якіх размяркоўваюцца фразеалагічныя значэнні ўстойлівых выразаў нямецкай і славянскіх моў, з’яўляюцца аднолькавымі, але запаўняюцца рознай колькасцю зарэгістраваных фразеалагізмаў з метэакампанентамі. Так, у беларускай мове значна часцей, чым у польскай, гэтыя фразеалагізмы ўжываюцца для адмоўнай і дадатнай характарыстыкі людзей (адпаведна 34 і 12 % ад агульнай колькасці фразеалагізмаў у беларускай мове супраць 24 і 8 % у польскай).

Такім чынам, агульнае ў семантыцы разгледжаных фразеалагізмаў палягае ў іх размеркаванні па аднолькавых тэматычных групах, у выражэнні адных і тых жа абагульненых значэнняў. Спецыфіка плана зместу фразеалагізмаў з метэакампанентамі ў нямецкай і славянскіх мовах заключаецца ў тым, што выдзеленыя тэматычныя групы запаўняюцца ўстойлівымі выразамі моў па-рознаму, як правіла, неаднолькавай колькасцю занатаваных фразеалагічных адзінак.

Галіна Гваздовіч
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ТЭРМІН ЯК НЕАД’ЕМНАЯ АДЗІНКА ТЭКСТАЎ НАВУКОВАГА СТЫЛЮ (на матэрыяле металінгвістыкі)

Мова як знакавая сістэма складвалася на працягу многіх стагоддзяў, яе развіццё і ўдасканальванне працягваецца і сёння. Э. Бенвеніст, вядомы французскі даследчык, трапна заўважае: «Мова – гэта тое, што аб’ядноўвае людзей у адзінае цэлае, гэта аснова ўсіх тых зносін, якія, у сваю чаргу, ляжаць у аснове грамадства» [1, с. 86]. Паколькі мова – з’ява сацыяльная, нельга не звярнуць увагу на логіка-філасофскую аснову мовы, непасрэдна звязаную з мысленнем у тым сэнсе, па словах Л. Вітгенштэйна, што «мова пераапранае думкі» [3, с. 18]. І адбываецца гэта «пераапрананне» ў адпаведнасці з тым, у якіх умовах адбываюцца зносіны, з якой мэтай, кім (якім аўтарам) і да якой слухацкай (чытацкай) аўдыторыі накіраваны тыя ці іншыя выказванні ў шырокім сэнсе гэтага тэрміна. Экстра- і інтралінгвістычныя фактары з часам садзейнічалі выпрацоўцы пэўных стыляў мовы і маўлення.

На сёння ў навуковай літаратуры няма агульнапрынятага разумення тэрміна *стыль*, адсутнічаюць і адзіныя крытэрыі выдзялення функцыянальных стыляў. Стыль (лац. stylus – стрыжань для пісьма) – слова мнагазначнае і нават аманімічнае: «1. Сукупнасць характэрных рыс, блізкасць выразных мастацкіх прыёмаў і сродкаў, што абумоўліваюць сабой адзінства якога-н. напрамку ў творчасці… 2. Метад, сукупнасць прыёмаў якой-н. работы, дзейнасці, паводзін… 3. Сукупнасць прыёмаў выкарыстання моўных сродкаў для выказвання тых ці іншых ідэй, думак у розных умовах маўленчай практыкі… Стыль... Спосаб летазлічэння... *Стары* с.» [12, с. 633]. Акадэмік В. У. Вінаградаў называе стылем «сукупнасць прыёмаў ужывання, адбору і спалучэння моўных сродкаў, якія залежаць ад сферы дзейнасці – экстралінгвістычнай утваральнай базы стылю» [2, с. 129].

Моўны стыль рэалізуецца ў маўленні ў пэўных формах тэксту. Тэрмін *тэкст* (лац. textus – тканіна, сувязь, спляценне) шырока выкарыстоўваецца ў многіх гуманітарных навуках: лінгвістыцы, літаратуразнаўстве, культуралогіі, семіётыцы, эстэтыцы і інш. І гэта не выпадкова. Як заўважае Ю. М. Лотман, *тэкст* – гэта, «бясспрэчна,

адзін з самых ужывальных тэрмінаў у навуках гуманітарнага цыкла. Развіццё навукі ў розныя моманты выкідвае на паверхню такія словы; лавінападобны рост іх частотнасці ў навуковых тэкстах суправаджаецца стратай неабходнай адназначнасці. Яны не столькі тэрміналагічна дакладна абазначаюць навуковае паняцце, колькі сігналізуюць аб актуальнасці праблемы, указваюць на галіну, у якой нараджаюцца новыя навуковыя ідэі» [7, с. 148]. У лінгвістыцы *тэкст* – «напісанае, надрукаванае (выказванне, абзац, раздзел твора і г. д.) або выказанае вусна паведамленне, якое характарызуецца сэнсавай і структурнай завершанасцю, яго можна ўзнавіць, паўтарыць у тым самым выглядзе. Т. з'яўляецца аб'ектам спецыяльнага вывучэння ў лінгвістыцы тэксту» [10, с. 152]. Такім чынам, тэкст уяўляе сабой фіксацыю маўленчага выказвання пры дапамозе моўных знакаў, ён з'яўляецца асноўным аб'ектам усіх відаў філалагічнага аналізу. Ужо сталі аксіяматычнымі сцвярджэнні, што тэксту ўласціва цэласнасць, што яго ўнутраная структура характарызуецца пэўнай сістэмай сувязей і адносін не толькі паміж словамі, але і на ўзроўні словазлучэнняў, сказаў, абзацаў і г. д. Вылучаюць тэксты розных стыляў: кніжныя і гутарковыя. Першыя, у сваю чаргу, падзяляюцца (з некаторай варыянтнасцю тэрміналагічных абазначэнняў) на афіцыйны, публіцыстычны, навуковы, мастацкі, якія рэпрэзентуюцца ў пэўных жанравых тыпах і г. д. Апісанне асаблівасцей усіх стылявых формаў і жанраў можна знайсці ў шматлікіх публікацыях. У сувязі з гэтым слушным падаецца выказванне ван Дэйка, падтрыманае І. Р. Гальперыным, аб тым, што «навука выйграла б, каб, замест вывучэння асаблівасцей усіх магчымых літаратурных тэкстаў, абмежавалася б даследаваннем якога-небудзь пэўнага тыпу тэксту, з тым каб надалей інтэграваць атрыманыя даныя ў "ідэальнай" універсальнай тэорыі (літаратурнага) тэксту» [4, с. 18].

Звернемся да навуковага стылю, адной з важнейшых крыніц і своеасаблівага рэтранслятара спецыяльных ведаў. Прынята лічыць, што «асноўная форма яго рэалізацыі – пісьмовая. Нават у выпадку, калі навуковы стыль рэалізуецца вусна (лекцыя, даклад, паведамленне на канферэнцыі), то ў аснове такога выступлення, як правіла, ляжаць тыя ці іншыя папярэднія запісы» [8, с. 130–131]. Тэксты навуковага стылю не з'яўляюцца аднатыпнымі, даследчыкамі яны падзяляюцца на ўласна навуковыя, навукова-папулярныя, навукова-

гуманітарныя, тэксты дакладных навук, прыродазнаўча-навуковыя. Да таго ж, вызначаецца і пэўная колькасць жанраў: дысертацыя, артыкул, манаграфія, нарыс, рэцэнзія, падручнік, дапаможнік, курс лекцый, даклад, рэферат, тэзісы. Патрэбна адзначыць, што пералічанымі падстылямі і жанрамі рэалізацыя тэкстаў навуковага стылю не абмяжоўваецца, у іх структуры можна вылучыць пэўныя падвіды. Усе яны характарызуюцца адметнасцю канструктыўных прынцыпаў і лінгвістычнымі асаблівасцямі. Аб'яднальнымі рысамі для ўсіх навуковых падстыляў і жанраў з'яўляецца дакладнасць, аб'ектыўнасць, доказнасць, лагічнасць, абстрактнасць, амаль поўная адсутнасць эмацыянальнасці, апісальны характар падачы інфармацыі, прысутнасць аўтарскага «я» пры аналізе канкрэтнага матэрыялу і інш.

Асноўная лінгвістычная сутнасць навуковага стылю ў розных яго праявах – насычанасць тэрміналагічнымі адзінкамі. Што да нашай тэмы, то вядома: метамова лінгвістыкі складвалася на працягу многіх стагоддзяў, таму нельга пераацаніць ролю тэрмінаў у структуры навуковых зносін у розныя перыяды жыцця народа. Да таго ж, лінгвістычныя тэрміны ўтвараюць ядро металінгвістыкі, у іх унутраным змесце знаходзіцца код інфармацыйнага характару. Развіццё мовазнаўчых метатэкстаў і ўласна тэрміналогіі цесна звязана з равіццём навукі аб мове. У лінгвістычных тэрмінах адлюстраваны не толькі тэарэтычная і канцэптуальная базы ведаў па лінгвістыцы, гістарычныя этапы яе станаўлення, шляхі і напрамкі развіцця навуковай думкі, але і ўвогуле ўзровень культуры і цывілізацыі. Таму і ў гісторыі мовазнаўства, і на сучасным этапе даследчыкамі асаблівая ўвага надаецца вывучэнню спосабаў перадачы навуковых ведаў, функцыянавання тэрмінаў у метатэкстах як асноўнага сродку навуковай камунікацыі.

У сувязі з тым, што тэрмін – адзінка неардынарная, многія вучоныя робяць спробы даць яму азначэнне, аднак, як мяркуе В. М. Лейчык [6, с. 135], агульнапрынятага азначэння паняццю *тэрмін* па сёння няма, і прычын гэтаму мноства: навуковая дысцыпліна можа быць у аснове сваёй не складзенай; тэрмін – гэта і прыналежнасць, і аб'ект шэрагу навук, а кожная з іх імкнецца вылучыць у тэрміне асаблівыя рысы, істотныя менавіта для гэтай навукі; спроба аб'яднаць рознахарактарныя прыметы тэрміна і інш. Таму, напрыклад, лінгвістычнае азначэнне паняцця *тэрмін* павінна адрозніваецца ад філасофскага ці лагічнага. «Агульным ва ўсіх азначэннях павінна быць

указанне на радавое паняцце. У дадзеным выпадку – гэта ўказанне на тое, што тэрмін уяўляе сабою слова ці словазлучэнне» [6, с. 135]. І з гэтым нельга не пагадзіцца. У той жа час выклікае пэўныя сумненні сцвярджэнне, што тэрмін – гэта «ўмярцвёнае слова, пазбаўленае адценняў, паху, смаку, пазбаўленае выразнасці і моцы, прыдатнае толькі для эсперанта» [11, с. 17]. Канешне, у некаторай ступені гэта так, калі параўноўваць навуковы стыль з мастацкім. Як падаецца, у тэрміна маюцца пералічаныя вышэй якасці, у якіх яму адмаўляецца, аднак праяўляюцца яны па-іншаму і ў значна меншай ступені. На тое ён і тэрмін.

Тэрмін – гэта матэрыяльнае выражэнне згустку думкі, ён акумулюе ў сабе цэлыя выказванні аб выніках навуковага пазнання рэчаіснасці. І ў той жа час фармальна – гэта лексема (ці спалучэнне лексем) з усімі граматычнымі асаблівасцямі, уласцівымі таму парадыгматычнаму класу слоў, да якога ён адносіцца. Такім чынам, пад тэрмінам разумеецца графічна (фанетычна) і арфаграфічна аформлены комплекс, за якім замацаваны канцэптуальны змест мысліцельнай дзейнасці ў залежнасці ад характару ўнутранай будовы і магчымасцей канкрэтнай мовы. Для высвятлення граматычнай спецыфікі той ці іншай мовы неабходна ведаць, якімі парадыгматычнымі класамі слоў прадстаўлены тэрміналагічны корпус. В. П. Даніленка ў гэтай сувязі заўважае, што такія веды неабходны пры ўкладанні тэрміналагічных слоўнікаў, у практычнай рабоце над шматлікімі стандартамі, а таксама «ў асобных даследаваннях і дысертацыях, прысвечаных тэрміналагічнай праблематыцы» [5, с. 321].

Сярод тэрмінолагаў распаўсюджанай з'яўляецца думка, што ў якасці самастойных адзінак у навуковую тэрміналогію патрэбна ўключаць усе знамянальныя часціны мовы, аднак перавага аддаецца назоўніку. Асабліва выразна гэта тэндэнцыя праяўляецца ў спецыяльных лінгвістычных слоўніках. Так, «Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў» П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкага, Л. А. Антанюк уключае звыш 2000 тэрмінаў, з іх назоўнікаў – больш за 600, прыметнікаў і дзеепрыметнікавых формаў – каля 50 і амаль 1500 словазлучэнняў, у якасці галоўнага кампанента ў якіх, як правіла, выступаюць назоўнікі. У кадыфікаванай мове не прадстаўлены дзеясловы, прыслоўі, лічэбнікі і займеннікі. На ўзроўні лінгвістычнага тэксту мы можам назіраць практычна поўны спектр парадыгматычных класаў слоў, аднак колькасны паказчык усё роўна будзе на карысць назоўнікаў і прыметнікаў.

У метамове лінгвістыкі, асобнай форме мовы, якую мы выкарыстоўваем, калі гаворым пра мову ў якасці аб'екта, часцей за ўсё ўзнікае неабходнасць у называнні выяўленых у мове аб'ектаў, вынікаў даследавання і адметных якасных характарыстык, якія знаходзяць выражэнне ў анталагічнай катэгорыі «прадметнасці» і «прадмета», што ў некаторай ступені паказвае на граматычнае разуменне «назоўнікавасці». «У якасці слоў, якія выражаюць значэнне прадметнасці, разглядаюцца не толькі назоўнікі, што абазначаюць цэласныя матэрыяльныя аб'екты (да якіх у паўсядзённым ужыванні звычайна і дадаецца слова “прадмет”), але і абстрактныя назоўнікі, гэта значыць абазначэнне ўласцівасцей, дзеянняў, адносін» [9, с. 29–30]. Такім чынам, у беларускай мове катэгорыя назоўніка дазваляе чалавеку мысліць прадметна, дае назву не толькі матэрыяльна існуючым прадметам і з'явам, але і абстрактным паняццям якасці і дзеяння, што вельмі актуальна для разглядаемай тэрміналагічнай сістэмы. Таксама важным з'яўляецца тое, што ў беларускай мове маюцца шырокія магчымасці для ўтварэння ад дзеяслоўных асноў і асноў прыметнікаў назоўнікаў-тэрмінаў: *скланенне*, *спражэнне*, *утварэнне*; *бессуб'ектнасць*, *бінарнасць*, *адушаўлёнасць* і г. д. Такім чынам, у лінгвістычнай сістэме беларускай мовы часцей за ўсё тэрмініруюцца назоўнікі на падставе таго, што для вывучэння мовы патрабуюцца ў асноўным спецыяльныя граматычныя катэгорыі, здольныя называць «прадметы» і «апрадмечваць» розныя абстрактныя паняцці і з'явы, характэрныя для мовы. Гэтымі якасцямі ў большай ступені валодаюць менавіта назоўнікі.

У працэсе вывучэння мовы ўзнікае неабходнасць у вызначэнні якасных характарыстык «прадметаў», якія граматычна часцей за ўсё знаходзяць выражэнне ў прыметніках. Назоўнік па сваёй прыродзе імкнецца да прыметніка як да катэгорыі, здольнай, не выціскаючы за межы падсістэмы, дыферэнцаваць «прадмет» паводле якаснага паказчыка. Напрыклад, лінгвістычнае паняцце *склон* прадугледжвае наяўнасць шасці катэгорый, якія размяжоўваюцца дзякуючы прыметнікам: *назоўны*, *родны*, *давальны*, *вінавальны*, *творны*, *месны*. У падобных выпадках для тэрмініравання лінгвістычнага паняцця выкарыстоўваецца словазлучэнне, у якім граматычным апорным кампанентам з'яўляецца слова з разраду назоўнікаў.

Як правіла, лексічныя адзінкі, якія граматычна належаць да класа прыметнікаў, у ролі самастойнай тэрміналагічнай адзінкі не ўжы-

ваюцца: па сутнасці, з'яўляючыся тэрмінам і знаходзячы адлюстраванне ў кадыфікаванай метамове ў якасці самастойнай адзінкі, у навуковых тэкстах такія тэрміны рэалізуюцца ў складзе свабодных тэрміназлучэнняў: *дадзены сказ*, *семантычны крытэрый*, *эксперыментальная фанетыка* і інш. Самастойнае ўжыванне ў лінгвістычных тэкстах тэрмінаў-прыметнікаў суправаджаецца іх пераходам у разрад назоўнікаў: *галосны*, *зычны*, *губны* і інш.

Нярэдка ў тэрміналагічнай сістэме ў ролі азначэння галоўнага кампанента-назоўніка выступае форма назоўніка: *катэгорыя асобы*, *дзеясловы руху*, *сістэма спражэння* і г. д., на падставе чаго яшчэ шырэй распаўсюджваецца функцыянаванне назоўнікаў у сістэме лінгвістычных тэрмінаў.

Вышэй мы адзначалі, што ў лінгвістычных слоўніках не зафіксавана ніводнага дзеяслова як самастойнага тэрміна, не назіраюцца яны і ў структуры тэрміназлучэнняў. Што да тэкстаў – сферы функцыянавання, то тут іх нямала: без дзеяслоўных тэрміналагічных прэдыкатаў цяжка пабудаваць выказванне. Праўда, выкарыстоўваюцца ў лінгвістычных тэкстах, як правіла, дзеясловы з агульнанавуковым тэрміналагічным значэннем: *разгледзець, уяўляць, быць, з'яўляцца, выступаць, узаемадзейнічаць, абумоўліваць, утвараць, фарміраваць, адлюстроўваць* і г. д., аднак сустракаюцца і непасрэдна лінгвістычныя: *скланяць, спрагаць, адасабляць* і некаторыя іншыя. Як уяўляецца, малаўжывальнасць тэрмінаў-дзеясловаў у лінгвістычнай метамове абумоўлена спецыфікай самой навукі аб мове, якая апелюе ў сваёй сутнасці да паняццяў і працэсаў, дзеля абазначэння якіх найлепей падыходзіць клас назоўнікаў. Да таго ж, ад асноў дзеясловаў, як ужо гаварылі вышэй, утвараюцца назоўнікі, якія выражаюць не проста назву дзеяння, а працэсуальную прымету.

Лексемы, якія належаць да такіх часцін мовы, як прыслоўе, займеннік, лічэбнік, у сілу сваёй катэгарыяльнай спецыфікі ў якасці лінгвістычнага тэрміна слоўнікамі не адлюстроўваюцца, у тэкстах яны прысутнічаюць, але, як правіла, вялікай спецыяльнай сэнсавай нагрузкі не нясуць.

Спецыфіка метамовы лінгвістыкі, высокая абстрактнасць тэрмінаў, неабходнасць адлюстравання імі важнейшых паняццяў як анталагічнага і граматычнага «прадмета», шырокія магчымасці назоўнікаў утварацца ад асноў дзеясловаў і прыметнікаў, здольнасць

лексем субстантываваецца даюць падставы на пераважнае выкарыстанне назоўнікаў у якасці тэрміналагічных адзінак – асноўнага складніка навуковых тэкстаў розных падстыляў і жанраў.

Літаратура

1. Бенвенист, Э. Общая лингвистика / Э. Бенвенист. – М. : Прогресс, 1974. – 248 с.

2. Виноградов, В. В. Стилистика. Теория поэтической речи. Поэтика / В. В. Виноградов. – М. : Наука, 1963. – 328 с.

3. Витгенштейн, Л. Философские работы : в 2 ч. / Л. Витгенштейн. – М. : Гнозис, 1994. – Ч. 1. – 402 с.

4. Гальперин, И. Р. Сменность контекстно-вариативных форм членения текста / И. Р. Гальперин // Текст как целое и компоненты текста. – М. : Наука, 1982. – С. 18–29.

5. Даниленко, В. П. Лексико-семантические и грамматические особенности слов-терминов / В. П. Даниленко // Татаринов В. А. История отечественного терминоведения : в 3 т. Т. 2. Направления и методы терминологических исследований : Очерк и хрестоматия. – М. : Моск. лицей, 1995. – 334 с.

6. Лейчик, В. М. Термин и его определение / В. М. Лейчик // Терминоведение и терминография в индоевропейских языках. – Владивосток : ДВО АН СССР, 1987. – С. 135–145.

7. Лотман, Ю. М. Избранные статьи в 3 т. / Ю. М. Лотман. – Т. 1. – Таллин : Александра, 1993. – 208 с.

8. Мурашов, А. А. Культура речи : Практикум / А. А. Мурашов, В. Ф. Русецкий. – Москва – Воронеж, 2004. – 272 с.

9. Руденко, Д. И. Имя в парадигме «философии языка» / Д. И. Руденко. – Харьков : Основа, 1990. – 299 с.

10. Сцяцко, П. У. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. – Мінск : Вышэйш. шк., 1990. – 222 с.

11. Русский язык и культура речи / под ред. В. И. Максимова. – М. : Наука, 2001. – 177 с.

12. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – Мінск : БелЭн, 1996. – 784 с.

Вольга Горбач
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

РЭКЛАМНЫЯ ТЭКСТЫ Ў СІСТЭМЕ ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫХ СТЫЛЯЎ (да пастаноўкі праблемы)

Сёння рэкламная інфармацыя заняла сваё трывалае месца ў масавай камунікацыі. Цяжка ўявіць сучасныя СМІ без рэкламы. У рэкламе закладзена шмат маніпулюючых тактаў: у інтэрнэце, на вуліцы, у транспарце, у пад'ездзе размешчана інфармацыя, якая разлічана на пэўнага спажыўца. Дзейнасць рэкламы ўплывае на розум, свядомае і падсвядомае кожнага індывідуума, «псіхалагічнае ўздзеянне рэкламнай інфармацыі праяўляецца ў працэсах перапрацоўкі рэкламных паведамленняў – эмоцыях, думках, магчымых рашэннях, што абумоўлівае канкрэтныя акты паводзін пакупніка. Так ці інакш у рэкламны працэс уцягнуты феномены перапрацоўкі інфармацыі – пачуцці, успрыманні, увага, памяць і г. д.» [2, с. 25].

Масавая ўключанасць рэкламы ў працэс камунікатыўных зносін розных сфер грамадства наводзіць на развагі пра тое, што рэклама ўсё больш набывае спецыфічныя стылістычныя рысы, якія абумоўлены суіснаваннем вядомых функцыянальных стыляў, пераплеценых на розных маўленчых узроўнях або ў жанравай палітры рэкламных тэкстаў. Паўстае пытанне: да якога функцыянальнага стылю належаць рэкламныя тэксты?

Сучасныя даследчыкі ставяцца да выбару стылю рэкламы неаднозначна. У прыватнасці, Л. У. Лебедзева не суадносіць мову рэкламы з адным функцыянальным стылем, паколькі ў рэкламе назіраецца функцыянальна-стылёвае адзінства з мэтай ўздзеяння на чытачоў аб'ектам інфармацыі. У межах асобнай падсістэмы публіцыстычнага стылю разглядае мову рэкламы Т. М. Ліўшыц, абапіраючыся на адзінства функцый інфармавання і ўздзеяння, сістэмнасць апісання рэкламнага падстылю. Як гібрыдны від мовы сучаснай масавай камунікацыі тлумачыць рэкламу А. С. Кара-Мурза. Сярод жанраў навуковага стылю асобна вылучае прамысловую рэкламу Н. Г. Валеява, якая ўключае ў навуковую рэкламу «тэксты рэкламных праспектаў, рэкламных лісткоў ці брашур з апісаннем і выявай вырабу, з называннем месца і ўмовы яго набыцця, рэкламныя каталогі на прамысловае абсталяванне, стэндавыя лісткі» [1, с. 36].

Сярод беларускіх даследчыкаў Н. Г. Швец пры разглядзе паняцця рэкламная аб’ява вылучае характарыстыкі аб’явы ў межах «рэкламнага стылю» [4, с. 3].

Паспрабуем вызначыць стылістычную прыналежнасць рэкламных тэкстаў на падставе азначэння лінгвістычнага паняцця «функцыянальны стыль мовы», прапанаванага вядомым стылістам М. Я. Цікоцкім: «Функцыянальны стыль мовы – гэта грамадска ўсвядомленая, унутрана аб’яднаная спецыфічная сістэма моўных сродкаў, якая абумоўлена мэтамі і прынцыпамі адбору гэтых сродкаў у той ці іншай сферы грамадскай дзейнасці (навуковай, справавой, публіцыстычнай, эстэтычнай і г. д.) і найлепшым чынам абслугоўвае зносіны ў гэтай сферы» [3, с. 159]. Немагчыма не пагадзіцца з тым, што «функцыянальныя стылі знаходзяцца ў жывых узаемаадносінах, яны ўзаемадзейнічаюць і ўзаемапранікаюць. Нельга ўявіць, напрыклад, што пэўныя лексічныя, граматычныя і фанетычныя сродкі належаць толькі да аднаго стылю. Нават самыя спецыфічныя для якога-небудзь стылю моўныя сродкі могуць ужывацца ў іншых стылях, праўда, пры гэтым, як правіла, змяняецца іх функцыянальная роля» [тамсама, с. 160]. Гэтае меркаванне цалкам адпавядае аналізу рэкламных тэкстаў, дзе спалучаюцца элементы навуковага, афіцыйнага, публіцыстычнага, размоўнага, мастацкага стыляў у розных жанрах.

На нашу думку, рэкламныя тэксты паводле мэтавых і дэйксічных установак падзяляюцца на групы: 1) уласна рэкламныя тэксты (напрыклад, кансультацыі, аб’явы, афішы, рэцэпты) і 2) тэксты кантамінавання сродкамі іншых функцыянальных стыляў (напрыклад, рэцэнзіі, артыкулы, інтэрв’ю, апавяданні, анекдоты, казкі). Гэтыя дзве групы інтэгруюць агульныя, адкрытыя для папаўнення моўна-стылёвыя рысы, якія характарызуюцца паводле наступных складнікаў: функцый, мэт і задач рэкламадаўцаў, адраснасці аўдыторыі, структурнай арганізацыі тэкстаў. Галоўная задача любога рэкламнага тэксту – прыцягнуць увагу мэтавай аўдыторыі (напрыклад, прамыслоўцаў, моладзі, хатніх гаспадынь) праз выбар вербальных і невербальных адзінак. Структурная арганізацыя большасці рэкламных (друкаваных, аўдыявізуальных і інш.) тэкстаў вызначаецца ўключэннем у іх: загалоўка, слогана, асноўнай і даведачнай інфармацыі, фотаздымкаў, малюнкаў, адпаведнага колеру, шрыфту. Да моўна-стылёвых сродкаў рэкламных тэкстаў належаць: тэрміны,

словы з абстрактным ці канкрэтным значэннем, запазычаныя словы, прастамоўі, жарганізмы; аддзеяслоўныя назоўнікі, займеннікі і дзеясловы ў 1-й і 2-й асобах; мадальныя, клічныя і пытальныя сказы, апісальныя і апавядальныя канструкцыі. Тэксты павінны быць лагічна пабудаваныя, мець пэўную ацэначнасць, вобразнасць, эмацыянальнасць і экспрэсіўнасць.

Названыя характарыстыкі рэкламных тэкстаў даюць падставы меркаваць, што ў наш час фарміруецца новы функцыянальны стыль – рэкламны, які з'яўляецца ў выніку частотных узаемапранікненняў ужо вядомых стыляў. Новы рэкламны стыль знаходзіцца яшчэ на стадыі станаўлення, з выпрацоўкай своеасаблівага стылістычнага рэгістра.

Літаратура

1. Валеева, Н. Г. Жанрово-стилистическая характеристика научных текстов / Н. Г. Валеева // Введение в переводоведение. – М. : Изд-во РУДН, 2006. – 251 с.

2. Мокшанцев, Р. И. Психология рекламы : учеб. пособие / Р. И. Мокшанцев. – М. : ИНФРА-М, 2001. – 230 с.

3. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка тэксту : вучэб. дапам. для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў філал. профілю / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 223 с.

4. Швец, Н. Г. Формализация взаимосвязи вербальных и невербальных составляющих рекламного объявления : автореф. дис. … канд. филол. наук / Н. Швец. – Минск, 2007. – 18 с.

Александр Градюшко

Белорусский государственный университет

НОВЫЕ ФОРМЫ ПРЕДСТАВЛЕНИЯ КОНТЕНТА В ИНТЕРНЕТ-СМИ

Для успеха в жесткой конкуренции с социальными медиа издателям и редакторам газет нужно экспериментировать с **новыми платформами и типами контента**. Это одна из важнейших тенденций рынка интернет-СМИ. Почти 15 лет мы живем в эпоху Интернета, а публикуем материалы все так же, как и 100 лет назад. Просто копируем их в онлайн. Наблюдается колоссальный недостаток воображения в использовании онлайновых платформ. Для обогащения своего портфолио и охвата новой аудитории ведущие мировые медиакомпа-

нии развивают **кросс-медийные решения** и инновационные формы представления контента. Поговорим об этом подробнее.

Позавчера мы узнавали о событии тогда, когда нам сообщали о нем СМИ, и так, как они нам сообщали. Вчера новости вначале появлялись в онлайн-СМИ, а лишь затем про них сообщали радио, телевидение, газеты. Сегодня о событии в Интернете нам рассказывают очевидцы. Площадкой оперативного доступа к этим сообщениям являются **социальные сети**. Сообщения в блогах и социальных сетях представляют собой сырье для интернет-изданий и информационных агентств. Завтра мы будем знать о событии практически одновременно с ним, сами сможем собирать «немодерированные» мнения и анализировать их. Мир уже научился информировать себя сам.

Постепенно молодая аудитория уходит за информацией в социальные сети. В Интернете возникает принципиально другая картина реальности. Это совершенно иная информационная система. Интернет развивается как **интерактивная социальная среда**. Если раньше мы искали информацию на тех или иных сайтах интернет-СМИ, то сегодня все чаще узнаем ее из социальных сетей. Для нас представляет интерес та информация, которой с нами хотят поделиться друзья в социальных медиа.

Принципы отбора информации и генерирования новостных поводов в интернет-СМИ отличаются от того, что мы видим в традиционной журналистике. Изменились понятия **форматов и жанров**. Новые медиа требуют принципиально нового контента. Перед журналистами сегодня встает задача научиться «дотягиваться» до пользователя и быть удобным ему везде, в том числе в социальных сетях. Идея нового витка отношений СМИ и читателя состоит в том, что традиционные медиа приходят в ближний круг пользователя и пытаются сохранять его интерес и доверие.

Принципиально важным и совершенно новым видом деятельности для СМИ в Интернете является работа с **сообществом читателей** в режиме реального времени, интерактивное взаимодействие с аудиторией. Успех в Интернете также обеспечивает качественный **уникальный контент**, ориентированный на запросы посетителей. Без этих компонентов все остальные технологические инновации не имеют значения. Традиционные способы продвижения СМИ уходят на второй план.

Перемены в отрасли требуют находить способы привлекать читателей, привыкших к мгновенности Интернета, а также сочетать

качественную журналистику с новыми технологиями. Изменился **баланс власти**, и у читателей теперь больше влияния. Новые платформы предусматривают иной способ подачи контента, требуют не повторять то, что было в газете. Необходимо учить журналистов писать хорошие краткие материалы, которые можно объединять с визуальными элементами.

Представление контента в интернет-СМИ имеет свою специфику. Не каждая новость, которая есть в газете, должна появиться на сайте, а тем более в социальных сетях. Парадоксально, но факт: чем больше люди хотят знать, тем меньше они хотят читать. Поэтому заголовки должны быть короткими, в них необходимо использовать понятные контекстные фразы, ключевые слова. Текст нужно писать в **новостном формате**. То есть все должно быть четко структурировано. Больше глаголов и существительных, меньше прилагательных и образных выражений [1].

Пользователи Интернета не задерживаются на веб-странице подолгу и бегло просматривают контент, не прочитывая его слово за словом. Вместо того чтобы читать каждое слово, читатели **«сканируют»** страницы в поисках информации, отыскивая ключевые слова, фразы и зрительные ориентиры. Необходимо научиться писать статьи, которые легко просматривать. При этом важны такие элементы, как заголовок с ключевыми словами, подзаголовки внутри публикации, форматирование текста, выделение цитат, короткие абзацы и др.

Принципы написания **заголовков** для интернет-СМИ были обозначены нами в предыдущих работах [3]. Напомним, что заголовки крайне важны. Так как именно по ним читатель определяет, будет ли он знакомиться с материалом или нет. Наиболее распространенными в интернет-СМИ являются констатирующие заголовки, в которые должны войти ключевые слова, совпадающие с поисковыми запросами аудитории. Заголовки должны быть короткими, простыми, с глаголом в активном залоге.

Поисковая оптимизация сайта – еще один немаловажный момент, так как значительная часть читателей приходит с поисковых систем. Поисковый запрос пользователя должен быть в полной мере удовлетворен. Вот почему так важны оптимальные ключевые слова и их достаточное количество. Существует много факторов, влияющих на место, на котором поисковая система расположит страницу с ма-

териалом. Однако одним из наиболее действенных способов продвижения являются слова, используемые в заголовке страницы.

Проиллюстрируем важность новых форм представления контента на конкретном примере. В ноябре 2011 г. в веб-лаборатории Института журналистики БГУ был создан новый сайт газеты **«Браслаўская звязда».** Предыдущая версия, разработанная два года назад, не пользовалась популярностью. Среднее количество посетителей не превышало 20–30 человек в день. После запуска нового сайта http://www.braslav-star.by/ его посещаемость увеличилась за месяц до 140–250 пользователей в сутки. Во многом этому способствовало продвижение как в поисковых системах, так и в социальных сетях.

Публикации газеты, предназначенные для размещения на сайте, переводятся с белорусского на русский язык. Делается это намеренно, для лучшей видимости сайта в поисковых системах. Процент пользователей, которые что-то ищут в Google или Яндекс на белорусском языке, чрезвычайно мал по сравнению с русским. По данным **статистики ключевых слов Яндекса** http://wordstat.yandex.ru/, за последний месяц слово «Браслав» вводили в строку поиска 6475 человек, в то время как «Браслаў» искали всего 17 человек, или в 380 раз меньше.

Профессор Нина Мечковская в этой связи совершенно верно отмечает, что «в силу коммерциализации производства контента для каналов массовой коммуникации (Интернет, СМИ, кинопрокат и др.) в условиях галопирующего прогресса и распространения информационных технологий функциональная полнота и самодостаточность национальных языков в сферах массовой коммуникации ослабевает – подобно тому, как суверенитет отдельного государства в силу глобализации становится все более ограниченным» [5].

Продвижение сайта газеты «Браслаўская звязда» в поисковых системах принесло ощутимый результат: по запросу «Браслав» сайт газеты находится на восьмом месте в Яндексе и на двенадцатом в Google, что обеспечивает стабильный приток посетителей из поисковых систем. Для сайта характерны такие **заголовки**, как «В Браславе на Новый год соревновались сильнейшие баскетболисты», «Браславский католический приход поставил новую пьесу», «Ватикан профинансирует реконструкцию браславского туберкулезного санатория». В каждом из них содержатся ключевые слова и глаголы.

Для продвижения сайта браславской районной газеты также активно используются **социальные медиа**. По статистике, группа

газеты «Браслаўская звязда» в социальной сети «В Контакте» в начале 2012 г. насчитывала 815 человек, в «Одноклассниках» – более 1380 человек [2]. Ленты новостей в Twitter и на Facebook, которые дублируются с сайта, к сожалению, пока не очень популярны, так как жители района хуже знакомы с ними, чем с вышеназванными российскими аналогами. Но это дело времени. Также у газеты есть свой видеоканал на Youtube, который она собирается развивать.

Появление социальных медиа обострило конкуренцию между ними и СМИ, но в то же время конкурент оказался партнером. Современное средство массовой информации должно использовать в своей работе все «плюсы» социальных медиа и взаимодействия с ними. Социальные медиа являются не только новым каналом распространения информации для СМИ, но и средством построения более сложных коммуникативных процессов с аудиторией, установления с ней непрерывного диалога. При желании социальные сети можно с успехом использовать для **сплочения аудитории** вокруг бренда газеты.

По информации статистического сервиса Socialbakers, в крупнейшей в мире социальной сети Facebook в январе 2012 г. было зарегистрировано 355 240 белорусских интернет-пользователей, а наиболее популярной социальной сетью в Беларуси считается российский ресурс **«В Контакте»** (более 1 млн белорусских аккаунтов). По разным оценкам, в нашей стране насчитывается более 30 тыс. учетных записей Twitter. Популярен и «Живой Журнал», в котором зарегистрировано порядка 80 тыс. интернет-пользователей из Беларуси.

Данные статистики говорят о том, что количество переходов на сайты СМИ с социальных сетей обычно не превышает 5–7 % от общего количества посетителей. В отдельных случаях эта цифра может быть значительно выше, достигая 40–50 % и более. Пользователям социальных сетей удобнее всего искать новости не на сайтах газет, а непосредственно в **социальных сообществах**. Прочитав анонс новости в социальной сети, для ознакомления с полной версией материала пользователи переходят по ссылке на сайт издания.

По мнению экспертов РИА «Новости», присутствие СМИ в соцсетях имеет ряд **преимуществ**: предпочтение бренду; прямые переходы на страницы сайта; регулярное посещение страницы, группы, сообщества СМИ в социальных сетях; активные обсуждения, которые, в свою очередь, могут быть проанализированы редакцией СМИ

и использованы как мнения и цитаты в новом контенте; использование сообщества групп как поставщика читательского контента; возможность иметь моментальную реакцию [7].

Деятельность российского **РИА «Новости»** в социальных медиа заслуживает внимания. В минувшем году РИА «Новости» открыло около 60 каналов в социальных сетях. Общее количество читателей аккаунтов РИА «Новости» в соцсетях по состоянию на декабрь 2011 г. составило более 800 тысяч. Из них: 390 тысяч – в Facebook, 112 – в Twitter, 279 – в «В Контакте», 14 тысяч – в «Одноклассниках», 1700 – в Google+.

Примечательно, что РИА «Новости» первым использовало на своем сайте новый **виджет** социальной сети «В Контакте», предназначенный для демонстрации наиболее популярных среди участников соцсети онлайн-публикаций СМИ. В специальном окне отображаются заголовки статей, которые чаще всего рекомендуют друг другу пользователи социальной сети, нажимая на кнопку «Мне нравится». Кроме того, виджет отображает информацию о том, сколько пользователей порекомендовали ссылку.

По схожей схеме с недавнего времени успешно работает и агентство **БелТА**, которое завело аккаунты в таких социальных медиа, как «В Контакте», «Одноклассники», Twitter, LiveJournal, Facebook. Правда, интерес пользователей пока невелик: на Facebook новости БелТА читает чуть больше ста человек, зато в Twitter агентство имеет около 700 подписчиков. Представлено это агентство и на Youtube: за один год в аккаунт добавлено более 400 видеосюжетов.

Деятельность российского РИА «Новости» интересна по многим направлениям. В настоящее время оно, пожалуй, является единственным по-настоящему **мультимедийным информационным агентством** в России. Эта лидирующая российская медиакомпания показывает нам вектор развития традиционных СМИ. В РИА «Новости» был создан один из первых конвергентных ньюсрумов. Также агентство зарекомендовало себя как ведущий разработчик информационных приложений для различных медиаканалов.

К основным мультимедийным достижениям «РИА Новости» в 2011 г. можно отнести выход в трехмерное пространство, открытие десятков новых спецпроектов, выпуск ряда приложений для мобильных устройств и браузеров, успешное освоение новых форм и форматов информационного вещания, запуск около 60 каналов в социаль-

ных сетях. В частности, в июне агентство запустило каталог материалов в **формате 3D**. Технология 3D позволяет увидеть изображение в объеме. Пользователям в этом разделе представлены специальные подборки материалов – фото, аудиослайдшоу и инфографика.

Принципиально новый формат подачи новостей – музыкальные видеоклипы в стиле рэп. Проект **RapInfo** – результат совместной работы ресурса «Ты – репортер» и рэперов Dino MC 47 и ST. Материалы RapInfo, ориентированные на молодую аудиторию, набрали более 8 млн просмотров в Интернете, 30 000 подписчиков канала проекта на видеохостинге Youtube и 50 000 участников группы в социальной сети «В Контакте». Новости в таком стиле пользуются популярностью среди молодежи 15–20 лет.

Проект RapInfo был запущен 3 июня 2011 г. Девиз проекта – «новости в речитативе о России и о мире, какими вы их еще не видели». После успеха первого выпуска (на каналах рэперов и сторонних сайтах его посмотрело более 200 тысяч человек) РИА «Новости» решило делать его постоянно. Первый выпуск RapInfo был показан **Дмитрию Медведеву** во время его визита в РИА «Новости» в честь 70-летия агентства. Президенту России понравилась идея знакомить аудиторию с последними событиями в стиле рэп, он даже в шутку пообещал подумать над тем, какое из своих выступлений записать в таком формате.

Проект RapInfo выходит каждую пятницу и освещает 3–4 новости. Премьеры выпусков проходят на сайте «Ты – репортер». Также у проекта есть официальные каналы в Youtube и «В Контакте». Представители теле-, радио- и музыкальной индустрии уверены, что подобная подача новостей создаст **новый информационный формат**. Популярный блогер drugoi (Рустем Адагамов) уверен в больших перспективах рэп-истории. «Rap Info – острые тексты и отлично подобранный видеоряд. Я думаю, что ребята нашли один из тех форматов подачи актуальной информации, который может быть интересен тем, кто уже давно не смотрит телевизор и не читает газет – я про нашу молодежь», – сказал он [6].

Представлять контент в интернет-СМИ можно также с помощью различных **спецпроектов**. Например, в октябре РИА «Новости» предложило посетителям своего сайта мультимедийный спецпроект «Титаник». К годовщине катастрофы в апреле 2012 г. первые публикации об истории корабля, версиях крушения будут дополнены

полностью воссозданной картиной произошедшего. У пользователей появится возможность в онлайн-режиме проследить путь лайнера и узнать подробности жизни пассажиров. Отметим, что с первых публикаций спецпроект пользуется большим успехом читателей. Так, в первые два месяца количество посетителей спецпроекта достигло 250 тысяч.

Дальнейшее развитие интернет-СМИ привело и к модификации **жанровой структуры**. Наряду с классическими, появились новые жанры. Интернет внес в работу СМИ инновационные формы представления контента. Появились принципиально новые способы донесения информации до аудитории, которых не существовало ни на телевидении, ни на радио, ни в прессе.

Довольно часто в интернет-СМИ используется **онлайновый репортаж**. В его основе всегда находится определенное событие в его динамике. Интернет означает публикацию в реальном времени, почти без задержки. Например, во время футбольного матча или судебного процесса издание может на отдельной странице сообщать об их ходе.

Появился такой новый жанр, как **интернет-конференция**. Многие издания практикуют веб-конференции с известными людьми, в том числе с использованием средств мгновенного обмена сообщениями. В таком интервью может поучаствовать любой желающий. Пользователь при этом может сразу вступить в контакт с журналистом, участниками конференции и другими читателями, выразить свое мнение или сообщить новую информацию.

Новое развитие получил и жанр статьи, преобразовавшись в **мультимедийную статью**. Онлайн-текст может быть дополнен звуком, видео, графикой. Он живет многообразием медийных средств. Тема раскрывается с помощью текста, фото, видео, инфографики, интерактивного видео, аудиослайд-шоу.

Популярен **авторский блог**, нашедший свое место и на страницах медийных сайтов. Привлекательность этого жанра заключается в том, что он позволяет обратиться к читателю напрямую. В блогах распространены такие явления, как собственные мнения, неформальный тон, живой язык. Это позволяет вовлечь читателя в разговор, заставить его почувствовать себя включенным в дискуссию. К разновидностям авторских колонок можно отнести видеоблоги.

Поставщиками информации для журналистов в последнее время все чаще становятся сами **читатели**. Именно они предоставляют са-

мые ценные кадры с места событий, пишут на форумах оперативные сообщения, размещают в Интернете видео и аудио, делятся подробностями важных историй. Гражданские журналисты уже готовы работать оперативно и умеют выбирать темы не хуже профессионалов. С другой стороны, в отличие от СМИ, они не несут ответственности за сказанное. Поэтому задачей журналистов становится проверка новостей, поступивших от пользователей.

Приведем пример такого взаимодействия. Журналисты портала **auto.onliner.by** ежедневно собирают сообщения очевидцев аварий на улицах Минска, используют фотографии с форума «Дороги. Аварии. Происшествия» forum.onliner.by, а также видео, оперативно загруженное пользователями форума на YouTube. В результате на основе читательского контента создается полноценный журналистский материал, который активно комментируют посетители сайта.

Подхватывать новостные поводы непосредственно от участников тех или иных событий можно также через **Twitter**. Миллионы событий фиксируются ежедневно на камеры телефонов. Миллионы людей размещают информацию о том, что происходит вокруг, в блогах и социальных сетях. Журналист уже никогда не будет на месте события первым. Если раньше задача СМИ состояла в том, чтобы найти новость и сообщить ее аудитории, то сегодня журналистам остается лишь отфильтровать контент, проверить информацию, выделить главное, объяснить и рассказать хорошим языком, предложив оптимальный сценарий потребления.

Принципиально новый вид деятельности СМИ в современном информационном пространстве – создание **контента для мобильных устройств**. Деловая газета «Ведомости», например, в 2011 г. представила приложение для телефонов с платформой Android. Оно включает в себя наиболее популярные разделы сайта и газеты и позволяет читать свежий номер газеты и круглосуточно обновляемую ленту новостей. «Мы следуем за нашим читателем везде, где бы он ни находился. В отпуске, в автомобильной пробке или самолете. Мы знаем, что самое ценное для делового человека – это свежие “Ведомости”, которые всегда под рукой», – говорит Виктор Саксон, руководитель отдела интернет-технологий газеты «Ведомости» [4].

Примеру ведомостей последовали «Труд», «Коммерсантъ», «Московский комсомолец», «Комсомолькая правда», «Московские новости»… **Приложения** для Android, iPhone, iPad, различные виджеты

для просмотра новостей на рабочем столе компьютера и планшета собирают дополнительную аудиторию. Помимо текстового контента, приложения Интернета предоставляют читателям видео- и аудио-ролики, инфографику, фотоленты дня, интерактивные сервисы, виртуальные туры, флэш-игры. Новые мобильные устройства меняют модель потребления информации, которая требует от редакций изменения способов ее подачи.

Проведенное исследование показывает, что в интернет-СМИ в последние годы появились новые способы представления контента. Для повышения влияния сайтов на общественное мнение, увеличения их посещаемости и цитируемости необходимо, чтобы их сопровождением занимались высококвалифицированные **интернет-журналисты** и специалисты по онлайн-коммуникациям, обладающие системными знаниями в области творческой деятельности веб-журналиста, оптимизации текстов для поисковых систем, продвижения сайтов, интернет-маркетинга.

Продвижение контента по всем возможным направлениям и каналам, доступным современному человеку, можно отнести к важнейшим способам повышения эффективности онлайн-СМИ. Пока что многие белорусские издания, к большому сожалению, воспринимают интернет-сайт всего лишь как «клон» своей печатной версии и упускают время, тогда как зарубежные издательские дома активно работают в интернет-пространстве и все чаще реализуют стратегию **«360 градусов»**, нацеленную на охват всех возможных медийных носителей.

Приходится констатировать, что в течение последних десяти лет в журналистике произошли **существенные перемены**. Изменился цикл производства информации. Претерпела изменения структура источников. Поменялись понятия форматов и жанров. Освещение события происходит параллельно с событием. Требования к навыкам журналиста стали принципиально другими. Полагаем, что в этом многообразии медийных платформ в век мгновенных сообщений, когда каждый хочет быть первым, один элемент должен остаться неизменным. Это классическая качественная журналистика. Журналистика завтрашнего дня.

Литература

1. Амзин, А. А. Новостная интернет-журналистика : учебное пособие для вузов / А. А. Амзин. – М. : Аспект Пресс. – 2011. – 142 с.

2. «Браслаўская звязда» ўзялася развіваць інтэрнэт-версію [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://westki.info/artykuly/12557/braslauskaia-zviazda-uzialasia-razvivac-internet-viersiiu. – Дата доступа: 13.01.2012.

3. Градюшко, А. А. Принципы написания текстов для интернет-СМИ // Слова ў кантэксце часу : зб. навук. прац да 80-годдзя доктара філал. навук, праф. Аркадзя Іосіфавіча Наркевіча, пад агул. рэд. В. І. Іўчанкава. – Мінск, 2009. – С. 126–135.

4. Деловая газета «Ведомости» запустила приложение для Android [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vedomosti.ru/corp_news/2011/04/01/206. – Дата доступа: 13.01.2012.

5. Мечковская, Н. Б. Постсоветские языки в условиях государственного суверенитета и расцвета информационных технологий / Н. Б. Мечковская // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. — Серыя 4: Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2011. – № 2. – С. 75.

6. Проект RapInfo «заработал» первый миллион [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ria.ru/ria70_news/20110715/402314927.html – Дата доступа: 13.01.2012.

7. Участники ФЕАМ-2011 обсудили будущее СМИ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ria.ru/mf_news/20111121/494265299.html. – Дата доступа: 13.01.2012.

Алена Губкіна
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ДА ПЫТАННЯ АБ ПРЫЧЫНАХ ЛЕКСІЧНЫХ ПАМЫЛАК ПРЫ ПЕРАКЛАДЗЕ

Кожная мова – гэта своеасаблівы код, г. зн. адвольнае абазначэнне прадметаў і з’яў рэчаіснасці пры дапамозе ўмоўных знакаў. Пераклад, такім чынам, можна разумець як перакадзіраванне, паколькі кожны ўмоўны знак адной знакавай сістэмы (мовы) замяняецца знакам іншай знакавай сістэмы (іншай мовы). У навуковай літаратуры пераклад вызначаецца як перавыражэнне, перакадзіраванне тэксту, створанага на адной мове, у тэкст на іншай мове. Якасны пераклад можа ажыццявіць спецыяліст, які творча падбірае варыянт, трапны адпаведнік у залежнасці ад рэсурсаў мовы, тыпу і задач перакладу, асаблівасцей тэксту і свайго досведу і густу. Пераклад – гэта і вынік дзейнасці перакладчыка [1, с. 149].

Любы моўны знак мае план выражэння і план зместу. Розныя мовы ў пэўнай ступені супадаюць у плане зместу, але істотна ад-

розніваюцца планам выражэння. Разыходжанні ў плане выражэння найбольшыя паміж генетычна аддаленымі мовамі і найменшыя паміж мовамі роднаснымі. Але гэта зусім не спрашчае работу тых, хто займаецца перакладам на блізкароднасныя мовы. Бо, як вядома, узровень інтэрферэнцыі (адпаведна і колькасць, і ўстойлівасць інтэрферэнцыйных памылак) тым большы, чым большая ступень роднаснасці паміж мовамі, якія знаходзяцца ў паралельным выкарыстанні. Такім чынам, білінгвізм як перадумова інтэрферэнцыі з'яўляецца ў пэўнай ступені небяспечным фактарам узнікнення і ўкаранення маўленчых памылак на розных моўных узроўнях.

Дзяржаўны статус беларускай і рускай моў у нашай краіне накладае на людзей, чыя прафесійная дзейнасць звязана з мовай, абавязак дасканала валодаць абедзвюма мовамі. Афармленне дакументаў на беларускай і рускай мовах, стварэнне рознамоўных версій сайтаў, тэкставай інфармацыі для перыядычных выданняў, тэле- і радыёперадач, якія «выходзяць» і па-руску, і па-беларуску, нярэдка звязана з перакладам тэксту, створанага на адной мове, на іншую мову. Пераклад з блізкіх, роднасных моў можа памылкова здавацца нескладанай працай. Але ж кожная мова валодае шэрагам лексічных і граматычных асаблівасцей, без добрага ведання якіх якасны пераклад наўрад ці магчымы. Паміж беларускай і рускай мовамі існуюць шматлікія істотныя разыходжанні і несупадзенні на ўсіх моўных узроўнях. У прыватнасці, беларуская мова адрозніваецца ад рускай націскам у асобных суадносных словах (*а́рышт – аре́ст, арэндава́ны – арендо́ванный, укамплектава́ны – укомплекто́ванный, забеспячэ́нне – обеспе́чение* і інш.), родам падобных па напісанні і гучанні слоў (*надпіс, перапіс, запіс, подпіс, продаж* і інш.), групамі адзіночналікавых і множналікавых назоўнікаў (напрыклад, бел. *крупы, паводзіны* (толькі мн. л.) – рус. *крупа, поведение* (толькі адз. л.), бел. *клопат* (толькі адз. л.) – рус. *хлопоты* (толькі мн. л.), бел. *дзверы* (толькі мн. л.) – рус. *дверь* (адз. і мн. л.) і інш.), афармленнем адмаўленняў (напрыклад, бел. *бясконцы* – рус. *нескончаемый*, бел. *міжволі* – рус. *непроизвольно*, бел. *небяспека* – рус. *опасность*, бел. *незлічоны* – рус. *бесчисленный* і інш.). Існуюць выразныя разыходжанні паміж беларускай і рускай мовамі і на сінтаксічным узроўні, звязаныя найперш з дзеяслоўным кіраваннем, выкарыстаннем дзеепрыметнікавых зваротаў, рознай будовай параўнальных канструкцый і асобных словазлучэнняў, значэннем і выкарыстаннем пры-

назоўнікаў і г. д. Тут да месца прыгадаць меркаванне пра тое, што душа мовы – сінтаксіс; якраз тут выяўляецца адметнасць спосабу і сродкаў перадачы думкі і пачуцця. Глыбока засвоіць мову нельга без спасціжэння яе сінтаксічнага ладу. Пры павярхоўным засваенні найбольшая колькасць памылак сустракаецца менавіта ў сінтаксісе – пабудове фразы [8, с. 85]. На жаль, інтэрферэнцыйныя памылкі на фанетычным, словаўтваральным, марфалагічным і сінтаксічным узроўнях маюць найбольшыя шанцы на замацаванне ў маўленні, паколькі, як правіла, істотна не ўплываюць на працэс разумення, амаль не перашкаджаюць перадачы сэнсу выказвання і таму нярэдка ігнаруюцца. Іншая справа памылкі лексічныя, якія больш заўважныя ў маўленні, паколькі памылковае словаўжыванне ці няправільна падабраны пры перакладзе адпаведнік скажаюць сэнс выказвання, робяць яго двухсэнсоўным або ўвогуле незразумелым. Найчасцей прычынамі лексічных памылак з’яўляюцца наступныя: неразуменне (няведанне) значэння слова, парушэнне лексічнай спалучальнасці, няправільнае выкарыстанне мнагазначных слоў і слоў-амонімаў, зблытванне міжмоўных паронімаў і амонімаў, маўленчая збыткоўнасць (плеаназмы і таўталогія), фармальны пераклад (калькаванне). Не ўсе названыя прычыны ў роўнай ступені маюць дачыненне да лексічных памылак, якія ўзнікаюць пры перакладзе з рускай мовы на беларускую. Тут так званымі лідарамі з’яўляюцца найперш няправільны пераклад слоў, якія маюць неаднолькавы аб’ём лексічнага значэння ў розных мовах, недакладны (памылковы) выбар адпаведніка з сінанімічнага рада і парушэнне лексічнай спалучальнасці. Па названых прычынах з’явіліся наступныя недарэчныя выразы ў студэнцкіх работах: *эканамічныя правапарушэнні, якія* ***вабяць*** *канфіскацыю маёмасці* (з рускага *экономические правонарушения, которые* ***влекут*** *конфискацию имущества*); *некаторыя пытанні* ***ўжывання*** *Указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь* (з рускага *некоторые вопросы* ***применения*** *Указов Президента Республики Беларусь*); *са* ***становішчаў*** *часткі другой Пастановы* ***варта****, што правапарушальнікамі могуць з’яўляцца…* (з рускага *из* ***положений*** *части второй Постановления* ***следует****, что правонарушителями могут являться…*); ***дадзенае*** *пытанне* ***ставіцца*** *да кампетэнцыі Міністэрства фінансаў* (з рускага ***данный*** *вопрос* ***относится*** *к компетенции Министерства финансов*); ***усталяваныя*** *тэрміны* (з рускага ***установленные*** *сроки*); *за* ***ра-***

хунак *уласных сродкаў* (з рускага *за* ***счет*** *собственных средств*); *канферэнцыя праводзілася на* ***аснове*** *філалагічнага факультэта* (з рускага *конференция проводилась на* ***базе*** *филологического факультета*); ***сапраўдны*** *мемарандум* (з рускага ***настоящий*** *меморандум); **грамадства** з абмежаванай адказнасцю* (з рускага ***общество*** *с ограниченной ответственностью*); *арганізацыя выступіла са* ***сказам*** (з рускага *организация выступила с* ***предложением***) і інш. На жаль, памылковае словаўжыванне мае месца і ў маўленні журналістаў-прафесіяналаў. Напрыклад, аўтар фразы *…меры для* ***ўсталявання*** *гаспадара машыны…* (Першы канал беларускага радыё, эфір 26.04.11), відаць, зблытаў словы ***ўсталяванне*** 'змяшчэнне куды-небудзь, устаноўка належным чынам; прывядзенне ў пэўны парадак' і ***ўстанаўленне*** 'вызначэнне, выяўленне'. Гаспадар машыны, натуральна, можа быць устаноўлены (гэта значыць, ***вызначаны, выяўлены, знойдзены ці адшуканы***). Памылка магла ўзнікнуць па прычыне няўважлівасці да перакладу слова ***установление***, якое ў рускай мове выкарыстоўваецца ў розных значэннях *(установление личности, установление памятника, установление власти, установление наблюдения).* У выразе *…калі вадзіцель будзе* ***грэбаваць*** *гэтым правілам…* (Першы канал беларускага радыё, эфір 24.03.11) дзеяслоў ***грэбаваць*** варта замяніць (напрыклад*,* ***ігнараваць*** ці ***не заўважаць*** *гэта правіла,* ***ставіцца без належнай ўвагі*** *да гэтага правіла, не надаваць значэння правілу* і пад.). Верагодная прычына памылкі ў неразмежаванні значэнняў слоў ***грэбаваць*** 'быць грэблівым (гідліва адносіцца да неахайнасці і ўсюды яе падазраваць) у адносінах да каго-, чаго-небудзь' і ***ігнараваць*** 'не заўважаць, не рэагаваць, не адказваць на што-небудзь) (рус. *брезговать* і *пренебрегать*). У выразе *…выбіраць рэжым руху,* ***адэкватны*** *ўмовам…* (Першы канал беларускага радыё, эфір 16.01.12) слова ***адэкватны***, якое мае значэнне 'такі, які поўнасцю супадае, роўны чаму-небудзь' мусіць быць заменена на ***адпаведны***, г. зн. 'які падыходзіць да пэўнага выпадку, адпавядае чаму-небудзь, вынікае з чаго-небудзь', а лепш выкарыстаць аднакаранёвы дзеяслоў: *…выбіраць рэжым руху, які* ***адпавядае*** *ўмовам…*

На нашу думку, зусім не па-беларуску, ненатуральна гучаць і выразы ***водпуск*** *па догляду за дзіцём, як не* ***згубіць*** *здароўе,* ***водпуск*** *без рэцэптаў некаторых прэпаратаў, праблемы (са здароўем)* ***з-за*** *самалячэння* (Першы канал беларускага радыё, эфір 14.01.12), нягледзячы на тое, што слоўнікі легалізуюць такія ўжыванні. Пытан-

не пэўнага недаверу ад асобнай інфармацыі, змешчанай у слоўніках, неаднаразова ўзнімалася рознымі даследчыкамі. Пішучы пра недасканаласць слоўнікаў, В. Вінаградаў адзначаў, што «ў кожным тлумачальным слоўніку прапускаюцца сотні, калі не тысячы жывых значэнняў і выдумваецца мноства значэнняў, якіх не існуе» [2, с. 169]. Мы згодныя з Д. Паўлаўцом, які лічыць, што часам «памылковае» выкарыстанне падмацоўваецца аўтарытэтам РБС, ТСБМ, і давесці памылковасць у такіх выпадках вельмі цяжка» [6, с. 36]. На думку П. Сцяцко, «у цяперашніх літаратурных слоўніках лексічнае багацце нацыянальнай беларускай мовы не знайшло свайго дастатковага адлюстравання» [7, с. 219]. Меркаванне пра тое, што аўтарытэтнасць любой лексікаграфічнай крыніцы не абсалютная, сустракаецца і ў іншых працах [гл., напр., 3; 4; 5; 9 і інш.]. Асабліва «скампраметаванымі» аказаліся слоўнікі, выдадзеныя пасля 1930 года, у якія пад уплывам тагачаснай моўнай палітыкі не ўключаліся многія адметныя, самабытныя беларускія словы, а ўводзіліся словы рускай мовы. Сумна і горка чытаць развагі Максіма Танка: «Узяўся гартаць слоўнікі. Бясконцая і бяздумная запазычанасць чужых слоў, як у нас, не можа не пагражаць дэградацыяй самой мове» [8, с. 7]. І таму лічыць слоўнік гарантыяй удалага і якаснага перакладу не выпадае. Зварот да перакладнога слоўніка ўсяго толькі спрашчае працу па перакладзе, але ж спадзявацца толькі на слоўнік рызыкоўна. Без тонкага адчування мовы, без глыбокага спасціжэння яе багацця і паўнаты, а таксама без маўленчай практыкі пераклад можа ператварыцца ў сухую і механічную пераробку тэксту. На жаль, такія выпадкі не ўнікальныя і не неверагодныя. У цяперашняй сітуацыі, калі беларуская мова не з’яўляецца рэальным сродкам зносін нацыі, у выніку чаго амаль не працуе механізм моўнай самарэгуляцыі, мы нярэдка бачым каструбаватыя і ненатуральныя беларускія выразы. Дарэчы, яны не абавязкова павінны быць перакладзенымі з рускай мовы, іншымі словамі, мець першасны, зыходны рускамоўны варыянт (як, напрыклад, тыя радыёматэрыялы, урыўкі з якіх прыведзены вышэй). Справа ў тым (дазволім сабе такую гіпотэзу), што вялікая колькасць журналістаў (і не толькі) з’яўляецца толькі карыстальнікамі беларускай мовы, а не яе носьбітамі. Чалавек, які думае па-руску, карыстаецца рускай мовай у паўсядзённым жыцці, не заўсёды можа прыгожа і беспамылкова выказацца па-беларуску. Адсюль і многія праблемы культуры беларускага маўлення. У такой сітуацыі ніякі слоўнік не засцеражэ ад памылак пры стварэнні і пе-

ракладзе тэксту. Да таго ж слоўнікам яшчэ трэба ўмець карыстацца. Тут прыгадваецца анекдатычны выпадак, калі фраза *этот вопрос является очень* ***важным*** была перакладзена так: *гэта пытанне з'яўляецца вельмі* ***вільготным***. Было б смешна, калі б не было так сумна: студэнтка ў рэестры рускіх слоў адшукала (безумоўна, выпадкова адгарнуўшы не тую старонку) ***не важный***, а ***влажный***. Але пры гэтым нават не збянтэжылася, пішучы бязглуздзіцу! Так што не кожнаму перакладны слоўнік можа дапамагчы. Некаторым ён толькі ўскладніць задачу і нават заблытае.

Падсумоўваючы сказанае, хочацца адзначыць, што, нягледзячы на розныя механізмы ўзнікнення лексічных памылак, перадумова іх адна – недастатковая ўвага да мовы, неўсведамленне таго, што кожная мова – унікальны і самадастатковы свет. Ствараючы ці перакладаючы тэкст, варта памятаць пра спецыфічныя рысы і характэрныя рысы мовы, а пры выбары слова кіравацца найперш мэтазгоднасцю.

Літаратура

1. Алексеева, И. С. Введение в переводоведение / И. С. Алексеева. – М., 2004. – 352 с.
2. Виноградов, В. В. Основные типы лексических значений слова // В. В. Виноградов // Лексикология и лексикография : избр. труды. – М. : Наука, 1977. – С. 162 –191.
3. Губкіна, А. В. Хто нас лечыць? / А. В. Губкіна // Роднае слова. – 2006. – № 7. – С. 31–33.
4. Каўрус, А. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / А. Каўрус // Полымя. – 1969. – № 8. – С. 200–207.
5. Красоўскі, В. Колькі разваг пра мову / В. Красоўскі // Полымя. – 1970. – № 1. – С. 223–229.
6. Паўлавец, Д. Да паняцця нармалізацыі ў лексіцы / Д. Паўлавец // Перспектывы развіцця і функцыянавання нарматыўнай лексікі : арт. і матэрыялы Міжнар. навук.-метад. канф. / Гомел. дзярж. універсітэт імя Ф. Скарыны, 22–23 мая. – Гомель, 1998. – С. 33–37.
7. Сцяцко, П. У. З пашанай да роднай мовы / П. У. Сцяцко // Полымя. – 1990. – № 4. – С. 219–222.
8. Сцяцко, П. У. Культура мовы / П. У. Сцяцко. – Мінск : Тэхналогія, 2002. – 444 с.
9. Шчэрбін, В. К. Тэарэтычныя праблемы беларускай лексікаграфіі / В. К. Шчэрбін. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1996. – 140 с.

Вольга Губская
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

НАРАТЫЎНАЯ СТРУКТУРА РАМАНА М. ГАРЭЦКАГА «ВІЛЕНСКІЯ КАМУНАРЫ» (1931–1932)

Вывучэнне вобраза аўтара ў структуры мастацкага тэксту з’яўляецца адным з найбольш актуальных пытанняў нараталогіі. Ці можна карыстацца метадалагічнымі прыёмамі нараталогіі пры аналізе тэкстаў беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя? Праілюструем адказ на гэта пытанне на прыкладзе рамана М. Гарэцкага «Віленскія камунары» (1931–1932).

Як сцвярджае В. Шмід, згодна з класічнай тэорыяй «да наратыўнага ці апавядальнага разраду творы залічваліся па прыкмеце камунікатыўнай структуры. Аповед, які супрацьпастаўляўся непасрэднаму драматычнаму выкананню, звязваўся з наяўнасцю ў тэксце голасу апасродкаванай інстанцыі, якую называлі апавядальнікам ці наратарам. У класічнай тэорыі аповеду асноўнай прыкметай апавядальнага твора з’яўляецца прысутнасць такога пасрэдніка паміж аўтарам і апісаным светам. Сутнасць апавядання зводзілася да пераламлення рэчаіснасці твора праз прызму ўспрымання наратара» [3, с. 11]. Згодна з канцэпцыяй структуралісцкай нараталогіі «вырашальным ў аповедзе з’яўляецца не столькі прыкмета структуры камунікацыі, колькі прыкмета структуры самога аповеду. Тэрмін «наратыўны», які супрацьпастаўляецца тэрміну «дыскрыптыўны», ці «апісальны», указвае не на прысутнасць апаспродкаванай інстанцыі выкладання, а на пэўную структуру выкладзенага матэрыялу» [3, с. 12]. Прыхільнікі структуралісцкай нараталогіі маюць на ўвазе наступнае: наратыўныя тэксты змяшчаюць у сабе пэўную гісторыю, пад якой разумеецца наяўнасць падзеі. Падзея, у сваю чаргу, – гэта змена зыходнай сітуацыі: ці знешняй (у гісторыі аповеду), ці ўнутранай сітуацыі персанажа (ментальная падзея). Такім чынам, наратыўнымі, з пункту гледжання структуралістаў, з’яўляюцца творы, у якіх адлюстроўваецца падзея, знешняя ці ментальная. Пры гэтым падзейнасць разглядаецца як ўласцівасць, што належыць градацыі па наступных крытэрыях: рэлевантнасць змены, непрадказальнасць (у падзеі ўтрымліваецца пэўная парадаксальнасць), кансекутыўнасць (змена поглядаў героя павінна адбіцца на яго жыцці), незваротнасць (прасвятленне героя робіць немагчымым

вяртанне да старого погляду на жыццё), непаўторанасць (змены не павінны паўтарацца, бо адбудзецца збліжэнне нарацыі з апісаннем) [3, с. 17–19].

Апавядальная (наратыўная) структура рамана М. Гарэцкага «Віленскія камунары» – прыклад рэалістычнай нарацыі, у якой складана будзе разгледзець пяць вышэйзгаданых крытэрыяў падзейнасці, больш арыентаваных на літаратуру пострэалізму. Падзея ў М. Гарэцкага, калі браць пад улік тэорыю структуралістаў, хутчэй заключаецца ва ўнутранай, ментальнай перамене галоўнага героя рамана Мацея Мышкі, якая ўвасоблена ў пазнавальнай, маральнай змене. Ад «неразумення», месцамі наіўнага «захаплення», праз «крытычнае стаўленне» Мацей Мышка прыходзіць да набыцця ўласнага погляду на жыццё. Аднак праз гэтае «мастацкае сталенне» героя і яго нарацыю можна прагледзець яшчэ адну падзею, больш значную для разумення сутнасці рамана і яго ролі ў кантэксце беларускай літаратуры. Гэтая падзея – водгаласак жыцця і жыццёвага вопыту самога пісьменніка М. Гарэцкага, тая прыхаваная праўда, тое глыбокае разуменне рэчаіснасці, якое было немагчыма выказаць адкрыта. Таму пры аналізе наратыўнай структуры рамана «Віленскія камунары» апраўданым будзе зварот да класічнай трактоўкі наратыўнасці, распрацаванай такімі вучонымі 1920-х гадоў, як М. Бахцін, У. Проп.

Сярод дастатковай колькасці трактовак гэтага паняцця выдзяляецца трактоўка М. Бахціна: «Перад намі дзве падзеі: падзея, пра якую апавядаецца ў творы, і падзея самога аповеду (у гэтым апошнім мы і самі ўдзельнічаем як слухачы-чытачы); падзеі гэтыя адбываюцца ў розныя часы (розныя і па працягласці) і ў розных месцах, і ў той жа час яны непарыўна аб’яднаны ў адзінай, але складанай падзеі, якую мы можам пазначыць як твор у яго падзейнай паўнаце. <…> Мы ўспрымаем гэтую паўнату ў яе цэласнасці і непадзельнасці, але адначасова разумеем і ўсю розніцу момантаў, якія яе складаюць» [1, с. 403–404].

Пытанне «двайной падзейнасці» ў мастацкім творы выцякае з праблемы, якую М. Бахцін вызначае як праблему «асабістага аўтарства». На яго думку, «пазіцыя аўтара рамана ў дачыненні да адлюстраванай рэчаіснасці вельмі складаная і праблематычная ў параўнанні з эпасам, з драмаю, з лірыкай. Агульная праблема «асабістага аўтарства» тут ускладняецца неабходнасцю мець нейкую істотную нявыдуманую маску, што вызначае як пазіцыю аўтара (як і адкуль ён – прыватны чалавек – бачыць і раскрывае гэта прыват-

нае жыццё), так і яго пазіцыю ў дачыненні да чытачоў, да публікі (у якасці каго ён выступае з «выкрыццём» жыцця – у якасці суддзі, следчага, «сакратара-пратакаліста», палітыка, прапаведніка, блазна і г. д.)» [1, с. 310].

Усведамленне прысутнасці гэтай праблемы (праблемы асабістага аўтарства) у рамане «Віленскія камунары» дазваляе выказаць меркаванне, што вобраз Мацея Мышкі – гэта і ёсць тая «істотная, нявыдуманая» маска, якая дапамагае зразумець, адкуль сам пісьменнік «бачыць і раскрывае гэта прыватнае жыццё». А бачыць ён яго з самай глыбіні народа, з таго асяроддзя, што было блізкім і зразумелым яму – сялянскаму сыну, які разам з усімі абяздоленымі верыў абяцанням пра знішчэнне несправядлівасці жыцця. Іншая рэч – пазіцыя аўтара-творцы, якую ён прымае ў дачыненні да чытача, і тая мэта, якой ён жадае дасягнуць. Тут трэба нагадаць, што ад рэвалюцыі 1917 года да напісання рамана «Віленскія камунары» прайшло 15 год. За гэты час пісьменнік меў магчымасць пераасэнсаваць гэту значную гістарычную падзею, супаставіць спадзяванні з вынікамі, абяцанні з рэальна дасягнутым, а самае галоўнае, усвядоміць усё гэта праз уласны лёс, які быў не надта літасцівы да яго (за 15 год пісьменнік быў двойчы арыштаваны: першы раз белапалякамі за пракамуністычную дзейнасць, другі раз камуністамі па падазрэнні ў антысавецкай дзейнасці). Такая школа жыцця ўнесла сур'ёзныя карэктывы ў разуменне М. Гарэцкім сутнасці рэвалюцыйных падзей, і дзеля таго, каб паказаць сапраўдную рэвалюцыю, а не глянцавае гістарычнае апісанне, аўтару-творцу і спатрэбіўся вобраз Мацея Мышкі, чалавека, які прадстае перад чытачом часам дзіваком, часам прайдзісветам, а часам нават і героем. Гэта ўдалая знаходка пісьменніка-прафесіянала, бо, па словах М. Бахціна, «раманіст мае патрэбу ў нейкай істотнай фармальна-жанравай масцы, якая вызначыла б як яго пазіцыю, так і пазіцыю для апублікавання жыцця. Тут якраз маскі блазна і дурня, канечне, розным чынам трансфармаваныя, і прыходзяць раманістам на дапамогу... Вельмі важны момант пры гэтым – непрамое, пераноснае значэнне вобраза чалавека, суцэльная іншасказальнасць яго» [1, с. 311].

Безумоўна, мы не можам лічыць Мышку ні цалкам блазнам, ні дурнем, але пэўная шматграннасць вобраза (бо, на самой справе дзеянням Мышкі складана даць адназначную ацэнку) падводзіць чытача да разумення, што пісьменнік уступае з ім у пэўнае сумоўе, стварае нейкую сваю «падзею», якая ў дастатковай ступені адрозніваецца ад

хрэстаматыйнага апісання рэвалюцыі гісторыкамі. Уменне ўбачыць наяўнасць гэтай другой «падзеі», усведамленне «непрамога» значэння вобраза галоўнага героя, разуменне таго, што аўтар і чытач знаходзяцца ў розных часе і прасторы ў дачыненні да твора, і з'яўляецца ключом да правільнага разумення стылю М. Гарэцкага ў «Віленскіх камунарах».

У рамане «Віленскія камунары» ўзнікае шматузроўневасць тэксту, так званая дваякая падзейнасць апавядальнай структуры, дзе паралельна з гісторыяй (сюжэтам) самога рамана падтэкстава, завуалявана, паказваецца гісторыя сапраўдная. Такім чынам мы можам сачыць за дзвюма падзеямі: падзеямі рамана і падзеямі-фактамі гісторыі. Менавіта такое супастаўленне і выводзіць нас да разумення аўтарскай канцэпцыі.

Маўленне героя выглядае маналагічным толькі фармальна. Чытач увесь час адчувае аўтарскую пазіцыю, чуе інтанацыю М. Гарэцкага, які «даручае» персанажу расказаць пра ўласна перажытае і асэнсаванае. М. Гарэцкі фактычна стварае дзве рэальнасці, два планы, дзве падзеі – «ідавочнае» і «рэальнае». Першае – пастка для шэраговага чытача, другое – тое балючае, нацыянальна-адраджэнцкае, што хацеў акцэнтаваць М. Гарэцкі.

Калі задацца пытаннем аб мэце аўтара пры выкарыстанні падобнай стылістыкі, можна прыйсці да наступнага тлумачэння: Мышка – асоба, якая знаходзілася ў эпіцэнтры нацыянальных і рэвалюцыйных падзей, чалавек, які не пераасэнсоўвае, а дзейнічае ў экстрэмальных абставінах (яму няма часу думаць, што добра, а што дрэнна, што карэктна, а што не, бо для яго стаіць адна задача – выжыць). Ён апавядае, як усё адбывалася, з пазіцыі звычайнага бедняка, што некалі «паехаў у пралетарыі»; голас М. Гарэцкага ж (яго свядомасць) прыводзіць нас да разумення таго, якім коштам здабывалася пралетарыямі доўгачаканая свабода і роўнасць; з улікам набытага жыццёвага і гістарычнага вопыту ён быццам бы ўступае ў сумоўе з чытачом і гаворыць: паглядзіце, а яны ж, гэтыя маладыя і шчырыя рэвалюцыянеры, не ведалі, што рабілася ў кулуарах вялікіх палітыкаў. Можна сказаць, што голас М. Гарэцкага – гэта голас недалёкай паслярэвалюцыйнай гісторыі, голас Мышкі – голас рэальнага «маленькага чалавека» таго часу.

Такім чынам, прысутнасць аўтара, або «другой свядомасці» ў рамане ідавочная. З аднаго боку, мы бачым мастацкі твор з яго па-

дзейнай напоўненасцю, з другога – разумеем тую рознасць, якая існуе паміж мастацкім творам і рэальным фактам. Атрымліваецца, што падзеі ўвабралі ў сябе не толькі атмасферу рэвалюцыйнай эпохі, але і жыццёвы вопыт пісьменніка больш позніх часоў. Гэта дае падставу сцвярджаць: «падзея самога аповеду» больш шырокая, чым «падзея, пра якую апавядаецца».

І менавіта гэты кантраст прыводзіць да адчування ў рамане двух удзельнікаў, двух герояў, дзвюх «свядомасцей» – наратара Мышкі і пісьменніка М. Гарэцкага. Важна падкрэсліць, што без супастаўлення гісторый жыцця аўтара і героя немагчыма правільнае прачытанне твора.

М. Гарэцкі стварае такую літаратурную прастору, якая дае нам магчымасць не толькі быць удзельнікамі складанай літаратурнай падзеі пад назвай «твор», але і прыводзіць да разумення таго, што неабходна схіліцца да аналізу не толькі падзей унутры сюжэта, але і вынесці гэтыя падзеі за межы твора ў гістарычны кантэкст.

Спрыяе такой «двайной падзейнасці» незвычайны, сінкрэтычны, «рухомы» жанр рамана «Віленскія камунары», у якім спалучаюцца рысы пісьма паслядоўна-хранікальнага, апісальнага, своеасаблівай сямейнай сагі, а таксама авантурна-прыгодніцкага, плутаўскога, і разам з тым рэалістычнага, з тыповымі вобразамі і сітуацыямі, з сацыяльнай дэтэрмінаванасцю і гістарызмам.

Наяўнасць гэтых асаблівасцей, «двайная падзейнасць» апавядальнай структуры рамана і стылёвая паліфанія робяць раман М. Гарэцкага «Віленскія камунары» ўнікальным, што яшчэ раз пацвярджае меркаванне М. Бахціна: «аўтар гаворыць не толькі ад свайго імя, але і прымушае розныя моўныя выказванні ўзаемадзейнічаць адно з адным. Раманнае выказванне, такім чынам, шматлікае па сваёй сутнасці» [2, с. 65]. А гэта наводзіць на думку, што раман М. Гарэцкага «Віленскія камунары» можа быць удалым прыкладам для выкарыстання канцэпцыі інтэртэкстуальнасці пры яго аналізе.

Літаратура

1. Бахтин, М. Вопросы литературы и эстетики / М. Бахтин. – М. : Худож. лит., 1975. – 502 с.

2. Пьеге-Гро, Н. Введение в теорию интертекстуальности / общ. ред и вступ. ст. Г. Косикова; пер. с фр. – М. : Издат. ЛКИ, 2008. – 240 с.

3. Шмид, В. Нарратология / В. Шмид. – М. : Языки славянской культуры, 2003. – 312 с.

Тацццяна Дасаева
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

«ЧУЕ НА ГУК І НА ВОБМАЦАК РОДНАЕ СЛОВА…» (Галіна Гарэцкая: лёс і творчасць)

Галіна Гарэцкая ўвайшла ў гісторыю нацыянальнай культуры не толькі як дачка класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага, але і як аўтар успамінаў «Наша сям'я», літаратурных артыкулаў, нарысаў, тэксталагічных каментарыяў. Лёс Галіны Гарэцкай драматычны, напоўнены суровымі выпрабаваннямі. Яна рана стала дарослай. Галі не споўнілася яшчэ і года, калі ў Вільні, дзе жыла сям'я Гарэцкіх, з 19 на 20 студзеня 1922 г. польскімі ўладамі быў упершыню арыштаваны яе бацька. Памятаць пра гэта яна не магла. Пазней пачула ад матулі, прачытала ў бацькавым творы «Камароўская хроніка». Наступныя арышты бацькі ўрэзаліся ў памяць назаўсёды. Галі было 9 гадоў, калі ў Мінску (сюды пераехала сям'я Гарэцкіх у канцы кастрычніка 1923 г.) з 18 на 19 ліпеня 1930 г. Максіма Гарэцкага зноў арыштавалі. Фактычна тады і скончылася яе дзяцінства. Па сфабрыкаваным абвінавачванні Максіма Гарэцкага асудзілі на пяць гадоў і выслалі ў Вятку. Жыццё сям'і рэпрэсаванага было складаным як у маральным, так і ў матэрыяльным плане.

Ужо з той пары Галя Гарэцкая адчула цяжар выпрабаванняў, якія выпалі на долю горача любімых ёю бацькоў і малодшага брата, і стала першай памочніцай маці. Так было ўсё жыццё, пакуль яны былі разам. У лістах, звяртаючыся да дачкі, Максім Гарэцкі пісаў: «Маладзец, што ты пасабляеш маці і насіла заказную бандэроль» (з ліста ад 4.01.1932 г.) [4, с. 432]. Пяшчотай прасякнуты і наступныя радкі: «Галінка, дачушка мая любая! Што ж гэта ў цябе плечкі няроўныя? Можа, мы вінаваты, а можа, ты сядзіш у школе няправільна. Старайся сядзець, пішучы і чытаючы, роўненька. Але нічога, не клапаці. У мяне правае плячо ніжэйшае – жыву. Што ты зробіш… І ты, Лёня, галубок, старайся сядзець роўненька. Сумна мне, падумаўшы, што не магу памагчы вам нічым» (з ліста ад 26.02.1932 г.) [4, с. 440].

«Бацька адмаўляў сабе ва ўсім і пасылаў з Вяткі грошы нам і бацькам у вёску, хоць мама і прасіла не трывожыцца за нас… Колькі сілы мела маці! Хадзіла на працу, пісала апавяданні, нарысы, пераклады. А дома дзеці. Трэба накарміць, дагледзець. Калодзеж не блізка, дроў мала, прадуктаў не хапае… І ўсё ж спяваць любіла,

толькі песні сумныя пяяліся» [3, с. 38], – напісала праз многа гадоў у сваіх успамінах «Наша сям'я» Галіна Максімаўна, захапляючыся мужнасцю бацькоў.

Менавіта ў гэтым дакументальна-мастацкім творы Галіна Максімаўна расказала пра перажытае сям'ёй Гарэцкіх. Трагічнае светаадчуванне выявілася ў яе вельмі рана, таму такой абвостранай была яе памяць, якая захавала да драбніц усё тое няўлоўнае для староннняга вока і дарагое для яе, звязанае з бацькам, якога гвалтоўна адарвалі ад сям'і, творчай працы; і маці, якая раздзяліла з мужам усе выпрабаванні, паехала да яго разам з дзецьмі летам 1932 г. у месца высылкі, каб не быў ён адзінокім, каб дзеціраслі і выхоўваліся ў поўнай сям'і, адчуваючы любоў і клопат бацькоў. За ўсё гэта Галіна Максімаўна была ўдзячная ім абодвум.

Нягледзячы на голад, неўладкаванасць побыту, там, у Вятцы, яны былі шчаслівымі, бо былі разам, адчувалі ўзаемную падтрымку, вялікую любоў адзін да аднаго. Лаканічна і стрымана, іншы раз нават з гумарам, пісала Галіна Максімаўна пра цяжкасці. Затое вельмі падрабязна, з цеплынёй і пяшчотай, апавядала пра хвіліны, калі побач быў бацька. Успаміны пра гэтыя імгненні саграваюць яе ўсё жыццё. Бацька вадзіў Галю і Лёню на прагулкі, любіў фантазіраваць, напрыклад, расказваў цікавыя гісторыі пра марсіян, аднойчы прыдумаў з Лёнем марсіянскую песню, а потым спявалі яе ўдвух; іграў на скрыпцы, балалайцы, зімнімі марознымі вечарамі паказваў дзецям сузор'і і зоркі, вучыў знаходзіць найбольш вядомыя. Максім Гарэцкі прывучаў дзяцей да самастойнасці, падтрымліваў іх творчыя здольнасці: развіваў схільнасць Лёні да канструявання, малявання, спорту; Галі раіў пісаць невялікія сачыненні, настойліва прасіў весці дзённік. Леаніла Усцінаўна і Максім Гарэцкі цешыліся, што іх дзеці добра вучацца, удзельнічаюць у грамадскім жыцці. «Як я цяпер разумею, – заўважыла Галіна Максімаўна, – радавала бацькоў маіх, што лёс, які выпаў сям'і нашай, не перашкодзіў належнаму выхаванню дзяцей, не адбіўся на ім» [3, с. 44].

Пасля адбыцця пяцігадовага тэрміну пакарання Максім Гарэцкі не вярнуўся з сям'ёй на Беларусь, застаўся у Расіі. Жылі ў пасёлку Пясочня Кіраўскай вобласці. Аднак выпрабаванні на гэтым не скончыліся. З 3 на 4 лістапада 1937 г. Максіма Гарэцкага зноў арыштоўваюць. 16 гадоў было тады Галі, Лёню – 15. Дзеці бачылі свайго бацьку апошні раз. Леаніла Усцінаўна пабачыла мужа

яшчэ 21 снежня 1937 г., калі Максіма Гарэцкага разам з іншымі арыштаванымі перавозілі з Кірава-Пясочні ў Вязьму. 8 студзеня 1938 г. яна прыехала ў Вязьму, каб атрымаць дазвол на перадачу мужу. Дазвол атрымала, перадала бялізну, цукар, махорку. У адказ Максім Гарэцкі даслаў апошнюю кароценькую запіску (яе захавала Галіна Максімаўна).

У лютым 1938 г. Леаніла Усцінаўна вярнулася ў горад Кіраў (былую Вятку). Крыху пазней, у гэтым жа годзе, Галя і Лёня паехалі ў Ленінград, паступілі на вучобу: Галя ў Ленінградскі педінстытут імя А. І. Герцана, дзе «вучылася ў мансійскай групе паўночнага аддзялення» [3, с. 58], Лёня – у Ленінградскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум.

Толькі 1 лістапада 1939 г. на шматлікія запыты Леанілы Усцінаўны пра лёс мужа ёй далі вусны адказ, што ён памёр 20 сакавіка 1939 г. у пасёлку Важаэль Комі АССР.

Вялікую Айчынную вайну Галіна Гарэцкая сустрэла ў 20-гадовым узросце. «Мне цяжка вайна далася. Летам 1941 г. прабыла на акопах пад Ленінградам, а ў канцы 1943 – пачатку 1944 г. працавала (у школе) блізка ад лініі фронта (пад Вялікімі Лукамі). Многа чаго наглядзелася, нацярпелася», – прызналася Галіна Максімаўна ў адрасаваным мне лісце ад 13.07.1997 г. 19-гадовага Лёню летам 1941 г. мабілізавалі ў армію. У 1944 г. ён загінуў пры прарыве блакады Ленінграда. Аб смерці брата Галіна Гарэцкая даведалася з ліста Леанілы Усцінаўны ад 21.04.1944 г. «Галя, забіты наш Лёня! Адна ты ў мяне засталася. Беражы сябе. Потым напішу падрабязней. Ён забіты 18 лютага, любы мой сыночак. Цалую і абдымаю моцна. Не можам мы і паплакаць разам» [1, с. 222]. Гарэцкія ўмелі падтрымліваць, супакоіць адзін аднаго ў цяжкія перыяды жыцця, а калі адбывалася непапраўнае, мужна пераносіць страты. Можна сказаць, што цяпер у сям'і Гарэцкіх Галіна стала галоўнай. Было ёй тады толькі 23 гады. У пасляваенны перыяд яна «была настаўніцай, а пасля цяжкай аперацыі працавала рэгістратарам у паліклініцы» [3, с. 58]. У 1947 г. Леаніла Усцінаўна пераедзе да дачкі ў Ленінград.

3 студзеня 1957 г. Галіна Максімаўна паслала заяву ў Пракуратуру СССР з просьбай аб пасмяротнай рэабілітацыі Максіма Гарэцкага. Яна робіць спробу даведацца пра месца і прычыну смерці бацькі. На афіцыйны запыт у пасёлак Важаэль атрымлівае паведамленне, што ў спісах зняволеных Максіма Гарэцкага няма. У 1958 г.

у Ленінградзе ёй уручылі пасведчанне аб смерці ад 2 ліпеня, дзе паведамлялася, што Максім Гарэцкі памёр 20 сакавіка 1939 г. ад кровазліцця ў мозг [5, с. 98–99].

Пасля незваротных страт (смерці бацькі і брата) галоўнай справай жыцця Галіны Максімаўны стала ўпарадкаванне і падрыхтоўка да выдання творчай спадчыны Максіма Гарэцкага. Спачатку яна займалася гэтым разам з маці. Яны прынялі рашэнне перадаць на захаванне матэрыялы сямейнага архіва Максіма Гарэцкага ў аддзел рукапісаў і рэдкай кнігі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа АН БССР (фонд 7). 26 верасня 1976 г. Леаніла Усцінаўна Чарняўская, восем гадоў прыкутая да ложка, памерла. Галіна Максімаўна засталася адна.

Калі на пачатку 80-х г. XX ст. на дзяржаўным узроўні было прынята афіцыйнае рашэнне аб выданні творчай спадчыны Максіма Гарэцкага, Галіна Максімаўна пачала актыўна супрацоўнічаць з Інстытутам літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, дзе група тэкстолагаў прыступіла да вывучэння архіўных матэрыялаў Максіма Гарэцкага. У складзе гэтай групы пашчасціла быць і мне. Я рыхтавала да выдання «Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага». Вось тады я ўпершыню сустрэлася з Галінай Максімаўнай. Яна стала для мяне блізкім і дарагім чалавекам. Галіна Максімаўна была цікавым і ўважлівым суразмоўцам. Усё, пра што яна апавядала, захапляла, бо было напоўнена яркімі дэталямі, вызначалася змястоўнасцю і глыбінёй. Ад яе я шмат даведалася, многаму навучылася. Пачаліся сустрэчы і перапіска.

Галіна Максімаўна прыязджала ў Мінск. Мы гадзінамі сядзелі над тэкстам «Летапісу», удакладнялі ўсё да драбніц. Праца наша працягвалася і падчас перапіскі. Іншы раз у лістах Галіны Максімаўны было толькі пару абзацаў, адрасаваных непасрэдна мне. Усё астатняе тычылася «Летапісу». Як лейтматыў гучалі словы ўдзячнасці за зробленую працу і пажаданне-просьба ўнесці праўкі ў падрыхтаваны тэкст. «Прагледзела я «Летапіс» у 4-м томе. Шчыра дзякую Вам за ўсё, што Вы зрабілі і яшчэ зробіце, каб быў ён поўным, цікавым і дакументальна бездакорным», – пісала яна ў лісце ад 26.11.1987 г. Далей ішлі праўкі, удакладненні і новыя факты. Усё гэта я потым уключала ў «Летапіс», пастаянна папаўняла яго. Я многаму навучылася ў Галіны Максімаўны, але дасягнуць той дасканаласці ў тэксталагічнай працы, якой валодала яна, было проста немагчыма.

Па волі лёсу мы сталі сведкамі знамянальнай падзеі. Дзякуючы працэсам дэмакратызацыі, якія адбываліся ў грамадстве, пляменнік пісьменніка Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі атрымаў магчымасць азнаёміцца са справай № 13036, якая была заведзена на Максіма Гарэцкага ў сувязі з яго апошнім арыштам у г. Кіраве. У пасведчанні аб смерці, выдадзеным у 1992 г., пазначана, што Гарэцкі М. І. памёр 10 лютага 1938 г. Прычына смерці – «расстраляны». Месца смерці – «невядомае» [5, с. 41]. На падставе архіўных дакументаў Радзім Гаўрылавіч напіша і апублікуе ў газеце «Літаратура і мастацтва» (1992, 9, 16 кастрычніка) артыкул «Расстрэл Гарэцкага». Як бачым, сапраўдная дата смерці Максіма Гарэцкага стала вядомай толькі праз 54 гады пасля таго, як ён пайшоў з жыцця. Дачцэ пісьменніка яшчэ раз давядзецца перажыць смерць бацькі, даведацца пра падрабязнасці апошняга арышту, допытаў, жахлівага прысуду. Душэўнае ўзрушэнне, боль ад перажытага былі настолькі моцнымі, што па стану здароўя Галіна Максімаўна не змагла прыехаць з Ленінграда на святкаванне 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага, якое адбылося ў Горках у лютым 1993 г.

Як найвялікшую каштоўнасць захоўваю лісты Галіны Максімаўны. Люблю перачытваць іх. Мне здаецца, што ў лістах яна адкрылася мне найбольш поўна. Сустрэчы з Галінай Максімаўнай былі не такія частыя, як нам хацелася, а ў лістах адлюстроўвалася тое, што жыло ў нашых душах.

За ўважлівыя адносіны да творчай спадчыны Максіма Гарэцкага, да роду Гарэцкіх Галіна Максімаўна не стамлялася выказваць удзячнасць, як, напрыклад, у наступных фрагментах з лістоў да мяне: «Найвялікшы Вам дзякуй за «Летапіс…» і цікавы, сардэчны, падрабязны ліст ад 3.03.93 г. А яшчэ – за ўдзел у Гарэцкіх чытаннях, за ўніверсітэцкія лекцыі пра Максіма Гарэцкага і арганізацыю прагляду кінафільма “Максім Гарэцкі”» (з ліста 30.03.1993 г.). «Вельмі ўдзячная, што слухалі Вы па радыё перадачу пра кнігу «Народныя песні з мелодыямі», пра бабулю маю Ефрасінню Міхайлаўну. Шкада, што не задалося нам больш пагаварыць, што не пачула я Ваш болей падрабязны расказ пра гэтую перадачу. А не напішы Вы, я нічога пра яе і не ведала б. Колькі Вы мне радасці прынеслі, суцяшэння!» (з ліста ад 18.03.1998 г.).

Яна ўмела суперажываць. Вельмі спачувала, калі ў 1995 г. я страціла свайго тату, хораша адзывалася пра зборнік яго вершаў «Ля

падножжа маіх святынь», хваліла мяне за тое, што я пачала парадкаваць літаратурны архіў свайго бацькі. У лісце ад 12.05.1996 г. Галіна Максімаўна напісала: «Дарагая Таня! Хачу яшчэ раз падзякаваць Вам за дарагі мне падарунак – кнігу Міколы Жука, бацькі Вашага, «Ля падножжа маіх святынь». Кожны верш знайшоў у душы маёй водгук, дайшоў да самага сэрца. Так хочацца, каб было надрукавана ўсё, што пакінуў нам Мікалай Андрэевіч. Высакародны, таленавіты, ён стаў духоўна блізкім мне чалавекам. Ды, вядома ж, не толькі мне».

Нерэалізаванасць асабістага жыцця, адсутнасць уласнай сям'і, дзяцей не зрабілі яе чэрствай, абыякавай. У ёй жылі нерастрачаныя мацярынскія пачуцці, якія мы, хто быў з Галінай Максімаўнай, адчувалі на сабе. Яна радавалася нашым поспехам, любавалася нашай маладосцю.

Мне здаецца, што Галіна Максімаўна ўспрымала нас як сваіх дзяцей, а нашых дзяцей – як сваіх унукаў, а інакш адкуль такая цеплыня, шчырасць, замілаванасць, пяшчота... Хочацца верыць, што і яе саграваці нашыя любоў, сардэчнасць, адкрытасць, моцная прывязанасць да яе, давер. Спадзяюся, што было гэта для Галіны Максімаўны важным (адчула па яе лістах), бо яна, такая мужная, моцная, была адначасна безабароннай, адзінокай, ранімай.

Іншы раз Галіна Максімаўна выказвала свой смутак, спавядалася: «IV-я Гарэцкія чытанні прайшлі, на мой погляд, добра. Уражанняў, вядома, многа. Многа і ўдзячнасці да іх арганізатараў і да ўсіх, хто прыняў удзел у гэтых чытаннях. Некаторы смутак у маёй душы ўсё ж узнік і трымаецца. Можа таму, што пабывала я ў мясцінах, дзе многае напомніла мне маё дзяцінства (Горкі, М. Багацькаўка), напомніла блізкіх, дарагіх мне людзей, якіх ужо няма. Сумна, што вельмі ж знямоглай стала стрыечная бацькаўская сястра Клаўдзя, што і сама я ўжо не такая, якой была нават год таму назад, на III-іх чытаннях» [ліст ад 13.07.1997 г.].

Асабліва дарагім з'яўляецца для мяне ліст ад 13.07.1997 г., у якім Галіна Максімаўна пад уражаннем ад прачытаных вершаў майго бацькі, Мікалая Андрэевіча Жука, успамінала пра брата Лёню, які загінуў на вайне, пра матулю: «Учора быў у мяне дзень успамінаў. Чытала «Ля падножжа маіх святынь», адчула моцную ўдзячнасць да паэта за тое, што ўсё жыццё помніў ён загінуўшых на вайне, стараўся ўшанаваць іх памяць: «Загінулі ў бітвах суровых, а з думак маіх не ідуць».

А як добра разумеў Мікалай Андрэевіч гора матак, якія згубілі сыноў сваіх на вайне: «Даўно ў магілах спяць салдаты, а маткі іх жывымі сняць…».

Я помню, як незадоўга перад смерцю мама трохі задрамала пад вечар, а як прачнулася, сказала мне з прасветленым тварам: «Бачыла ў ва сне цябе і Лёню, маладымі, у шэранькіх джэмпярочках. Рада была хоць так, у ва сне, пабачыць забітага на вайне сына».

Галіна Максімаўна вяла аскетычны лад жыцця: строгае адзенне някідкіх колераў (галоўнае, каб было зручным, практычным); простая стрыжка (звычайна хадзіла з грабенчыкам у валасах); харчаванне як неабходнасць (не да прысмакаў было). На ўсіх этапах свайго жыцця Галіна Максімаўна ведала, што такое нястача, нават голад, абмежаванасць матэрыяльных сродкаў, таму жыла сціпла, эканомна, мела толькі самое неабходнае. Пра матэрыяльныя цяжкасці ўласнага побыту гаварыць не любіла.

На пытанне, хто ёй дапамагае, адказала так: «Дапамога мне пакуль што не патрэбна. Жыву дружна з нашчадкамі дзядзькі майго – Івана Гарэцкага, а таксама з сяброўкамі маімі старымі. Ёсць з кім падзяліцца, сустрэцца. Спраўляем дні нараджэння, праведваем блізкіх сваіх на могілках, сустракаемся на святы, часам і ў буднія дні. На вялікі жаль, наш дружны калектыў пачаў радзець: у апошнія гады некалькі чалавек памерлі ад розных хвароб» (ліст ад 10.10.1995 г.).

У выяўленні пачуццяў Галіна Максімаўна была стрыманай, а калі адкрывалася – колькі ў ёй было маладога тэмпераменту, рамантычных усплёскаў эмоцый! Стрыманасць зыходзіла ад яе самой. Яна нібыта рабіла ўстаноўку: немагчыма быць шчаслівай, калі столькі пакут выпала на долю яе родных і блізкіх. За стрыманасцю хавала несціханы боль. Адкрывалася не кожнаму, а толькі тым, да каго адчувала давер, прыязнасць.

Дабрыня, спагадлівасць спалучаліся ў Галіны Максімаўны з прынцыповасцю, бескампраміснасцю. Першае выяўлялася ў адносінах да людзей, якіх яна добра ведала, якім давярала, якіх любіла. Другое – да тых, з кім разыходзілася ў поглядах на жыццё, творчасць, маральныя нормы. З апошнімі не хацела мець ніякіх стасункаў. У гэтым бачыцца спадчынная рыса Гарэцкіх. Па словах Галіны Максімаўны, Максім Гарэцкі, «з тымі нямногімі, хто не падабаўся яму, ніякіх адносін не меў. Да апошніх гадоў гэтай рысе свайго характа-

ру не здрадзіў. Людзей шанаваў, добра адносіўся да ўсіх, з кім прыходзілася жыць, працаваць, сустракацца» [3, с. 33].

Літаратурны талент Галіны Максімаўны адзначалі ўсе, хто яе ведаў. Ён выявіўся ў яе ўспамінах, артыкулах, нарысах, тэксталагічных каментарыях, нарэшце, у яе лістах. Гэта была таксама спадчынная рыса па бацькоўскай і мацярынскай лініях. Як трапна заўважыў Максім Лужанін, Галіна Максімаўна «чуе на гук і на вобмацак роднае слова, і так яго падае, што возьмеш скупыя радкі ўспамінаў і не адарвешся» [6].

У калейдаскопе жыццёвых малюнкаў, адлюстраваных ва ўспамінах «Наша сям'я», Галіна Максімаўна вылучае постаці бацькі, маці, брата. Асабліва бацькі. Дакладнымі, выразнымі мазкамі стварае яна партрэт Максіма Гарэцкага, раскрывае яго духоўны свет. Кожнае яе слова напоўнена пяшчотай, замілаваннем. Напрыклад, у эпізодзе, дзе згадваецца, як Максім Гарэцкі з дачкой ехаў у Багацькаўку: «Раніцай прыехалі ў Смаленск. Пайшлі ў горад… Насустрач групкамі і па адным чырвонаармейцы. Некаторыя мне падмігваюць: «Гэй, курносая!» Глянула сарамліва на бацьку, а ён ідзе справа побач, стройны, дужы і ўсміхаецца. У сінім шавіётавым касцюме, белай летняй фуражцы. Вышэй сярэдняга росту быў, вочы карыя, даволі вялікія, хоць і глыбокія. Усмешка прыгожая, добрая. Сорак тры гады было яму, а мне пятнаццаць» [3, с. 50]. І яшчэ пра адно наведванне Багацькаўкі: «З канца саду ішоў да мяне бацька, энергічны, любы мне» [3, с. 57].

Вялікая любоў да бацькі дазваляла Галіне Максімаўне адчуваць яго настрой, прадугадваць душэўны стан. Увасобленая ў мастацкім слове, гэтая пранікнёнасць, заглыбленасць асабліва ўражвае. «Помню заўважаны мною, дзяўчынкаю, міг усхваляванасці ў бацькі. Цвіў у Вятцы бэз, і выдаўся цёплы сонечны вечар. Я прынесла аднекуль пышны букет фіялетавага бэзу. Тата ўсё падыходзіў да яго, не гаварыў нічога, а быў неяк радасна ўсхваляваны. Можа ўспомніў што ці проста вясну адчуў» [3, с. 45], – пісала Галіна Максімаўна.

Менавіта дзякуючы ўспамінам Галіны Максімаўны, разам з успамінамі іншых людзей, постаць Максіма Гарэцкага паўстае ва ўсёй шматграннасці. І самыя тонкія грані, і глыбінныя рысы характару раскрыла менавіта дачка пісьменніка. Тое ж можна сказаць і ў дачыненні да паказу духоўнага свету Леанілы Усцінаўны Чарняўскай, Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага, брата Лёні.

У дакументальна-мастацкай прозе Галіны Гарэцкай праступаюць і адметныя рысы самой аўтаркі: паэтычнасць натуры, здольнасць адчуваць навакольны свет ва ўсім багацці фарбаў, адценняў, гукаў, як, напрыклад, у фрагменце ўспамінаў, дзе Галіна Максімаўна перадае дзіцячыя ўражанні, што засталіся ад Горак. Там сям'я Гарэцкіх пражыла два шчаслівыя гады: «Запомніліся Горкі мноствам кветак. Адзін раз хадзілі з бацькам туды, дзе іх было цэлае мора, чырвонабарвовае… Каля дома нашага, як выйсці, ад ганка справа і злева за дом – вялікі кветнік быў. Луг насупраць дома бываў ружовы ад маргарытак, і ў летні ясны ранак я ўлоўлівала ў паветры над імі ледзь чутную дзівосную музыку» [3, с. 38]. Адчуванне хараства прыроды, паэтычнасць у самыя цяжкія хвіліны жыцця вярталі Галіне Максімаўне душэўную раўнавагу, надавалі моц яе характару.

Стылю літаратурных твораў Галіны Максімаўны ўласцівы лаканізм, дакладнасць, яркасць мастацкай дэталі, ёмістасць слова, лексічнае багацце, адметны сінтаксіс. Сама Галіна Максімаўна адмяжоўвала сябе ад паняццяў «літаратурны талент», «творчасць», «літаратуразнаўчая праца», тым больш ад прызнання яе заслуг. А яна ж была бібліёграфам, тэкстолагам, літаратуразнаўцам, мовазнаўцам, фалькларыстам, празаікам у адной асобе. Галіна Максімаўна катэгарычна адмовілася ад прапановы ўступіць у Саюз пісьменнікаў Беларусі. У гэтым выявіліся яе неверагодная сціпласць, вялікая патрабавальнасць да сябе – спадчынныя рысы роду Гарэцкіх.

Яна была вельмі далікатнай і разам з тым магла сказаць у вочы не вельмі прыемныя, але справядлівыя словы, выказаць сваё меркаванне публічна ў друку. Абурэнне Галіны Максімаўны выклікалі, напрыклад, публікацыі, якія тычыліся яе бацькоў, дзе былі дапушчаны недакладнасці, памылкі, скажэнне фактаў. Аднойчы яна напісала мне: «Радзім прыслаў 2-гі том «Энцыклапедыі Беларусі», дык там маці мая прадстаўлена як мужчына. У артыкуле пра Бягомльскі музей народнай славы (с. 159) сказана: «Сярод экспанатаў музея матэрыялы пра беларускіх пісьменнікаў П. Панчанку, Ю. Свірку, А. Ставера, Л. Чарняўскага….». У пачатку 70-х гадоў мы паслалі, па просьбе загадчыка музея, некаторыя матэрыялы для экспазіцыі. Спадзяюся, што ператварэнне Л. Чарняўскай у Л. Чарняўскага адбылося толькі ў энцыклапедыі» [ліст ад 10.10.1995 г.].

Права на такую крытыку Галіна Максімаўна заслужыла дакладнасцю, выверанасцю ўласных матэрыялаў, падрыхтаваных ёю для

апублікавання. Разважаючы пра спадчынныя рысы роду Гарэцкіх, Галіна Максімаўна найперш успамінала бацькаву маці, «любую бабу багацькаўскую» [3, с. 24]. «Бацька лічыў, – пісала яна, – што моц духоўную ў цяжкім жыцці прыдавала Ефрасінні Міхайлаўне не вера ў Бога, а паэтычнасць яе душы, веданне стольхіх песень, народных абрадаў, здольнасць адчуваць хараство іх, і хараство прыроды» [3, с. 27]. Паэтычнасць натуры ўласцівая ўсім Гарэцкім. Іх аб'ядноўвае любоў да народнай творчасці, мастацтва, адчуванне хараства прыроды. Гэта не толькі аснова іх духоўнай і фізічнай моцы, але і выдатных прафесійных дасягненняў, літаратурнага таленту.

Галіна Максімаўна ганарылася прыналежнасцю да роду Гарэцкіх, падтрымлівала цесныя сувязі з роднымі. Асабліва любіла бацькавага брата Гаўрылу Іванавіча і яго сям'ю. Гаўрыла Іванавіч таксама прайшоў праз рэпрэсіі (цудам застаўся ў жывых), а яго сям'я зведала цяжкія выпрабаванні. Сем'і братоў Гарэцкіх сябравалі, падтрымлівалі адна адну. Пасля смерці Максіма Гарэцкага Гаўрыла Іванавіч, па-сутнасці, быў для яго дзяцей Галі і Лёні як родны бацька. Варта толькі прачытаць лісты Лёні Гарэцкага з фронта да дзядзькі, і ўсё адразу становіцца відавочным.

Галіна Максімаўна прысвяціла Гаўрылу Іванавічу Гарэцкаму – акадэміку АН БССР, сусветна вядомаму вучонаму ў галіне геалогіі – твор «Дзядзька Гурык», у якім раскрыла сваю любоў да дзядзькі і любоў Максіма Гарэцкага да брата. Кожнае слова тут прасякнута любоўю да роднага чалавека. Чаго варты адзін толькі сказ: «Імя Гурык так і засталося за ім для блізкіх яго на ўсё жыццё. Каму – дзядзька Гурык, каму быў проста Гурык, а найбліжэйшыя і цяпер скажуць – Гурэечка» [2].

Галіна Максімаўна апавядала, як у 1951 г. разам з матуляй «выправілася з Ленінграда ў Растоў-на-Доне, далей плылі двое сутак на параходзе» [2], каб трапіць у станіцу Раманаўскую пагасцяваць у сям'і дзядзькі. Відаць, Гаўрыла Іванавіч хацеў, каб вандроўка хоць на пэўны час адцягнула ўвагу дарагіх яго сэрцу людзей ад перажытага, якое балела і яму. Па словах Галіны Максімаўны, «кіраваў ён тут інжынерна-геалагічнымі вышукваннямі, што папярэднічалі будаўніцтву Цымлянскага гідравузла, а таксама стварэнню Цымлянскага вадасховішча» [2]. Падчас той вандроўкі Галіне было толькі 30 гадоў. Маладая, прыгожая, разумная дзяўчына, за плячыма якой столькі гора і роспачы. Але трэба было стрымліваць пачуцці,

каб ненарокам не патрывожыць матулю, засцерагаць яе ад цяжкіх успамінаў.

У творы «Дзядзька Гурык» ёсць невялічкая пейзажная замалёўка, напоўненая глыбокім падтэкстам. Яна не толькі перадае душэўны стан Галіны Гарэцкай, але і вытлумачвае «загадку» духоўнай моцы Гарэцкіх. «Хмурным днём выйшлі ўпершыню ў данскі стэп, і раптам я пабегла. Расхінула пахучае травамі паветра, пакуль не здаволілася. Адчула стэпавы прастор. Цудоўнае было паветра, гаючае. Можа і яно прыдавала дзядзьку Гурыку нястомныя сілы» [2], – пісала Галіна Максімаўна. Новыя мясціны, бязмежнасць стэпу, уражанні ад незвычайнай, поўнай рамантыкі і таямнічасці, працы дзядзькі Гурыка, які здабываў «скарбы зямлі» – усё гэта вярнула Галіне Гарэцкай душэўную раўнавагу, надало фізічнай моцы, абудзіла новыя пачуцці. Яна наблізілася да дзядзькі Гурыка: глыбей спасцігла яго чалавечую сутнасць, пранікласся яго працай, адчула яго трывалую сувязь з «родным карэннем» (гэта рыса ўласцівая ўсім Гарэцкім).

Галіна Максімаўна раскрыла багаты духоўны свет Гаўрылы Іванавіча: «Я чула, што дзядзька Гурык дае паэтычныя, як кажуць, былінныя назвы некаторым прарокам. Вось і скажу пра любоў яго да народных спеваў, у прыватнасці, да беларускіх. Будзе слухаць песні па радыё, на канцэртах, будзе сачыць за ўсімі беларускімі фальклорнымі зборнікамі, і таму яшчэ, што неабыякавы да творчасці народнай, і таму, што амаль у кожным з іх ёсць песні, запісаныя калісьці ад яго маці – Ахрасінні Міхайлаўны» [2]. Вось яны, вечныя крыніцы творчасці, – матуля, родная зямля, духоўныя скарбы народа. І ўсе Гарэцкія стаялі ля вытокаў гэтых крыніц.

Апавядаючы пра геалагічныя экспедыцыі Гаўрылы Іванавіча, Галіна Максімаўна з захапленнем адзначала: «Колькі чарговых адпачынкаў выкарыстоўваў дзядзька Гурык для ўсё новых і новых геалагічных пошукаў. Міжволі ў гэтым параўноўваю яго з бацькам маім. Так жа і бацька мой ездзіў, шукаў, ахвяруючы для навукі, для сваёй творчасці кожную часіну. І, мусіць, такая апантанасць, як у іншых, падобных ім, самаадданых сваёй справе людзей, толькі ўзмацняе духоўныя і фізічныя сілы» [2]. Шматграннасць асобы Гаўрылы Іванавіча Галіна Максімаўна дапоўніла яшчэ адным істотным штрыхом: «Ён не ўяўляў сабе паўнацэннага творчага жыцця ў галіне навукі без жывейшай цікавасці ў пытаннях літаратуры і мастацтва» [2].

Саму Галіну Гарэцкую падчас незабыўнай вандроўкі ўразілі ўнікальныя знаходкі геолагаў: «Адзін жаночы бранзалет здзівіў. Варажылі, на чыёй жа такой тонкай руцэ быў ён? З найцікавейшых знаходак – багатая, з унікальнымі каштоўнасцямі, магіла качэўнай жанчыны-воіна, пахаванай разам з канём» [2]. Такая рэакцыя на ўбачанае яшчэ раз засведчыла паэтычнасць натуры Галіны Гарэцкай.

Галіна Максімаўна – яркая прадстаўніца двух радоў: Гарэцкіх і Чарняўскіх. Асабліва выразна выявіліся ў ёй спадчынныя рысы Гарэцкіх, найперш духоўная моц, адданасць свайму роду, высокая чалавечая годнасць, любоў да Бацькаўшчыны, роднай мовы, народнай творчасці, глыбокая ўнутраная культура, літаратурны талент, вытанчанасць пачуццяў, паэтычнасць натуры, мужнасць, прынцыповасць, стрыманасць, любоў да людзей.

Успаміны «Наша сям'я», якія пабачылі свет у 1984 г., завяршаюцца наступнымі словамі Галіны Максімаўны: «Літаратурная спадчына бацькоў маіх засталася жыць. Франтавыя лісты брата былі апублікаваны ў часопісе «Маладосць» № 9 за 1974 год і «Юность» № 4 за 1975 год» [5, с. 58]. Колькі за гэтымі словамі перажытага, выпакутаванага. Колькі падзвіжніцкай працы і вялікай радасці, шчасця ад пачуцця выкананага абавязку.

Творчая спадчына самой Галіны Максімаўны Гарэцкай – неад'емная частка гарэцказнаўства. Выданне яе эпісталярнай спадчыны істотна дапоўніць і ўзбагаціць яго.

Літаратура

1. Адамовіч, Алесь. Браму скарбаў сваіх адчыняю… / Алесь Адамовіч. – Мінск : Выд. БДУ, 1980. – 224 с.

2. Гарэцкая, Галіна. Дзядзька Гурык / Галіна Гарэцкая // ЛіМ. – 1988. – 2 снежня.

3. Гарэцкая, Галіна. Наша сям'я / Галіна Гарэцкая // Максім Гарэцкі : Успаміны, артыкулы, дакументы. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 366 с.

4. Гарэцкі, М. Творы / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 629 с.

5. Гарэцкі, Р. Ахвярую сваім «я» … (Максім і Гаўрыла Гарэцкія) / Р. Гарэцкі. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 287 с.

6. Лужанін, Максім. Духоўная апантанасць (Лёс Максіма Гарэцкага і яго роду) / Максім Лужанін // ЛіМ. – 1991. – 17 мая.

Ксения Дементьева
Мордовский государственный университет им. Н. П. Огарева (Россия)

РЕГИОНАЛЬНАЯ ПРЕССА В СОВРЕМЕННЫХ УСЛОВИЯХ И ЕЕ ВОЗДЕЙСТВИЕ НА ОБЩЕСТВЕННОЕ МНЕНИЕ

Функционирование средств массовой информации в «новых условиях» поменяло медиасистему, по-другому распределив первенство между ее видами – по силе влияния стали лидировать телевидение и Интернет. Но и в сегодняшней России именно газеты остаются необходимым посредником между человеком и мировым и региональным сообществами. По данным ВЦИОМ, две трети россиян думают, что всегда найдутся люди, согласные оплачивать качество и аналитику хороших газет и журналов (66 %).

Газетная периодика – одна из древнейших классических форм средств массовой информации. Сейчас она обладает немалыми самобытными ресурсами быстро, беспристрастно, адекватно или искаженно отражать реальную действительность. Несомненно, важное значение имеет доверие к печатному слову, ставшее традицией. Газета в регионе «служит традиционным, а значит и вызывающим высокий уровень доверия, средством массовой информации» [2, с. 3]. Печатные СМИ имеют достаточно устойчивые позиции, прежде всего потому, что интеграция различных видов информации в одном телевизионном или компьютерном виде не заменяет текста. Также во время советской власти общество всецело доверяло печати, и до сих пор пресса имеет достаточно сильное воздействие на сегодняшнее массовое сознание России, организуя его и моделируя его внешнее отражение в виде общественного мнения.

Пресса владеет «огромной силой, не только зеркально отражая общественное мнение, но и формируя его. И еще им манипулируя» [1]. Умение читателя понимать политические вопросы формируется благодаря публичности тех сведений, которые за небольшую цену представляются масс-медиа [9, с. 176]. «Пресса равна общественному состоянию и общественному строению. Они как сообщающиеся сосуды: если идет падение гражданских желаний и реформистских стремлений из-за неоправдавшихся надежд, это один к одному сказывается на прессе» [13, с. 337]. Современное российское общество демонстрирует достаточно широкий спектр разных возможностей для управления и манипулирования общественным мнением по-

средством печатных средств массовой информации. В России пресса выражает разные мнения и нацелена на различные социальные слои. Кроме того, по заключению Ю. А. Левады, «именно в газете настоящая аналитика и может быть. Только газета способна давать обоснованную, аргументированную точку зрения» [11, с. 335]. Н. Луман отмечал относительно этого: «потребители информации рано или поздно понимают, что масс-медиа – экономические субъекты и регулируются прибылью, т. е. продают не истину или объективную реальность, а товар. Но противоречие заключается в том, что других способов познать реальность, с которой непосредственно познакомиться ты не можешь, у человека, как правило, нет. Следовательно, у любого думающего субъекта появляется необходимость потребления качественного, на его взгляд, товара. И первым показателем качества информационного товара для большинства является аналитичность» [10, с. 184].

Рассмотрим русскоязычные и национальные издания Республики Мордовия. Региональная пресса пользуется неизменным спросом у своей аудитории. Тиражи периодических изданий в Мордовии, несмотря на экономически нестабильную ситуацию в стране, остаются на прежнем уровне. Кроме того, именно российские регионы проявляются как субъекты развития, тогда как федеральная власть лишь регулирует региональные программы.

Роль региональной прессы значительна в создании культуры у населения республики, в получении умений самореализации в условиях современного состояния России. Эффективность влияния региональной прессы на развитие различных областей общественной жизни, по нашему мнению, будет повышаться. Это, в первую очередь, обусловлено задачами, поставленными перед населением республики по налаживанию комфортной жизни. Речь идет, прежде всего, о социально-политических задачах, о продуктивном воздействии механизма информационного управления общественными процессами, формирующегося в регионе, умеющего, при условиях поддержки и неугасающего внимания к нему, разрешить проблемы, связанные с консолидацией мнений населения. Явственна и такая склонность, уже полностью проявившаяся в демократических странах запада, как подчиненность средств массовой информации финансовым возможностям их учредителей и спонсоров. Нужно отметить и многообразие функциональных ресурсов региональной прессы, которые во

многом объясняются особенностями зоны распространения. Печать действует на всей территории региона, динамично формируя общественное мнение, адресуя свою продукцию различным слоям населения. Разнообразный выбор региональных периодических изданий позволяет целеустремленно формировать вполне конкретное отношение населения к политике властей, склонное, однако, к ее полному одобрению, нежели затрагиванию вопросов неприятия данной политики. В центре работы сегодняшних региональных, а тем более районных газет, находится рядовой человек. Информация, излагаемая печатными изданиями, должна расширять его кругозор, уважать его интересы, отображать плюралистическую направленность гражданского общества, склоняться к объективности. С этой целью региональной общественности и печати нужно активно взаимодействовать. Информация, проходящая через местную прессу, должна способствовать согласию в региональном обществе, его развитию и равновесию.

Региональная пресса во всем ее многообразии отражает различные события культурной и политической жизни общества, расширяя свою аудиторию и, следовательно, сферу воздействия того или иного события, интерпретируемого печатными изданиями. Опыт истории показывает, что печать способна служить разным, а иногда и полярным целям: просвещению людей, развитию у них чувства собственного достоинства, потребности в свободе самовыражения, способствованию взвешенному принятию решений, максимальному обогащению личности, но также склонна и «духовно порабощать, дезинформировать и запугивать население, разжигать массовую ненависть и сеять недоверие и страх» [3, с. 45].

Трансляция мнения населения через печатные издания может выражаться в отображении прессой общественного мнения. Это предоставляет возможность расширить поле действия, доводить целевую информацию до разных социальных групп. Использование такого способа выражения оценок народных масс закрепляет в журналистском дискурсе категорию «общественное мнение», делая возможным характеристику и исследование истинного интереса средств массовой информации к суждениям населения. На основании изучения средств массовой информации можно судить об их обращении к мнению населения, ориентируясь на различные текстуальные выражения понятия «общественное мнение». Оно может принимать

такие формы, как «мнение граждан», «мнение населения города», «массовое мнение» (категория 1), может не содержать слово «мнение» вообще – «население считает, что...», «жители Мордовии возражают против...» (категория 2).

Результаты проведенного исследования позволяют сделать вывод, что в лексиконе журналистов и, следовательно, в общественном сознании, категория «общественное мнение» пока закреплена несущественно. Доля статей в газетах, упоминающих данную категорию, не превышает 13 %. Однако можно заметить, что во всех проанализированных изданиях количество материалов, употребляющих выражения категории 1, интенсифицируется к 2010 году. Все чаще встречаются тексты, в которых говорится об изучении общественного мнения в рамках региона. Например, следующие: «Принятию закона предшествовала огромнейшая работа по изучению опыта других регионов. Также мы выясняли общественное мнение представителей нашей республики, слушали педагогов, родителей, самих подростков, поэтому закон проработан досконально, с учетом всех мнений» [4]; «Успешное социально-экономическое развитие, движение вперед возможно лишь тогда, когда решения, принимаемые властью, основаны на мониторинге общественного мнения, когда они вызревают в недрах самого общества и учитывают интересы разных слоев населения» [4]; «Центральная детская библиотека Мордовии подвела итоги социологического исследования «Мы – финно-угры! Наши корни едины!», целью которого являлся мониторинг читательских мнений о межэтнической толерантности» [7]. По нашим наблюдениям, газета «Известия Мордовии» чаще всего апеллирует к категории «общественное мнение».Этот оборот регулярно появляется в высказываниях представителей власти, к нему обращаются и сами журналисты. Также газета (при поддержке городских властей) проводит акции по изучению мнения горожан по поводу определенных вопросов, например, таких как выбор цвета Кафедрального Собора, обсуждение Послания Федеральному Собранию Президента РФ или голосование за проекты Единой архитектурно-градостроительной концепции Саранска к празднованию 1000-летия единения мордовского народа с народами Российского государства [4].

В других проанализированных изданиях категория «общественное мнение» употребляется реже, но чаще встречаются такие выра-

жения, как «жители полагают, что…», «горожане выражают протест», «многие надеются, что…» и др. Например, корреспонденты газеты «Столица С» нередко употребляют в своих статьях вышеназванные выражения: «Судя по настроениям жителей республики, чемпионат мира они ждут как сказку. Этой мечтой живут все, начиная от простых граждан и заканчивая руководством региона. «Нет гостиниц. Ну и что? Построим, – говорят горожане. – … Стадион же построить можно, как и всю инфраструктуру. Были бы деньги и желание работать!» [7] Однако очень редко подобные конструкции подкрепляются данными о проведенных опросах жителей города (например, «Пока леди Гага шокирует общественность своим платьем из свежей говядины, жители Саранска назвали свои самые любимые мясные продукты. Маркетинговое исследование провел агрохолдинг «Талина» [7]). Данный факт не позволяет полностью доверять материалам, использующим подобные категории «общественного мнения». Мы полагаем, что часть публикаций рассчитана на доверие читателей и содержит скорее лишь предположение о том, что «думают горожане», мнение отдельных людей, а возможно, даже личный взгляд автора статьи. В 2010 году статей, содержащих такие выражения, как «жители полагают, что…», «горожане выражают протест», «многие надеются, что…» и др. было также больше во всех проанализированных изданиях. В газете «Известия Мордовии» насчитывается 11 % от общего количества публикаций за год, в «Столице С» – 10 %, в газете «Маяк» – 13 %.

В национальной печати ссылки на общественное мнение встречаются редко, но обращение к мнению общества проявляется в подтексте, когда журналисты пытаются в своих публикациях объединить всех эрзян, мокшан или татар, поднимая национальное самосознание народа. Например, это наблюдаем в материалах: «Эрзянь культурась – питневдеяк питнев сюпавчи» («Культура эрзян – ценность»): «…Хорошо, когда народ любит культуру, бережет ее, свой язык, старинные обряды и традиции… Когда люди вносят вклад в сохранение всего того богатства, которое передали нам наши предки…» [8]; «Марятама инксост гордость» [6] («Чувствуем за них гордость»): статья про победу О. Каниськиной и В. Борчина на чемпионате мира в Берлине в 2009 году.

Согласно классическому исследованию П. Лазарсфельда, представители масс-медиа могут оцениваться как лидеры мнений, обе-

сістэма сродкаў мовы беларускіх пісьменнікаў, а таксама распрацавана методыка аналізу аўтарскага маўлення і маўлення дзейных асоб [1].

4. Адным з найбольш складаных і маладаследаваных напрамкаў сучаснага мовазнаўства застаецца *супастаўляльная стылістыка*, прадстаўленая адзінкавымі работамі.

Пад навуковым кіраўніцтвам прафесара М. Я. Цікоцкага ў 1990 г. была падрыхтавана кандыдацкая дысертацыя М. П. Карповіч, дзе праведзены супастаўляльны аналіз словаўтварэння як сістэмнай крыніцы стылістычнага ўзбагачэння рускай і беларускай моў, прасочаны характар адносін паміж канататыўнай семантыкай вытворнай адзінкі і яе функцыянальна-стылістычным значэннем, акрэслена ступень міжмоўнай стылістычнай адэкватнасці вытворных субстантываў [15].

Лексіка-стылістычную эквівалентнасць беларускіх перакладаў рускай прозы (на матэрыяле рускага савецкага апавядання) вывучала І. В. Галубенка. Даследчыца вызначыла ўмовы, найбольш прадуктыўныя шляхі яе дасягнення і напрамкі рэалізацыі, вылучыла і апісала віды эквівалентаў у дачыненні да перакладаў літаратурна-мастацкіх тэкстаў з рускай мовы на беларускую, прааналізавала сутнасныя заканамернасці зрухаў пры перакладзе як падставы для вывучэння лексіка-стылістычнай эквівалентнасці, вызначыла ролю стылістычна маркіраваных лексем у аўтарскіх літаратурна-мастацкіх тэкстах з пункту гледжання іх сувязі з рознымі аспектамі культурнага кампанента і асаблівасцямі аўтарскага стылю, вылучыла тыпы і падтыпы перакладчыцкіх трансфармацый [7].

Заканамерным вынікам прааналізаваных навуковых даследаванняў стала падрыхтоўка і выданне цэлага шэрагу дапаможнікаў па лінгвастылістыцы, запатрабаваных у сферы вышэйшай адукацыі (М. Я. Цікоцкага, Т. Я. Старасценкі, Ф. С. Шумчыка, В. А. Кузьміч і В. В. Шахаб, Г. К. Семяньковай і А. М. Пісарэнкі і інш.).

Літаратура

1. Абабурка, М. В. Станаўленне і развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры / М. В. Абабурка. – Магілёў : МагДУ, 2000. – 204 с.; Абабурка, М. В. Станаўленне і развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры : аўтарэф. дыс. … д-ра філал. навук : 10.02.01 / М. В. Абабурка ; БДУ. – Мінск, 2001. – 40 с.

2. Барысенка, В. Я. Моўна-выяўленчыя сродкі ў паэзіі Васіля Віткі : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.02.01 / В. Я. Барысенка; ГДУ. – Гомель, 2002. – 20 с.

3. Барысенка, Н. А. Устарэлая лексіка ў сучаснай беларускай гістарычнай прозе : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / Н. А. Барысенка; ГДУ. – Гомель, 2004. – 19 с.

4. Бельчиков, Ю. А. Стилистика / Ю. А. Бельчиков // Русский язык: энциклопедия. – 2-е изд., перераб. / гл. ред. Ю. Н. Караулов. – М. : Большая Российская энциклопедия; Дрофа, 1997. – С. 539–541.

5. Бобрик, В. А. Новообразования в языке Янки Купалы : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.02 / В. А. Бобрик; ИЯ АН Беларуси. – Мінск, 1992. – 28 с.

6. Васілеўская, А. С. Функцыянальна-стылістычнае выкарыстанне лексічных вобразных сродкаў у мастацкай прозе : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01 / А. С. Васілеўская; БДПУ. – Мінск, 2000. – 19 с.

7. Галубенка, І. В. Лексіка-стылістычная эквівалентнасць беларускіх перакладаў рускай прозы (на матэрыяле рускага савецкага апавядання) : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01; 10.02.02 / І. В. Галубенка; БДУ. – Мінск, 2002. – 21 с.

8. Дзергачова, Т. Л. Фонастылістыка сучаснай беларускай мовы: парадыгматыка і сінтагматыка : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01 / Т. Л. Дзергачова; БДУ. – Мінск, 2003. – 21 с.

9. Дзянісаў, У. С. Эпітэт як моўна-стылістычны сродак у беларускай мастацкай прозе (марфалагічнае выражэнне і стылістычныя функцыі) : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / У. С. Дзянісаў; ГДУ. – Гомель, 1998. – 19 с.

10. Дзятко, Д. В. Беларускае мовазнаўства: дысертацыі па беларускай мове, абароненыя ў Рэспубліцы Беларусь (1990–2011 гг.) : навуковы даведнік / Д. В. Дзятко, С. У. Шахоўская. – Мінск : БДПУ, 2011. – 400 с.

11. Ермакова, А. М. Катэгорыя суб’ектыўнай мадальнасці ў сучаснай беларускай публіцыстыцы : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.02.01 / А. М. Ермакова; ГДУ. – Гомель, 1999. – 21 с.

12. Іўчанкаў, В. І. Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В. І. Іўчанкаў. – Мінск : БДУ, 2003. – 257 с.; Іўчанкаў, В. І. Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту : аўтарэф. дыс. … д-ра філал. навук: 10.02.01 / В. І. Іўчанкаў; БДУ. – Мінск, 2003. – 41 с.

13. Ивченков, В. И. Лингвистическая организация текста: в творческой лаборатории Владимира Короткевича / В. И. Ивченков. – Минск : БГУ, 2002. – 211 с.; Ивченков, В. И. Лингвостилистика тропов Юрия Казакова / В. И. Ивченков. – Минск : Пачатковая школа, 2002. – 112 с.; Іўчанкаў, В. І.

Медыярыторыка : рытарычныя асновы журналістыкі, лінгвістыка публіцыстычнага тэксту, дыскурсны аналіз сродкаў масавай інфармацыі / В. І. Іўчанкаў. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – 280 с.

14. Жаўняровіч, П. П. Публіцыстыка Уладзіміра Караткевіча: моўны факт у вызначэнні жанру : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.01.10 / П. П. Жаўняровіч; БДУ. – Мінск, 2006. – 21 с.; Жаўняровіч, П. П. Публіцыстычны дыскурс Уладзіміра Караткевіча / П. П. Жаўняровіч. – Мінск : РІВШ, 2011. – 244 с.

15. Карпович, М. П. Сопоставительно-стилистический аспект русского и белорусского словообразования (на материале личных номинаций) : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01; 10.02.02 / М. П. Карпович; МГПИ. – Минск, 1990. – 17 с.

16. Кныш, Л. С. Гутарковая камунікацыя ў мастацкай прозе Максіма Гарэцкага : спосабы стылізацыі : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / Л. С. Кныш; ІМ НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – 20 с.

17. Кожина, М. Н. Стилистика / М. Н. Кожина // Стилистический энциклопедический словарь русского языка. – М. : Флинта: Наука, 2006. – С. 408–414.

18. Ляшчынская, В. А. Метафара ў паэзіі Янкі Купалы / В. А. Ляшчынская. – Гомель : Выд-ва ГДУ, 2003. – 160 с.; Ляшчынская, В. А. Слова ў паэзіі Янкі Купалы / В. А. Ляшчынская. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 272 с.; Ляшчынская, В. А. Мова паэзіі Янкі Купалы : аўтарэф. дыс. … д-ра філал. навук: 10.02.01 / В. А. Ляшчынская; ІМ НАН Беларусі. – Мінск, 2004. – 42 с.

19. Пачкоўская, А. В. Прагматыка і стыль рэкламных тэкстаў : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / А. В. Пачкоўская; ГДУ. – Гомель, 2004. – 20 с.

20. Рагаўцоў, В. І. Маўленчае выражэнне камічнага ў беларускай драматургіі / В. І. Рагаўцоў. – Магілёў : МагДУ, 2002. – 304 с.; Рагаўцоў, В. І. Маўленчае выражэнне камічнага ў беларускай драматургіі : аўтарэф. дыс. … д-ра філал. навук : 10.02.01 / В. І. Рагаўцоў; ІМ НАН Беларусі. – Мінск, 2002. – 39 с.

21. Свістунова, М. І. Моўныя і стылёвыя асаблівасці «Апокрысіса» Хрыстафора Філалета : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / М. І. Свістунова; БДУ. – Мінск, 2000. – 20 с.

22. Серыкаў, Р. У. Лексічная стылістыка Янкі Купалы (функцыянаванне сінанімічных лексем нерэгулярнага і рэгулярнага ўжытку) : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / Р. У. Серыкаў; ГДУ. – Гомель, 1998. – 20 с.

23. Старасценка, Т. Я. Лексіка-стылістычныя сродкі рэалізацыі кантрасту (на матэрыяле твораў Алеся Разанава) : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.02.01 / Т. Я. Старасценка; БДПУ. – Мінск, 2001. – 16 с.

24. Торра, В. А. Эўфанічныя сродкі моўнай выразнасці ў паэзіі Рыгора Барадуліна : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / В. А. Торра; ГДУ. – Гомель, 2006. – 20 с.

25. Шубадзёрава, А. М. Каламбур у мове беларускай драматургіі : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / А. М. Шубадзёрава; ГДУ. – Гомель, 1998. – 20 с.

26. Шумчык, Ф. С. Вобразныя сродкі мовы ў мастацкіх творах В. Адамчыка (параўнанне і метафара: структура, лексіка, ужыванне) : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / Ф. С. Шумчык; ІМ НАН Беларусі. – Мінск, 1999. – 20 с.

Дмитрий Дроздов
Белорусский государственный университет

МЕНЕДЖМЕНТ СОВРЕМЕННОЙ ЖУРНАЛИСТИКИ КАК СПЕЦИФИЧЕСКОЙ ОТРАСЛИ ДУХОВНОГО ПРОИЗВОДСТВА

Типология основных видов человеческой деятельности традиционно базируется на разделении такого фундаментального явления, как культура, на материальную, духовную и физическую. Среди прочих составляющих феномена культуры основополагающее значение, безусловно, имеет процесс создания, производства ценностей, обеспечивающий поступательное развитие индивида и социума. До определенного времени было принято отождествлять общественное производство только лишь с материальным, поэтому закономерности функционирования сферы материального производства во всем многообразии их проявлений давно и основательно изучаются исследователями, начиная с А. Смита и заканчивая современными учеными-экономистами.

Впервые выделил сферу духовного производства как особое подразделение общественного производства и употребил само понятие «духовное производство» русский экономист и историк Андрей Шторх. К. Маркс в работе «Теория прибавочной стоимости» признал эту заслугу А. Шторха, но критиковал его за непонимание неразрывной естественной связи материального и духовного производств. Именно К. Маркс и Ф. Энгельс ввели в широкий научный оборот понятие «духовное производство», под которым они понимали производство специализированными группами людей умственного тру-

да общественного сознания, а конкретнее – идей, теорий, образов, духовных ценностей, духовных связей членов общества, духовности отдельного человека.

Постепенно в научных кругах сложилось понимание того, что определенному историческому способу материального производства всегда сопутствует соответствующий способ производства общественного сознания. С целью удовлетворения потребностей, формирующихся объективно и(или) правящей элитой, в обществе происходит выработка и распространение системы идей, представлений, ценностей, приемов и методов освоения окружающего мира, воздействия на общественную жизнь. Для успешного выполнения этих задач необходимо наличие целого комплекса взаимодействующих между собой отраслей духовной деятельности.

Исторически сложившимися формами духовного производства стали религия, мораль, искусство, наука, образование, философия, право, политическая идеология, средства массовой информации и др. Причем возникали они в различные периоды развития, являясь ответом на необходимость удовлетворения соответствующих важных духовных потребностей общества. Достаточно вспомнить то революционное значение, которое имело изобретение книгопечатания, когда массовое тиражирование духовного продукта – книг – стало первым в истории человечества случаем массового производства товаров.

Еще более эта конвергентная тенденция усилилась в XX веке, когда широкое распространение получила массовая культура в контексте пропагандируемой североамериканской модели общества массового потребления. Ярким примером в данном случае может быть творчество известного художника Энди Уорхала, который изображал на своих картинах банки с мясной тушенкой, рисовал («тиражировал») одни и те же портреты в количестве нескольких десятков и даже сотен.

В современную эпоху к средствам духовного производства и распространения его продуктов и услуг добавились компьютеры, информационные сети, информационные и мобильные технологии. В результате была создана и постоянно развивается мощная техническая и социальная инфраструктура производства и распространения информации. Очевидно, что в дальнейшем именно информационное производство станет основной и экономически наиболее прибыльной сферой деятельности передовых стран мира.

По мнению многих современных исследователей и практиков, ведущую роль в современном обществе все больше играет система средств массовой информации в качестве особой отрасли духовной деятельности, оперирующая как на специфическом информационном, так и на смежных – финансовом, рекламном и других рынках. Возможность получения прибыли тем или иным СМИ становится одним из главных показателей эффективности его функционирования, что в некоторых случаях (изменение контента материалов в угоду невзыскательной аудитории) может расцениваться как негативная тенденция «падения духовности». Эта и другие тенденции, вызванные рыночными отношениями, порождают большое количество новых социальных проблем.

Вообще журналистику можно определить как социальный институт, вид социального познания действительности и способ духовного производства. Специфика журналистики как общественного феномена определяет ее особенности и в качестве особого типа духовного производства, главной задачей которого является производство социально значимой массовой информации, содержащей не только максимально возможное объективное отражение существующей, прошлой и будущей действительности, но и валюативный анализ актуальных событий с точки зрения их влияния на достижение общественного блага.

Следует отметить естественную корреляцию журналистики со всеми без исключения сферами общественной жизни. Она органично включена в политические, экономические, культурные и другие процессы, использует научные методы анализа действительности, а также разнообразные художественные формы, приемы и методы отображения окружающего мира. Главными участниками процесса духовного производства в данном случае следует назвать журналистов и коллективы СМИ, продуктом деятельности которых является массовая информация, в разных формах и на различных носителях распространяемая по телекоммуникационным каналам, в качестве же потребителя информационного продукта выступает аудитория масс-медиа.

Очевидно, что складывающийся в итоге такой деятельности рынок информации функционирует не только и не столько по экономическим законам. Идеологическая, нравственная, эстетическая, воспитательная и другие составляющие контента информационного продукта объективно вызывают необходимость материальной, пра-

вовой и организационной поддержки и регулирования отдельных СМИ и национального информационного пространства со стороны государства, юридических и физических лиц. В условиях развития индустрии развлечений сегодня невозможно представить себе развитие массовой культуры без телевидения, которое, по нашему мнению, само уже стало ее неотъемлемой частью.

Таким образом, функционирование сферы массовой коммуникации как специфической отрасли духовного производства представляет собой сложный процесс, в котором задача получения прибыли сочетается с созданием духовных ценностей, удовлетворением духовных потребностей общества и человека, созданием в итоге специфического духовного мира, в котором присутствуют самые различные образы, идеалы и нормы. В самом деле, для журналистики характерны все функции духовного производства: направленность на совершенствование всех остальных сфер жизни общества, производство и распространение новых идей и знаний, другими словами, производство общественного мнения.

С 1980-х в мировой журналистике все больше внимания уделяется теоретическому осмыслению и практической реализации трансляции положений и концепций различных школ и подходов менеджмента материального производства на сферу массовой коммуникации. Именно с этого времени средства массовой информации стали рассматриваться как полноценные рыночные предприятия, а результаты журналистского труда в качестве специфического информационного продукта. Обострение конкурентной борьбы за аудиторию и рекламодателей в связи с увеличением предложения на рынке СМИ, появление новых телекоммуникационных технологий объективно потребовали внедрения научных систем управления в сферу массовой коммуникации.

Главную цель менеджмента можно определить как достижение наивысшей эффективности материального и духовного производства, повышение качества продукции и услуг при постоянном расширении и обновлении их перечня. Традиционно называют следующие сферы управления в организации: материально-вещественная (продукция, оборудование и др.), информационная (документы, проекты, программы и пр.) и человеческая – личностная. Очевидно, что для редакции СМИ именно вторая и третья сферы являются важнейшими, тогда как выпуск материальных продуктов может

рассматриваться и на практике является только вспомогательным средством.

Современный менеджмент ставит перед сотрудниками редакции целый комплекс конкретных задач. Прежде всего необходимо оптимизировать размеры, состав и структуру коллектива редакции или медиакомпании. Вторая задача состоит в оптимизации кадрового состава, в эффективном управлении коллективом и четкой организации его работы. Третья по порядку, но не по значению задача – улучшение качества и постоянное обновление перечня выпускаемых информационных продуктов и услуг. Решение этих задач менеджмент связывает с оптимизацией работы каждого сотрудника редакции и с выполнением всех операций производства СМИ на возможно более высоком профессиональном уровне, своевременно, с использованием наименьших ресурсов – человеческих, финансовых и материальных. Таким образом, менеджмент в журналистике – это творческое производственное управление процессами подготовки и выпуска в свет качественных и востребованных аудиторией информационных продуктов, а также оказание определенных услуг.

Другой вид управленческой деятельности в СМИ – собственно экономический, прежде всего финансовый менеджмент, выработка оптимальной финансовой, тиражной и ценовой политики. Он обеспечивает формирование и укрепление финансовой базы редакции, контролирует процесс разработки редакционного бюджета и следит за достижением его положительного баланса. Финансовый менеджмент направлен на достижение превышения доходов над расходами, получение максимальной прибыли и напрямую связан с маркетингом – изучением конъюнктуры информационного рынка, реальной и потенциальной аудитории, приемов и методов конкурентов, умении позиционировать СМИ и выгодно продать свои информационные продукты и услуги. Можно утверждать, что маркетинг средств массовой информации, как и их менеджмент, сегодня уже институировался в самостоятельный социально значимый вид деятельности.

Кадровый менеджмент в журналистике должен быть направлен на установление взаимопонимания и сотрудничества между работниками редакции, предотвращение трудовых и межличностных конфликтов, стабилизацию состава и морально-психологического климата в коллективе. Менеджеры СМИ различных уровней обязаны профессионально управлять персоналом, давать ему материальную

и моральную мотивации, развивать творческую и деловую инициативу, направлять их на достижение общередакционных тактических и стратегических целей.

Очевидно, что в связи со всем вышесказанным резко возрастают требования к профессиональной компетентности руководителей современных СМИ. Одновременное сохранение административно-распределительных методов управления сферой журналистики с дотационным бюджетным финансированием и все более широкое внедрение экономических приемов хозяйствования редакций на практике кардинально меняют требования к профессионализму менеджера в сфере массовой коммуникации. Если раньше требовалось прежде всего соблюдение идеологической лояльности к властным элитам и практиковались административно-командные методы, то теперь необходимо быть экономически и юридически грамотным специалистом-организатором, управленцем, психологом, необходимы знания, умения и навыки практического применения технологий менеджмента и маркетинга в коммерческой и творческой деятельности.

Современная социально-экономическая ситуация вообще и на информационном рынке в частности объективно предъявляет к менеджерам СМИ всех уровней требования овладеть финансово-экономическим, информационно-творческим, рекламно-информационным, культурно-просветительским видами деятельности, научиться профессионально решать этические и правовые проблемы, разрабатывать новые проекты, а также овладеть навыками организации продаж на медиарынке и т. д. Новым направлением в современном менеджменте журналистики стало создание, поддержание и развитие в редакционных коллективах корпоративной культуры. Она необходима для осознания сотрудниками себя и своего места в редакции, налаживания эффективных вертикальных и горизонтальных коммуникационных потоков, позитивных взаимоотношений между коллегами, выработки объединяющих корпоративных ценностей и норм, наиболее полного развития и самореализации работников, других условий успешного функционирования СМИ.

Очевидно, что менеджмент журналистики во многом зависит от вида СМИ, в котором он осуществляется. Организация и управление процессом выпуска информационных продуктов и услуг в газетах, журналах, радиовещании, телевидении, глобальной сети имеют свою специфику. Но можно однозначно утверждать, что важнейшей

тенденцией развития системы современных средств массовой информации является их конвергенция, создание медиахолдингов, активное использование традиционными СМИ новейших коммуникационных технологий. Экономический аспект в данном контексте является основным. Билл Гейтс был во многом прав, когда заявил: «В будущем на рынке останется два вида компаний: те, кто в Интернете, и те, кто вышел из бизнеса». Интернет-экономика включает в себя индустрию создания и использования информационных технологий и продуктов, что само по себе очень близко самой сути журналистики. Экономическая деятельность редакций в глобальной сети со временем будет приобретать для них все большее значение, что обусловлено мировыми тенденциями развития этой новой коммуникационной среды.

Современная журналистика представляет собой сложную систему, которая постоянно трансформируется, изменяется, приобретая новые качества и свойства. В информационном обществе роль и значение системы СМИ будут постоянно возрастать, поэтому теоретики и практики массовой коммуникации должны постоянно анализировать последние тенденции развития в данной сфере для того, чтобы вырабатывать объективные и своевременные рекомендации для органов государственного управления, менеджеров, общественности с целью достижения максимальной эффективности ее функционирования.

Литература

1. Андреев, С. Н. Маркетинг некоммерческих субъектов / С. Н. Андреев. – М. : Финпресс, 2002. – 312 с.

2. Духовное производство: социально-философский аспект проблемы духовной деятельности. – М. : Наука, 1981. – 100 с.

3. Маркс, К. Собр. соч. / К. Маркс, Ф. Энгельс. – Изд. 2-е. – Т. 26. – Ч. 1. – С. 278–282.

4. Морозова, Е. Я. Экономика и организация предприятий социально-культурной сферы / Е. Я. Морозова. – СПб. : Михайлов, 2002. – 317 с.

5. Новаторов, В. Е. Маркетинг в социально-культурной сфере / В. Е. Новаторов. – Омск : Омич, 2000. – 288 с.

6. Тульчинский, Г. Л. Менеджмент в сфере культуры / Г. Л. Тульчинский. – СПб. : Лань, 2001. – 384 с.

7. Шейн, Э. Организационная культура и лидерство / Э. Шейн. – СПб. : Питер, 2002. – 120 с.

Сяргей Дубовік
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

МЕДЫЙНАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ І ВЫКЛІКІ ЧАСУ

Структурныя і субстантыўныя змены ў беларускіх СМІ прынята звязваць з канцэпцыяй пераходнай мадэлі краіны. Аднак за час, які прайшоў з пары распаду СССР, істотна змяніліся ўмовы існавання СМІ не толькі на Беларусі, у Расіі, іншых постсавецкіх краінах, але і ў глабальным вымярэнні. Вось чаму развіццё сродкаў камунікацыі ў постсавецкіх грамадствах, у тым ліку і беларускім, трэба разглядаць у глабальным і нацыянальным кантэкстах, а таксама ў цеснай сувязі з тэхналагічнымі працэсамі ў інфармацыйна-камунікатыўным асяроддзі, з эканамічнымі і фінансавымі фактарамі, з развіццём рынкаў культуры.

Пераход ад адміністрацыйна-каманднай сістэмы да рыначнай эканомікі і дэмакратызацыі выявіў перш за ўсё палітычныя складнікі гэтага працэсу і патрабуе ўважлівага вывучэння асаблівасцей трансфармацыі грамадскіх адносін у нашай краіне, у тым ліку і СМІ. Назапашаны за гады незалежнасці вопыт дае багаты матэрыял для аналізу працэсаў, якія адбываюцца ў нацыянальнай інфармацыйна-камунікатыўнай сферы. Можна адзначыць галоўнае:

1. Масава-інфармацыйныя працэсы цесна звязаны з кантэкстам грамадска-палітычнай сітуацыі. Беларуская прэса праходзіць, як і ўся краіна, тры найбольш акрэсленыя фазы: асэнсаванне і пераацэнку былых каштоўнасных сістэм; пошук палітычнага і эканамічнага выбару; канструктыўную эвалюцыю адносна ранейшага вопыту.

З пачаткам дэмакратызацыі грамадства і прыняццем у 1995 г. Закона Рэспублікі Беларусь «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі», які забяспечыў шырокія правы рэдакцыям і журналістам, сітуацыя ў друку змянілася: адбыліся істотныя структурныя і тэматычныя змены і ідэалагічная пераарыентацыя газет, а таксама іншымі сталі ўмовы іх функцыянавання. Новым стымулам для развіцця нацыянальных СМІ было прыняцце ў 2008 г. новай рэдакцыі Закона «Аб сродках масавай інфармацыі». Суадносіны паміж дзяржаўнымі і альтэрнатыўнымі друкаванымі выданнямі сведчаць аб тым, што ў Беларусі будуецца дэмакратычнае грамадства.

2. Дзяржаўная інфармацыйная палітыка ў такой ступені павінна абараняць інтарэсы дзяржавы і ўлады, у якой дзяржава рэалізуе

і абараняе інтарэсы дэмакратычнага грамадства і кожнай асобы, – гэта і ёсць найважнейшы, фундаментальны прынцып ажыццяўлення дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі.

Аб’ектыўна неабходна, каб пры ўсім плюралізме пазіцый альтэрнатыўных СМІ ў іх быў агульны канструктыўны вектар для абароны нацыянальных інтарэсаў Беларусі, асобы, дэмакратычнага грамадства, народа і канструктыўнае ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі.

3. Аналіз дзейнасці беларускіх СМІ сведчыць, што ў цяперашні час паўстае праблема змянення (карэкцыі) дзейнасці сродкаў інфармацыі на парадыгмальным узроўні, асабліва ў частцы іх узаемадзеяння з грамадствам у мэтах адстойвання інтарэсаў дзяржавы. Важна ўлічваць сацыяльна-псіхалагічныя наступствы інфармацыйнага ўплыву на грамадзян. Таму не варта крытыкаваць дзяржаўнае кіраванне інфармацыйнымі працэсамі: кожная развітая дэмакратычная дзяржава прама або ўскосна ажыццяўляе гэту функцыю, асабліва ў мэтах абароны сваіх нацыянальных інтарэсаў, маральных і патрыятычных традыцый людзей. Наша грамадства зацікаўлена ў ідэйнай, патрыятычнай скіраванасці СМІ як суб’екта інфармацыйна-псіхалагічнага ўздзеяння і ў той жа час у захаванні прынцыпаў аб’ектывізму, праўдзівасці ў падачы матэрыялаў, павышэнні кваліфікацыі журналістаў, авалоданні новымі інфармацыйнымі тэхналогіямі ўплыву на масавую свядомасць. Масаваінфармацыйная дзейнасць беларускіх СМІ павінна быць сарыентавана на фарміраванне грамадскай думкі на аснове канкрэтных фактаў, аб’ектыўнай і сацыяльна адказнай інфармацыі, з дапамогай якой людзі змогуць лепш убачыць і ацаніць рэчаіснасць.

4. Паляпшэнню арганізацыі дзейнасці нацыянальных СМІ і павелічэнню іх канструктыўнага ўплыву на людзей ва ўмовах трансфармацыі грамадства спрыяюць:

- удасканаленне прававой базы сродкаў інфармацыі;
- стварэнне аналітычных службаў на радыё, тэлебачанні і ў рэдакцыях перыядычных выданняў з мэтай аператыўнага аналізу ўплыву іх дзейнасці на грамадскую думку;
- павышэнне ўзроўню палітычнай і сацыяльна-псіхалагічнай падрыхтоўкі журналістаў;
- павышэнне ўзроўню прававой і маральнай адказнасці кіраўнікоў СМІ за аб’ектыўнасць і праўдзівасць інфармацыі, а так-

сама за аб'ектыўнасць і навуковасць сацыяльных апытанняў, што праводзяцца і распаўсюджваюцца выданнямі, тэле- і радыёканаламі;
– удасканаленне механізмаў аператыўнай зваротнай сувязі паміж СМІ і грамадскай думкай, а таксама выпрацоўка каналаў давядзення праблем сучаснасці і настрою ў грамадстве да ўсіх інстытутаў дзяржавы.

5. Рэгуляванне тэлебачання ў большасці краін свету развіваецца ў кірунку змяншэння або рэструктурызацыі ўдзелу дзяржавы ў фінансаванні і вытворчай дзейнасці, у кірунку канкурэнцыі дзяржаўных інстытутаў з іншымі распаўсюджвальнікамі відэапраграм – прыватнымі вяшчальнымі арганізацыямі, кабельнымі або спадарожнікавымі сістэмамі і ў кірунку перагляду ролі дзяржавы ў кантролі над тэлебачаннем. Па гэтым шляху развіваецца і айчыннае тэлебачанне.

6. Развіццё айчыннага радыёвяшчання як найбольш таннага і эфектыўнага электроннага СМІ праходзіць у напрамках лакалізацыі станцый і сегментацыі іх аўдыторый. Беларускае дзяржаўнае радыё арыентуецца на ўсебаковае асвятленне рэчаіснасці, задавальненне патрабаванняў розных груп аўдыторыі і выкананне не толькі інфармацыйных і забаўляльных функцый, але і адукацыйных, культурных, выхаваўчых і г. д. Нацыянальнае радыё не адмовілася ад традыцыйных праграм з выкарыстаннем усяго набору жанраў радыёжурналістыкі, не скацілася на пазіцыі кампрамісу паміж інфармацыяй і музыкай, трывала ўтрымлівае сваю нішу на айчынным рынку інфармацыі. Яно не толькі інфармуе насельніцтва Беларусі, але і фарміруе новую эканамічную і палітычную культуру, прапагандуе каштоўнасці духоўнага і культурнага адзінства, гуманізму, талерантнасці. У шырокім сэнсе слова дзяржаўныя радыёканалы былі і застаюцца асноўным сродкам фарміравання сацыяльнай актыўнасці грамадскай супольнасці Рэспублікі Беларусь.

Канкурэнцыя за аўдыторыю радыёслухачоў істотна ўзбагаціла беларускае радыёвяшчанне. Паводле звестак на 1 студзеня 2012 г. на тэрыторыі краіны вяшчанне ў FM-дыяпазоне ажыццяўляюць 30 радыёстанцый, у асноўным музычнага і спецыялізаванага фарматаў. Яны ўнеслі новае ў вяшчальную палітыку: паставілі пад сумненне радыёпраграмы, заснаваныя на слове, і амаль поўнасцю замянілі эфірную мову, што пакладзена ў аснову традыцыйнага радыёвяшчання, на музыку і забаўляльныя радыёжанры.

Сёння на айчыннае радыёвяшчанне ўскладваюцца найважнейшыя задачы пераасэнсавання мінулага і ўзважанай ацэнкі цяперашняга, а таксама фарміравання новых каштоўнасна-нарматыўных установак на будучае. Тэндэнцыя работы камерцыйных радыёстанцый, якія клапоцяцца ў асноўным пра фінансавую выгаду, пакідаючы па-за ўвагай спадчыну, азначае абмежаванне прасторы, соцыуму, паказ жыцця ў межах вузкага, пазбаўленага гістарычнага сэнсу быцця.

7. Інтэрнэт як сродак інфармацыі забяспечвае большую, чым радыё, празрыстасць палітыкі і ў значнай ступені ўмацоўвае дэмакратычныя структуры.

Медыя беларускага інтэрнэту садзейнічаюць збалансаванаму ўстойліваму развіццю грамадства, утрымліваюць вялікі патэнцыял у плане яго далейшай дэмакратызацыі. Як грамадскі форум людзей і як сродак, што забяспечвае большую празрыстасць палітычнай сферы, СМІ ўмацоўваюць асновы дэмакратычнай сістэмы кіравання, гэта значыць неабходныя ўмовы эканамічнага росту. Новая інфармацыйна-насычаная эканоміка патрабуе больш адкрытых палітычных сістэм, якія, у сваю чаргу, запатрабуюць больш свабоднага патоку інфармацыі.

8. На тэрыторыі нашай краіны расійскія СМІ захоўваюць высокія тыражы, невялікі кошт на сваю друкаваную прадукцыю, а разам з тым і аўдыторыю чытачоў, рэалізуюць новыя праекты, актыўна пашыраюць сістэму дадаткаў, удасканальваюць службу распаўсюджвання.

9. Інфармацыйнае забеспячэнне стварэння Саюзнай дзяржавы адначасова з іншымі відамі арганізацыйнай дзейнасці – прававой, фінансава-эканамічнай, матэрыяльна-тэхнічнай – з’яўляецца стратэгічным напрамкам дзейнасці інтэграцыйных структур. Мана аб Беларусі часта выкарыстоўваецца апанентамі Саюза Беларусі і Расіі. Аднак нельга не прызнаць, што і бюджэтныя саюзныя СМІ, калі яны з-за перасцярогі пазбягаюць любой крытыкі, у тым ліку і справядлівай, наўрад ці будуць здольныя аб’ектыўна адлюстроўваць рэаліі, а таму непазбежна ператворацца ў своеасаблівыя «ведамасныя шматтыражкі», яны не спрыяюць, а, наадварот, шкодзяць інтэграцыйным працэсам.

Змест саюзных СМІ павінны вызначаць матэрыялы, якія здольны, з аднаго боку, адлюстраваць шырокі спектр поглядаў і пазіцый палітычных партый і рухаў на новым этапе развіцця Саюза, а з другога – праз дыскусію і абмен поглядамі, каментарый і аналіз уплы-

ваць на зрухі вектара грамадскай думкі на карысць інтэграцыі Расіі і Беларусі.

Аднак, трэба канстатаваць, што існуючыя саюзныя СМІ, за рэдкім выключэннем, у лепшым выпадку займаюцца інфармаваннем, а часцей – «інфармацыйным суправаджэннем».

Сёння ў нашай рэспубліцы на СМІ як адзін з апорных пунктаў грамадства і дзяржавы ўскладваецца гістарычная адказнасць. Палітычная кан'юнктура, сітуацыйныя абставіны штодзённасці заўсёды дыктуюць тэмы прафесійнаму журналісту. Хваляваца толькі аб імгненным на шкоду памяці пра мінулае і думак пра будучыню азначае абмяжоўваць прастору соцыуму, уціскаць жыццё ў рамкі вузкага, пазбаўленага гістарычнага сэнсу факта. Сучасная беларуская журналістыка не інфантыльная, каб выбраць такі шлях, яна павінна стаць паўнапраўным сааўтарам нашага часу, пашырыць гарызонты гістарычнага ўсведамлення мінулага, цяперашняга, будучыні – гісторыя вывучаецца не толькі па падручніках, але і па падшыўках газет, архівах тэле- і радыёперадач.

Аляксандр Дуброўскі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

РЭДАКТАРСКІ АНАЛІЗ ВЕРШАВАНАГА ТЭКСТУ: СІСТЭМЫ ВЕРШАВАННЯ

Рэдактарскі аналіз вершаванай формы паэтычнага твора пачынаецца з усведамлення таго, у якой сістэме вершавання ён напісаны. Гэта звязана з тым, што сістэма вершавання – самая агульная катэгорыя, якая апісвае рытмічную арганізацыю верша. Метр, памер, рытм – катэгорыі, якія канкрэтызуюць (менавіта ў такой паслядоўнасці) рытмічную структуру твора. У пэўных сістэмах вершавання некаторыя са звёнаў гэтага ланцужка будуць супадаць (напрыклад, метр і памер у сілабічнай сістэме), а ў іншых сістэмах традыцыйна выкарыстоўваюцца замест некаторых з названых катэгорый іншыя (напрыклад, «віды танічнага верша» ў танічнай сістэме займаюць тую пазіцыю ў гэтым ланцужку, якую ў сілаба-тоніцы займае метр).

Задача аксіяматычнага апісання ўсіх магчымых сістэм вершавання ў дачыненні да рускай мовы была вырашана Б. Ф. Ягоравым [9].

Нішто не можа перашкодзіць прыняць гэтае апісанне і для беларускамоўнага матэрыялу. Рэдактар, які працуе з вершаванымі тэкстамі, павінен добра ведаць усе тыя сістэмы вершавання, з якімі ён можа сутыкнуцца, разумець, што з’яўляецца дапушчальным і недапушчальным у кожнай з іх, умець ацэньваць матываванасць выкарыстання тых ці іншых сістэм вершавання.

У абсалютнай большасці выпадкаў, рэдагуючы сучасныя вершаваныя творы на беларускай і рускай мовах, мы сутыкаемся з сілаба-танічнай, танічнай сістэмамі і верлібрам. Але, як гэта ні дзіўна, разуменне такіх архаічных сістэм вершавання, як сілабічная, дасілабічная, метрычная (антычная), застаецца актуальным пры рэдагаванні літаратурных вершаў і сёння. На гэтым мы зараз і спынімся.

Здавалася б, антычная сістэма вершавання не павінна ўвогуле цікавіць сучаснага рэдактара, калі ён не працуе з выданнем антычных твораў. Але гэта не так. І справа не толькі ў тым, што менавіта антычная сістэма непасрэдна паўплывала на станаўленне найбольш распаўсюджанай у нас цяпер сілаба-танічнай сістэмы вершавання. З метрычным вершаваннем мы можам сутыкнуцца і значна больш непасрэдна. Па-першае, гэта эквірытмічныя пераклады антычных твораў. Бясспрэчна, ва ўсходнеславянскіх мовах працягласць гучання галосных не мае самастойнага фаналагічнага значэння. У нас гэтая працягласць непасрэдна звязана з націскам. А, напрыклад, у лацінскай мове доўгі склад і націскны склад не былі тоеснымі паняццямі, і антычнае вершаванне было заснавана менавіта на ўпарадкаваным чарграванні доўгіх і кароткіх складоў. Такім чынам, эквірытмічным перакладам з класічных моў на ўсходнеславянскія трэба лічыць такі пераклад, у якім памер арыгінала імітуецца сродкамі мэтавай мовы. І спосаб такой імітацыі добра вядомы: доўгім складам арыгінала павінны адпавядаць націскныя склады перакладу. Перад намі ўрывак з эквірытмічнага перакладу оды Гарацыя «Да Мельпамэны» («Exegi monumentum…»), зроблены М. Багдановічам (твор вядомы пад назваю «Памятнік»):

Лепшы медзі сабе памятнік справіў я,
Болей ўсіх пірамід царскіх падняўся ён;
Не зруйнуе яго сівер, ні едкі дождж,
Ні гадоў чарада, вечнага часу рух [2, с. 376].

Гэта імітацыя асклепіядава верша. Вось яго схема: | – | – – | // | – – | – |.

Але імітацыі антычнага верша сустракаюцца не толькі ў перакладах. Звернем увагу, напрыклад, на «Пентаметры» М. Багдановіча:

Чыстыя слёзы з вачэй пакаціліся нізкай парванай,
Але, упаўшы у пыл, брудам зрабіліся там [2, с. 135].

Гэта элегічны двуверш, утвораны спалучэннем гекзаметра, прычым лацінскага – з цэзурай пасля першага склада трэцяй стапы (першы радок), і пентаметра (другі радок). Схема элегічнага двуверша наступная:

| – – | – – | // – – | – – | – – | –
| – – | – – | // | – – | – – |.

У абодвух прыкладах цікава тое, што тут назіраецца ўплыў рытмічных законаў сілаба-тонікі: М. Багдановіч дапускае пропускі схемных націскаў на месцы доўгіх складоў (гаворка ідзе пра службовыя часціны мовы – часціцы *не* і *ні* ў перакладзе оды Гарацыя і злучнік *але* ў «Пентаметрах»). І гэта абсалютна заканамерна і дапушчальна: і сам паэт, і мы, сучасныя чытачы, успрымаем гэтыя імітацыі антычнага верша менавіта праз прызму сілаба-тонікі, таму падобныя сілаба-танічныя прыёмы гучаць для нас натуральна.

Вось больш складаны прыклад імітацыі метрычнай сістэмы вершавання ў арыгінальным творы М. Валошына:

Седым и низким облаком дол повит…
Чернильно-сини кручи лиловых гор.
Горелый, ржавый, бурый цвет трав.
Полосы йода и пятна желчи [5, с. 59].

Гэта алкеева страфа, чацвёрты радок якой і ўяўляе сабою алкееў верш – спалучэнне двух дактыляў і двух харэяў.

Нарэшце, трэба сказаць і пра тое, чым жа з’яўляюцца такія імітацыі з пункту гледжання ўсходнеславянскага вершазнаўства, бо, зразумела, сама метрычная сістэма як такая немагчымая ва ўсходнеславянскіх мовах. Адказ відавочны: гэта стопныя лагаэды [10, с. 219], што з’яўляюцца пераходнай формай паміж сілаба-тонікай і тонікай [8, с. 51].

Сфармулюем, у чым заключаецца складанасць і небяспека для рэдактара пры сустрэчы з імітацыямі антычнага верша. **Па-першае**,

рэдактар можа проста не распазнаць такую імітацыю, калі не будзе знаёмы з антычным вершаваннем і з самой магчымасцю такіх імітацый. Калі ён не распазнае гэтай з'явы, то зробіць памылковую выснову аб тым, што такі тэкст мае нейкую незразумелую, немагчымую, недапушчальную метрыка-рытмічную арганізацыю і проста не можа быць апублікаваны. **Па-другое**, нават дасведчаны ў нашай тэме рэдактар павінен ацэньваць дарэчнасць, эстэтычную матываванасць выкарыстання такіх вершаваных форм. Прымяняць тут трэба семантычны крытэрый: антычныя формы асацыіруюцца з антычнымі матывамі. Таму іх ужыванне магчымае ў перакладах твораў антычнай літаратуры (у сучаснай практыцы перакладу гэта нават абавязковае патрабаванне, бо гэта самы арганічны спосаб дасягнуць эквірытмічнасці), а таксама ў творах, у якіх выкарыстоўваюцца вобразы, што могуць быць суаднесены з антычнай тэматыкай, у тым ліку ў перайманнях. Напрыклад, згаданую вышэй алкееву страфу мы знаходзім і ў творы В. Брусава «Перайманне Гарацыя». Што ж датычыцца працытаванага верша М. Валошына, то ён уваходзіць у нізку «Кімерыйская вясна». Кімерыяй М. Валошын называў усходні Крым, гісторыя якога сапраўды шчыльна звязана з антычнай цывілізацыяй. Таму М. Валошына дакараць няма за што. А вось змястоўна не матываваныя спробы выкарыстоўваць імітацыі антычных форм павінны ацэньвацца рэдактарам адмоўна. Як паказаў М. Л. Гаспараў, вершаваны метр сапраўды мае культурную памяць [6], што нельга ігнараваць. **Па-трэцяе**, непасрэдна ў працэсе рэдагавання твора рэдактар павінен сачыць за тым, каб не разбурыць метрычную структуру верша. Звернем увагу на тое, што ў працытаваным перакладзе М. Багдановіча напісанне *ў нескладовага* падпарадкоўваецца менавіта метрычнай схеме. Рэдактар, які па недасведчанасці ўспрыняў бы падобныя тэксты як танічную форму, мог бы захацець прывесці напісанне *ў нескладовага* ў адпаведнасць з правіламі арфаграфіі. Іншая справа, што сучасныя аўтары, на наш погляд, і самі павінны адыходзіць ад практыкі, якая раней дазваляла ў гэтым пункце парушаць арфаграфічныя правілы.

Такая сітуацыя з антычнымі формамі ва ўсходнеславянскай паэзіі. Яшчэ дзве з названых намі архаічных сістэм вершавання – сілабічная і дасілабічная – маюць іншы статус у нашых літаратурах. У адрозненне ад антычнай сістэмы, яны сапраўды выкарыстоўваліся ў паэзіі на нацыянальных мовах усходніх славян. Гэта значыць,

што рэдактары сутыкаюцца з адпаведнымі формамі, калі працуюць над выданнем айчыннай паэзіі мінулых эпох. І калі для рускай літаратуры гэта перыяд да рэформы Традзьякоўскага – Ламаносава, то для беларускай – нават XIX стагоддзе: Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, А. Рыпінскі, В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч і іншыя паэты, якія карысталіся сілабікай [10, с. 259]. Наш літаратурны верш узнік як верш дасілабічны – «з адвольнай колькасцю складоў у радку і рэгулярнай рыфмай у суседніх радках» [4, с. 375]. Менавіта гэтым тэрмінам трэба называць тэксты накшталт эпіграмы Ф. Скарыны да кнігі «Іоў» (В. П. Рагойша гэты верш адносіць да сілабічнай сістэмы [10, с. 257]):

Богу въ Троици единому ко чти и ко славе,
Матери Его пречистой Марии к похвале,
Всем небесным силам и святым Его к веселию,
Людем посполитым к доброму научению [1, с. 338].

Колькасць складоў у радках тут 15 – 14 – 15 – 14, не захоўваецца пастаяннае месца цэзуры.

Цікава, што прынцыпы сілабічнай паэзіі не так даўно актуалізаваліся ў сучаснай літаратуры. Можна прывесці два прыклады. Першы мы знаходзім у М. Л. Гаспарава: «Есть один случай, где русский автор бежит впереди даже западного прогресса: западный верлибр, устав от полной свободы, начинал было организовываться в сложные силлабические строфы – и вот в русском верлибре, еще не освоившем полной свободы, то же делает еще малоизвестная поэтесса Л. Березовчук (в «Новом литературном обозрении») – то ли начитавшись М. Мур и Д. Томаса, то ли просмотрев нужный параграф в книжке «История западноевропейского стиха» [7, с. 308].

Другі прыклад – зварот беларускіх паэтаў у канцы XX – пачатку XXI ст. да японскіх форм верша – хоку і танка, бо гэтыя формы, сапраўды, ствараюцца на прынцыпах сілабікі. Асабліва палюбіліся беларусам хоку. Гэтыя вершы складаюцца з трох радкоў; у першым і трэцім – пяць складоў, у другім – сем. Цікава, што сустракаюцца тэксты, у якіх гэтае патрабаванне не вытрымліваецца, але яны чамусьці называюцца хоку. У апошнім выпадку рэдактар павінен зняць жанравае абазначэнне, але сам твор можа быць апублікаваны. У якасці жартаў ці эксперыментаў узнікалі творы, у якіх хоку выкарыстоўваліся ў якасці страфы ў раўнастрофным творы (А. Глобус і інш.), хаця вядома, што хоку – гэта манастрафа.

Дасілабічная і сілабічная (квазісілабічная) сістэмы вершавання – гэта, як ні дзіўна, менавіта тое, што часам можна сустрэць у творах людзей, якія пачынаюць пісаць вершы, але якім не хапае рытмічнага слыху, каб інтуітыўна засвоіць сілаба-тоніку або тоніку, у той час як з тэорыяй вершавання яны не знаёмыя. У лепшым выпадку яны пачынаюць лічыць склады ў радках (чаго рабіць не трэба), і атрымліваецца квазісілабічная сістэма вершавання («квазі» – таму што не вытрымліваюцца астатнія патрабаванні гэтай сістэмы). У горшым выпадку (хаця «горш» ці «лепш» тут катэгорыі вельмі ўмоўныя) не вытрымліваецца нават аднолькавая колькасць складоў. У выніку – дасілабічныя вершы. Але часта ўзнікае наступная сітуацыя. Сілаба-танічны кантэкст, які пануе ў нашай культуры, аказвае пэўны ўплыў на пачаткоўцаў, у выніку нейкія сілаба-танічныя «кавалкі» ў бессістэмнай паслядоўнасці трапляюцца ў тым рытмічным хаосе, што ствараюць гэтыя аўтары.

Мы вымушаны працытаваць адзін верш, які быў знойдзены ў інтэрнэце, але спачатку звернем увагу на каментарый, які быў там жа: «Особую пикантность стихотворению придает то, что это не Стихи.Ру и даже не самиздат. Это было напечатано в самарской газете «Молния», № 4 (2003), изрядным тиражом» [11]. А вось і ўрывак з верша (пунктуацыя аўтарская):

Прощай, неверная подруга!
Я тихо ушла из жизни твоей
И дверь я прикрыла без стука.
Не миновать теперь из прошлого теней,
Но веришь, мне легка с тобой разлука.
Я просто фотоальбом беру,
Листаю в поисках мыслей.
Различные воспоминания я только нахожу,
Что было со мной и с тобой вспоминаю [11].

Першы радок – чатырохстопны ямб, другі – чатырохстопны амфібрахій са сцяжэннем, трэці – трохстопны амфібрахій, чацвёрты і пяты – шасцістопны ямб, шосты і сёмы могуць быць кваліфікаваны як танічны верш, восьмы радок – васьмістопны ямб, дзявяты – чатырохстопны амфібрахій.

Якім чынам рэдактар мог прапусціць такі тэкст?.. Яго змест здаўся рэдактару прымальным?.. Студэнты задавалі нам пытанне:

«Ці можа быць прымальным змест паэтычнага твора ў выпадку непрымальнасці яго формы?» Наш адказ катэгарычны: гэтага не можа быць ніколі. Гэта супярэчыла б усім нармальным уяўленням пра паэтыку і эстэтыку мастацтва слова. У паэзіі форма і змест яшчэ мацней спаяны, чым у прозе. Нейкія прыватныя фармальныя агрэхі могуць сустракацца, і менавіта іх заклікананы выправіць рэдактар. Але калі форма з'яўляецца адным суцэльным і катастрафічным агрэхам, то няма сэнсу штосьці шукаць у змесце, бо ў гэтым выпадку перад намі будзе проста *нейкі тэкст*, але не *мастацкі твор*. У прыведзеным прыкладзе работа рэдактара з тэкстам павінна і пачынацца, і заканчвацца аналізам сістэмы вершавання. Такі тэкст не падлягае рэдактарскай праўцы і не падлягае публікацыі.

Пяройдзем да тых сістэм вершавання, якія пануюць у сучасных усходнеславянскіх літаратурах.

Сілаба-танічная сістэма не стварае праблем для рэдактара (гаворка ідзе зараз пра ацэнку выкарыстання самой сістэмы вершавання, а не пра канкрэтныя метры, памеры, рытмічныя прыёмы, бо тут складанасцей ёсць нямала). Трэба толькі заўважыць, што рэдактар павінен адэкватна рэагаваць на радковыя лагаэды [10, с. 219] і паліметрычныя вершы. Такія з'явы абсалютна нармальныя ў нашай паэзіі (хоць і не частыя) і не павінны выклікаць ніякіх нараканняў. А вось астатнія дзве сістэмы вершавання ствараюць больш праблем для рэдактарскага аналізу з прычыны іх меншай распаўсюджанасці і прывычнасці. Гаворка ідзе пра танічную сістэму вершавання і верлібр. Тыя праблемы, якія могуць напаткаць рэдактара, маюць дваістую прыроду: па-першае, гэта праблемы псіхалагічныя, па-другое – структурныя. Псіхалагічныя праблемы зводзяцца да таго, што рэдактар, як і любы чытач, прывыкае да тых вершаваных форм, якія найчасцей сустракае. А гэта азначае, што найбольш рэдкія ў нашай паэзіі тактавікі і акцэнтныя вершы могуць нявопытнаму рэдактару здавацца і «непрыгожымі», і «няправільнымі». Практыка паказвае, што, нягледзячы на школьнае вывучэнне паэзіі У. Маякоўскага, многія чытачы так і не развіталіся з псіхалагічным непрыманнем акцэнтнага верша. Але для рэдактара такія псіхалагічныя рэакцыі абсалютна недапушчальныя.

Верлібр зараз папулярны: яго ўяўная простасць вабіць многіх паэтаў, у тым ліку маладых. І мала хто разумее, што за гэтай структурнай простасцю хаваецца змястоўная складанасць: выкарыстоўваючы гэтую сістэму вершавання, паэт заўсёды рызыкуе стварыць пусты

тэкст. Стандартнае патрабаванне да верлібра – філасофская заглыбленасць. А патрабаванне гэтае не заўсёды выконваецца аўтарамі.

Структурныя (на ўзроўні рытмікі) праблемы чакаюць рэдактара пры сутыкненні з любымі відамі танічнага верша (а вось верлібр менавіта такіх праблем рэдактару не прынясе). Але трэба сказаць, што танічны верш у параўнанні з сілаба-танічным сапраўды мае больш разняволеную рытмічную арганізацыю, таму часцей за ўсё рэдактару трэба не столькі выпраўляць нешта, колькі ўстрымлівацца ад неапраўданых правак. Спынімся на гэтым і звернем увагу на просты, але паказальны прыклад.

Савецкі час прывучыў чытача да вельмі строгага, вельмі ўпарадкаванага дольніка [7, с. 291]. Гэта дольнік, які набліжаецца да трохскладовых сілаба-танічных памераў з пастаяннай анакрузай. На фоне гэтай чытацкай прывычкі павінны выглядаць «няправільнымі» нават класічныя творы А. Блока.

Вхожу я в темные храмы,
Совершаю бедный обряд.
Там жду я Прекрасной Дамы
В мерцаньи красных лампад [3, с. 168].

У другім радку – двухскладовая анакруза на фоне аднаскладовых. Звернем увагу і на тое, што ў першым, другім і чацвёртым радках аднаскладовыя інтэрвалы знаходзяцца на першай між’іктнай пазіцыі; гэтая рытмічная варыяцыя 3-іктнага дольніка, характэрная для творчасці А. Блока, пазней выцясняецца больш прывычнай нам цяпер – з аднаскладовым інтэрвалам на другой пазіцыі (як у трэцім радку) [7, с. 244].

Входил в свою тихую келью,
Зажигал последний свет,
Ставил лампаду веселью
И пышный лилий букет [3, с. 170].

У першым і чацвёртым радку анакрузы аднаскладовыя, у другім – анакруза двухскладовая, у трэцім – нулявая. У другім радку – два аднаскладовыя інтэрвалы паміж націскамі («прывычным» для нас зараз з’яўляецца толькі адзін аднаскладовы інтэрвал у радку, тым больш у 3-іктным дольніку).

Гэтыя прыклады паказваюць, што рытм дольнікаў, які стаў нам прывычным дзякуючы савецкай паэтычнай традыцыі, зусім не

з'яўляецца адзіна магчымым. І калі рэдактар сустрэне «незвычайныя», непрывычныя рытмічныя варыяцыі, ён павінен гэта толькі вітаць і ні ў якім разе не спрабаваць выправіць.

Вось такія складанасці могуць напаткаць рэдактара нават у адносна прывычным дольніку, а што гаварыць пра тактавік і акцэнтны верш! Але падкрэслім, што, як было паказана, гэтыя складанасці не з'яўляюцца рытмічнымі недахопамі, таму іх не трэба выпраўляць, нягледзячы на ўсю «непрывычнасць» такіх версіфікацыйных форм. Тым больш рэдактар дапусціць грубую памылку, калі «забракуе» верш на падставе выкарыстання гэтых форм аўтарам. Такім чынам, мы прыходзім да высновы, што важныя ўмовы прафесійнага выканання рэдактарам сваіх абавязкаў пры рабоце з вершаванымі тэкстамі – начытанасць і веданне тэорыі вершавання.

Літаратура

1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры : XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; падрыхт. А. І. Богдан [і інш.]; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Бел. навука, 2005. – 1015 с.

2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 752 с.

3. Блок, А. Собрание сочинений : в 6 т. / А. Блок. – М. : Изд-во «Правда», 1971. – Т. 1. – 478 с.

4. Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – М. : Оникс, 2005. – 416 с.

5. Волошин, М. Избранное : стихотворения, воспоминания, переписка / сост., подгот. текста, вступ. ст. и коммент. З. Давыдова, В. Купченко. – Минск : Маст. літ., 1993. – 479 с.

6. Гаспаров, М. Л. Метр и смысл. Об одном механизме культурной памяти / М. Л. Гаспаров. – М. : Российск. гос. гуманит. ун-т, 1999. – 289 с.

7. Гаспаров, М. Л. Очерк истории русского стиха. Метрика. Ритмика. Рифма. Строфика / М. Л. Гаспаров. – 2-е изд., доп. – М. : Фортуна Лимитед, 2000. – 352 с.

8. Дуброўскі, А. У. Паэтыка Рыгора Барадуліна: рытмічная арганізацыя верша / А. У. Дуброўскі. – Мінск : Рэйплац, 2006. – 128 с.

Як падкрэслівалася, нераспазнаванне адрасатам інтэртэкстуальнай адзінкі з-за няведання прэтэксту можа не адбіцца на разуменні агульнага зместу публіцыстычнага артыкула (маем на ўвазе прафаннае, лінейнае прачытванне медыятэксту, падчас якога адбываецца рэцэпцыя толькі экспліцытнай інфармацыі), але імпліцытная інфармацыя, якую журналіст, кіруючыся пэўнымі матывамі (напрыклад, выкарыстанне інтэртэксту ў якасці эўфемізму), намагаўся перадаць праз спасылку на «чужы» тэкст, апеляцыю да пэўнага прэцэдэнтнага феномену, застанецца па-за ўвагай рэцыпіента: «... недарэчнасць, неапраўданасць выбара (як і трансфармацыя) прэцэдэнтнага феномена абавязкова прывядзе да камунікатыўнай няўдачы» [8, с. 228]. У такім разе нельга казаць пра паўнавартасны дыялог паміж журналістам і аўдыторыяй: «без разумення прапанаванага чытачу аўтарскага тэксту камунікацыя не можа адбыцца» [12, с. 21]. Такім чынам, у постмадэрнісцкім дыскурсе, які рэгламентуе сёння і тэкстабудаванне і тэкстаўспрыманне, г. зн. і аўтарскую і чытацкую дзейнасць па стварэнні тэксту, вытворца (донар) інфармацыі павінен дакладна ацэньваць і суадносіць сродкі, якія ён выкарыстоўвае для перадачы інфармацыі, з ментальнымі ўласцівасцямі і магчымасцямі чытача: «індывід павінен мець ключ для апазнавання разнастайных груп сістэмных знакаў, таму што інакш ён будзе ўспрымаць іх як абсалютна бяссэнсавую з'яву і не здолее ўключыць механізм працэсу апазнавання» [13, с. 57]. У сваю чаргу, як падкрэслівае доктар філалогіі Н. П'еге-Гро, «інтэртэкстуальнасць у поўнай меры прадугледжвае актыўнага чытача; менавіта ён павінен не толькі распазнаць наяўнасць інтэртэксту, але і ідэнтыфікаваць яго, а затым і даць яму сваё вытлумачэнне» [14, с. 132]. Інакш навукоўцам прыйдзецца канстатаваць пасля «смерці аўтара» (тэрмін Р. Барта) і «смерць чытача» як раўнапраўнага ўдзельніка працэсу стварэння і вытлумачэння тэксту.

Несупадзенне моўных карцін свету журналіста і рэцыпіента інфармацыі таксама можа адмоўна паўплываць на карэляцыю медыятэксту і інтэртэксту, паколькі «тэкст валодае значэннем толькі ў адпаведнасці з умовамі яго вытворчасці, а таксама і ў адпаведнасці з умовамі яго тлумачэння» [15, с. 552]. Калі пагадзіцца з Ю. Караулавым, што моўная карціна свету – гэта вынік узаемадзеяння сістэмы каштоўнасцей пэўнай асобы з яе жыццёвымі мэтамі, матывамі паводзін, інтэнцыямі і ўстаноўкамі, якія праяўляюцца ў тэкстах, што стварае гэта асоба, а таксама ў асаблівасцях успрымання чужых тэкстаў [11, с. 207], то можна меркаваць, што ментальна-кагнітыўную канфрантацыю паміж суб'ектамі камунікацыі, якая перашкаджае дасягненню перлакутыўнага эфекту журналісцкай дзейнасці, здольна спарадзіць, напрыклад, густавае непрыняцце адрасатам інфармацыі манеры журналісцкага пісьма, яго стылістычнай танальнасці. В. Іўчанкаў слушна заўважае, што пры асістэмным уключэнні ў журналісцкі тэкст інтэртэкстуальных адзінак можа быць спароджана парадаксальная сітуацыя, калі «вынік журналісцкай дзейнасці – тэкст – не суадносіцца з пэўнымі густамі, нават разумовымі здольнасцямі рэцыпіента» [9, с. 95]. Напрыклад, артыкул *«Пришел невод с... “травкой”»* (ЗЮ, 19.11.2004) беспадстаўна, на наш погляд, перанасычаецца інтэрлексемамі (эмацыянальна афарбаваныя моўныя адзінкі абмежаванай сферы выкарыстання (жарганізмы, аргатызмы, ненарматыўна-лаянкавыя і субстандартна-абсцэнныя лексемы), якія ўжываюцца замест агульнапрынятых для адлюстравання ў медыятэксце пэўнай рэальнай сітуацыі) і інтэрстылёвымі ўкрапінамі (лексічныя адзінкі аднаго стылю, якія ўключаюцца ў медыятэкст з мэтамі стварэння пэўнага каларыту і спараджэння ў чытацкай аўдыторыі адпаведных спецыфіцы публікацыі асацыяцый): «*среди **потребителей зелья сбытчица** наркотиков*», «***сильнодействующая отрава афганского происхождения***», «*девушка продавала “**кайф**” за бесплатную “**дозу**”*», «*переключилась на героин, которого в столице **было хоть завались***», «***дури** было в избытке*», «*а тут **вдобавок** сотрудники УПНОНа буквально **озверели**: то и дело они перекрывали каналы поступления “**дури**”, один за одним **поставщики** оказывались **в местах не столь отдаленных***», «*в разговоре с “**коробейницей**” “**оптовик**” сказал, что готов купить крупную партию наркотиков **за солидные бабки***», «*убедившись, что покупатель “**чист**”,*

*он предложил “**упакованному**” **клиенту** 350 граммов героина*», «***дельцы** решили встретиться*», «*“**оценщик**” захотел убедиться*», «*торговалась **братва** долго*», «*сам же “**сделал ноги**”*», «*напоследок попытался **выпендриться***», «*остаток героина “**затырили менты**”*», «***окончательно загрустил** он уже в ходе следствия*», «*сотрудники милиции блокировали “Опель” с **азиатом***», «***опера** нашли еще 221,1 грамма героина*», «*“**белая смерть**” попала в силки*». Падобную маштабную апеляцыю да прыёму інтэрстылёвага таніравання можна кваліфікаваць як парушэнне норм чысціні маўлення. Прафесар В. Сірацініна, аналізуючы літаратурна-жаргонны тып маўленчай культуры, адзначае, што характарызуецца ён наўмыснай жарганізацыяй маўлення (выбарам з сінанімічнага раду не літаратурнага слова, а яго прастамоўнага, дыялектнага, лаянкавага сэнсавага адпаведніка) і «назіраецца ў журналістаў не самай высокай культуры» [16, с. 345]. Дастаткова сумніўным уяўляеца той факт, што журналісту для стварэння адпаведных тэме публікацыі кантэксту і стылістычнага каларыту, наладжвання з маладзёжнай аўдыторыяй кантакту за кошт выкарыстання «пануючай», як, напэўна, лічыць журналіст, у маладзёжным асяроддзі лексікі спатрэбілася такая значная колькасць маўленчых адзінак абмежаванай сферы выкарыстання. Прадэманстраваны прыклад з'яўляецца, на наш погляд, яскравым узорам прафесійнай недапрацоўкі аўтарам публікацыі, а таксама недастатковай кампетэнтнасці літаратурнага і стылістычнага рэдактараў канкрэтнага СМІ.

Такім чынам, аналіз маўленчых карцін свету журналіста і рэцыпіента інфармацыі, вызначэнне адпаведнасці намераў журналіста пры ўключэнні інтэртэксту ў медыятэкст (адмове ад яго выкарыстання) фрэймавай характарыстыцы аўдыторыі (ментальны партрэт гіпатэтычнага чытача) пры прагназаванні верагоднаснага ўзаемадзеяння журналісцкага тэксту і інтэртэксту дазваляюць як аўтару артыкула, так і рэдактару, які заклікаваны ўдасканаліць тэкст, папярэдзіць неабгрунтаваную інтэртэкстуалізацыю публіцыстычнага маўлення, якая ў пэўных выпадках можа прывесці да стварэння не закладзеных у тэксце сэнсавых структур і псеўдарэалій, перашкодзіць спажыўцу інфармацыі зразумець пададзены факт або падштурхнуць да памылковай інтэрпрэтацыі яго ці нават прафанацыі.

Літаратура

1. Бразговская, Е. Е. Текст культуры: от события – к событию (логико-семиотический анализ межтекстовых взаимодействий) / Е. Е. Бразговская. – Пермь : ПГПУ, 2004. – 284 с.

2. Былинский, К. И. Язык газеты / К. И. Былинский. – М. : Изд-во МГУ, 1996. – 304 с.

3. Грицанов, А. А. Симулякр / А. А. Грицанов // Новейший философский словарь. Постмодернизм. – Минск : Современный литератор, 2007. – С. 550–553.

4. Дубовік, С. В. Даведнік журналіста / С. В. Дубовік. – Мінск : БДУ, 2006. – 222 с.

5. Елистратов, В. С. Словарь русского арго / В. С. Елистратов. – М. : Русские словари, 2000. – 694 с.

6. Зелянко, С. В. Рэдактарска-канцэптуальны аналіз інтэртэксту ў СМІ / С. В. Зелянко // Журналістыка-2010: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 12-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 8–9 снеж. 2010 г. / Бел. дзярж. ун-т; рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – Вып. 10. — С. 179–182.

7. Зеленко, С. В. Интертекст в публицистической речи: проблема корректировки стилистического регистра медиа-текста / С. В. Зеленко // II Кодуховские чтения : межвузовский сб. науч. и науч.-методических статей. – Ишим : ИГПИ им. П. П. Ершова, 2010. – С. 101–102.

8. Ильясова, С. В. Языковая игра в коммуникативном пространстве СМИ и рекламы / С. В. Ильясова, Л. П. Амири. – М. : Флинта, 2009. – 296 с.

9. Іўчанкаў, В. І. Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В. І. Іўчанкаў. – Мінск : БДУ, 2003. – 258 с.

10. Іўчанкаў, В. І. Інтэртэкстуальнасць у сучасным публіцыстычным маўленні / В. І. Іўчанкаў // Текст в лингвистической теории и в методике преподавания филологических дисциплин : материалы III Междунар. науч. конф., Мозырь, 12–13 мая 2005 г. : в 2 ч. / Мозыр. гос. пед. ун-т.; редкол. : С. Б. Кураш [и др.]. – Мозырь : МГПУ, 2005. – Ч. 1. – С. 135–136.

11. Караулов, Ю. Н. Русский язык и языковая личность / Ю. Н. Караулов. – М. : URSS : ЛКИ, 2007. – 261 с.

12. Клушина, Н. И. Интенциональные категории публицистического текста (на материале периодических изданий 2000–2008 гг.) : автореф. дис. ... д-ра. филол. наук : 10.01.10 / Н. И. Клушина; Московский гос. ун-т им. М. В. Ломоносова. – М., 2008. – 56 с.

13. Мисонжников, Б. Я. Феноменология текста (соотношение содержательных и формальных структур печатного издания) / Б. Я. Мисонжников. – СПб. : СПбГУ, 2001. – 490 с.

14. Пьеге-Гро, Н. Введение в теорию интертекстуальности / Н. Пьеге-Гро; пер. с фр. ; общ. ред. и вступ. ст. Г. К. Косикова. – М. : ЛКИ, 2008. – 240 с.
15. Серио, П. Дискурс и интердискурс / П. Серио // Семиотика : антология. – М. : Академический проект; Екатеринбург : Деловая книга, 2001. – С. 549–562.
16. Сиротинина, О. Б. Речевая культура / О. Б. Сиротинина // Стилистический энциклопедический словарь русского языка / под. ред. М. Н. Кожиной. – М. : Флинта : Наука, 2003. – С. 343–347.
17. Солганик, Г. Я. Выразительные ресурсы лексики публицистики / Г. Я. Солганик // Поэтика публицистики : сб. науч. ст. – М. : МГУ, 1990. – С. 10–20.
18. Ухванова-Шмыгова, И. Ф. Газета – аудитория: типология речевого взаимодействия / И. Ф. Ухванова-Шмыгова // Методология исследований политического дискурса : актуальные проблемы содержательного анализа общественно-политических текстов. – Минск : БГУ, 1998. — Вып. 1. – С. 186–200.
19. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка беларускай мовы / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 294 с.
20. Чернышова, Т. В. Современный публицистический дискурс (коммуникативно-стилистический аспект) / Т. В. Чернышова. – Барнаул : Алтай. ун-т, 2003. – 178 с.
21. Шестерина, А. М. Прецедентные тексты в полемических публикациях современной российской прессы / А. М. Шестерина // Феномен прецедентности и преемственность культур. – Воронеж : Воронеж. гос. ун-т, 2004. – С. 264–272.

Елизавета Ивченкова
Белорусский государственный университет

ЯЗЫК ЖУРНАЛИСТСКОГО ПРОИЗВЕДЕНИЯ КАК ОТРАЖЕНИЕ КУЛЬТУРЫ СЛАВЯНСКОГО НАРОДА

Проблема «языка и национальной культуры» имеет многоаспектный характер и представляет собой своеобразную дихотомию, выражающуюся в том, что язык – отражение национальной культуры – представлен в речемыслительной деятельности (логосфере) носителей языка. Язык как система знаков отражает мир во всем его многообразии и служит ярким презентантом речемыслительной деятельности общества.

Человек, язык и культура находятся в постоянной корреляции, образуя своеобразный «триумвират», интересующий гуманитарные науки: журналистику, лингвокультурологию, эстетику, философию. Язык является первоосновой культуры, которая представляет соци-

альный продукт. По мнению А. Е. Супруна, язык, «с одной стороны, является одним из важнейших достижений истории человеческой, он выступает и как слагаемое культуры и как ее орудие. Однако, с другой стороны, в самой материи языка, в ряде существенных характеристик языковой структуры отразилась биологическая природа человека» [11, с. 48]. Взаимозависимые понятия язык-культура дихотомичны, потому что продуцируются в новых явлениях и одновременно поддерживаются укладом всего сущего.

Язык – наиболее глубокая всеопределяющая структура во всякой национальной культуре. По утверждению Вильгельма фон Гумбольдта, «язык всеми тончайшими фибрами своих корней связан с народным духом, это его внутренняя поэтическая энергия» [5, с. 18]. Известный исследователь Анна Вежбицкая приводит пример из области гастики: «В польском языке есть особые слова, обозначающие солянку из тушеной капусты (bigos), свекольный суп (barszcz) и особого рода сливовый джем (powidła). В английском языке таких слов нет. Но в нем есть, например, обозначение апельсинового джема – marmalade, а в японском – слово, означающее крепкий алкогольный напиток, приготовляемый из риса (sake)» [3, с. 15]. Белорусской культуре принадлежат слова *брыль, чыгунка, ваўкалак, знічка, неруш, здарожыцца, пасталець*. Перед нами так называемая безэквивалентная лексика, т. е. не имеющая переводных вариантов на другой язык. В работах И. Г. Шкрабы «Самабытнае слова» (1994) и в «Словаре белорусскоязычной безэквивалентной лексики (в русскоязычном отношении)» (2008) таких единиц приводится около 800 и около 2 000 соответственно. Именно эта лексика является аккумулятором обозначений специфических явлений национальной культуры.

По утверждению Н. Б. Мечковской, о доле безэквивалентной лексики в национальном словаре можно судить по следующим данным: русские безэквивалентные слова и обороты (*сельсовет, воскресник, гармошка, народоволец, бить челом, толстый журнал* и т. п.) составляют 6–7 % от общеупотребительной русской лексики. Англо-русский лингвострановедческий словарь «Великобритания» (далеко не исчерпывающий явление семантической конденсации) толкует 9 500 подобных слов и словосочетаний (включая и некоторые известные топонимы).

Язык как звучащая речь, посредством которой происходит общение, – самый важный инструмент коммуникации, то есть получения,

хранения, дешифровки, интерпретации культурных кодов. В своем живом проявлении речь не может существовать без ее носителя – человека, пребывающего в социальной среде и в некоторой степени ограниченного рамками культуры. Под воздействием культуры язык меняется, что проявляется в своеобразии самого процесса общения в разных культурах. Это может сказываться в некоторой специфике лексики и грамматики, а также в особенностях нормативно-стилистического уклада языка.

Воздействие культуры на язык ярко и цельно проявляется в том, в каких формах существования, семиотических системах он представлен. Так, существует язык вербальный и невербальный, язык искусства, язык математики и т. д. Ч. У. Моррис отмечает, что «термин «язык», как и большинство терминов, относящихся к знакам, неоднозначен, поскольку его признаки могут быть сформулированы в терминах различных измерений. Представитель формальной логики склонен рассматривать язык как любую аксиоматическую систему, независимо от того, обозначает ли эта система какие-нибудь объекты и использует ли ее реально какая-либо группа интерпретаторов; и, наконец, представитель прагматизма склонен рассматривать язык как тип коммуникативной деятельности, социальной по происхождению сущности, с помощью которой члены социальной группы более успешно удовлетворяют свои индивидуальные и общие нужды» [7, с. 45].

Язык универсален, необходим для человека, так как это форма коммуникации и познания. Его «знаковая структура является дискретным слепком и морфологическим результатом рефлексии взаимодействия человека и природного универсума, возникающей на основе становления субъектно-объектных отношений» [12, с. 176]. На современном этапе наблюдается отказ от «имманентной» лингвистики, язык «становится все более *человечным*: в поле его зрения оказываются многие ранее даже не поднимавшиеся вопросы – этнографии речи, язык социального статуса, культурная семантика, национальная специфика семантики языка» [6, с. 10]. В свете антропологической парадигмы изучение языка как знаковой системы, включающей многогранный комплекс взаимосвязей с бытом, сознанием народа, а также процессы кодирования и декодирования культурных реалий, является предметом пристального внимания философов, лингвистов, культурологов (Б. Кроче, К. Фосслер, Л. Шпитцер, Марсель Гране,

Клод Леви-Строс, Жан Пиаже, Шарль Балли, Альф Соммерфельт, М. Фуко, Н. Хомский, А. Вежбицкая и др.).

Возникающий вопрос о взаимодействии текстовых кодов в культуре и вербалике подчинен проблеме детерминизма дихотомии *язык – культура*. В современной лингвистике, как правило, не ставится вопрос о детерминизме языка и культуры. Обращаясь к проблеме «язык и культура», ученые не стремятся решать, «что первично и что вторично»: язык или культура. Вернее, искать те или иные корреляции между структурами языка и культуры. Язык как сущность двусторонняя, состоящая из формы (звуки, графические символы, линии, объемы) и внутреннего значения (эмоциональность, психические процессы, умственная деятельность), специфичен в отражении вещного мира. Именно значение, которое вкладывается в знаковые формы, и является определяющим для данной культуры, общества, «культура в словаре – только культура, а сам словарь как целое представляет эту культуру» [8, с. 38]. Культура записывает явления в виде знаковых систем, а затем транслирует их и передает посредством (кода) языка, чем реализуется фатическая и коммуникативная функции в речемыслительной деятельности.

Человек неотделим от природы, и язык также подчинен ее власти. Возникает постоянное стремление человека к мимезису, поэтому, порождая культурные коды, он опирается на «дом» и «я». Это проявляется на различных уровнях языка, в частности, на фонетическом: «Во всех языках мира количество гласных и согласных и преобладание звуковых цепей с чередованием гласных и согласных обусловлено не культурой, а природой. Человек не в состоянии ни произносить, ни воспринимать речь из одних гласных или согласных» [11, с. 48], синтаксическом, семантическом: ограниченный объем оперативной памяти человека определяет среднюю длину предложения, размеры лексико-семантических групп, длину синонимического ряда и т. д.

Истоки изучения культурных кодов выросли из научных изысканий древности. Герменевтические исследования, толкования религиозных текстов (Веды, Коран) приводят к экспликации, обрисовке национального компонента определенной культуры, составлению «языкового портрета» народа. Так, основными нуминозными концептами древнеиндийских Вед являются *гора* и *вода*, которые очень четко указывают на ценностные установки индийской культуры. Гора – «устремление ввысь, избавление от бренного тела», вода означает растворенность человека как имманация бытия.

С. Рыжакова в статье «Индийские боги живут на деревьях» упоминает о том, что «горы и реки в индийской культуре, два символа вечности, образуют ландшафт Гархвала и становятся прообразом традиционного индуистского храма – с возвышающейся башней-виманой, похожей на горный пик, и струящейся внизу водой для омовений» [7]. В Коране представлены «следующие концепты: «Бог и человек, мир, путь (стезя, прямой путь), благо, истина. Нами были выделены и концепты: знание (книга, писание, перо, знать, ясный, знамение, откровение, тайное-явное, ясный и т. п.), количество (числа: 40 ночей, 12 источников, 4 птицы, 6 дней, пары, удвоить, умножить и т. п.). Особое место занимает концепт время. Во всех переводах Корана лексемы *день и час* имеют сакральное значение, обозначая срок (несомненный, неотвратимый)» [1, с. 3].

Из вышеизложенного следует, что менталитет нации закодирован в языке. Например, категория темпоральности относительна в разных культурах. Индуисты относятся ко времени терпимо, как к трансцендентной сущности, корни которой уходят в небытие, вечность, для арабов же время более «материально», более точно и определимо.

Вопрос о корреляции «язык и национальная культура» также имеет глубокие корни. Так, древнегреческий мыслитель Гераклит Эффеский уделял большое внимание взаимосвязи культуры и языка. Философ ввел в научный обиход термин *логос* в значении ‘смысл, понятие, слово’. Логос представляет собой общий закон, смысл всего сущего, способ передачи мудрости от учителя к ученику. Логос вечен и отражает действительное знание вещей. Внутреннее наполнение постоянно обновляется, отодвигая свои пределы. В этом контексте употреблена знаменитая фраза Гераклита «Как в одну реку ты не вступишь дважды, так и пределов души ты не отыщешь, столь обширен ее логос». По мнению Гераклита, душа отражается в слове, понятии. Это дает возможность предположить, что древнегреческий мыслитель говорит о дуалистическом единстве язык-речь, а логос является ключом к познанию. Подобные суждения носили рудиментарный характер и не достигли окончательного развития.

Более строго и прямолинейно, ригористически и более основательно проблему онтологической природы языка осветил Вильгельм фон Гумбольдт. Он выдвинул деятельностно-энергетическую концепцию языка. Его труд «О различии строения человеческих языков и его

влияние на духовное развитие человечества» произвел переворот в языкознании. Ученый утверждает, что человек воспринимает предмет так, как преподносит его язык. «Каждый язык описывает вокруг народа круг, откуда ему не дано выйти постольку, поскольку он попадает в круг иного языка». В его научных работах отражается проблема языковых картин мира. «Понимая язык как орган, образующий мысль, Гумбольдт подчеркивает зависимость языка от мышления и обусловленность его каждым конкретным языком, заключающим в себе свою национальную самобытную классификационную систему, которая определяет мировоззрение носителей данного языка и формирует их картину мира. Говоря о том, что, овладевая другими языками, человек расширяет «диапазон человеческого существования», Гумбольдт имел в виду именно постижение при помощи языка – через «языковое мировидение» – картины мира другого народа» [2, с. 78]. По мнению В. фон Гумбольдта, язык – важный компонент культуры, хотя он менее всего осознаваем. В свою очередь, в языке нельзя видеть намеренное произведение народа, так как язык – доставшийся народу дар, при помощи которого человек становится деятельностным.

Последователи В. фон Гумбольдта занимались также изучением языка в неразрывной связи с культурой конкретного народа. Эрнст Кассирер, яркий представитель неогумбольдтианской школы, занимался вопросом роли языка в культуротворчестве. Человек живет в мире знаков, знание о мире корреспондируется посредством символики речи. Исходя из взаимообусловленности существа человека и культуры, Кассирер во «Введении в философию культуры» анализирует основные из существовавших в истории концепций человека и приходит к выводу, что «символ — ключ к природе человека».

Для описания мировоззрения и эмоциональной стороны человека, фиксированных в языке, используется термин концепт, который ввел С. А. Аскольдов, а развили учение о нем Д. С. Лихачев и Ю. С. Степанов. Д. С. Лихачев понимал концепт как отклики на предшествующий языковой опыт, то есть многомерный мыслительный конструкт, отражающий процесс познания мира, результаты человеческой деятельности, его опыт и знания о мире, хранящий информацию о нем [6, с. 35]. Концепт замещает слово схематично. Он ввел понятие концептосферы национального языка – сжатое алгебраическое выражение всей культуры нации.

В работах Ю. С. Степанова концепт представлен как единица культуры, способ ее отражения в сознании. Он утверждает, что «пронизование» человека культурой структурировано и осуществляется через ментальные образования, концепты – сгустки культуры в сознании человека, в виде чего культура входит в ментальный мир человека, заключаясь в языковые формы [10, с. 40]. То есть культура мыслится как нечто отдельное от человека, но вместе тем тесно связанное, «человек – не «творец культурных ценностей», а сам входит в культуру, а в некоторых случаях влияет на нее» [11, с. 40].

Анна Вежбицкая говорит о «сплетении» языка-культуры посредством концептов, семантический анализ которых «должны по возможности дать полное знание о понятиях, существующих в сознании носителей культуры» [3, с. 289]. При помощи концептуального анализа можно исследовать культуру и язык. В своей работе «Семантические универсалии и описание языков» А. Вежбицкая подробно описывает все валентности слов и указывает на то, как они могут заполняться, а также раскрывает их роль в культуре.

Через языковые концепты можно представить определенные коммуникативные установки, характеризующие полномасштабно их производителя. Так, в газете «СБ. Беларусь сегодня» превалируют соматизмы *глаза* и *рот*, что можно квалифицировать на паравербальном уровне как факт «смотрения» и «говорения», т. е. синхронного описания происходящего, фиксирования медиасобытия (глаза), оповещения, интерпретации происходящего (рот). В философском преломлении реализуется формула «смотрю и говорю», которая может вывести на раскодирование информационных сегментов самого издания.

Соматическое наполнение кода газеты «Звязда» можно охарактеризовать концептами «глаза», «руки», что свидетельствует о формульной установке «видения» и «возделывания»: «смотрю» и «делаю».

«Gazeta Wyborcza» имплицирует себя в соматизмах *руки* и *сердце*, что напрямую связано с общественным и государственным укладом жизни поляков, и, в первую очередь, с глубокой религиозностью: «делаю, что чувствую».

Тексты рассматриваемых изданий кодированы в силу своей культуроспецифичности: в каждой культуре поведение людей регулируется стереотипами. В их возникновении и культивировании огромную роль играют СМИ – фундамент социального опыта и ментального мира носителей конкретного языка.

Литература

1. Аминова, А. А. Концепты мусульманского мира в языке разновременных переводов Корана на русский язык / А. А. Аминова // Концептуально-семантический и системно-функциональный аспекты: материалы итоговой научной конференции. – Казань, 2002.

2. Андрющенко, Н. А. Проблема языка и картины мира в философии культуры XX века / Н. А. Андрющенко // Философия культуры. Становление и развитие. – СПб., 1998. – С. 78.

3. Вежбицкая, А. Понимание культур и описание языков / А. Вежбицкая // Семантические универсалии и описание языков; под ред. Т. В. Булыгиной. – М., 1999. – С. 15.

4. Верещагин, Е. М. Язык и культура: Лингвострановедение в преподавании русского языка как иностранного / Е. М. Верещагин, В. Г. Костомаров. – М., 1983. – С. 55–68.

5. Гудков, Д. Б. Телесный код русской культуры: материалы к словарю / Д. Б. Гудков, М. Л. Ковшова. – М., 2007.

6. Красавкий, Н. Эмоциональные концепты в немецкой и русской лингвокультурах / Н. Красавкий. – М. 2008. – С. 10.

7. Моррис, Ч. У. Основания теории знаков / Ч. У. Моррис // Семиотика; под ред. Ю. С. Степанова. – М., 1983. – С. 19–22.

8. Рождественский, Ю. В. Философия языка и учебный предмет / Ю. В. Рождественский. – М., 2006. – С. 38.

9. Сайфи, Л. А. Концептуализация соматического образа человека в языке и дискурсивных практиках : автореф. ... канд. филол. наук / Л. А. Сайфи. – Уфа, 2008.

10. Степанов, Ю. С. Константы. Словарь русской культуры / Ю. С. Степанов. – М., 1997. – С. 40.

11. Супрун, А. Е. Общее языкознание / А. Е. Супрун. – Минск, 1983. – С. 48.

12. Яковенко, И. Г. Культура как система / И. Г. Яковенко, А. А. Пелипенко. – М., 1998. – С. 176.

Віктар Іўчанкаў
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

МЕДЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ СУЧАСНАСЦІ: РЫЗЫКІ НЕВЕРБАЛЬНАГА ДЗЕЯННЯ Ў ПРАЕКЦЫІ НА РЫТАРЫЧНЫ ІДЭАЛ САКРАТА–ПЛАТОНА

Журналіст – камунікатыўны лідар, таму ўменне прачытваць маўленчую сітуацыю, прадбачыць працэс яе разгортвання, разумець суразмоўцу і прагназаваць вынікі кантактавання не менш важнае, чым, «аддзяляючы зерне ад жыцікаў, публікаваць жыцікі» [3, с.17].

Функцыянальная стратыфікацыя публіцыстыкі паводле сваіх разнавіднасцей (страт) характарызуецца асаблівай сістэмай арганізацыі, дзе вербальныя стратэгіі, тактыкі і разумова-маўленчая дзейнасць грамадства (лагасфера) выражаюцца найбольш наглядна, вызніваюцца асаблівым перлакутыўным эфектам.

Умець скарэктаваць маўленчую падзею, знаходзячы ісціну, ёсць вызначальная якасць прафесіі журналіста. Толькі раўнапраўны, суб’ект-суб’ектны дыялог з чытачом уганаруецца поспехам, калі homo eloquens бачыць свайго суразмоўцу такім, як ён сам, – жывым, дзейсным, актыўным суб’ектам, а не чыстым лістом, які трэба спісаць, пустым сасудам, які трэба запоўніць. Шукай ісціну ў дыялогу! Сакрат даў нам вялікае адкрыццё: ён паглядзеў на чалавека, з якім размаўляў, абсалютна інакш, як гэта было да яго, у сафістаў. Ён убачыў у іншым сябе самога, ці ўбачыў сябе самога як іншага, і ператварыў гэтага іншага ў суразмоўцу. Гэта стала пачаткам сапраўднага дыялогу, перададзенага нам, нашчадкам, у якім погляд на чалавека быў новым, напоўненым гармоніяй і пошукам ісціны, а аўдыторыя пераставала быць пасіўным аб’ектам, падпарадкаваным маніпулятыўнай сіле маўленчага дзеяння. Сіла ўздзеяння інфармацыі, маштаб уплыву на грамадскую думку вымушае журналістыку быць павелічальным шкельцам пры выражэнні непазбежных сацыяльных эмоцый і меркаванняў, нават калі ацэначнасць пільна маскіруецца пад аб’ектыўнасць. Бо маўленчая дзейнасць журналіста ў цесным звязку з актуалізаванымі сацыяльнымі дзеяннямі грамадства вызначае асноўныя прыярытэты развіцця і адлюстроўвае механізм уладкавання маўленчых зносін суб’ектаў камунікацыі – СМІ і чалавека.

У сучаснай вербалістыцы вылучаюцца два тыпы рытарычнага маўлення – сафістычны (амерыканізаваны, сёння ўзяты на ўзбраенне медыямі) і Сакрата–Платона (еўрапейскі, славянскі, усходнеславянскі, айчынны). Такая тыпалогія бярэ пачатак з антычнай Грэцыі, калі ў час сафістаў і Сакрата паралельна існавалі ў напружанай барацьбе адно з адным два ідэалы прамовы. Паводле Сакрата, такая прамова ісцінная, карысная для грамадства, строга ўпарадкаваная ў сэнсавым і фармальным планах. Ідэал сафістаў зусім іншы. Прамова павінна быць «падпарадкавальнай», маніпулюючай сілай. Другім патрабаваннем з’яўлялася фармальная, слоўная прыгажосць і элегантнасць, трэцім – лагічная вытанчанасць і трафарэтна-лагічная правільнасць. Усё гэта прыводзіла да галоўнага, якое не выстаўлялася напаказ, – давала магчымасць самавыражэння ў прамове. Выдатная прамова для сафіста – гэта перш за ўсё пэўная самарэклама, самасцвярджэнне.

Сафістычны ідэал сфарміраваўся з вучэння, якое мела цягу да рэлятывізму і прапаведвалася філосафамі-асветнікамі. Яны лічыліся першымі прафесійнымі настаўнікамі аратарскага майстэрства. Сафіст (sophistes – мудрэц), настаўнік мудрасці вучыў: як у вольнай дзяржаве чалавек мае права меркаваць аб дзяржаўных справах і патрабаваць, каб з ім лічыліся, так і пра любы прадмет усякі чалавек мае права мець сваё меркаванне, і яно мае столькі ж правоў на існаванне, як і любое іншае. Аб’ектыўнай ісціны няма, ёсць толькі суб’ектыўнае меркаванне пра яе: чалавек ёсць мера ўсіх рэчаў. Адсюль робіцца выснова: нельга гаварыць, што адна думка больш сапраўдная, чым другая; можна толькі гаварыць, што адна думка больш пераканальная, чым іншая. Навучыць пераконваць, «слабае меркаванне быць моцным» – асноўная задача сафістаў-настаўнікаў. Да іх мог звярнуцца кожны, хто хацеў спасцігнуць веды. Яны прапаноўвалі навучыць любога жадаючага даступным ведам і гэтым зрабіць яго дасканалым. У распараджэнні сафістаў было два сродкі: дыялектыка (майстэрства разважаць) і рыторыка (майстэрства гаварыць). Першая была накіравана на розум слухача, другая – на пачуцці. Калі чалавек валодае гэтымі двума майстэрствамі – перамога яму забяспечана. Тады і рэалізуецца катонаўскі запавет: «Vir bonus dicendi peritus» (годны муж – майстар у слове).

Спачатку сафісты вучылі вынайдзеным імі ж лагічным прыёмам доказу і абвяржэння, яны адкрылі шэраг правіл лагічнага мыслен-

ня, аднак у хуткім часе адышлі ад прынцыпаў яго арганізацыі і сканцэнтраваліся на распрацоўцы ўловак, хітрыкаў, заснаваных на знешнім падабенстве з'яў, на тым, што канкрэтная сітуцыя вынікае з агульных месцаў (loci communes), падзея зыходзіць з агульнай сувязі падзей, на полісеміі, на падмене паняццяў, і г. д. сафісты Пратагор, Горгій, Гіпій, Продзік, Антыфонт усе ісціны выставілі сумніўнымі, аб'явілі іх адноснымі, што прыводзіць да абвяржэння аб'ектыўнай ісціны. «Малодшыя» сафісты Фразімах, Крыцій, Алкідам, Лікфрон, Палемон, Гіпадам бяруць на ўзбраенне жангліраванне словамі, фальшывыя прыёмы доказу ісціны і падману адначасова. З гэтага пачынаецца ідэйнае раздваенне сафістыкі. Нездарма ўжо ў антычнасці да сафіста ставіліся двуяка: як да настаўніка мудрасці і як да рытара-краснабая, які «ўмее гаварыць пра ўсё, не ведаючы нічога». У выніку ўзнікаюць сафізмы – наўмыснае прымяненне ў спрэчцы і доказах падманлівых аргументаў, заснаваных на свядомым парушэнні лагічных правіл. Менавіта гэта адрознівае іх ад паралагізмаў і апорый, якія могуць утрымліваць у сабе ненаўмысную памылку або ўвогуле не мець лагічных памылак, але прыводзіць да яўна няправільнага вываду.

Сафістычнае красамоўства стала базай для стварэння арсеналу хітрык і ўловак у спрэчцы, якія з поспехам прымяняем і па сёння, не задумваючыся пра іх маніпулятыўную сілу. Такіх прыёмаў налічваецца сотні: ад самых банальных, незаўважных, да вытанчаных. Напрыклад, чуем: «Вы, канечне, чыталі гэтую кнігу…», «Канечне, вы ведаеце гэтага рэжысёра…», «Не сумняваюся, што вы, такі разумны і інтэлігентны, не дазволіце…», «Вы, як будучы журналіст, павінны ведаць…». Гэтыя прыёмы часам называюць «стаўкай на падманлівы сорам». Пры такім звароце да суразмоўцы хаваецца небяспечная сіла ўплыву. Як жа прызнацца, што ты не чытаў твора ці не ведаеш рэжысёра, і ты пачынаеш губляць свае пазіцыі, падпарадкоўвацца, табой пачынаюць маніпуляваць. Банальная сітуацыя, калі ў спрэчцы са студэнтам у запале не вытрымлівае выкладчыца: «Я трыццаць гадоў выкладаю, а вы мне будзеце даказваць…», прыструньвае шэф свайго падначаленага: «Калі будзеце на маім месцы, то і загадаеце…», выступоўца, не называючы кагосьці канкрэтна, прыбягае да надуманага аўтарытэту: «Як сцвярджаюць амерыканскія даследчыкі…» і шмат інш. Калі так звяртаюцца, то гэта азначае толькі адно: у апанента няма аргументаў.

Росквіт сафістыкі быў даволі бурным, але нядоўгім. Узнёсшыся разам з уздымам афінскай дэмакратыі, яна заняпала з ёю. Ідэал грамадскага жыцця распадаецца на два ўзаемавыключальныя паняцці: жыццё дзейснае, ідэалам якога быў палітык і рытар («Vir bonus dicendi peritus»), і жыццё сузіральнае, ідэалам якога быў філосаф, тэарэтык і мысліцель. Антычная культура раздвойваецца на два полюсы – рыторыку і філасофію, паводле якіх сфарміраваліся культурныя ідэалы; паміж імі часам вялася жорсткая барацьба, калі намячалася перамір'е, але барацьба ніколі не заканчвалася перамогай аднаго над другім, а перамір'е не ператваралася ў зліццё абодвух.

Першым супраць вучэння аб адноснасці ісціны і сафістычнага рытарычнага ідэалу катэгарычна выступіў Сакрат. Абсалютная ісціна існуе, яна Божая, вышэйшая за чалавечыя меркаванні, і яна з'яўляецца мерай усіх рэчаў. Рытар сам павінен ведаць, што праўдзівае, а што падманлівае, што ёсць справядлівасць і несправядлівасць. Не валодаючы такімі ведамі, рытар-сафіст, які імкнецца да поспеху, будзе ісці за публікай, патакаючы ёй, прыносячы гэтым не карысць, а шкоду. Узгадаем заключны фрагмент «Апалогіі Сакрата» – прамову пасля вынясення яму смяротнага прысуду: «Быць можа, вы думаеце, афіняне, што я асуджаны таму, што ў мяне не хапіла такіх доказаў, якімі я б мог схіліць вас на свой бок, калі б не лічыў бы рабіць і гаварыць усё, каб пазбегнуць прысуду. Зусім не. У мяне, праўда што, не хапіла, толькі не доказаў, а дзёрзкасці і бессаромнасці і жадання гаварыць вам тое, што вам прыемней за ўсё было б слухаць: каб я аплакваў сябе, бедаваў, словам, рабіў і гаварыў многае, што вы прызвычаіліся чуць ад іншых, але што недастойна мяне, як я сцвярджаю» [Цыт па кн.: Михальская А. К., с. 19]. Наступным момантам найвышэйшага абвастрэння барацьбы двух рытарычных ідэалаў сталі дыялогі Платона «Федр» і «Горгій».

Пасля заваяванняў Аляксандра Македонскага фарміруецца новая плынь, якую сучаснікі назавуць «азіянствам». Перайманне стыляў і прамоўніцкіх манер Лісія, Платона і Дэмасфена былі ўганараваны імем атыцызму, а традыцыі эліністычнай школы заклеймаваны кплівай мянушкай «азіянства». Развіццё класікі падмянялася яе дагматызацыяй. Замест жывога слова асновай творчасці стала педантычная вучонасць, творы аднаўляліся паводле класікаў таго часу, інтэрпрэтаваліся паводле густаў тэарэтызуючых эстэтаў. Атыцызм стаў модай, даступнай толькі вузкаму колу знаўцаў тако-

га мастацтва. З заняпадам рабаўладальнай дэмакратыі рыторыка ператвараецца ў нарматыўна-каталагізатарскую дысцыпліну і ратвараецца ў стылістыцы, якая і да апошняга часу ўтрымлівае ў сабе вялікі арсенал сродкаў, прыёмаў, фігур, тропаў, так бы мовіць, гатовых формул для пабудовы мастацка адзначанага маўлення, для ўпрыгожвання яго.

Паводле звестак розных энцыклапедый, наменклатура тропаў у антычнасці налічвала каля дзвюхсот адзінак. Найбольш вядомыя сучасніку віды тропаў – метафара, увасабленне, персаніфікацыя, эпітэт, аксюмаран, антанамазія, метанімія, сінекдаха, літота, гіпербала і інш. – толькі часцінка гэтай наменклатуры. Безумоўна, *і інш.* зусім не пазначае, што працэс іх стварэння вычарпаны. І справа не столькі ў розных падыходах даследчыкаў да гэтай з'явы, а ў самім працэсе трапеічнасці, у арбіту якой можа быць зацягнуты любы семантычны перанос, вар'іруючы мільённымі выпадкамі спалучальнасці слова са словам. Як бачым, нават на класіфікацыйным узроўні працэс стварэння тропаў (семантычнага пераносу па аналогіі, супастаўленні, падабенстве) бясконцы. «Мастацкія тропы ўяўляюць сабой з'яву, якая па сваёй прыродзе супадае са з'явай стварэння новых слоў у самой мове. Розніца заключаецца толькі ў тым, што новае значэнне, якое ўзнікла ў мове, становіцца абавязковым і агульнараспаўсюджаным, у той час як тропы маюць спецыяльныя выразныя функцыі і ўвогуле не захоўваюць за сабой часавых значэнняў, што ўзнікаюць у адпаведным кантэксце» [3, с. 227].

Перад тым як стаць набыткам сучаснікаў, формулы тропаў павінны былі быць вынайдзены. І часцей за ўсё гэта рабілася на антычных народных форумах, калі трэба было запаліць сэрцы людзей, звярнуць іх розум да пераканання, вобразнасцю ўзмацніць аргумент.

Публіцыстычны тэкст мае выразныя адметнасці функцыянавання, сутнасць якіх можна звесці да вядомага пастулата: хто валодае інфармацыяй – той валодае светам. Калі паспрабаваць знайсці асноўны адменнік існавання публіцыстычнага маўлення ад іншых дзейнасных у жыцці чалавека сфер, то можна звесці суму адрознівальных уласцівасцей тэксту СМІ да анталагічнага па сваёй прыродзе феномену – утрымліванне ў сабе актуальнай інфармацыі. Публіцыстычны тэкст ёсць складнік жыцця любога цывілізаванага грамадства, у ім маніфестуецца вобраз, лад жыцця народа, выразна

адбіваецца этна-псіхалагічны склад, у выявах аўтарскага «я» журналіста праглядаецца аблічча часу, месца і вымярэння людской далучанасці да працэсаў пазнання навакольнага свету.

Творчасць СМІ выступае ў ролі прадвесніка, а далей і выразніка ўзнікнення пэўных маўленчых тэндэнцый, замацавання заканамернасцей развіцця мовы. Мова СМІ вылучаецца сацыяльнай ацэначнасцю, у аснову якой кладзецца прынцып пеяратыўнасці пры маніпуляванні фактамі, што адчужаюцца ад каштоўнасцей пабудаванага грамадства, і прынцып пеяратыўнасці пры ўхваленні «сваіх» вартасцей. Вынікам агульнай тэндэнцыі слоўнай ацэначнасці стала завострана экспрэсіўная, стылістычна вульгарызаваная лексіка, накіраваная на выкрыццё «чужароднасці», адпаведная камунікатыўным установкам адрасата. Суб'ектыўная мадальнасць медыямаўлення паказвае на знешне схаваную, імпліцытную пазіцыю журналіста, які не жадае праяўляць сваю рэакцыю на рэчаіснасць адкрыта, але на гэта паказваюць мадыфікатары асноўнай мадальнай кваліфікацыі, ствараючы ў мадальнай іерархіі выказвання кваліфікацыю «апошняй інстанцыі» – непрымірaльнай пазіцыі, як таго патрабуе карпаратыўны інтарэс выдання. У такім выпадку на перыферыі выказвання ўзнікае імітацыя дадатковага семантычнага ядра, што стварае эфект паліпрэдыкатыўнасці паведамлення. Гэта якраз і адлюстроўвае складаныя ўзаемадзеянні паміж чатырма фактарамі камунікацыі: гаворачым (адрасантам), суразмоўцам (адрасатам), зместам выказвання і рэчаіснасцю.

Сукупнасць мадальных і аўтарызаваных канструкцый у дачыненні да мэтавых установак матэрыялу спараджае патрэбу змяніць афармленне і размеркаванне традыцыйных жанраў газетных публікацый, абвастрае пытанне аб змяшчэнні межаў паміж імі. Адсюль узрастае доля ўвагі да розных спосабаў аўтарызацыі газетнага тэксту. Напрыклад, перадавы артыкул мінулага быў прадуктам рэдакцыі, меў калектыўнае аўтарства, быў агітатарам і прапагандыстам. З канца 90-х гадоў XX стагоддзя ён выдаляецца з першай паласы газеты. Што прыйшло на змену аналітычнаму жанру? Першыя паласы газет мінулага і сённяшнія даюць наглядны адказ на пытанне. Святое месца пустым не бывае, на змену першапалоснай перадавіцы прыйшлі новыя сродкі падачы інфармацыі ў выглядзе паведамленняў, фотакалажаў і інш. Гэта кардынальным чынам памяняла грамадства, якое перастала быць аб'ектам павучання, чыстым лістом

(tabula rasa), маніпуляцыі, а становіцца раўнапраўным суб'ектам, які паводле прачытанай, праслуханай, прагледжанай інфармацыі мае права выбару, альтэрнатывы, роздуму.

У апошняе дзесяцігоддзе актыўнымі замяняльнікамі перадавіцы сталі калонкі рэдактара, думкі, меркаванні і блогі, у якіх падаецца персаніфіцыраваны погляд, аналітычны агляд падзей, разлічаныя на актыўнае супрацоўніцтва з чытачом, на рэалізацыю суб'ект-суб'ектных вербальных адносін.

Такім чынам, медыйная вербалістыка сучаснасці, вызваленая ад рытуальнай зададзенасці, апелюе да такіх якасцей, як іранічнасць, самаіронія, скепсіс і крытычнасць ва ўспрыманні і супастаўленні інфармацыі, здольнасць адзначаць эстэтычнае афармленне маўлення, нецярпімасць да катэгарычнай ацэначнасці.

Журналісцкі тэкст можа адпавядаць ці не адпавядаць пэўным правілам пабудовы, сістэмнасці паводзін моўнага факта ў складаным цэлым, але ён заўсёды павінен мець арсенал ключавых камунікатыўных кампазітаў, скіроўваючых яго на існасць, прызначанасць свайго існавання. Такімі камунікатыўнымі кампазітамі з'яўляюцца знешнелінгвістычныя фактары функцыянальнай накіраванасці СМІ. Будуецца даволі складаная іерархія пераўтварэння індывідуальнага духоўнага прадукта, прапанаванага праз СМІ канкрэтнымі людзьмі, у прадукт грамадскі, калектыўны. Публіцыстычныя тэксты адрозніваюцца незвычайнай шырынёй тэматыкі, яны могуць датычыць любой тэмы, якая патрапіла ў цэнтр грамадскай увагі. Гэта натуральным чынам уплывае на журналісцкае маўленне: узнікае неабходнасць уключаць спецыяльную лексіку, якая патрабуе тлумачэнняў, а калі і разгорнутых каментарыеў. З другога боку, шэраг тэм пастаянна знаходзіцца ў полі зроку грамадскай увагі, і лексіка, якая адносіцца да гэтых тэм, набывае публіцыстычную афарбоўку. Фарміруецца пласт маўленчых адзінак, характэрных для публіцыстычнага тэксту, камунікатыўная прызначанасць якога спрыяе канструяванню своеасаблівага тэзаўруса. Апошні вызначаецца не жанрава і не функцыянальна, а сацыяльнай абумоўленасцю камунікацыі, якая становіцца важным механізмам станаўлення індывіда як сацыяльнай асобы, праваднікам установак пэўнага соцыуму, фарміруючых, у сваю чаргу, індывідуальныя і групавыя ўстаноўкі. Індывідуальныя матывацыі і формы паводзін могуць быць прыняты соцыумам, калі яны ўяўляюць сабой варыяцыі ў

азначанах межах. Выразным прыкладам апошняга можа стаць праекцыя на грамадскае ўладкаванне манеры паводзін і ладу жыцця палітыкаў.

Сёння даволі моднымі сталі рознага тыпу тэлевізійныя дыялогі, ток-шоу, якія даволі часта сталі перарастаць у вербальныя і невербальныя канфлікты. На якім фоне грамадскага жыцця яны праходзяць? З жалем можам канстатаваць: на фоне маўленчай агрэсіі. Падчас вывады аб праваце ці неправаце ўдзельнікаў канфлікту зрабіць нельга, і тады ілюструецца пераход вербальных агрэсіўных дзеянняў у невербальныя, у фізічную канфрантацыю.

Камунікатыўнасць медыятэксту з'яўляецца інструментам карэкцыі асацыяльных паводзін чалавека або групы людзей. Можна сказаць, што ў ролі сацыяльнага працэсара журналісцкі тэкст служыць фарміраванню грамадства ў цэлым, адыгрываючы сувязную ролю ў жыцці камунікантаў. Публіцыстычны тэкст выражае карэляцыі ўласна паводзін аб'екта інфармацыі і артэфактаў, г. зн. апрацаванага рэдактарам або аператарам і рэдактарам друкаванага тэксту або відэатэксту. Артэфакт даступны адрасату – грамадству. Тое, што стаіць за такой апрацоўкай, застаецца для яго невядомым. Маўленчы імідж палітыка складаецца менавіта з артэфактаў, тады калі зыходная маўленчая падзея і іх першапачатковая фіксацыя часта не бярэцца пад увагу. Што застаецца для журналіста, які вядзе такога кшталту перадачы? Пасіўная роля наглядатая, разагравальніка канфлікту да невербальнага дзеяння. Так, у 1995 годзе на тэледэбатах «Адзін на адзін» распачалася гонка за такімі сенсацыямі, калі Уладзімір Жырыноўскі сказаў свайму апаненту Барысу Нямцову, што яго губернія лідзіруе ў краіне па колькасці венерычных захворванняў. Губернатар параіў суразмоўцу прайсці курс лячэння ад венерычнай заклапочанасці і паказаў яму часопіс «Плэйбой» з інтэрв'ю, у якім Жырыноўскі сцвярджаў факт інтымных сувязей з 200 жанчынамі.

«"Мы вас вылечим!" – съязвил Немцов.

Жириновский: Да, не надо лечить-то!

Немцов: У нас два укола, и всё» [1].

Медыявербалістыка выплюхнутай шклянкі, прымітыўнай бойкі ў студыі – пазнака нашага часу, калі даволі часта не хапае розуму давесці сваю думку, не стае аргументаў, такту, элементарнай культуры. І яно – бескультур'е, мардабой тыражуецца на мільённыя

аўдыторыі. Праграма мела велізарны рынкавы поспех. На наступны дзень яе пазапланава паўтарылі, яна ўзняла рэйтынг перадачы.

Якая камунікатыўная роля належыць у такіх сітуацыях журналісту? Узгадаем:

Жириновский: Это подонок, прямо скажем, что это подонок!

Ведущий: Господа, я прошу прощения...

Жириновский: Я хочу плеснуть ему в лицо!

Ведущий: Ой, что вы делаете! Ну что же вы делаете! Мы вынуждены прервать нашу программу, будьте с нами через неделю [1].

Кінутым Аляксандрам Любімавым «Ой, что вы делаете! Ну что же вы делаете!» журналіст распісаўся ў бездапаможнасці, у сваёй разгубленасці. Перадача дала імпульс для невербальнай разбэшчанасці аднаго з удзельнікаў. Чытаем сведчанні: «В том же 1995 году, только тремя месяцами позже, Жириновский стал участником массовой драки уже в стенах парламента. К слову сказать, зачинщиком тогда выступил не он. Все началось с того, что депутат Николай Лысенко обвинил своего коллегу, Глеба Якунина, в том, что тот не имеет права носить облачения священника, и сорвал с него крест. Жириновский поддержал господина Лысенко словами: «Коля, бей его!» Депутат Евгения Тишковская пыталась вмешаться, но лидер ЛДПР оттащил ее за волосы и начал душить. В марте 2005 года Владимир Жириновский подрался с депутатом Андреем Савельевым. Тогда члены фракции ЛДПР выразили свое недовольство результатами выборов в Ямало-Ненецком автономном округе. В итоге, словесная перепалка между Жириновским и Савельевым перешла в массовую драку с участием 20 парламентариев. Одним из последних ярких столкновений лидера ЛДПР можно назвать драку, произошедшую в феврале 2008 года во время записи предвыборных дебатов на телеканале «Звезда». Тогда, недовольный ходом дискуссии Владимир Жириновский ударил доверенное лицо кандидата в президенты Андрея Богданова – Николая Гацу» [1].

Носьбіт мовы валодае важнай здольнасцю вызначаць і рэзюмаваць даволі дакладна складаныя інфармацыйныя стратэгіі паведамлення, актывізаваць мадэль рэальнай сітуацыі, якая фарміруецца з элементаў сацыяльнага вопыту, іншых інфармацыйных крыніц, вывесці агульную тэматычную структуру з нейкай канкрэтнай сітуацыйнай мадэлі; улічваючы існуючую сістэму вартасцей публіцыстычнага тэксту, нормы журналісцкай практыкі, зададзеныя во-

пытам стэрэатыпы і эстэтычныя арыенціры, накшталт навізны паведамлення, запраграмаванае негатыўнае стаўленне, вырашыць, якія з галоўных тэм найбольш рэлевантныя і значныя.

У працэсе апрацоўкі медыятэксту выяўляецца шэраг прыёмаў, якія кіруюць дзеяннямі і ўстаноўкамі аўтара. У сукупнасці гэтыя фактары вызначаюць структуру рэлевантнасці паведамлення – у інтэрпрэтацыі рэпрадуцэнта і перцэптыцы рэцыпіента. Веды, перакананні, устаноўкі, валоданне сітуацыяй, усе іншыя тыпы агульнай інфармацыі набываюцца, выкарыстоўваюцца і змяняюцца ў розных сацыяльных кантэкстах. Журналіст як сацыяльны суб’ект пастаянна выражае гэтыя веды, правярае і супастаўляе іх з ведамі іншых людзей.

Кагнітыўны аспект апрацоўкі дыскурса заснаваны на ўзаемадзеянні паміж рэпрэзентацыямі і сацыяльным вопытам, аперацыямі ў памяці. Стэрэатыпныя, характэрныя для пэўнага грамадства сацыяльныя і прагматычныя сітуацыі могуць утрымлівацца ў памяці ў форме сцэнарыяў такім чынам, што носьбіты мовы маюць магчымасць узаемадзейнічаць не толькі на вербальным узроўні, але і на сацыяльна адзначаным, паравербальным, падзейным. Любы слоўны акт выступае ў такім разе як сацыяльнае (а таксама як кагнітыўнае, прагматычнае, ментальнае) дзеянне. Фенаменальнасцю нашага часу становіцца лёгкае пасмейванне, абсмоктванне факцікаў пераўтварэння вербальнага дзеяння ў невербальнае накшталт высвятлення адносін Лебедзева і Палонскага ў студыі энтэбэшнікаў, што сведчыць пра адсутнасць у такіх жа студыях доказнай базы, аргументацыі, заснаванай на прыметах айчыннага рытарычнага ідэалу: дыялагічнага па змесце і па форме, анталагічнага, гарманізуючага, які з антычнасці супрацьпастаўлены ідэалу сафістычнаму: маналагічнаму і па змесце і па форме, рэлятывісцкаму, аганальнаму.

Літаратура

1. Википедия. – Рэжым доступу : http://ru.wikipedia.org/wiki.

2. Михальская, А. К. Русский Сократ: Лекции по сравнительно-исторической риторике / А. К. Михальская. – М. : Издательский центр «Academia», 1996.

3. Томашевский, Б. В. Стилистика / Б. В. Томашевский. – Л. : Издательство Ленинградского университета, 1983.

4. Фихтелиус, Э. Десять заповедей журналистики / Э. Фихтелиус. – Вэрнамо : Fälths Tryckeri, 1999.

Арцём Кавалеўскі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ТРАНСФАРМАЦЫЯ МЕТАДАЛАГІЧНАЙ ПАРАДЫГМЫ Ў СУЧАСНАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ КРЫТЫЦЫ

Сітуацыя, якая склалася сёння ў гуманітарных дысцыплінах вакол аналізу і прынцыпаў вывучэння феномена мастацкага (паэтычнага) тэксту, характарызуецца шматаспектнасцю, надзвычайнай складанасцю і неадназначнасцю ў выбары метадаў і прыёмаў даследавання, што звязана, у першую чаргу, з трансфармацыяй, зрушэннем метадалагічнай парадыгмы ў галіне гуманітарных і сацыякультурных даследчых плоскасцей.

Спецыфіка сучаснага гуманітарнага пазнання заключаецца ў тым, што даследчык вольны не толькі ў актуалізацыі пэўнага аспекту абранай тэмы, але і ў выбары прадмета, аб'екта даследавання, арганізацыі даследчага поля. Пры гэтым вызначальную ролю адыгрывае не столькі актуальнасць тэмы, колькі здольнасць аўтара сфармуляваць, вызначыць, актуалізаваць у сваёй рабоце новы вектар абранай праблемы.

Улічваючы насычанасць або нават перанасычанасць і дынаміку працэсаў стварэння сучаснай навукі, у тым ліку і гуманітарнай, даволі складана настойваць на ўнікальнасці і эксклюзіўнасці выбару тэматыкі даследавання, а тым больш прэтэндаваць на яе выключнасць і наватарства. Характарызуючы сучасную філалагічную навуку, неабходна адзначыць, што ў поле даследчыцкіх інтарэсаў філолагаў трапляюць амаль усе аспекты гуманітарных ведаў. А гэта, у сваю чаргу, непазбежна прыводзіць да выкарыстання метадаў і прыёмаў з самых разнастайных сумежных галін ведаў і стварае новыя міждысцыплінарныя плоскасці даследавання.

Мастацкі (паэтычны) тэкст (твор) у самым шырокім сэнсе на сёння з'яўляецца засвоеным, адаптаваным «сюжэтам» адначасова для некалькіх сумежных субдысцыплін, якія ўзніклі ў выніку аб'яднання намаганняў лінгвістаў, літаратуразнаўцаў, гісторыкаў літаратуры, крытыкаў, культуролагаў, філосафаў, мастацтвазнаўцаў. Сам міждысцыплінарны характар сучаснай гуманітарыстыкі схіляе даследчыка да непазбежных запазычанняў і трансляцый адных і тых жа «сюжэтаў» з адной дысцыпліны ў іншую. Аднак гэта не азначае, што адбываецца толькі прырост колькасці даследаванняў па дадзенай праблематыцы.

У святле сучаснай гуманітарнай думкі выпрацоўваюцца новыя падыходы да аналізу і вывучэння мастацкага (паэтычнага) тэксту, трансфармуюцца метадалагічныя прынцыпы яго даследавання, рэканструююцца асноватворныя мадэлі крытычнай інтэрпрэтацыі твора. Развіццё герменеўтыкі, семіётыкі, структурнай лінгвістыкі, лінгвістыкі тэксту і іншых сумежных напрамкаў даследаванняў дыктуе прынцыпова новае разуменне мастацкага (паэтычнага) тэксту (твора) і яго вытлумачэнне. Разам з тым, множнасць і варыятыўнасць тэксталагічных падыходаў да літаратурнага твора ў сучаснай гуманітарыстыцы стварае значныя перашкоды, у першую чаргу, для практычнага вытлумачэння літаратурнага твора на старонках спецыялізаваных перыядычных выданняў.

Вядома, што пытанні, адказы на якія дае мастацкі твор, – гэта не заўсёды тыя пытанні, якія ўзнікаюць перад чытачом у момант прачытання і адаптацыі тэксту. Паэтычнае мысленне, маналагічнае па сваёй прыродзе, валодае тонкай алегарычнай арганізацыяй, тэхніка асацыіравання адыгрывае тут вельмі важную ролю як у плане выказвання, так і ў плане ўспрымання. Засваенне прасторы тэксту праз адказы на пастаўленыя чытачом пытанні можа сутыкацца з пэўнымі цяжкасцямі, бо часам аўтар сам не ведае дакладнага адказу, ён толькі набліжаецца да яго: пытанне (у яго глабальным сэнсе) можа быць самамэтаю. Але калі паэт усё ж дае адказ на пастаўленыя ім пытанні ва ўласным творы, а рэцыпіент адшуквае іх, асэнсоўвае, параўноўвае з уласнымі, факт інтэрпрэтацыі перацякае ў кантэкст агульнакультуралагічны, а гэта ўжо новая, «аб’ектыўная» сфера жыцця тэксту, якая ў значнай ступені пераадольвае выключна індывідуалізаванае яго разуменне.

Імкнучыся праінтэрпрэтаваць паэтычны тэкст, крытык ставіць перад сабою пытанне аб механізме самой інтэрпрэтацыі, якая можа ісці, з аднаго боку, у культуралагічным рэчышчы, калі апрыорная полісемантычнасць твора разглядаецца як трансфармацыя сэнсаў у розных культурных сістэмах і практыках, з другога – у рэчышчы ўласна лінгвістычным (больш звязаным з літаратуразнаўствам), калі апісваюцца і тлумачацца спосабы дасягнення мастацкай вобразнасці праз моўна-выяўленчую экспрэсію. Гэтыя механізмы могуць спалучацца і ўзаемадапаўняцца, што ў прынцыпе цалкам абумоўлена спецыфікай паэтычнага тэксту, унутры- і знешнеэстэтычныя элементы якога складаюць гарманічна арганізаванае адзінства. Ад-

нак перад тым як перайсці да чыста тэксталагічнай праблематыкі, крытыку неабходна засяродзіцца на ўласным стане ўспрымання твора, зафіксаваць яго асноўныя моманты – такім чынам ажыццяўляецца інтраспектыўны спосаб перажывання, характэрны для чытацкай практыкі, што прадугледжвае пастаноўку пэўных пытанняў, на якія мы спадзяёмся атрымаць адказ ў творы.

Па сутнасці, кожны чытач шукае (а значыць, і прачытвае) у мастацкім тэксце тое, што яго найбольш цікавіць, аднак пошукі *свайго* заўсёды звязаны з *пытаннем*, паколькі цікавасць да новага твора – гэта выяўленне таго, што нам пакуль незразумела або зразумела інтуітыўна, і мы жадаем пацвердзіць уласнае меркаванне. Ствараючы сістэму пытанняў, адказ на якія павінен даць твор, крытык абавязаны памятаць і пра іх выключную індывідуальнасць у дачыненні да кожнага чытача.

Вывучэнне верша як мовы паэзіі і вывучэнне вершаванай мовы канкрэтнага паэтычнага твора – гэтыя даследчыя задачы адначасова адрозніваюцца па зместу, патрабуюць рознага метадалагічнага падыходу, і ў той жа час яны не могуць быць проста падзеленыя паміж рознымі навукамі, бо цесна звязаныя паміж сабой у адзінстве і сукупнасці гуманітарных, філалагічных ведаў. Гэтая складанасць патрабуе ад даследчыка сістэмы ўсвядомленых метадалагічных пераходаў у працэсе гуманітарнага пазнання, у працэсе руху ад міжіндывідуальнай супольнасці вершаванай мовы да ўзнікнення на гэтай аснове паэтычнай індывідуальнасці, у якой неабходна ўбачыць не толькі варыяцыі і камбінацыі ў ажыццяўленні і парушэнні законаў, нормаў і правілаў, але і новы рэалізаваны закон. Тут асабліва неабходным робіцца сапраўднае філалагічнае супрацоўніцтва спецыялістаў у галіне літаратуразнаўства, лінгвістыкі, эстэтыкі, культуралогіі, крытыкі.

Разнастайнасць падыходаў да вывучэння мастацкага тэксту прапануе даследчыку не толькі неабсяжную прастору ў выбары сродкаў аналізу, але і новыя цяжкасці пры ацэнцы асаблівасцей літаратурнага твора, адна з якіх – пошук дакладнага крытэрыя для інтэрпрэтацыі таго ці іншага элемента тэксту ў пэўнай зададзенасці, такой, напрыклад, як сімвал, знак, мастацкі прыём, міфалагічны падтэкст, пазалітаратурны дыскурс і г. д. Узнікае ўражанне бясконцай магчымасці бясконцага вытлумачэння любога тэксту. І ў той жа час сярод такой неабсяжнай множнасці звяртаюць на сябе ўвагу дзве выраз-

ныя тэндэнцыі: па-першае, імкненне расшыфраваць тэкст, знайсці ў ім нешта накшталт схаванага сэнсу (падтэксту) і ацаніць яго менавіта з гэтых пазіцый; па-другое, даць адваротную папярэдняй ацэнку тэксту як увасабленню (ілюстрацыі) пэўнага прынцыпу, ідэі, праблемы, аўтарскай задумы. Пры ўяўнай дыхатаміі дадзеных спосабаў даследавання ў іх прысутнічае выразная бінарнасць: тэкст паўстае як *канструкт аўтарскай персаніфікацыі* і *чытацкага ўспрымання* адначасова.

Вытлумачэнне паэтычнага твора, на думку некаторых даследчыкаў, з’яўляецца сярэдняй, прамежкавай галіной літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі, якая не супадае непасрэдна з фармальна-тэарэтычным вывучэннем паэтычнага тэксту як сістэмы. Інтэрпрэтацыя ў нашым разуменні – паняцце больш шырокае, чым вытлумачэнне, яно цесна звязана, у першую чаргу, са спасціжэннем зместу твора, у аснове якога ляжыць той змест, які аб’ектыўна прысутнічае ў паэтычнай структуры. Гэты сэнс суб’ектыўна ўкладзены ў твор паэтам і суб’ектыўна ўспрымаецца, адаптуецца чытачом. Кожны кампанент складана арганізаванай славесна-мастацкай аўтарскай сістэмы ў рэшце рэшт разлічаны на чытацкае ўспрыманне сістэмы вобразнай. Нават калі ўявіць практычную адсутнасць чытача як асноўнага рэцыпіента, то яго месца абавязкова зойме сам аўтар, аднак тады інтэрпрэтацыя страчвае сваю актуальнасць, бо не выходзіць за межы аўтарскай аперцэпцыі.

Прачытанне крытыкам твора ці комплексная ацэнка творчасці пісьменніка тычацца не толькі аўтарскіх твора або творчасці, але таксама і іншых крытычных тэкстаў, прысвечаных дадзеным аб’ектам даследавання. Такім чынам, літаратурны твор, крытычна асэнсаваны і суаднесены са шматлікімі рэплікамі-меркаваннямі пра яго, ператвараецца ў *літаратурны факт*, г. зн. у дыялог паміж творцам і публікай. Прычым меркаванне крытыка, увасобленае ў створаным ім тэксце, з’яўляецца важным і неад’емным элементам гэтага літаратурнага факта. Гэтае паняцце – неабходнае ў працэсе разважання над месцам твора ў гісторыка-літаратурным працэсе – уяўляе сабой у самым абагульненым выглядзе адзінства, якое складаецца з літаратурнага твора і яго *інтэрпрэтацыйнай мадэлі* ў канкрэтных сацыяльна-літаратурных абставінах. У найбольш абагульненай форме літаратурны факт паўстае як двухэлементная сістэма: твор і пасіўнае меркаванне аб ім таго ці іншага чытацкага асяроддзя.

Такая спрошчаная сістэма аказваецца пазбаўленай дынамікі, якую здольна прыўнесці толькі крытычнае выказванне.

Варта адзначыць, што з пункту гледжання засваення чытачом прасторы літаратурна-крытычнага твора, ён з'яўляецца актуалізацыяй «звышусведамлення» аўтарскага тэксту або асобы аўтара; крытык мае права і нават павінен уявіць некаторыя перадумовы з'яўлення мастацкага тэксту, спецыфіку аўтарскіх вымыслу і задумы, вербалізаваць уяўнае становішча так званага ідэальнага аўтара, які добра ўсведамляе межы свайго твора і здольнасць толькі частковай рэалізацыі яго патэнцыяльна-універсальных магчымасцей (мастацкіх, ідэйных, маральных, сацыяльных і інш.).

З'яўленне новага літаратурнага твора заўсёды прадугледжвае амаль адначасовую магчымасць з'яўлення крытычных меркаванняў аб ім, якія выступаюць у якасці інфарматыўных «адказаў» і забяспечваюць уключэнне канкрэтнага твора ў сістэму бягучага літаратурнага працэсу. Новы мастацкі твор здольны актывізаваць прастору свайго прачытання і пазнейшых вытлумачэнняў, якія – калі гэта вытлумачэнні крытычныя – самі з'яўляюцца тэкстамі і існуюць у якасці аўтарскай персаніфікацыі крытыка праз спасціжэнне прасторы мастацкага тэксту.

У дыскусіях апошніх дзесяцігоддзяў, прысвечаных праблеме ўзаемадзеяння (і ўзаемаадасаблення) літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства, адрозненню іх аб'екта і спосабаў яго даследавання, традыцыйна праводзіцца строгі падзел, паводле якога пазнавальная праца над сістэмным даследаваннем літаратурнага твора замацоўваецца выключна за навукоўцамі, а крытыкам адводзіцца дапаможная, другасная роля «вольных інтэрпрэтатараў», якая абапіраецца на такія адносна-абстрактныя паняцці, як «уражанне», «імпрэсія», «суб'ектывізм», «ацэначнасць» і ім падобныя. Але ўсё ж цяжка не пагадзіцца з меркаваннем пра спецыфічную прыроду крытычнага выказвання.

На сучасным этапе літаратурная крытыка апынулася ў надзвычай складанай сітуацыі і пэўнай разгубленасці. Доўгі час лічылася, што пісьменніцкае мастацтва мае шэраг строга ўласцівых яму правіл, прынцыпаў і прадпісанняў, якія ствараюць адзін з найважнейшых крытэрыяў ацэнкі творчасці мастака слова. Апошнія дзесяцігоддзі адзначаны спробамі выпрацоўкі новых, амаль рэвалюцыйных канцэпцый і мадэлей аналізавання літаратуры і мастацтва ў

цэлым. З прычыны недахопу ўласна літаратурных крытэрыяў сучасная крытычная думка актыўна шукае новыя пазалітаратурныя крытэры эстэтычнай ацэнкі. Менавіта таму на працягу апошніх гадоў у спецыялізаванай перыёдыцы друкаваліся матэрыялы, якія трактавалі літаратурныя з'явы з самых розных пунктаў гледжання: сацыялагічных, гістарычных, эканамічных, псіхалагічных і нават псіхіятрычных, але, на жаль, не літаратурных. У гэтым выявіўся крызіс літаратурна-мастацкай крытыкі, падрыхтаваны гадамі панавання ў ёй строгіх дырэктыў і падуладнасці афіцыйным ідэалагічным дактрынам.

Адначасова з пераглядам традыцыйных крытэрыяў эстэтычнай ацэнкі назіраецца заканамернае звужэнне грамадскай функцыі крытыкі, якая доўгі час лічылася найбольш важнай і вызначальнай. Папулярызацыя прынцыпу «мастацтва дзеля мастацтва» дыскрэдытавала ў вачах чытача наіўнае ўяўленне пра надзвычайную грамадскую ролю крытыкі як камертона ў бягучым літаратурным працэсе. Менавіта адсюль вынікае з'ява, якую можна акрэсліць як *«расплывістасць (амбівалентнасць) меркаванняў»*, што з'явілася сёння не толькі перад рэцэнзентамі, але і літаратуразнаўцамі.

Нарэшце, хоць і вельмі павольна, крытыка пачынае згадваць, што яна – далёка не другасны, дапаможны вектар у сферы абслугоўвання літаратуры ці ідэалогіі, а перш за ўсё паўнавартасны *тэкст*, спецыфічным аб'ектам якога з'яўляецца не столькі свет і рэчаіснасць, як у выпадку з паэзіяй ці прозай, колькі *слова* пра гэты свет, сказанае іншым. Спецыфіка крытыкі заключаецца ў тым, што яе слова – гэта *слова пра слова* ці *«з нагоды» слова*. Нельга сказаць, што працэс уласнага пераасэнсавання крытыкай свайго статусу адбываецца без страт і пралікаў. У імкненні крытыкі адмовіцца ад сябе ўчарашняй часам назіраецца паспешлівая непаслядоўнасць і нервовасць, а самі крытыкі перажываюць відавочную разгубленасць ад усведамлення таго, на множнасці якіх філасофскіх тэорый і канцэпцый можа грунтавацца і развівацца іх прафесійная дзейнасць. Метадалагічнае багацце і разнастайнасць, якія пагражаюць эклектызмам і непаслядоўнасцю, не толькі крытыка ставяць перад праблемай выбару, але заводзяць у тупік нават самых знакамітых майстроў. Цытацыя і некрытычнае перайманне чаго і каго заўгодна з сучаснага агульнагуманітарнага мыслення ў творах некаторых аўтараў з інсітным адчуваннем сучаснай эстэтыкі, выключна інтуі-

тыўным (а таму і ўяўна пераканаўчым) поглядам на сучасны літаратурны працэс, імкненне ўвасобіць свае пазалітаратурныя прыхільнасці ў слоўнай творчасці часам падаюцца вельмі штучнымі і няпэўнымі, што ўрэшце вядзе да разгляду «новай» літаратуры па-за ўласна літаратурным дыскурсам.

Што тычыцца літаратурнага рэцэнзавання, то яго належыць разглядаць як асобны, спецыфічны род літаратурна-даследчай дзейнасці, які не можа існаваць асобна (у адрозненне ад публіцыстычных тэкстаў як самастойных літаратурных жанраў) ад канкрэтнага мастацкага твора. Тым не менш, рэцэнзаванне, якое абапіраецца на метадалагічную базу навуковых падыходаў, а таксама прымае ўмову свабоды творчага пачатку крытыка, здольнае ўсё ж прэтэндаваць на пэўную аўтаномію, бо, зрэшты, найвыдатнейшыя прыклады рэцэнзій можна па праву залічыць у шэраг арыгінальных твораў, якія маюць не толькі даследчую (тэарэтычную) каштоўнасць (пры ўмове інтэрпрэтацыйных уласцівасцей), але і ўласна мастацкую вартасць, што робіць рэцэнзаванне адным з найбольш універсальных, а таму і складаных, жанраў літаратурнай крытыкі.

Мы мяркуем, што задача і значэнне сучаснай літаратурнай крытыкі заключаецца менавіта ў выпрацоўцы адзінства ва ўяўленнях пра інтэрпрэтацыю твора для розных гуманітарных дысцыплін, у ліквідацыі ўяўнай дыспрапорцыі, супярэчнасці паміж выключна навуковым і «ацэначным» рэцэнзаваннем, у імкненні да канцэптуалізацыі і сінтэзу асноўных крытычных жанраў, у іх адпаведнасці навейшым тэндэнцыям бягучага літаратурнага працэсу. Праблема рэцэнзавання, як і праблема агульнага стану сучаснай літаратурнай крытыкі ва ўмовах радыкальнага перагляду вартасных арыенціраў і крытэрыяў эстэтычнай ацэнкі мастацкіх твораў, не павінна заставацца па-за ўвагай даследчыцкай дзейнасці. Неабходным з'яўляецца тэарэтычнае асэнсаванне як гістарычнага вопыту, так і тых вызначальных тэндэнцый і напрамкаў, якія ўплываюць на існаванне сучаснай крытычнай думкі, а таксама ўтвараюць прастору для яе прымянення; вызначэнне сістэмы, метадаў і прынцыпаў, якія б садзейнічалі як літаратурнакрытычнаму, так і міждысцыплінарнаму падыходу пры разглядзе мастацкага (паэтычнага) тэксту (твора). Гэта прадугледжвае перш за ўсё выяўленне і выпрацоўку тыпалогіі інтэрпрэтацыйных мадэлей мастацкага твора ў сістэме літаратурнага факта, што дапаможа вылучыць і сістэматызаваць як агульныя рысы, так і спецыфічныя характарыстыкі разнастайных

тэксталагічных канцэпцый у айчынным вершазнаўстве. Сістэмнае даследаванне падыходаў да комплекснага аналізу сучаснай паэзіі дазваляе стварыць цэласную карціну сумежнага тэарэтычнага поля класічнага літаратуразнаўства і сучаснай літаратурнай крытыкі і на аснове гэтай карціны разгледзець мастацкі тэкст як складаную шматузроўневую з'яву, у якой кожнаму элементу адведзена важная роля ў стварэнні гарманічна ўпарадкаванага мастацкага адзінства.

Марина Калинина
Рязанский институт (филиал) Московского государственного открытого университета (Россия)

Ф. ДОСТОЕВСКИЙ И С. ЕСЕНИН: КОНЦЕПТУАЛЬНЫЙ ИНТЕРТЕКСТ

Романист «белых» ночей Петербурга и певец берез и полей Рязанщины… По выражению Ю. Мамлеева, «самый великий русский урбанист» и «самый великий русский деревенщик» [13]. Сопоставление их дискурсов в настоящее время все больше привлекает внимание филологов [3, 4, 10]. В настоящей работе анализ произведений Достоевского «Бедные люди» и «Белые ночи» и дискурса Есенина проводится в зеркале концепта **тоска**, который выделяется А. Вежбицкой [2] в качестве одного из русских национальных (о наших принципах концептуального анализа художественного текста см., например, [16, 17]).

Под термином **концепт** мы вслед за А. Вежбицкой [1] понимаем результат когнитивной деятельности человека, отмечая культурно-смысловую наполненность этой единицы (Ю. Степанов [12]) и способность к категоризации мира (Е. Кубрякова [8]).

Анализ предикатов, эпитетов к концепту, фразеологических единиц с концептом **тоска**, а также данные свободного ассоциативного эксперимента позволили реконструировать ряд метафор (МФ), характеризующих этот концепт в русской языковой картине мира (РЯКМ) как:

1) неодушевленный предмет/стихию: МФ тоска – огонь (*жгучая*), холод (*холодная*), твердый материал (*давит*), жидкость (*безбрежная*), атмосфера (*нагоняется*), вместилище (*глубокая*);

2) ощущение/состояние: болезнь/боль (*щемящая, тосковать – обл. болеть, ныть; Тоскуша – имя лихорадки в народных заговорах);*

3) живое существо: враг (*необоримая*), волк/пес/змея/вурдалак (*сосет сердце, завыть с тоски*).

Как видим, можно говорить о внутренней энантиосемии концепта в РЯКМ. О его семантической емкости свидетельствует также текст Синодального перевода Библии, где ряду не родственных между собой греческих лексем соответствует **тоска/тосковать**. Роль объединяющего фактора играет их контекстуальная связь со *смертью* (2 Цар. 1, 9; Притч. 12, 25; Ис. 38, 14; Мф. 26, 37; Мк. 14, 33).

Состояние **тоски** в РЯКМ противоположно веселью, общению, покою, радости, творчеству, труду, сопряжено с гордостью, мятежом, нервным возбуждением, страхом, печалью/грустью, одиночеством, унынием, болезнью, смертью, холодом, непогодой, алкогольным опьянением, инфернальностью, водой.

Звуки, с которыми связана **тоска** в РЯКМ, напоминают крики животных: *завыть с тоски;* В. Даль отмечает орл., калуж. *тоскунья* – ворон-крятун; в Синодальном переводе Библии – *тосковал, как голубь.* Невозможность выражения в речи состояния **тоски** *(безмолвная, неизъяснимая)* и безотчетность *(беспричинная, неясная)* приводят к ограничению пространства вокруг Я и к «смерти» Другого (родств. лат. tesqua «глушь», «степь», «пустыня»). В духовном пространстве тоски как основная акцентируется сема «лишенности» *(безнадежная, безрадостная* и мн. др.), происходящая из этимологической мотивировки «пустота».

Пространство тоски противопоставлено всему остальному пространству *(вгонять, вводить* в тоску; тоска *сжимает).* При «погружении» в тоску это состояние переносится на окружающий мир *(беспредельная, вселенская* тоска). МФ **тоска** – твердый материал, болезнь/боль, предикаты *находит, нападает,* фразеологизм *впасть в тоску* свидетельствуют о перемещении человека в **тоске** вниз, что является отражением в языке ненормальности этого состояния.

В целом, в РЯКМ выражено негативное отношение к **тоске**. Эпитеты *темная, черная,* лексема **тоска** в Синодальном переводе в соответствии с греч. σκοτος «мрак, неясное» позволяют говорить о принадлежности тоски в оппозиции «свет – тьма» мраку. Хронотоп исследуемого концепта *(вводить, впасть* в тоску) сближает его с понятиями греха, искушения, что подчеркивает МФ тоска – змея. МФ тоска – волк, пес, холод, эпитеты *адская, мертвая, смертельная,* дериват *тоскунья* «ворон», движение человека в тоске вниз свидетельствуют о принадлежности тоски в оппозиции «жизнь – смерть» смерти и связи с инферналъны-

ми силами. Замкнутость пространства тоски, обреченность на неудачу действий против нее (*необоримая, неистребимая* и др.) предполагает выход в небытие *(пропасть, удавиться, умереть* с тоски) или в состояние опьянения (ср. в словаре В. Даля: *Пей – тоска пройдет)* (подробнее о концепте **тоска** в РЯКМ см. наши работы [7, 15 и др.]).

Интересно, что старец Амвросий Оптинский считал **тоску** единственной причиной греха винопития; по его мнению, ее вызывают скудость веры в промысел Божий и надежды на его милосердие в стеснительных обстоятельствах, а также оскорбленное самолюбие и тщеславие, когда что-то препятствует исполнению мнимоблагих желаний. Безотчетная **тоска** наводится врагом людей, и ее следует терпеть как крест духовный. Решительные действия в этом случае – сердечная молитва, поскольку человек сам не в состоянии выйти из **тоски** (ср. в соответствующих эпизодах Библии тоска побеждается молитвой, а ветхозаветный богоотступник Саул не видит иного выхода, кроме самоубийства). Представлению о **тоске** в РЯКМ соответствует один из выходов из нее – в состояние опьянения – у героя романа Достоевского «Бедные люди» Макара Девушкина и у лирического героя Есенина. Последний видит «выход» из **тоски** в стремлении к Богу (Небу, Дому в сакрализованном смысле, молитве за лирического героя, творчестве), Другому (к *родной*, к сестре, природе, детям), но чаще **тоска** навевает суицидальные мысли: *«на рукаве своем повешусь»* – предельно концентрированное поэтическое сжатие пространства вокруг человека в тоске. («Устал я жить в родном краю…»).

Этимологическая сема «лишенности», присутствующая и в основном значении русского слова **тоска** («тревога», «беспокойство»), способствует развитию семы «стремление» (ср. родст. *тще, тщательный*), и глагол **тосковать** принимает управление по + Д/П. Кроме того, реализуя потенциальную сему «мысленно воссоздавать образ, к которому стремится субъект», глагол **тосковать** принимает делиберативный объект (*о + П*), переходя в поле глаголов речи и интеллектуальной деятельности (о теории вертикальных синтаксических полей глаголов см. [9]). А. Вежбицкая, отметив способность русских эмоциональных глаголов подчинять себе, как и глаголы мысли, объект с предлогом *о*, доказывает этим их активный характер, их связь с чувством «через продолжительный и протекающий одновременно с эмоциональным мыслительный процесс» [2].

Показательно, что в ранних романах Достоевского нет употребления тосковать по+Д/П, в отличие от дискурса Есенина, в котором глагол реализуется на всех уровнях.

В зеркале концепта **тоска** в индивидуально-авторских концептах Достоевского «бедные люди» и «мечтатель» выделяются семы «лишенности», «стремления к власти над к./ч.-л.», «близости интеллектуальной деятельности тоске», «отсутствия устремленности к к./ч.-л.» (нет употребления тосковать по+Д/П). В этих концептах происходит разделение по гендерному признаку (персонификация **тоски** Девушкиным – **тоска** как состояние у Вареньки (роман «Бедные люди»); свойственность **тоски** Мечтателю – отсутствие **тоски** в дискурсе Настеньки («Белые ночи»)). Для Мечтателя характерно семантическое «продолжение» метафоры русской языковой картины мира «**тоска**-удушливая атмосфера» в виде «**тоска**-облако», сжимающее сердце и заслоняющее солнце (Бога?). Это одна из реализаций известной концептуальной МФ Достоевского человек-Вселенная.

В дискурсе Есенина, кроме *лирического героя*, тоскуют *девушка/любимая, бунтовщики-мятежники* («Песнь о великом походе», «Пугачев»), *Русь, все люди, живущие на земле*, а также *пашни, облака, ветлы, хата, конопляник, куры*. Единство состояний лирического героя и природы подчеркнуто местоимением *мы* по отношению к герою и волне: «*Мы тоскуем*». Для Есенина **тоска** – неотъемлемая часть Руси, без любви к ней невозможно понять русского человека.

«Русский дух» Достоевского и Есенина, их следование РЯКМ в концептуализации **тоски** проявляется в неагентивности, выделении в концепте **тоска** как основной этимологической семы «лишенности»; связи **тоски** со смертью, мраком/непогодой; в персонификации, инфернальности, неконтролируемости **тоски**, невыразимости ее в слове, замкнутости пространства **тоски**, МФ «**тоска**-болезнь»; в способности глагола *тосковать* переходить в поле глаголов интеллектуальной деятельности. Представлению о **тоске** в РЯКМ соответствует один из выходов из нее – в состояние опьянения – у «бедного человека» Девушкина и лирического героя Есенина. Коннотационные акценты в концепте **тоска** в дискурсе Достоевского расставлены в соответствии с РЯКМ и православным осмыслением мира (как грех, искушение). Есенин вступает в «диалог» с этими представлениями.

В дискурсе Есенина есть отчетливый «вертикальный контекст» (термин И. Софроновой [11]) на концептуальную картину мира Достоевского: МФ «человек-цветок», сопряженность **тоски** с дорогой,

бунтом; необъективность видения мира («неузнанность» Христа) в **тоске**, насмешки окружающих как одна из причин **тоски**; один из выходов из **тоски** – творчество. Есенинская связь **тоски** с тюрьмой и самоубийством коррелирует с образами позднего Достоевского (Раскольников, Свидригайлов, Ставрогин и др.). «Полюбить **тоску**» у Есенина – эвфемизм смерти через повешение (наказание за убийство, неизбежно совершенное лирическим героем, несмотря на его мечту о «чистоте сердца»). Мечтатель Достоевского, таким образом, – одна из интертекстуальных ипостасей Есенина, недаром стихотворение «Кто я, что я? Только лишь мечтатель…» содержит на вертикальном контексте полемику с романом Достоевского «Белые ночи».

Кто я? Что я? Только лишь мечтатель,
Синь очей утративший во мгле…
(*«Кто я? Что я? Только лишь мечтатель…»,* <Вариант 1925 г.>*)* [6].

Вопрос «Кто я?» направлен на выяснение внутренней сущности личности, выделение ее из мира живой природы. Следующее за этим вопросительное местоимение ***что*** переносит акцент с индивидуальности на типологическую принадлежность, указывает на возможность отнесения к определенному типу характера. В таком плане показан Мечтатель у Достоевского:

– Послушайте, Вы хотите знать, кто я таков?.. Извольте, я – тип.

– Тип, тип! Какой тип? – закричала девушка, захохотав так, как будто ей целый год не удавалось смеяться. – … что это такое тип?

– Тип?…Это такой характер. Слушайте, знаете Вы, ***что такое*** (здесь и далее выделено нами. – М. К.) мечтатель? [5, с. 17–18].

В стихотворении С. Есенина два маркера ограничительности показывают некоторую «недо-человечность» Мечтателя («…***только лишь мечтатель»***), что является еще одним сигналом вертикального контекста на роман Ф. Достоевского: «Мечтатель – если нужно его подробное определение – не человек, а знаете, ***какое-то существо среднего рода. Селится*** он большею частию где-нибудь в неприступном углу…» [5, с. 19]. Близость животному (т. е. в картине мира Достоевского – недуховному) миру заявлена глаголом ***селиться***, а далее эксплицируется в сравнениях Мечтателя с улиткой, черепахой, котенком.

Упоенность мечтами приводит к притупленности восприятия и чувств как откликов на реальную действительность: у Достоевско-

го – «Он ничего не желает, потому что он выше желаний, потому что с ним все, потому что он пресыщен…», «я никогда не способен начать жить настоящею жизнию…, я потерял всякий такт, всякое чутье в настоящем, действительном» [5, с. 24–25, 28], и у Есенина – «Оттого душе моей не жестко // Не желать, не требовать огня», «Я тебя нисколько не ревную, я тебя нисколько не кляну», «И тебя любил я только кстати, // Заодно с другими на земле».

Мечтателю «Белых ночей» свойственно совершать многие действия «автоматически», без участия сознания: «с удивлением вспомнил, что он уже совсем пообедал, решительно проглядев, как это сделалось» [5, с. 23]; «уже совсем успел, по своему обыкновению, забыть, где я» [5, с. 8] и мн. др. У Есенина эта неосознанность также присутствует («И с тобой целуюсь ***по привычке***, // Потому что многих целовал») и в поэтически-концентрированном виде выражается словом-понятием ***кстати***: «Эту жизнь прожил я словно ***кстати***, // ***Заодно*** с другими на земле». Этимологическая сема этого слова «заодно с к./чем-либо», как видим, эксплицируется в тексте. При этом имеется в виду не со-вместность, а рядо-положенность, одинаковость, невозможность обнаружить различия в череде лиц. Указанный признак для поэта – один из основных типологических признаков характера Мечтателя: ***кстати*** создает перекрестную рифму с ***Мечтатель***, употребляется в первой строфе и последней (т. е. сильных позициях текста), с вариацией: «И тебя любил я только кстати, // Заодно с другими на земле». Находящееся в конце произведения – абсолютно сильной позиции текста – и первой строфе слово ***земля*** указывает на принадлежность Мечтателя в оппозиции профанное – сакральное профанному. Есенин ощущает даже некоторую его «инфернальность»:

«Синь	синий/голубой в христианской традиции – цвет Богоматери
очей	сема «визуальности» основная в этимологии концепта **мечта** – от и.-е. *meik- «мерцать, блестеть, мелькать» [14]
утративший	действительное, а не страдательное, причастие подчеркивает агентивность, наличие акта самосознания и признание своей ответственности за случившееся
во мгле»	эвфемизм Ада, нередко встречающийся и в дискурсе Есенина; кроме того, слово ***мгла*** акцентирует в концепте **Мечтатель** сему «неясности»

«Духовное зрение» Мечтателя Есенина замутнено. Согласно христианскому миропониманию, причина неспособности различить доб-

ро и зло, истину и ложь кроется в греховном, «страстном» состоянии человека. Такая концептуализация близка и поэту: «Если тронуть страсти в человеке, // То, конечно, правды не найдешь». Сравним и номинации в романе Достоевского: Мечтатель – ***сладострастный ленивец***, мечта – ***прием сладострастного яда*** (своего рода самоубийство).

В романе «Белые ночи» подчеркивается насильственный и болезненный характер мечтаний: «какое-то ***темное*** ощущение, от которого слегка ***заныла***…грудь его, какое-то новое желание ***соблазнительно щекочет*** и раздражает его фантазию» [5, с. 23], «***утомленный***, ***измученный***, засыпает в ***замираниях*** от восторга своего ***болезненно***-потрясенного духа и с такою ***томительно***-сладкою ***болью*** в сердце» [5, с. 25]. «Инфернальность» мечты и Мечтателя в дискурсе Достоевского выражена более эксплицитно, нежели у Есенина, и в большей степени осознается героем: «уже давно приготовил я над самим собой приговор», «я проклинал сам себя», «куда ты схоронил свое лучшее время», «я…сделал преступление и грех в моей жизни, потому что такая жизнь есть преступление и грех» [5, с. 26–29]. В фельетоне «Петербургские сновидения в стихах и прозе» (1847 г.) Достоевский употребляет по отношению к Мечтателю номинацию «олицетворенный грех». Грех Мечтателя подобен греху Денницы-Сатаны, который поставил себя на место Бога («он сам художник своей жизни и творит ее себе каждый час по новому произволу» [5, с. 25]) и с этой мнимой высоты осуждал все сущее («На его подкупленный взгляд мы… живем так лениво, медленно, вяло;… так ***томимся*** нашею жизнию», «он думает, что это бедная, жалкая жизнь» [5, с. 24]).

Событие реальной – а не воображенной в мечтаниях – жизни (встреча с Настенькой и возникшая влюбленность) ощущается героем «Белых ночей» как сакральный момент, способствующий прозрению: «…я даром потерял все свои лучшие годы! Теперь я это знаю и чувствую больнее от такого сознания, потому что ***сам Бог послал мне вас, моего доброго ангела***, чтоб сказать мне это и доказать» [5, с. 27]. И в конце романа: «***Боже*** мой! Целая минута ***блаженства***! Да разве этого мало хоть бы и на всю жизнь человеческую?..» [5, с. 59]. Слово ***блаженство*** в таком сакральном контексте отсылает к Библейским «заповедям блаженств», где среди других – «Блаженны чистые сердцем, яко тии Бога узрят». ***Белые ночи*** заканчиваются ***утром***; духовное прозрение концептуализируется Достоевским как «выздо-

ровление» (Настенька говорит Мечтателю: «Вы выздоравливаете, вы, право, совсем другой человек, чем как вы себя описали» [5, с. 46]). Герой романа осознает свое прежнее существование (пребывание в мире мечтаний) как преступление и грех падшего Ангела: «***богиня*** фантазии» [5, с. 22], кажущаяся «***неистощимой***», впоследствии начинает восприниматься Мечтателем как «***раба*** тени, идеи, ***раба*** первого облака», которая «***истощается*** в вечном напряжении» [5, с. 28]. Видению и осознанию действия Промысла Божьего в жизни человека, пониманию обманного характера мечтаний («какой обман!», «обман воображения») способствует реальное чувство любви.

Мечтатель Есенина также стремится найти выход именно в этом чувстве («всегда ***ища*** себе ***родную***»), однако описываемая им женщина в оппозиции «свой-чужой» отнесена к «чужим» («заодно с ***другими***»), и испытываемое в данный момент чувство не концептуализируется им как любовное: «И, как будто зажигая спички, // Говорю любовные слова // …А в душе всегда одно и то ж», «Оттого душе моей не жестко // Не желать, не требовать огня, // Ты, моя ходячая березка, // ***Создана для многих и меня***». Последняя строчка – полемика на «вертикальном контексте» с эпиграфом к роману «Белые ночи»: «Иль был он ***создан*** для того, // Чтобы побыть хотя мгновенье // ***В соседстве*** сердца ***твоего***?..» [5, с. 5] и знак существования сакрального мира с Создателем-Богом в центре (если есть создание – есть и создатель). Номинация ***ходячая березка*** (в одном из вариантов стихотворения Есенин вводил, кроме этой, номинацию «***ландыш мой***») подчеркивает концептуальное различие с «выздоровевшим» Мечтателем Достоевского, который не хочет ревностью и горьким упреком «измять хоть один из этих нежных ***цветков***» [5, с. 59], вплетенных Настенькой в ее венчальный венок. Сравнение девушки (и самого Мечтателя) с цветком у Достоевского «закольцовано» последними (цитированными выше) строками романа и эпиграфом (слегка измененным) из стихотворения И. С. Тургенева «***Цветок***». У Есенина «закольцованность» стихотворения выстроена на понятии «кстати», и встреча с описываемой женщиной не воспринимается как действие Божественного Промысла. Потому ему и чужда идея благодарности девушке и Богу, так пронзительно «выписанная» Достоевским: «Да будет ясно твое небо, да будет светла и безмятежна милая улыбка твоя, да будешь ты благословенна за минуту блаженства и счастия, которое ты дала другому, одинокому, благодарному сердцу!» [5, с. 59].

Мечтатель Есенина, таким образом, находится в процессе поиска, на этапе «томления в плену» (ср. «Но, всегда ища себе родную // И ***томясь*** в неласковом плену» у Есенина – и «***утомленный***, ***измученный***, засыпает в ***замираниях*** от восторга своего ***болезненно***-потрясенного духа и с такою ***томительно***-сладкою ***болью*** в сердце» [о Мечтателе **до** появления в его жизни Настеньки] у Достоевского), однако направление, интенция поиска в сторону сакрального (как у Достоевского) в стихотворении намечена: присутствует осознание некоторой инфернальности («синь очей утративший во мгле»), недочеловечности («только лишь мечтатель») Мечтателя, проекция на происходящее с позиции сакрального мира («ты…создана»).

В зеркале концепта **тоска**, таким образом, выявляется большой семантический пласт, важный для интерпретации произведений Достоевского и Есенина. Необъяснимый «русский дух» при КА получает свое «материальное» выражение и измерение.

Литература

1. Вежбицкая, А. Судьба и предопределение // Путь: Международный философский журнал. – 1994. — № 5. – С. 82–150.
2. Вежбицкая, А. Язык. Культура. Познание. – М.,1996. – 411с.
3. Воронова, О. Е. Сергей Есенин и русская духовная культура. – Рязань, 2002. – С. 459.
4. Грицай, Л. «Красота спасающая» и «красота бунтующая» в творчестве С. А. Есенина и Ф. М. Достоевского // Современное есениноведение. – 2008. — № 8. – С. 149–160.
5. Достоевский, Ф. М. Собрание сочинений: в 10 т. / Ф. М. Достоевский. – М., 1956. – Т. 2. – С. 5–59.
6. Есенин, С. А. Полное собрание сочинений: в 7 т. – М., 2004. – Т. 4. – С. 242.
7. Калинина (Широкова), М. А. Мечта, тоска, гармония как фрагменты русской языковой картины мира // Философско-педагогические и религиозные основания образования России: история и современность. Шестые Международные Покровские образовательные чтения, 23–25 октября 2007 г. – Рязань, 2008. – С. 57–61.
8. Краткий словарь когнитивных терминов / Е. С. Кубрякова, В. З. Демьянков, Ю. Г. Панкрац; под общ. ред. Е. С. Кубряковой. – М, 1997.
9. Прохорова, С. М. Еще раз о языковой непрерывности. – Минск, 1999. – С. 62.
10. Самоделова, Е. А. Антропологическая поэтика С. А. Есенина: авторский жизнетекст на перекрестье культурных традиций. – М., 2006. – С. 785.

11. Софронова, И. Н. Вертикальный контекст как категория художественного текста и средства его создания : автореф дис. … канд. филол. наук : 10.02.02. – Минск, 1990. – 99 с.
12. Степанов, Ю. С. Константы. Словарь русской культуры. – М., 1997.
13. Столетие Сергея Есенина. Международный симпозиум. – М., 1997. – С. 30.
14. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка / М. Фасмер. – М., 1986.
15. Широкова, М. А. Концепт ТОСКА в русском языке и в дискурсе Ф. М. Достоевского // Антропоцентрический подход в исследовании языка : материалы VII Международных Карских чтений, Нежин, 13–14 мая 1998 г. / НДПИ, ГрГУ. – Нежин – Гродно, 1998. – С. 238–240.
16. Широкова, М. А. Концептуально-лингвистический анализ произведений Ф. М. Достоевского и их переводов на белорусский язык : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.014 10.02.02. – Минск, 2001. – 153 с.
17. Широкова, М. А. О принципах концептуального анализа художественного текста // Личность – слово – социум : материалы 2-й науч.-практ. конф., 17–19 апреля 2002 г. – Минск, 2002. – С. 92–96.

Галіна Канцавая
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна (Беларусь)

МОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ІНТЭРНЭТ-ПУБЛІЦЫСТЫКІ

Мова публіцыстыкі за апошнія дзесяцігоддзі істотна змянілася. Адна з прычын гэтага – з'яўленне інтэрнэта, які налажыў свой адбітак і на мову публіцыстыкі ў цэлым, і асабліва – на мову інтэрнэт-публіцыстыкі.

Мова СМІ знаходзіцца ў цэнтры стылістычнай сістэмы сучаснай літаратурнай мовы. Многія словы ўзнікаюць і апрабіруюцца менавіта ў мове СМІ, прычым найбольшая колькасць моўных нованаўвядзенняў у нашы дні ўзнікае ў інтэрнэт-журналістыцы, і асабліва – у публіцыстычных жанрах, якія заўсёды былі больш чуйнымі да ўсяго новага і найбольш змяняліся на лінгвістычным і стылістычным узроўнях.

Змены публіцыстычнай мовы ў інтэрнэт-асяроддзі выкліканы як знешнімі, так і ўнутранымі прычынамі.

Знешнімі прычынамі відазмянення публіцыстычнай мовы ў інтэрнэт-асяроддзі з'яўляюцца: 1) лёгкасць публікацыі матэрыялу. Сёння стварыць свой сайт і публікаваць на ім матэрыялы сацыяльна знач-

най накіраванасці не ўяўляе вялікай складанасці. Сярод аўтараў можна сустрэць непрафесіянальных журналістаў, літаратараў-аматараў і г. д., у электронных публікацыях якіх назіраюцца такія з'явы, як: а) незахаванне літаратурных нормаў (наяўнасць у матэрыялах ненарматыўнай лексікі, арфаграфічных і пунктуацыйных памылак, парушэнне правіл спалучальнасці слоў, стылю і г. д.); б) змацненне дыялагічнасці і інтэрактыўнасці, у тым ліку і за кошт публікацыі каментарыяў да аўтарскіх матэрыялаў; в) узмацненне экспрэсіўнасці маўлення, якое выражаецца ў пранікненні ў мову сучаснай публіцыстыкі жарганізмаў, прастамоўных слоў і г. д.; 2) адсутнасць прафесійнай апрацоўкі тэксту, у выніку чаго ў інтэрнэт-публікацыях арфаграфічныя, пунктуацыйныя, граматычныя, маўленчыя памылкі і памылкі друку сустракаюцца значна часцей нават у прафесійных журналістаў. Асноўнымі прычынамі гэтага, на нашу думку, з'яўляюцца паспешнасць, нязручнасць чытання тэксту з экрана, звычка звяртаць увагу толькі на словы, падкрэсленыя тэкставым рэдактарам.

Унутранымі прычынамі пераўтварэння публіцыстычнай мовы ў інтэрнэт-асяроддзі тлумачыцца: 1) адлюстраванне ў лексіцы інтэрнэт-публіцыстыкі ўласна мовы інтэрнэту, нярэдка знарок скажонай; 2) павелічэнне колькасці англіцызмаў; 3) узмацненне інтэртэкстуальнасці за кошт уплыву на структуру тэксту гіперспасылак; 4) змяненне структуры публіцыстычнага тэксту па прычыне таго, што многія аўтары сталі ўлічваць псіхалагічныя фактары ўспрымання інфармацыі з экрана (напрыклад, фактар распаўсюджвання так званага праглядавага, курсорнага чытання); 5) эканомія часу, затрачанага на падрыхтоўку матэрыялу.

Унутранымі прычынамі відазмянення публіцыстычнага тэксту ў інтэрнэт-асяроддзі выклікана выкарыстанне невербальных знакаў (эматыконаў) у якасці словазаменнікаў, якія абазначаюць шырокі спектр эмацыянальнага стану аўтара, падкрэсліваюць яго адносіны да напісанага (смайлікі, разнастайныя канфігурацыі пунктуацыйных знакаў – дужак, двукосся, кропкі з коскаю і г. д., а таксама выкарыстанне змешаных літарна-знакавых спалучэнняў, якія замяняюць смайлікі, напрыклад, *lol:* (ад англійскага акроніма *lol – laughing out loud, 'гучна ўслых смеючыся'). І хоць невербальныя сімвалы адносяцца не столькі да лінгвістычных асаблівасцей інтэрнэт-тэкстаў, колькі да графічных, тым не менш, яны значна ўплываюць на мову інтэрнэт-публіцыстыкі ў цэлым.*

Сёння істотна змяніліся не толькі адносіны да моўных нормаў, але і самі моўныя нормы. У сувязі з тым, што інтэрнэт-публіцыстыка адлюстроўвае актуальныя праблемы жыцця сучаснага грамадства і арыентавана на масавую аўдыторыю, яе мова максімальна падстройваецца пад існуючае гутарковае маўленне з разлікам на найлепшае ўспрыманне публіцыстычных матэрыялаў рознымі сацыяльнымі групамі.

Для публіцыстычнага стылю ўласцівы такія функцыі, як: 1) інфармацыйная (у аснову публіцыстычнага паведамлення пакладзены якія-небудзь сацыяльна значымыя факты, падзеі і з'явы); 2) функцыя ўздзеяння на аўдыторыю; 3) камунікатыўная (зварот да чытача і чаканне яго рэакцыі на публікацыю, запрашэнне да дыялогу). Яны рэалізуюцца пераважна з дапамогай лексікі, якая выкарыстоўваецца ў мове інтэрнэт-публіцыстыкі.

Сярод асноўных моўных асаблівасцей сённяшняй інтэрнэт-публіцыстыкі адзначым наступныя: 1) укараненне ў лексіку сеткавай публіцыстыкі значнай колькасці англіцызмаў, калькаванне англійскіх слоў, асабліва з мовы інтэрнэта (*сайт, блогер, хакер, пост, анлайн* і інш.), а таксама вытворных ад іх (*анлайнавы, хакерскі, блогерскі* і г. д.); 2) з'яўленне значнай колькасці скарачэнняў ад слоў, шырока ўжывальных у інтэрнэт-асяроддзі, а таксама вытворных ад гэтых слоў (*комп, камент, дыз* (ад дызайн), *боты* (ад 'робаты пошукавых сістэм' і г. д.); 3) пашырэнне семантычнага значэння шэрагу слоў *(кантэкст, пост, паставы);* 4) шырокае распаўсюджанне інтэрнэт-жарганізмаў (*мыла* – ад англ. *e-mail* і г. д.); 5) наяўнасць знарок скажонай арфаграфіі, выкарыстанне слоў з т. зв. маргінальных моў інтэрнэту; 6) наўмыснае зліццё асобных словазлучэнняў у складаныя словы (*іржунемагу*); 7) наяўнасць значнай колькасці размоўнай і прастамоўнай лексікі (*кідала* і інш.); 8) выкарыстанне ненарматыўнай лексікі; 9) узмацненне гульнёвых элементаў у мове і інтэнсіўнае ўтварэнне неалагізмаў (*слава блогу, блогіка*); 10) выкарыстанне графічных элементаў, якія выражаюць эмоцыі аўтара: смайлікаў, камбінацый дужак ці іх заменанікаў**.**

Мова сучаснай інтэрнэт-публіцыстыкі пастаянна папаўняецца неалагізмамі абрэвіятурнага характару і вытворнымі ад іх: *аська* (праграма імгненнага абмену паведамленнямі ICQ), а таксама неалагізмамі на ўзроўні ўстойлівых словазлучэнняў: *выкласці на сайце* 'апублікаваць', *перапост* 'публікацыя чужога матэрыялу без змен' і г. д.

Такім чынам, за апошнія дзесяцігоддзі ў мове публіцыстыкі адбыліся істотныя змены. Найбольш яскрава яны выражаюцца ў інтэрнэт-публіцыстыцы.

Марыя Карповіч
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ВЫБАР МОЎНЫХ СРОДКАЎ У ПУБЛІЧНАЙ КАМУНІКАЦЫІ (з навуковага досведу знакамітых вучоных)

Міхась Яўгенавіч Цікоцкі. Навукоўцы, пісьменнікі, мастакі да свайго юбілею імкнуцца, як правіла, прымеркаваць новы, свежы твор. Наш паважаны, уганараваны намі юбіляр Міхась Яўгенавіч Цікоцкі, доктар філалагічных навук, прафесар, былы загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання факультэта журналістыкі БДУ, паклапаціўся пра свой найшаноўнейшы юбілей крыху загадзя і выдаў кнігу «Урокі моўнага майстэрства» (2009) [5]. «Урокі…», якія не ведаюць тэрміну даўніны і не зведаюць, пакуль будзе існаваць публічная камунікацыя – навуковая, мастацкая, масава-інфармацыйная, кіно і інш. І гэта нягледзячы на тое, што ўрокі моўнага майстэрства ў аднайменнай кнізе грунтуюцца толькі на мастацкай літаратуры, на творчасці беларускіх класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Зноў жа юбіляраў, якім у гэтым годзе споўніцца 130 гадоў. Варта чытачу-студэнту, журналісту, выкладчыку, якім адрасуецца кніга М. Цікоцкага, разгарнуць яе, прабегчыся па некалькіх старонках, каб пераканацца, што сапраўдная класіка заўжды сучасная, заўжды своечасовая і што аўтар для сваіх «Урокаў…» выбраў такі трывалы грунт свядома. Што датычыць выбару моўных сродкаў у публічнай камунікацыі – тэмы маёй нататкі, дык яна прадыктавана канцэпцыяй культуры маўлення ў наступным гучанні: «культура маўлення – гэта *такі выбар* і *такая арганізацыя* моўных сродкаў, якія ў пэўнай сітуацыі зносінаў пры захаванні сучасных моўных нормаў і этыкі зносінаў дазваляюць забяспечыць найвялікшы эфект у дасягненні пастаўленых камунікатыўных мэтаў» [2, с. 13].

У прыведзенай канцэпцыі побач з нарматыўным аспектам паўстае камунікатыўны аспект – гэта значыць, што «мова дае магчымасць выбару і рознай арганізацыі сваіх сродкаў дзеля дасягнення пастаўленых у зносінах мэтаў» [Тамсама]. Эфектыўную камунікацыю нельга забяспечыць толькі правільным, **нарматыўным**, маў-

леннем. Хаця наяўнасць у мовах нарматыўных варыянтаў таксама дае носьбіту мовы права выбару. Але гэта выбар іншы.

«Урокі моўнага майстэрства» Міхася Цікоцкага і ёсць, у першую чаргу, *узоры менавіта выбару моўных сродкаў майстрамі слова* – сродкаў лексічных, граматычных, стылістычных. Пры ўсім гэтым вучоны не пакідае ніводнага прыведзенага ім мастацкага тэксту без навуковага каментару, без тлумачэння функцый моўных адзінак у тэксце – сюжэтна-кампазіцыйных, вобразна-стылістычных, партрэтных і інш.

Працытую некалькі прыкладаў з кнігі М. Я. Цікоцкага – узораў для выбару моўных сродкаў публіцыстычнага гучання ў вершах Янкі Купалы.

«У вершы “Вы кажаце…” Купала піша:

Вы кажаце: надта пяю я нявесела,
Пацехаў ніякіх не бачу ў людзей…
Пакіньце смяяцца! Вас праўда не ўсцешыла,
Няпраўды ж не знаю ў душы я сваёй.
Як пеў я дагэтуль, так пець не цураюся,
Жальбою маркоцячы песню сваю;
Я ў долю народа свайго ўзіраюся
І толькі аб гэтым для вас я пяю.

Пра сваю цяжкую працу «на запусцелым дзірване» беларускага мастацкага слова Купала піша ў вершы «Я не для вас, паны…»:

Я не для вас, паны, о не,
Падняць скібіну слова рвуся
На запусцелым дзірване
Сваёй старонкі Беларусі» [5, с. 10].

Паказальным прыкладам для журналістаў у выбары моўных сродкаў можа быць прыведзены даследчыкам М. Цікоцкім верш Купалы «З летніх малюнкаў», пабудаваны на паўтарэнні ключавых слоў. Даследчык, ухваляючы гэты мастацкі прыём, заўважае: «Такі характэрны паўтор ключавых слоў мы знаходзім у многіх вершах паэта («Я бачыў», «Над Свіслаччу» і інш.)» [5, с. 11].

Верш «З летніх малюнкаў»:

Коціцца, уецца далінай крыніца,
Б’ецца, *плюскоча* ў каменнях вадзіца,
Далей плыве і *плюскоча*.
Белымі грудкамі лёгшы на траўцы,

Хоча дзяўчынка к вадзіцы дастацца.
Губкамі чэрпнуць *хоча*.
Вольха ліісткамі ёй шыю ласкоча,
Плюскатам рэчка смяецца ў вочы,
Сонейка ўсіх абнімае.
Сонейка, рэчка, вольха, *дзяўчына*
Думцы ўсміхаюцца соладка, дзіўна,
Думка іх шчыра вітае (курсіў мой. – *М. К.*).

Урокі моўнага майстэрства – навука складаная. Спасцігаць гэтую навуку мне пашчасціла поруч з Міхасём Яўгенавічам Цікоцкім, прафесарам Цікоцкім. Небеспадстаўна адзначу, што Міхась Яўгенавіч ніколі не нагадваў нам пра сваё навуковае званне. Мы ж ніколі не забывалі гэтага. Ён, прафесар, можа спакойна запытаць у мяне, непрафесара:

– Дык як, Марыя, будзем пісаць: аповед ці пакінем апавяданне?

– Аповед болей набліжаны да рускага «повествования». Але будзем пісаць, як Вы скажаце.

– Хай будзе аповед.

Падобныя дыялогі за час нашай амаль 30-гадовай сумеснай працы былі не адзінкавымі. Яны ўзнікаюць нават сёння…

Ілля Уладзіміравіч Талстой. Прафесар факультэта журналістыкі МДУ імя М. В. Ламаносава І. Талстой да свайго 70-гадовага юбілею падрыхтаваў навуковы твор «Не могу молчать»: семантико-стилистический анализ статьи Л. Н. Толстого». Твор цалкам заняў плошчу выдання «Журналистика и культура русской речи» [4]. Прафесар для свайго навуковага даследавання таксама абраў класіку. Не мастацкую, а публіцыстычную. Аўтар даследавання паведамляе: «Не могу молчать» – одна из высочайших вершин публицистического творчества Льва Николаевича Толстого. Написана была в 1908 году.

Пятьдесят лет тема насильственной смерти мучила и тревожила Льва Николаевича Толстого… Каждый раз, узнавая о новых казнях, а продолжалось это, по словам Толстого, “не неделю, не месяц, не год, а годы” [37, 83][1], он испытывал неимоверные страдания. Он стра-

[1] Усе спасылкі на Л. М. Талстога аўтарам даследавання падаюцца па Юбілейным выданні збору твораў пісьменніка ў 90 тамах. М., 1928–1958 (першая лічба – том, другая – старонка).

дал и как человек, обостренно чувствовавший чужую боль, и как философ-моралист, придерживающийся одной из главных заповедей Христа «не убий» – основы толстовской морально-этической системы, и как гражданин России, который “гордился … когда-то перед европейцами”, что в его стране “до последнего времени по закону не было смертной казни”» [37, 183].

Пра неадназначную рэакцыю на артыкул «Не могу молчать» з боку ўладаў, нелегальных тыпаграфій, замежнага друку і інш. цікава прачытаць у даследаванні І. Талстога [4, с. 8–10]. (Вось яна, класіка. Дагэтуль своечасовая.)

Хачу звярнуць увагу на матэрыял вучонага датычна артыкула «Не могу молчать» пад загалоўкам «Лексическая система и особенности словоупотребления как отражение мировоззрения Л. Н. Толстого», сугучны з тэмай маёй нататкі. Прафесар І. Талстой дае нам свае ўрокі моўнага майстэрства праз глыбокі аналіз выкарыстання лексічных адзінак пісьменнікам Талстым, у прыватнасці такіх слоў, як *народ* (ключавое паняцце ў артыкуле «Не могу молчать» выкарыстоўваецца звыш 20 разоў з тонкай дыферэнцыяцыяй значэнняў, абумоўленай выразным і адназначным разуменнем пісьменнікам «социального расслоения общества в России»: «Народ» – «не-народ» («мы»), *обман, ложь, совесть, развращение* і вялікі шэраг іншых).

Даследчыкі не раз адзначалі, паведамляе І. Талстой, як адну з характэрных асаблівасцей мовы і стылю Талстога шырокае выкарыстанне ім паўтораў. «Повторы у Толстого функционально разнородны: они служат и организации текста, и целям усиления эмоционального и экспрессивного воздействия, несут большую семантико-стилистическую и синтаксическую нагрузку. В каждом конкретном произведении и в каждой части целого *при внимательном чтении* (вылучана мною. – М. К.) можно обнаружить те задачи, которые решал Толстой, прибегая к приему повторения» [4, с. 57].

«Слова «развращение», «развращать», «развращённый» намеренно повторяются Толстым в близких по содержанию контекстах, повторяются многократно, будто Толстой не доверяет проницательности читателя, боится, что читатель пройдет мимо столь важной для автора мысли. Ср.: «Придумано то, чтобы *разыскивать* самых развращённых и несчастных людей…» [37, 84] и: «Используют же дело несчастные, обманутые, развращённые, презираемые» [37, 84]. «Распространяется же это *развращение* особенно быстро среди простого, рабочего народа»

[37, 86] и: «Распространяется это *развращение* с необычайной быстротой» [37, 86]. С другой стороны, Толстой будто бы опасается также того, что для читателя это понятие остается слишком отвлеченным, а значит, может оставить его равнодушным к тому, что волнует автора. Чтобы избежать этого, он обращается к жизненным фактам, иллюстрирующим его мысль» [4, с. 21]. (Нашыя рэдактары даўно б ужо наклеілі ў аўтарскі тэкст слоў «оно», «они» і г.д., нягледзячы на ўсе моўныя перасцярогі хай сабе і класіка. Менавіта таму я акцэнтую сваю ўвагу на паўторах. І не толькі я. «Стилистический прием повторений» – загаловак тэксту ў І. Талстога [4, с. 57].

Павучальным (ці навучальным) урокам выбару моўных сродкаў у публічнай камунікацыі будзе наступны творчы прыём класіка не толькі рускай, але і сусветнай літаратуры Льва Мікалаевіча Талстога, адзначаны даследчыкам І. Талстым. «Лев Толстой в своих обличительных статьях редко прибегает к прямой оценке «ругательным» словом. Только в черновиках и дневниковых записях мы можем встретить откровенные выпады. Например: «Какой-нибудь – не могу удержаться – негодяй, называемый императором, или подлец, называемый министром...» [37, 368]. Еще пример: «... те несчастные (имеются в виду царь Николай II и премьер-министр Петр Столыпин – И. Т.), чтобы не сказать мерзавцы...» [37, 396]. Толстой публично считал, что откровенная брань в публицистическом произведении уменьшает силу его воздействия, поэтому вопреки своему темпераменту и привычке называть вещи своими именами в частных беседах он избегал слишком сильных выражений в статьях и других предупреждал против подобного столь заманчивого, но поверхностного способа создавать у читателя нужное автору отношение к объекту. Характерен в этом отношении отзыв Л. Н. Толстого о предисловии В. Г. Черткова к брошюре «Финский разгром».

Лев Николаевич писал Владимиру Григорьевичу: «предисловие к Финл[яндиам] мне не нравится. Опять тот же нехороший, грубый, вызывающий тон с резкими эпитетами, которые ничего не только не прибавляют к вескости доводов, но ослабевают их. Совсем нехорошо» [88, 197] [4, с. 13].

Прыведзены тэкст, без сумніву, можа быць сапраўдным **урокам** выбару моўнага сродку для сучасных публічных асоб найвышэйшага рангу. Так, напрыклад, зусім нядаўна карэспандэнт тэлеканала «РТР» Сяргей Брылёў папрасіў прэм'ера сваёй краіны «патлумачыць

стылістыку» ўжытых ім выразаў «Бараны – вперед!», «контрацептивы», на думку супрацоўнікаў канала, не да месца. Прэм'ер патлумачыў, але, як мне падалося, журналіст застаўся незадаволеным (РТР. Вести. 17.12.2011: 20.45).

Высокадзяржаўным прамоўцам не заўжды ўдаецца, насуперак свайму тэмпераменту, пазбегнуць, падобна Л. Талстому, «слишком сильных выражений». Але ж гэта неабходна, асабліва з улікам сітуацыі міжкультурных зносінаў, калі тэксты прамоўцаў перакладаюцца на мовы розных краін. Прывяду прыклад выкарыстання недыпламатычнага фразеалагізма расійскім прэзідэнтам у тэлеэфіры падчас знаходжання ў Бразіліі. «Сильное выражение» адрасавалася тым, каму, на думку прэзідэнта, не даспадобы яго паспяховыя інвестыцыйныя дамоўленасці з гэтай краінай. «Но нам на это наплевать», – выказаўся прэзідэнт у эфіры, стоячы поруч з жанчынай, якая неўзабаве стала прэзідэнтам Бразіліі. Па праўдзе кажучы, пачуты выраз агаротшыў. І ужо назаўтра на занятках са студэнтамі спецыяльнасці «Журналістыка міжнародная» мы абмеркавалі гэты маўленчы выпадак, знайшлі сэнсава адэкватныя стылістычна нейтральныя замены грубаму фразеалагізму. Назаўтра, у ранішнім выпуску навінаў быў паказаны сюжэт, у якім прэзідэнт Расіі абышоў ужо сваё непрыстойнае выказванне.

Як маглі ўжо заўважыць, урокі моўнага майстэрства ад беларускага прафесара-юбіляра і ад прафесара-юбіляра расійскага, выспеўшыя на класічным творчым грунце, шмат у чым сугучныя, а галоўнае – своечасовыя.

***

Варта адзначыць той факт, што юбілеі прыўносяць у навуку шмат новага. У адным з артыкулаў чытаю: «Когда отмечалось восьмидесятилетие Дитмара Эльяшевича Розенталя, много лет возглавлявшего кафедру стилистики русского языка факультета журналистики Московского университета, юбиляра приветствовали дикторы радио. Они пели шуточные куплеты на мотив цыганского романса. В них были такие строки: *«Ты подарил фольгу́ нам и отменил раку́рс»*. На падставе гэтага аўтар артыкула слушна разважае пра тое, «што Разенталь дазволіў дыктарам вымаўляць гэтыя словы так, як іх вымаўляюць усе нармальныя людзі». Норму Разенталь не памяняў. Яна памянялася стыхійна. Свядома ж была абноўлена кадыфікацыя

нормы літаратурнай мовы. Менавіта яна, кадыфікацыя, і павінна служыць захаванню культурнай спадчыны нацыі. Падобныя выпадкі ў мовах на кожным кроку: толькі праз сваё папярэдняе функцыянаванне норма можа дамагчыся кадыфікацыі. (У нашай жа традыцыі рэдактары будуць гадамі крэсліць аўтару нарматыўную форму слова *шэраг* у родным склоне з канчаткам *-у* «для шэрагу выданняў», выпраўляць на *шэрага!*)

Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі. Некалькі слоў пра выбар арфаграфічнай нормы. Вучонага ўжо даўно няма, але яго беларуская навука жыве. Жыве і цудоўная кніжачка «Само слова гаворыць». Што яно, гэтае гаваркое слова, нам скажа наконт выбару арфаграфічнага моўнага сродку, вакол якога няма адзінай думкі. Чытаем у Ф. М. Янкоўскага: «Атрымаў з Полацка кніжку, але ў той дзень не паспеў пагартаць, нават прабегчы вачыма прадмову. Спяшаўся. Трэба было трапіць на нараду: будзе абмяркоўвацца, як быць са скланеннем два і дзве… *Двух* сталоў і *дзвюх* дошак, *двух* братоў і *дзвюх* гадзін. Усё і ўсім, нават блытанікам, зразумелае. Свой *род*, свая *форма*: два сталы – двух сталоў, а дзве дошкі – дзвюх дошак. А далей? Пытанне: дзвюх ліній, а як «двухлінейная»? Дзвюх гадзін, але двухгадзінная?

Тое самае становіцца ўжо нібы *не тым самым*. Спрачацца тут як бы няма чаго, няма за што. Сама элементарная логіка магла спыніць спрэчку» [6, с. 194]. Кніга выдадзена ў 1986 г., а значыць ужо тады не ставала вучоным «элементарнай логікі»?

На жаль, чытаю новае правіла: «У складаных словах, утвораных ад лічэбніка ў форме роднага склону і іншага слова, першая частка пішацца так, як яна пішацца ў родным склоне лічэбніка» [3, с. 8]. Сярод шэрагу (не шэрага!) прыкладаў ёсць слова *саракапяцітонны*, г. зн. можа быць і *пяцітонны* і *пяцітонка*, дзе другая частка паходзіць ад назоўніка жаночага роду *тона*, а першая частка – родны склон лічэбніка. Вывад: р. скл. лічэбніка – дзвюх + іншае слова тонны, тонка) – дзвюхтонны, як і пяцітонны. «Элементарная логіка», але некаторыя вучоныя моўчкі абыходзяць яе. Альбо запішуць у выключэнні, толькі невядома, з якога правіла. Шкада, што нашыя студэнты не надта сябруюць з названай кнігай вучонага-класіка ў галіне беларускай мовы. (Таму замест слова *галіна* і выбіраюць слова *вобласць.*)

Не першы раз даводзіцца мне рэзюмаваць сутнасць сваіх даследчых намаганняў словамі настаўніка творчай моладзі, пісьменніка,

журналіста, рэдактара М. Горкага: «Я ведаю, што гэта незасвоенае». Можа, настаў ужо час аб'яднаць нам свае намаганні менавіта на карысць нацыянальнай культуры, з аднаго боку, і на карысць свайго ўласнага «лінгвістычнага капіталу» – з другога.

Літаратура

1. Гессен, Д. Большой польско-русский словарь / Д. Гессен, Р. Стыпула. – Москва – Варшава: Изд-во «Советская энциклопедия», государственное издательство «Везда Повшехна», 1967. – 1344 с.

2. Культура русской речи и эффективность общения. – М. : Наука, 1996. – 441 с.

3. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі: зацверджаны Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г. № 420–3. – Мінск: Дыкта, 2009. – 159 с.

4. Толстой, И. В. Не могу молчать: семантико-стилистический анализ статьи Л. Н. Толстого / И. В. Толстой; под ред. С. В. Светана-Толстой // Журналистика и культура русской речи. Вып. 10. К 70-летию проф. И. В. Толстого / гл. редактор С. В. Светана-Толстая. – М., 2000. – 74 с.

5. Цікоцкі, М. Я. Урокі моўнага майстэрства: стылістычныя назіранні над паэзіяй і мастацкай прозай Янкі Купалы і Якуба Коласа: дапаможнік / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – 88 с.

6. Янкоўскі, Ф. Само слова гаворыць: філал. эцюды, абразкі, артыкулы / Ф. Янкоўскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. – 318 с.

Уладзімір Касько
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

НАРОДНЫЯ МУДРАСЛОЎІ
(да пытання вывучэння беларускай парэміялогіі)

Беларусы ўсе факты, усе выпадковасці чалавечага жыцця, усе учынкі: як добрыя, так і кепскія, падводзяць пад мерку сваіх прыказак. Старыя прыказкамі навучаюць дамачадцаў быць паважлівымі да старэйшых, быць беражлівымі, ахайнымі, працалюбівымі і паблажлівымі да блізкіх. Прыказкамі... выпраўляюць недахопы, суцяшаюць у смутку, смяшаць і нават у тых, хто плача, выклікаюць усмешку. Насмешлівых і жартоўна-сатырычных прыказак ёсць вельмі многа ў беларускай мове.

І. І. Насовіч

У фальклоры выгадна вылучаюцца прыказкі і прымаўкі. Яны ярка і шматгранна адлюстроўваюць багаты працоўны і жыццёвы вопыт народа, яго псіхалогію, маральна-этычныя і эстэтычныя ідэалы. Першыя ўпамінанні пра беларускія прыказкі і прымаўкі сустракаюцца ў помніках XII ст., у прыватнасці ў Пачатковым рускім летапісе і асабліва ў помніках XVI–XVII стст. Умела выкарыстоўваў залацінкі народнай мудрасці беларускі грамадскі дзеяч, асветнік, аршанскі стараста Філон Кміта-Чарнабыльскі ў вядомых «Допісах» (1573–1574). Сустракаюцца яны ў помніках беларускай палітычнай сатыры XVII ст.: «Прамове Івана Мялешкі, кашталяна смаленскага», а таксама ў «Лісце да Абуховіча».

У 1618 г. ураджэнец Беларусі С. Рысінскі надрукаваў у мястэчку Любча на Нёмане (цяпер Навагрудскі раён) зборнік «Польскія прыказкі», куды ўвайшлі звыш 1800 тэкстаў. Быў сярод іх і беларускі матэрыял.

І ўсё ж прынята лічыць, што першыя публікацыі беларускіх прыказак належаць А. Рыпінскаму – беларускаму эмігранту, які жыў у Францыі. У 1840 г. ён надрукаваў кнігу «Беларусь», дзе змясціў 50 прыказак, што захаваліся ў яго памяці. У рускім друку беларускія прыказкі і прымаўкі ўпершыню з'явіліся ў 1844–1845 гг. В. Васільеў апублікаваў на старонках пецярбургскага часопіса «Маяк» (т. XV, XII, XXIII) 75 тэкстаў.

Збіралі і друкавалі парэміялагічныя творы таксама Я. Чачот, Я. Тышкевіч, П. Шпілеўскі, А. Кіркор. Цікавая дэталь – збіральнікі фальклорных залацінак вывучалі народную творчасць большасці рэгіёнаў Беларусі. Да Шпілеўскага, які збіраў матэрыялы па ўсёй яе тэрыторыі, далучыўся М. Анімеле. Ён сабраў у Віцебскай губерні каля 100 прыказак і прымавак, якія былі выдадзены Рускім геаграфічным таварыствам. Звыш 150 прыказак, сабраных навучэнцамі Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі, надрукаваў у сваім зборніку П. Гільтэбрант, каля 70 тэкстаў запісаў у Пружанскім павеце Гродзеншчыны Ф. Варажбіцкі.

Высока ацаніла навуковая грамадскасць «Сборник белорусских пословиц» І. І. Насовіча, які ўбачыў свет у 1874 г. Ён уключаў у сябе 3715 запісаў, зробленых у розных кутках Беларусі, адрозніваўся ад многіх іншых колькасцю матэрыялаў, дакладнасцю рэгіянальнага вымаўлення прыказак, чаму садзейнічалі неабходныя надрадковыя знакі. Аўтар паслядоўна раскрыў змест кожнай прыказкі, падрыхтаваў да кнігі тлумачальны слоўнік незразумелых слоў і выразаў.

У 1880–1890-я гг. з’явіліся новыя публікацыі прыказак і прымавак, якія хаця і ўступалі па колькасці зборніку Насовіча, але былі не менш каштоўнымі па змесце і мастацкіх вартасцях. Сярод іх вылучаюцца зборнік прыказак, прымавак і загадак Я. Ляцкага, запісы В. Дыбоўскага з Навагрудскага павета (звыш 700 тэкстаў) і З. Радчанкі з Гомельшчыны (83 тэксты).

Па колькасці сабраных і апублікаваных прыказак і прымавак пальма першынства па праву належыць М. Федароўскаму, які запісаў каля 28 000 тэкстаў. У чацвёртым томе яго фундаментальнай працы «Люд беларускі» змешчана каля 10 000 прыказак і іншых матэрыялаў.

Звыш 3000 прыказак, прымавак і блізкіх да іх устойлівых выразаў утрымлівае трэцяя частка «Смоленского этнографического сборника» У. М. Дабравольскага (Санкт-Пецярбург, 1894).

Не абыйшоў увагай парэміялагічную спадчыну народа і Е. Р. Раманаў. У яго знакамітым «Беларускім зборніку» (Кіеў, 1886) пад рубрыкай «Прыказкі, прымаўкі, апісальныя выразы» надрукаваны больш за 700 тэкстаў гэтага жанру. Сустракаюцца прыказкі і ў іншых яго працах. Ведалі цану жамчужынам народнай мудрасці, ахвотна запісвалі і друкавалі іх П. В. Шэйн, Д. Г. Булгакоўскі, М. Я. Нікіфароўскі.

Важны ўклад у парэміялагічную скарбонку ўнёс А. К. Сержпутоўскі. На працягу многіх гадоў Аляксандр Казіміравіч збіраў і запісваў народную фразеалогію, у тым ліку прыказкі, прымаўкі, выслоўі і г. д. Падрыхтаваная ім машынапісная праца «Прыказкі і прымаўкі беларусаў (Матэрыялы да вывучэння творчасці беларусаў і іх мовы)» утрымлівала 10 000 тэкстаў і па колькасці запісаў пераўзыходзіла самыя буйныя дарэвалюцыйныя парэміялагічныя зборнікі.

«У літаратуры маецца ўжо цэлы шэраг добрых зборнікаў беларускіх прымавак, – гаварыў ён. – Зборы Дабравольскага, Шпілеўскага, Ляцкага, Насовіча, калектыўныя зборнікі, надрукаваныя ў працах Шэйна і Гільтэбранта, а таксама шэраг старажытных, маладаступных зараз зборнікаў Чачота, Дзмітрыева, Мальчэўскага і іншых. Зборнік Сержпутоўскага пераўзыходзіць усе гэтыя зборнікі багаццем матэрыялу, сістэмна сабранага ў адной пэўнай мясцовасці і запісанага з захаваннем фанетычных асаблівасцей мясцовых гаворак», – пісаў у сваёй рэцэнзіі на зборнік акадэмік Д. К. Зяленін (Отзыв д. чл. Д. К. Зеленина о трудах А. К. Сержпутовского. Очет Имп.

Рус. Георг. О-ва за 1908 г. Санкт-Петербург, 1909. Приложение к отчету, л. 19).

Увесь фактычны матэрыял у зборніку быў размешчаны ў алфавітным парадку паводле пачатковай літары першага слова. Зяленін аднёс гэта да недахопаў навуковай працы. Улічваючы той факт, што беларуская лексікалогія ўяўляла сабой амаль некрануты пласт, з якім зусім была незнаёма навуковая грамадскасць Расіі і Еўропы, вучоны раіў Сержпутоўскаму істотна пашырыць слоўнік, пазнаёміць чытача з прыгожай сакавітай народнай мовай, указаць канкрэтны адрас (вёску, прыход, павет), дзе запісаны пэўны твор, распрацаваць сучасную класіфікацыю прыказак і прымавак. На думку Зяленіна, варта было не толькі ўказаць на запазычанасць асобных слоў, выразаў, але і падкрэсліць, што пэўнае слова, прыказка, прымаўка бытуюць толькі ў гэтым рэгіёне.

Высока ацаніў Зяленін і дадатак да слоўніка аб'ёмам у 158 старонак машынапіснага тэксту, які тлумачыў спіс і значэнне асобных слоў і выразаў многіх прыказак і прымавак. Акадэмік выказаўся за тое, каб пасля дапрацоўкі зборнік Сержпутоўскага быў надрукаваны на сродкі Рускага геаграфічнага таварыства ў адным з навуковых выдавецтваў Пецярбурга або ў «Виленском временщике». Па яго прапанове аддзяленне этнаграфіі РГТ прысудзіла А. К. Сержпутоўскаму малы залаты медаль.

У 1926 г. Інбелкульт меў намер выдаць зборнік, аднак па невядомай прычыне ён не быў апублікаваны. Машынапісны экзэмпляр зборніка аказаўся ў архіве секцыі этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі АН БССР. У час вайны рукапіс разам з акадэмічным архівам быў вывезены нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Германію.

У 1946 г. сярод матэрыялаў радыёкамітэта, вернутых на радзіму, была знойдзена і частка зборніка Сержпутоўскага. Захаваліся машынапісныя старонкі 1–99 і 127–186, якія ўтрымліваюць каля 5 200 прыказак, прымавак, выслоўяў. Уцалелі таксама тытульны ліст з указаннем назвы працы «Прыказкі і прымаўкі беларусаў» і прадмова «Ад збіральніка». На першай старонцы рукапісу стаіць афіцыйны штамп з указаннем друкаваць работу тыражом 500 экзэмпляраў.

У прадмове Сержпутоўскі піша, што ў зборнік трапілі прыказкі і прымаўкі, запісаныя ім у канцы XIX ст. у Беларускім Палессі – паўднёвай частцы Слуцкага павета і паўночнай частцы Мазырскага павета Мінскай губерні. У большасці сваёй інфарматарамі былі пажылыя жыхары вёсак Чудзін, Будча, Колкі, Дзяніскавічы, Гаўрыль-

чыцы, Вялікі Рожан, Малы Рожан, Мазалі, Папоўцы, Люнговічы, Старчыцы, Бучацін Слуцкага павета і Камаровічы, Бобрык, Лучыцы, Навасёлкі, Убібацька, Гарадзячыцы Мазырскага павета. Пры гэтым асаблівая ўвага ў час запісаў удзялялася дакладнай перадачы тэкстаў, вымаўленню асобных гукаў. Навуковай каштоўнасці працы садзейнічаў фанетычны спосаб пісьма.

Былыя супрацоўнікі А. К. Сержпутоўскага сцвярджалі, што ў справаздачах аб навуковай дзейнасці вучоны ўказваў далёка не ўсе напісаныя ім працы. Так, А. С. Бяжковіч расказаў аўтару гэтых радкоў, што на рабочым стале Аляксандра Казіміравіча бачыў невялікі зборнік прыказак і прымавак, запісаных рукой Сержпутоўскага. Жонка А. Супінскага, які працаваў разам з Сержпутоўскім у беларускім аддзеле Дзяржаўнага музея этнаграфіі народаў СССР, успамінала, што Аляксандр Казіміравіч не раз чытаў у іх кватэры ўласныя запісы песень, прыводзіў па памяці мноства арыгінальных прыказак, выслоўяў, загадак, якія, па яго словах, павінны былі неўзабаве ўбачыць свет. Усё гэта наводзіла на думку, што недзе могуць захоўвацца яшчэ невядомыя працы Сержпутоўскага. І сапраўды, знаёмячыся з асабістым архівам Я. А. Ляцкага ў Інстытуце рускай літаратуры (Пушкінскі дом) у Санкт-Пецярбургу, аўтар гэтых радкоў звярнуў увагу на сшытак з надпісам: “Сержпутовский А. Белорусские пословицы и поговорки, записанные в Мозырском уезде”.

У сшытку рукой А. К. Сержпутоўскага ў алфавітным парадку запісаны 493 прыказкі і прымаўкі з захаваннем асаблівасцей мясцовай гаворкі. Спачатку падумалася, што знойдзены сшытак з’яўляецца часткай зборніка «Прыказкі і прымаўкі беларусаў». Пасля супастаўлення тэкстаў высветлілася, што перад намі самастойная праца: супадалі толькі 58 тэкстаў.

Незразумела, чым выклікана складанне асобнага невялікага зборніка прыказак і прымавак, запісаных у Мазырскім павеце, і чаму яны не былі ўключаны ў агульны зборнік, падрыхтаваны да друку. Меркаванні, што да друку былі адабраны найбольш яркія тэксты, беспадстаўныя. Прыказкі і прымаўкі, запісаныя ў мазырскім сшытку, па сваіх ідэйна-мастацкіх якасцях не толькі не ўступаюць адабраным для апублікавання, а ў некаторай ступені нават пераўзыходзяць іх. Думаецца, што ўключыць у зборнік новыя матэрыялы не дазволіў аб’ём рукапісу, вызначаны выдавецтвам.

Як сведчыць перапіска А. К. Сержпутоўскага з кіраўніцтвам Інбелкульта адносна выдання яго прац, яму неаднаразова даводзілася

скарачаць свае матэрыялы. Магчыма і такое: мазырскі сшытак Сержпутоўскі збіраўся выдаць невялікім лакальным зборнікам.

Характар матэрыялаў, змешчаных у абодвух зборніках А. К. Сержпутоўскага, прыналежнасць іх да аднаго і таго ж палескага рэгіёна даюць падставы прымяняць агульны падыход да аналізу прыказак, прымавак, іншых афарыстычных твораў. Пры гэтым адзначым цікавую дэталь: у разглядаемым машынапісным варыянце яны згрупаваны па тэматычных рубрыках, пададзеных у алфавітным парадку: «Абавязак», «Абмаўленне», «Абяцанне», «Адзінота» і г. д. Асобныя словы, паняцці маюць тлумачэнні, якія даюцца пасля слоў у дужках. У прадмове пералічаны назвы населеных пунктаў, дзе вучоны рабіў свае запісы.

Прынцып класіфікацыі парэміялагічнага матэрыялу па асноўных паняццях і тэмах варта лічыць больш дасканалым, чым прынцып Адальберга і Федароўскага, якія сістэматызавалі матэрыял па апорным слове тэксту. Прыказкі Сержпутоўскага давалі шырокае ўяўленне аб шматлікіх баках вясковага жыцця, аб норавах, звычаях, маралі, занятках беларусаў-палешукоў. У рубрыцы «Земляробства», напрыклад, многа прыказак-прыкмет, абагульняючых шматвекавы гаспадарчы вопыт земляроба: *«Без догляду зямля – круглая сірата», «У сошкі залатыя рожкі».*

Прыказкі і прымаўкі пад рубрыкай «Бяда» малююць гаротны стан сялян, якія жылі ў голадзе і жабрацтве: *«Бяда бы дуда: пачне дуць, аж слёзы бягуць», «То не бяда, што ў жыце лебяда, няма горшай бяды, як ні жыта, ні лебяды», «Бяда ўсюды знойдзе», «Адкуль толькі тое ліха бярэцца, калі кепска жывецца».*

Класіфікацыя прыказак і прымавак, прапанаваная Сержпутоўскім, хаця і мела шэраг пераваг перад алфавітным размяшчэннем матэрыялу, у той жа час таксама не магла лічыцца дасканалай. Матэрыялы многіх рубрык былі падобнымі па тэмах, змесце, не вытрымлівалася гістарычная паслядоўнасць у развіцці прыказак і прымавак і функцыянальнае значэнне іх асобных катэгорый. На нашу думку, мэтазгодна карыстацца класіфікацыяй па асноўных сферах жыцця і быту народа, з якімі творы гэтага жанру непасрэдна звязаны.

Значнае месца ў абодвух зборніках займаюць прыказкі пра зямлю-карміцельку: *«Хто поле троіць, той хлеб кроіць», «Без догляду зямля – круглая сірата», «Не зважай на ўраджай, а жыта сей»,*

«Уміраць збірайся, а поле пашы». Яны цесна звязаны з народнай метэаралогіяй і народным календаром: *«Дзе валошка, там хлеба крошка», «Рэпу ды гарох не сей каля дарог», «Мокры май – жыта як гай», «Без прыкмет не будзе хлеба на абед»*.

Аднак селянін разумеў, што лёс ураджаю перш за ўсё залежыць ад яго працы, адсюль прыказкі, якія праслаўлялі працавітага чалавека: *«Дзе гаспадар ходзіць, там жыта родзіць», «Хто ў дождж косіць, той у пагоду награбе», «Работа хлеб салодзіць»*, *«Работа чалавека лечыць»,* і, наадварот, прыказкі, якія асуджалі ленасць, гультайства: *«Не за сваё дзела не бярыся»*, *«Менш гавары, ды больш рабі»*.

Многія прыказкі прысвечаны народным рамёствам: *«Навучыўся сам – навучы іншых», «Што ўмець – за плячыма не насіць»*.

З асаблівай павагай адносіўся беларускі селянін да прафесій швачкі, каваля: *«Не ўмееш шыць золатам, дык куй молатам»*, «*У каваля рукі па локці ў золаце»*. Адносіны да працы вызначалі, на думку народа, маральнае аблічча чалавека. Працавітасць, павага да прафесіі выступаюць у прыказках і прымаўках як катэгорыі прыгожага, узвышанага.

Сярод прыказак і прымавак, аднесеных да раздзела «Грамадскае жыццё», асаблівай вастрынёй вылучаюцца творы, накіраваныя супраць царскага самадзяржаўя, памешчыкаў, рэлігіі: *«Надзеў ярмо, ды не скінеш»*, *«Ярмо лёгкае, а цяжка»*. Пад ярмом падразумяваўся сацыяльны прыгнёт.

Прыказка, як чуйны барометр, адзывалася на ўсе з'явы палітычнага жыцця. Свае адносіны да зямельных рэформ, ад якіх выйгрывалі памешчыкі і буйныя землеўладальнікі, народ трапна выказаў у прыказках: *«Кося, кося, каб толькі злавіць удалося»*, *«Кося, кося, у аглоблю, дам аброку, а там другою па боку»*.

Насуперак сцвярджэнням асобных рэакцыйных дэмографаў аб тым, што беларускі народ, як ніякі іншы, верыў у добрага цара, народная мудрасць гаварыла: *«Горшага пекла няма, як тут»*, *«Брадзяга – усяму свету знявага, а сволач – цару помач»*.

Спецыфікай беларускага парэміялагічнага матэрыялу можна растлумачыць і наяўнасць у зборніках Сержпутоўскага прыказак і прымавак, якія высмейвалі паноў і памешчыкаў. Аналагічная рубрыка не сустракаецца нават у фундаментальных зборніках рускіх прыказак.

Вострая сатыра на паноў праяўляецца ў самых, на першы погляд, нечаканых словазлучэннях: *«Свіння ў балоце, як пан у злоце», «Пан*

багаты – яму добра, сабака калматы – яму цёпла». Параўноўваючы ганарлівых паноў з сабакам і свіннёй, у прыказцы падкрэслівалася нянавісць сялян да сваіх прыгнятальнікаў, жаданне высмеяць іх. Створаныя ў перыяд прыгоннага права і паслярэформенны час, многія прыказкі і прымаўкі сведчаць пра жорсткасць і бесчалавечнасць памешчыкаў і паноў, заклікаюць не верыць у іх дабрыню: *«Пан мякка сцеле, ды спаць колка», «У пана ласка па парог».* У некаторых прыказках утрымліваецца прамы заклік да непадначалення ўладам: *«Знойдзем дубінку і на панскую спінку», «Хто гнецца, таго і гнуць».*

«Магчыма, ні ў адной з форм моўнай творчасці народа з такой сілай і так шматгранна не праяўляецца яго розум, так крышталёва не адкладваецца яго нацыянальная гісторыя, грамадскі лад, быт, светапогляд, як у прыказках», – пісаў М. Шолахаў. Гэтыя словы адносяцца і да беларускіх прыказак і прымавак зборнікаў А. Сержпутоўскага.

Жыццёвую мудрасць, вопыт утрымліваюць прыказкі і прымаўкі, у якіх размова ідзе пра чалавечую этыку, выхаванне дзяцей: *«Які палец ні ўкусі, аднолькава баліць», «Без дзяцей ціха, ды на старасці ліха», «Вінавата хата, што спесціла Ігната», «Палажы госцю ячную лусту, а не пшанічнае слова».*

Прыказкі і прымаўкі са зборнікаў Сержпутоўскага вызначаюцца незвычайнай дасканаласцю мастацкай формы. Сярод шматлікіх выяўленча-выразных сродкаў даследчыкі вылучаюць параўнанні, якія маюць самыя разнастайныя формы выражэння. Самымі распаўсюджанымі з іх з'яўляюцца злучнікі *як, каб, што, быццам, то, але, бы* і г. д.: *«Тады хіба перастане, як сарока белай стане», «Трэба быць без галавы, каб гэта зрабіць», «Варочаецца, бы мядзведзь».* Але сустракаюцца і бяззлучнікавыя канструкцыі: *«Гразь не сала – пацёр дык і адстала», «Хто маўчыць – трох навучыць», «Як ні круці – трэба ўмярці».*

Часта параўнанні выражаюцца ў форме сінтаксічных паралеляў: *«У старцы пугаю не выганіш, а са старцаў мёдам не вымaніш».*

У прымаўках параўнанні сустракаюцца яшчэ часцей, чым у прыказках. І вось чаму. Калі ў прыказках заўсёды робяцца нейкія абагульненні, вывады, сустракаюцца павучанні, то роля прымавак іншая. Іх прызначэнне – упрыгожыць мову, зрабіць яе яркай, вобразнай, запамінальнай. Яны лагічна ўпісваюцца ў канву літаратур-

ных твораў, становяцца іх часткай: *«Зімой Бог мосціць, а ўлетку высыхае, той бродзік можна перайсці», «Зямля такая, што пасадзі дзіця, дык і тое вырасце».*

Прымаўка бліжэй да жыцця, людзей. Калі прыказкі маюць абагульняльны, універсальны характар, то прымаўкі падкрэсліваюць наяўнасць нейкай падзеі, указваюць на аб'ект – чалавека, жывёлу, хаця прысутнасць апошніх не заўважаецца: *«Не па Сеньку шапка», «Пусціўся Мікіта на валакіту», «На бязлюддзі і Саўка чалавек».*

Параўнанні ў прымаўках носяць лакалізаваны характар, дапаўняюць характарыстыкі мясцовасцей, персанажаў, даюць ім ацэнкі: *«Свіслач – рэчка невялічка», «Крукам носа не дастанеш».*

Прымаўка малюе партрэт чалавека, перадае яго псіхалагічны стан: *«Ловіць слова на ляту», «На печы ляжыць і не думае тужыць», «На той час і розум адняло», «Няма да каго прыгарнуцца, прыхіліцца»*, дае ацэнку яго дзеянням, учынкам: *«Харошы чалавек – адразу відаць», «Сам анёл з неба», «Ён гэтым сабе голаў скруціць», «Рукам волю не давай».*

Параўнанні ў прымаўках выражаюць сацыяльны аспект праз абагульненні: *«Не дзівіся: сёння давялося мне, заўтра – табе», «З голага няма чаго ўзяць», «Сірата сіраце жаліцца ў бядзе».* Дзякуючы гэтай функцыі, яны па свайму зместу набліжаюцца да прыказак.

Вялікая роля ў прыказках і прымаўках належыць рыфме, якая спрыяе вобразнасці, запамінальнасці твора: *«На Іллю наллю перапеч поўну печ», «Любіш спаць – любі і слаць».*

Шырокае ўжыванне рыфмы ў парэміялагічных творах, на думку А. К. Сержпутоўскага, тлумачыцца танічнай уласцівасцю беларускай мовы, дзякуючы чаму націск у словах не мае пастаяннага месца, як гэта назіраецца ў французскай мове. Акрамя таго, нескладовыя *ў,* якія стаяць пасля галосных гукаў, даюць магчымасць размяшчаць словы так, каб атрымліваўся вершаваны размер. Адсюль – напеўнасць, меладычнасць, прыгажосць беларускай мовы.

У той жа час вучоны сцвярджае, што толькі таленавіты апавядальнік можа з усімі адценнямі, на якія здатна народная мова, данесці да слухача той ці іншы вусна-паэтычны твор, дадаючы ад сябе розныя падрабязнасці, упрыгожваючы іх рыфмамі, рознымі тропамі і фігурамі.

У зборніках акрамя прыказак і прымавак ёсць гумарэскі, каламбуры і іншыя кароткія, часцей гумарыстычныя і сатырычныя творы.

У іх адлюстраваны розныя бакі жыцця і быту беларускага селяніна: *«Сёння паабедаем, а як заўтра – не ведаем»*, *«Мае бацькі добра жылі, а я лепш: у іх хлеб ёсць, а солі няма, соль ёсць, то хлеба няма, а ў мяне ні хлеба, ні солі»*.

Большасць прыказак і прымавак у кнігах А. К. Сержпутоўскага маюць эстэтычную грамадзянскую каштоўнасць, уносяць значны ўклад у беларускую і сусветную фалькларыстыку. Заслуга вучонага ў тым, што ён захаваў для нашчадкаў скарбы народнай мудрасці беларусаў.

Наталья Клушина
Московский государственный университет имени М. В. Ломоносова (Россия)

НЕПРЯМОЕ ИНФОРМИРОВАНИЕ В СОВРЕМЕННЫХ СМИ

Современная российская медиакоммуникация не является однородной. Сегодня она представлена тремя основными типами дискурсов: информационным, публицистическим и развлекательным, различающимися своей интенциональностью, коммуникативными стратегиями и тактиками порождения текстов, а также перлокутивным эффектом, направленным на адресата. Журналистская практика рассчитана на самые широкие слои населения, на массового адресата. Тем не менее массовость не означает однородность аудитории. Адресант медиадискурса создает свои произведения с четкой ориентацией на «своего» адресата – вдумчивого, анализирующего (адресат качественных СМИ) или, наоборот, «легкого» читателя желтой прессы. Поэтому для реализации своей интенции в каждом из обозначенных типов дискурса (интенции информирования, убеждения или развлечения) адресант использует различные коммуникативные стратегии воздействия.

Возникшая в перестройку тенденция критического отношения лингвистов к СМИ как средству манипуляции общественным сознанием, открытого обмана, подавления чужого мнения сегодня неправомерна. В постперестроечной массовой коммуникации сформировался сектор качественных изданий различной идеологической направленности («Новая газета», «Московские новости», «Российская газета», «Новые известия», «Коммерсантъ» и др.). Эти издания де-

монстрируют уважительное отношение к своему адресату, предоставляя ему качественную информацию и аналитику без эпатажа и девиантности в использовании языковых средств. Поэтому экстраполяция на весь современный медиадискурс негативных черт, свойственных только желтой прессе (например, выделение в качестве доминирующих стратегий гедонизма, секуляризации, манипуляции и других негативных явлений), приводит к неоправданной демонизации СМИ в ущерб объективности научного исследования. Напротив, сегодня рассчитанные на различную аудиторию СМИ демонстрируют специфический набор стратегий и тактик в современной медиакоммуникации. И наиболее характерной особенностью языка качественных СМИ становится его интеллектуализация, в первую очередь за счет использования косвенных речевых актов, то есть непрямой коммуникации, предполагающей активное участие адресата в декодировании послания адресанта.

В лингвистической прагматике под косвенным речевым актом понимают такой тип высказывания, при котором воздействие на слушателя осуществляется опосредованно.

Современные российские лингвисты рассматривают косвенные речевые акты как составляющие теории речевых актов (родоначальниками которой являются Дж. Л. Остин и Дж. Р. Серл). И. П. Сусов определяет *косвенный / небуквальный речевой акт* как «речевой акт, в котором друг другу противостоят иллокутивная сила, присущая произносимому предложению и независимая от контекста использования, и иллокутивная сила, которую говорящий вкладывает в это высказывание, намереваясь побудить адресата принять и понять его действительное коммуникативное намерение. На контекстуально независимую иллокуцию ориентирована экспликатура. А привлечение контекста, знание конститутивных правил и прагматических принципов (прежде всего, принципа кооперации) позволяет вычислить импликатуру» [3, с. 238].

Развивая теорию непрямой коммуникации, В. В. Дементьев вводит понятие *косвенный речевой жанр*: «Предлагаемый нами термин-понятие «косвенный речевой жанр», с одной стороны, очевидным образом пересекается с термином-понятием «косвенный речевой акт», что дает возможность жанроведам эффективно использовать достижения теории речевых актов. С другой стороны, данные понятия значительно расходятся. Косвенные речевые акты всегда соотноси-

мы с «прямыми» речевыми актами, обычно высококонвенциональны (последняя стадия развития для косвенных речевых актов – грамматикализация) и воплощают скорее семиотическое, чем семантическое начало в языке (в терминологии Э. Бенвениста). Единственная возможность множественной интерпретации в косвенных речевых актах имеет по сути формальный характер и является скорее теоретической, чем реализуемой на практике» [1, с. 260].

Отталкиваясь от основных идей теории речевых актов, В. В. Дементьев пытается разграничить косвенный речевой акт и косвенный речевой жанр: «1) Речевой акт – действие, речевой жанр – имеет количественно и качественно более сложную природу и соотносится с ситуацией, событием, текстом; 2) в центре внимания теории речевых актов – грамматика языка (предложение), теории речевых жанров – речевая коммуникация и функциональный стиль; 3) теория речевых актов по своей сути монологична. Теория речевых жанров диалогична (социологична)» [1, с. 260].

В. В. Дементьев предлагает к косвенным речевым жанрам относить флирт, шутку, светскую беседу, колкость, розыгрыш и др. При таком подходе речевой жанр оказывается шире понятия «речевой акт», но в то же время речевой жанр и традиционный жанр как способ реализации конкретного стиля также не совпадают.

Еще шире косвенность понимает И. М. Кобозева: «В широком смысле косвенным можно назвать всякий коммуникативный акт, как речевой, так и невербальный, действительная цель которого не выражена явно. При такой трактовке вставание одного из собеседников из-за стола можно рассматривать как косвенный коммуникативный акт информирования адресата о том, что разговор окончен» [2].

Несмотря на несовпадение понятий *косвенный речевой акт – косвенный речевой жанр – косвенный коммуникативный акт*, тем не менее основой каждого из них является небуквальное выражение смысла.

Непрямая коммуникация в СМИ имеет *двойственную* природу. К косвенным речевым актам относят *метафору*, *иронию, эвфемизм, намек* и т. п., то есть любой лингвистический способ непрямого информирования. С одной стороны, подобные косвенные речевые акты являются риторико-стилистическими приемами оформления мысли, то есть «техническими» средствами создания текста, и закономерно относятся к области риторики и стилистики. С другой стороны, кос-

венные речевые акты составляют суть прагматического воздействия на адресата и служат не *оформлению* мысли, а ее *выражению*. И с этой точки зрения непрямая коммуникация в СМИ – это особый способ «сотрудничества» с адресатом, так как непрямая коммуникация требует определенных усилий от адресата, декодирующего скрытый смысл послания адресанта.

Интенция побуждения адресата к определенным действиям (в том числе и речемыслительным) в косвенном речевом акте имплицитна. Адресат при декодировании высказывания не всегда может распознать заданный адресантом «правильный смысл». Именно поэтому косвенные речевые акты *нетипичны* для масс-медийного дискурса, в котором детерминируется однозначная интерпретация предложенного массовому читателю сообщения.

Тем не менее современный российский медиадискурс дает примеры косвенной коммуникации. Косвенные речевые акты как особый способ прагматического воздействия на адресата, по нашим наблюдениям, наиболее востребованы в печатных СМИ. Современные исследователи говорят о двухуровневой организации медийного текста (Т. В. Кузнецова, А. А. Негрышев и др.), при которой журналистский текст является структурной единицей макротекста (включающего, помимо собственно текста, такие структурные единицы, как заголовок, лид, врезка, фотография). Небуквальное выражение авторской интенции часто «прячется» в семантическом «зазоре» между структурными компонентами медиатекста. Например, авторская негативная интенция в рецензии Юлии Бедеровой на постановку в Большом театре оперетты Иоганна Штрауса «Летучая мышь» (Время новостей, 2010, № 42) раскрывается только в сопоставлении текста рецензии, оформленном в подчеркнуто нейтральной стилистической тональности, с цитатным заголовком «**За что, за что, о боже мой!** *В Большом театре ставят оперетту*»: «В среду в главном театре страны начинается премьерная серия показов новой постановки оперетты Иоганна Штрауса. Постановочная команда во главе с молодым режиссером Василием Бархатовым (в активе – несколько названий в Мариинском театре) объяснила на презентации, что «Летучая мышь» сегодня входит в репертуар самых известных оперных театров и фестивалей, а также в сферу интересов самых амбициозных и авторитетных режиссеров…».

Еще одним примером использования непрямого информирования может послужить рецензия Алены Солнцевой на фильм «Али-

са в стране чудес» (Время новостей, 2010, № 33): «**Ужель та самая Алиса?** *Фильм Тима Бертона выходит на экраны*)», где в заголовке с помощью контаминации прецедентного выражения и прецедентного имени, включенных в вопросительную конструкцию (которая сама по себе является частотной формой выражения небуквального смысла), спрятана основная информация, эксплицированная затем автором в самом тексте: «Совсем скоро, 4 марта, долгожданный фильм Тима Бертона «Алиса в стране чудес» выходит у нас в прокат. Фильм сделан в модном формате 3D, но если честно, то смотреть его в таком виде совершенно необязательно, разве что вы уж очень любите именно трехмерное кино. <…> И еще одно. Несмотря на поставленные в титрах на месте авторов сценария две фамилии – Льюиса Кэрролла и Линды Вулвертон, поклонники знаменитой сказки должны быть готовы к тому, что фильм снят, что называется, по мотивам. В нем известные по книге персонажи – Чеширский кот, Тру-ля-ля и Тра-ля-ля, Шляпник, Кролик и Гусеница, но история, в фильме рассказанная, не имеет отношения ни к философии Кэрролла, ни даже к сюжету его произведений…».

Прагматический эффект непрямой коммуникации в печатных СМИ, на наш взгляд, заключается прежде всего в том, что косвенные речевые акты способствуют усложнению, *интеллектуализации* медийного дискурса, поскольку ориентированы на умного, эрудированного адресата, распознающего скрытый смысл сказанного, поддерживающего интеллектуальную игру (очень часто основанную на прецедентности и апеллирующую к базовым культурным ценностям адресата), предложенную адресантом: «**Мойдодыр. Или твой?** *В суде идет сражение за права персонажа Чуковского».* Предыстория вопроса такова. В 1997 году компания P&G пришла на российский рынок и решила провести ребрендинг порошка «Миф». В качестве бренда выбрали Мойдодыра. Был подписан договор с наследницей Корнея Чуковского, по которому к P&G перешел довольно расширенный объем прав – и на персонаж, и на отрывки из произведения, и на сюжетные ходы. В 2007-м срок договора истек. И уже год продукт творческого труда Корнея Чуковского используется бесплатно…» (Новая газета, 2008, № 52).

Интеллектуализация языка современной качественной прессы, наряду с его визуализацией, способна, как нам кажется, обеспечить конкурентоспособность печати (по сравнению с электронными СМИ)

на рынке информационных услуг. Интеллектуализация современного печатного медиатекста рассчитана на серьезного, вдумчивого читателя, который предпочтет «медленное чтение» скороговорке звучащей речи.

Литература

1. Дементьев, В. В. Непрямая коммуникация / В. В. Дементьев. – М. : Гнозис, 2006. – 376 с.
2. Кобозева, И. М. Лингвопрагматический аспект анализа языка СМИ / И. М. Кобозева. – Режим доступа : http://evartist.narod.ru/ text12/08.htm.
3. Сусов, И. П. Лингвистическая прагматика / И. П. Сусов. – Винница : Нова Кныга, 2009. – 272 с.

Елена Кононова

Белорусский государственный университет

КРОСС-МЕДИА – ИННОВАЦИОННЫЙ ПРОДУКТ ЖУРНАЛИСТИКИ

Понижение количественных величин при формировании тиражей газет абсолютно верно доказывает, что в последнее время интерес читателя к печатной продукции ощутимо падает. Это заметно не только на отечественном медиарынке, такая же тенденция характерна для западной модели информационной деятельности. Поэтому коллективы редакций многих принтных изданий разумно торопятся погрузиться в сетевое виртуальное пространство, помимо бумажных версий создавая веб-сайты.

Как успешно взаимодействовать этим изданиям между собой, не создавая друг другу конкуренции; какими навыками должен обладать мультимедийный журналист, чтобы оставаться интересным читателю; как сделать интернет-ресурс популярным, не в ущерб бумажной версии, и наоборот? Все эти вопросы волнуют непосредственно журналистов, а также издателей, владельцев и руководителей информационных ресурсов.

С развитием технического прогресса западная мультимедийная журналистика становится объектом анализа и одновременно направлением, стратегией развития для современных СМИ. В свою очередь, она порождает все новые тактические решения и модели,

предлагает воспользоваться профессиональными открытиями и принять участие в поисках инноваций.

Кросс-медийные технологии.

В последние годы в основном западные газетные компании могли наблюдать, как все больше и больше людей начинали сами создавать локальное содержание – через блоги, социальные сети, видео и другие онлайн-ресурсы. Многие издатели видят большие возможности в предоставлении локального содержания и направленном предложении продуктов и услуг местных бизнесов своим аудиториям с одновременным укреплением своей роли как сердца местных сообществ.

Всемирная газетная и информационно-издательская ассоциация (WAN-IFRA) учредила Премию WAN-IFRA «Кросс-медиа» [1], которой собирается награждать газеты с лучшими локальными кросс-медийными проектами. В 2012 году уже шестой раз премия будет присуждаться газетным компаниям, преуспевшим в распространении уникального содержания и рекламы на всех издательских платформах. Премия WAN-IFRA «Кросс-медиа» открыта для всех проектов: как обслуживающих рынки с населением больше миллиона, так и тех, что работают на рынках с населением меньше тысячи человек. Этот факт отражает появление одного из направлений кросс-медиа, когда медиахолдинги демонстрируют работу интегрированных редакций, где все отделы делают информацию для всех медиа. Это характеризует кросс-медийные технологии, сочетающие массовый охват с индивидуальным подходом к каждому адресату.

Технология кросс-медийных компаний базируется, с одной стороны, на передаче клиенту информации одновременно по нескольким коммуникационным каналам. С другой стороны, созданное при помощи современного программного обеспечения персонализированное сообщение позволяет человеку чувствовать себя в центре внимания. Более того – технология кросс-медийных компаний подразумевает создание индивидуального сайта для каждого клиента с оригинальным контентом.

Четыре кита кросс-медийной компании.

Анализ ряда методических рекомендаций по разработке кросс-медийных компаний, представленных зарубежными агентствами, позволяет сделать заключение, что эта работа включает четыре этапа. Начинается все, естественно, с постановки задачи, определения

аудитории потребителя, которой будет адресована продукция и реакции которой в результате компания намерена добиться.

Второй этап – создание **базы данных**. Если таковая уже сформирована, вполне возможно, что она нуждается в актуализации. С другой стороны, отсутствие собственной базы не является негативным фактором. Существует масса программ – дисконтных, призовых и прочих, уже позволивших аналитическим агентствам собрать добровольно предоставленную информацию по сотням тысяч потенциальных клиентов. Главное в этом вопросе – обратиться к специалистам с четко поставленной задачей.

Гораздо более серьезную работу подразумевает **креатив** и концепция компании в целом, вытекающие из нее наполнение персональных сайтов и контентное содержание. Именно креатив, разработанный в соответствии с целевой аудиторией и задачами проекта, отвечает за то, насколько эффективной будет компания.

Наконец, финальный этап – собственно **реализация** кросс-медийной компании. Эта стадия работ требует специализированного програмного обеспечения и компьютерных мощностей, способных оперативно обрабатывать большое количество информации.

Система кросс-медиа и журналистика.

Мультимедийная журналистика стала основой в реализации новой системы информирования выбранной аудитории посредством кросс-медиа технологий. Это не новые жанры и не новые компьютерные возможности, это новая организация труда. Различают несколько уровней кросс-медиа. Понятие «медиаплатформы» для газет было уже знакомым, и смысл его оставался прежним – информационные носители: печатная газета, веб-сайт, телевидение, радио.

Примером, иллюстрирующим систему реализации кросс-медиа в журналистике, может быть норвежская газета «Budstikka» [2], которая выходит еженедельно в городе Вест-Огдер как одно из 273 изданий самой рейтинговой по обеспечению СМИ стран Европы. Примечательно, что газету, которая делает информацию для района с 160 тысячами населения, читает почти половина жителей. В издании очень хорошо налажена интерактивная связь с читателями, есть отдельная секция, где люди могут разместить собственные репортажи, фотографии. В планах «Budstikka» раздать своим подписчикам электронные книги, чтобы люди могли иметь постоянный доступ к интернет-сайту газеты. Логисты считают эти планы вполне продуктивными, способными окупить затраты.

Прежде всего, успешную работу редакции определяет высокая культура труда, когда каждый думает о том, чтобы коллеги не мешали друг другу. Во-вторых, эффективная организация работы. Если коллеги решили провести тематическое совещание, это можно сделать в комнате для заседаний, их несколько и они разного размера. Если у журналиста ожидается долгий телефонный разговор, то он может перейти в специальную комнату, где имеются компьютер, телефон. Есть еще комнаты для переговоров, когда к вам приходят собеседники. В редакции все двери и перегородки стеклянные, все на виду друг у друга. Но главное не в помещениях и оборудовании.

Издатели газеты предпринимают различные подходы для того, чтобы настроить творческий коллектив на солидарную работу, учитывая специфику обязанностей журналистов. Журналисты должны быть мотивированы на конкретную деятельность в создании и реализации контентного содержания информационного продукта. Хотя не всегда это получается. Прежняя психология разделения газетных журналистов от веб-журналистов, радийщиков, от телевизионщиков не преодолена, каждый из цехов может припрятать информацию от коллег (не отдать на сайт, беспокоясь о газетной новизне) или переключиться на другую платформу. С этим борются, проводят учебы, тренинги. В трудовых контрактах стали предусматривать такую взаимосвязь, закладывая в функциональные обязанности журналистов многоплановость. Для поощрения коллективизма формулируются общие рабочие задачи для всего коллектива. Используется обычная для западных журналистов практика, когда один текст готовится несколькими репортерами, или сразу они ведут какое-то общее расследование, или по мере развития сюжета расширяется число авторов.

Работа над формированием коллектива единомышленников идет постоянно. Делается все аккуратно, осторожно, и не только в силу консервативности человеческой психики, а с целью сохранения в рабочем состоянии всех информационных платформ. Активное перетекание творческой энергии на одну из сторон «медиакорабля» финансово небезопасно для доходности предприятий. Наибольший интерес у читателей сегодня к веб-сайтам, но основные доходы медиахолдингам, как и прежде, приносит печатная продукция (газеты), потому нужно все время искать золотую середину.

Организаторы газетного дела сейчас озабочены тем, как, с одной стороны, сохранить читателей, а с другой, – минимизировать за-

траты на издание (дорогая бумага, очень дорогое распространение, особенно для общенациональных газет). Одни специалисты, преимущественно интернет-журналисты, уверяют, что газеты должны умереть. Другие думают не о смерти газет, а о гибели носителей, то есть именно о бумажных газетах. Уже сейчас в скандинавских странах пытаются прививать культуру чтения газетных публикаций на электронных носителях.

Применение кросс-медиа.

Ответить на вопрос, возможно ли применить скандинавский опыт на практике у нас, и сложно и просто одновременно. По мнению аналитиков, использовать можно все, были бы для этого средства и желание. Многое же использовать нельзя только по причине различий в менталитете владельцев СМИ. Отечественный бизнесмен, вкладывая деньги в содержание веб-сайта или газеты, пытается затем вернуть затраченное, используя свой информационный инструмент для решения собственных коммерческих задач. В Норвегии пытаются создавать предприятие, производящее информационную продукцию в первую очередь для общества, и зарабатывать на продаже информации и рекламных площадей.

Недостаточность медиахолдингов в Беларуси также влияет на беспрепятственное продвижение кросс-медиа в СМИ.

Существуют несхожести в менталитете и на уровне потребителя. Интернет-журналистика в скандинавских странах более ориентирована на событийность и краткость. Интернет-редакторы не без оснований считают, что люди не хотят читать в Интернете длинные, аналитические статьи. У нас несколько иная ситуация, когда и от интернет-СМИ люди ожидают глубокого погружения в тему.

Использование автором в тексте эпитетов «золотые очки», «золотые ободочки», «золотые австралийские россыпи» позволяет интеллигентному читателю увидеть те существенные моменты, которые не будут понятны необразованному цензору. Слово-концепт «золотой» описывает идеологического редактора. Золотые очки – свидетельство того, что живет он не бедно, партия хорошо платит за служение «красной литературе».

Огре никогда не поймет, почему его поэму не принимают, ибо он не умеет бредить советской, а не какой-то другой действительнос-

тью. А для коммунистов творчество как раз должно быть «здоровым и полезным», и наказание инакомыслящих – это нормальный «быт революции».

Ожесточенное идейное противостояние «Плуга» и «Гарта» создало условия для возникновения литературной дискуссии. Она началась 30 апреля 1925 г. статьей «плужанина» Г. Яковенко «О критиках и критике в литературе». Автор требовал введения цензурных комитетов при редакциях для отбора литературы по принципу «пролетарское творчество – элементарное, простое, но здоровое и полезное» [5, с. 71].

Хвылевой, член «Гарта», не замедлил с ответом – памфлет «Про сатану в бочке, или про графоманов, спекулянтов и других просвещенцев» полностью разгромил все демагогические тезисы Яковенко. Дискуссия разгорелась, привлекая к себе все больше и больше участников (А. Дорошкевича, Н. Зерова, С. Пилипенко, Н. Скрипника, А. Хвылю, С. Щупака и проч.). В целом было опубликовано более 1000 публицистических статей о проблемах нового пролетарского искусства и литературной критики.

Л. Турчина отмечает, что в ходе литературной дискуссии «поднималось много вопросов: отношение к классическому наследию, которое пролеткультовцы отвергали, прикрываясь левацкими (марксистскими) фразами, проблема традиций и новаторства, путей развития нового искусства» [6]. Собственно путь развития литературного искусства был предусмотрен один: оно должно было стать «пролетарским». «Просветительская» позиция в определении пролетарского искусства сужалась до «обсуждения произведения с единой целью установления ценности произведения как художественной, так и читабельной» [8, с. 403]. Итак, читабельность (критерий, очевидно, рассчитанный на малограмотных крестьян и заводских работяг. – *О. К., Ю. Р.*) и художественную ценность произведения поставили на одну ступень критериев оценки. Н. Хвылевой с возмущением высказался по этому поводу: «Надо немедленно “отшить” или, по крайней мере, поставить на свое место разных писак, которые, умея как-нибудь сделать репортерскую заметку, тычут свой нос в искусство и – более того – пытаются руководить им. Тогда ясно станет, что так называемое массовое искусство есть продукт упорной работы многих поколений, а вовсе не “красная” халтура» [8, с. 403].

Хвылевой в полемике старался как можно четче обрисовать понятие «пролетарское искусство»: «Один из признаков искусства – это

его безудержное влияние на развитый интеллект. Итак, когда наш ликбез сделает свое дело среди нашего пролетариата, тогда то пролетарское искусство, о котором мы сейчас будем говорить, воистину будет творить чудеса, воистину будет мощным фактором в развитии человечества и поведет его к ненавистным просвещенцу тихим озерам загорной Коммуны» [8, с. 414]. В этом отрывке автор подразумевал, что в строительстве коммунизма для советских людей литература играет далеко не последнюю роль, а тормозит это строительство именно мещанский просветитель, неуклюже прикрытый ультракрасной демагогией.

В цикле памфлетов «Мысли против течения» он критиковал лидера «Плуга» С. Пилипенко как идеолога массовизма: «Об этом нам Пилипенко не раз говорил – литературой (он подразумевает художественной) называется и вывеска на Госиздате, и афоризмы на заборе, и стихи в уборной» [8, с. 471].

Откровенно пренебрежительное отношение к большевистским фанатикам, которые критикуют искусство, можно проследить в новелле «Иван Иванович». Главный герой – яркий представитель мещанского «просвещенства», убежденный марксист и большевик:

«Иван Иванович не признает конструктивного театра и признает только батально-героические и мажорно-реалистические фильмы: они ему напоминают те дни, когда <u>он проливал кровь за советскую республику</u>, когда <u>по запорожским степям мчалась пламенная большевистская кавалерия</u>» [8, с. 20]. Итак, наш герой-большевик с удовольствием убивал своих земляков, сражаясь на стороне «интернационального», а на самом деле национально обезличенного войска.

После похода в кино он с возмущением отзывается об увиденной им сатирично-бытовой картине: «Опять <u>мещанская побрякушка</u>! Удивительно: такая эпоха, такие героические дни, и такая, можно сказать, <u>пессимистическая пустышка</u>!» [8, с. 20].

Неуместность и гнусность этой кинокартины Иван Иванович объясняет Плехановской формулой (ею, по сути, объяснялась любая критика искусства того времени): «Революционное движение в России может восторжествовать <u>только как революционное движение рабочих</u>. Другого пути у нас нет и быть не может» [7]. В этой формуле выражен окончательный крах искусства в Советском Союзе. В стране рабочих и крестьян не остается места для национальной самобытности и высокой культуры.

Нужно отметить, что «в советское время авторская правка сочеталась с самоцензурой. Для того чтобы напечатать текст, авторы нередко шли на значительные моральные уступки» [4, с. 263]. По поводу этого нельзя не выразить восхищение умением Хвылевого играть смыслами, скрывать целые контрреволюционные абзацы не только в публицистике, но и в художественных произведениях.

Пример таких скрытых смыслов обнаруживается в новелле «Ревизор»: «Можно, скажем, попросить соседку, чтобы присмотрела за детьми... В конце концов, что это за фокусы? Что за буржуазные замашки? Разве можно так воспитать настоящую рабоче-крестьянскую детвору? Итак, Валентин советует посадить под ключ Неличку и Мурзика. <…> Пусть кричат: покричат, покричат и замолчат» [8, с. 51]. Н. Хвылевой с помощью тонкого символизма изображает, как власть относится к народу: воспитание «рабоче-крестьянской детворы», то есть будущих взрослых, которые построят коммунизм, проходит в тирании. Если «детвора» чем-то недовольна, ее можно закрыть (посадить в тюрьму, сослать в лагеря и т. п.) – «покричат, покричат и замолчат».

И вот пример из новеллы «Иван Иванович». Кажется совсем фантастическим, что этот отрывок был допущен к печати:

«– Я думаю, – говорила Марфа Галактионовна, – что Зюзя имеет полное право быть недовольным аппаратчиками. <…> Ты знаешь, я уже давно точу зубы на Сталина.

– Я, Галакточка, ничего не имею против <…> На мой взгляд, он тоже... как бы его сказать, – дискусийщик... То есть надо предполагать, что он будет дискусийщик» [8, с. 42].

Дискусийщик – это, по сути, контрреволюционер, отклоняющийся от линии партии, идущий наперекор официальным догмам коммунистического строя. Н. Хвылевой предвидел, что Сталин, который уже в первые годы своего правления проявил жесткое отношение к украинской литературе, только усилит политическое давление на них и в итоге установит монополию на содержание и тематику художественной литературы. Поэтому он осмотрительно вложил свои неутешительные выводы в уста персонажа Марфы Галактионовны – женщины, не слишком верной ни коммунизму, ни мужу.

De jure классический марксизм предусматривал господствующую тенденцию реализма в пролетарской литературе, но de facto писатель обязан был творить другую, несуществующую реальность, иде-

альный социалистический мир. Приведем несколько эпизодов из новеллы «Лилюли». Вот размышления поэта, горбуна Алеши:

«И садится поэт, и хочет творить не беспомощный реквием, а гимн весеннему шуму. Он не хочет творить реквием, ибо редактор с золотыми очками на носу скажет написать другую поэму. Тогда поэт выходит на улицу и думает о жизни, что она обязательно прекрасна, и думает о тайфуне, которого никогда не видел, и тогда золотые реки текут у его сердца. Поэт говорит:

– Савойя!

И думает, что савояры – убогие люди, уходят с гор на чужбину, на заработки, чтобы не умереть в горах» [9, с. 273].

Ю. Безхутрый так комментирует отрывок из «Лилюли»: «Прагматический и аморальный мир требует от художника не реквиема, а гимна весеннему шуму в духе стихов пролетарских поэтов. Для этого художник должен думать о жизни, что она обязательно прекрасна, о тайфуне, который никогда не видел. Речь, следовательно, об иллюзии <...>, которая бы полностью удовлетворяла «редактора в золотых очках» <...> Вечная трагедия вынужденной продажности художника лишь модифицировалась в мире, претендовавшем на кардинальное отрицание старого» [1, с. 387].

Золотые реки текут у сердца поэта – мысли о деньгах, о хоть каком-то заработке. И он думает о савоярах – гастарбайтерах, которые уходят работать в чужие страны, чтобы не умереть с голоду. И сам поэт, по сути, такой же гастарбайтер, он работает в чужой ему стране и пишет о совершенно чужой реальности.

Образ успешных литераторов-современников Н. Хвылевой передает через персонажа Пупышкина: «Товарищ Пупышкин, председатель пролеткульта – не просто глава: и писатель. Рассказы его начинаются фатально так: Галя внесла самовар и расставила чашки. Петр только что пришел с завода и принес с собой несколько прокламаций etc» [9, с. 270]. Таковы культурно-политические реалии новой жизни: «смещение представлений о настоящей и квазикультуре, удивительные, даже анекдотические карьеры, выход на первый план проходимцев, которые воспользовались соответствующей политической конъюнктурой, графоманство невежд» [1, с. 381].

Г. Церна отмечает: «Длительные споры на протяжении 1920-х гг. относительно места и назначения искусства в общественной жизни страны завершились в 1929 г. II съездом ВУСПП, на котором было провозглашено, что фронт пролетарской литературы на Украине ор-

ганизован, что пролетарская литература успешно борется за свою гегемонию. Литература становится сугубо прагматическим фактором в культурной политике советской власти, а художники и их произведения превращаются в идеологическое оружие» [10].

Н. Хвылевой оставил для потомков много таких ключей-подсказок, которые при детальном исследовании раскрывают нам суть тогдашней политической системы, состояние украинской литературной жизни, действительную ценность творчества партийных подхалимов, острую замалчиваемую проблему цензуры. В борьбе писателя за истинное искусство партия увидела только неуправляемый потенциал влияния на массы. Результатом стало клеймление Хвылевого как контрреволюционера и украинского шовиниста. После пятого номера журнал «ВАПЛИТЕ» был закрыт, все экземпляры шестого номера изъяты, впоследствии ликвидированы «Литературная ярмарка» и издательский проект «Политфронт». Это была самая жестокая советская цензура – административная.

После того как к автору применены такие меры, реабилитированным он быть уже не может. Ему остается или полная творческая бездеятельность, или побег из страны, или смерть. Н. Хвылевой сделал свой выбор. 13 мая 1933 г. он, не выдержав идеологического прессинга и краха всех своих творческих проектов, покончил жизнь самоубийством.

Советский режим в течение почти 70 лет держал украинское издательское дело в атмосфере идеологической нетерпимости, ущемления свободы слова и жестоких цензурных репрессий. Редактирование произведений проводилось в идеологических рамках: стилистике, фактажу, композиции и другим аспектам почти не уделялось внимания. Особенно бескомпромиссность партии в вопросе цензуры проявила себя в конце 30-х гг., когда начались массовые репрессии писателей, издателей, журналистов. Это угнетающее воздействие привело к сегодняшней неутешительной ситуации в украинском книгоиздании, ибо в отличие от капиталистических стран, издательское дело которых могло развиваться в XX в. без особых помех, Украина очень отстала как в техническом, так и в методическом планах.

Литература

1. Безхутрий, Ю. М. Хвильовий: проблеми інтерпретації / Ю. М. Безхутрий. – Харків : Фоліо, 2003. – 495 с.

2. Брюховецький, В. Романтик з непоступливою вдачею / В. Брюховецький // Рад. літературознавство. – 1989. – № 8. – С. 26.

3. Карпенко, В. О. Основи редакторської майстерності. Теорія, методика, практика : підручник / В. О. Карпенко. – К. : Університет "Україна", 2007. – 431 с.

4. Куцевська, О. С. Саморедагування Олесем Гончаром публіцистичного твору : модифікація, прагматика, інтерпретація : дис. ... канд. наук з соц. ком. : спец. 27.00.05 / О. С. Куцевська. – Луганськ, 2009. – 483 с.

5. Полювання на Вальдшнепа. Розсекречений Микола Хвильовий. Науково-документальне видання / упоряд. Ю. Шаповал; передмова: Ю. Шаповал, В. Панченко. — Київ : Темпора, 2009. – 296 с.

6. Турчина, Л. В. Роль України в теорії азіатського ренесансу М. Хвильового [Електронний ресурс] / Л. В. Турчина. – Режим доступу: http://www.nbuv.gov.ua/portal/soc_gum/Npifznu/2006_20/20/turchina.pdf.

7. Фундаментальная электронная библиотека. Русская литература и фольклор [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http://feb-web.ru/feb/litenc/encyclop/le8/le8-6931.htm.

8. Хвильовий, М. Твори у двох томах / М. Хвильовий. – К. : Дніпро, 1990. – Т. 2. – 925 с.

9. Хвильовий, М. Я. Романтика : для серед. та ст. шк. віку / М. Хвильовий. – К. : Школа, 2008. – 368 с. – (Шкіл. хрестоматія).

10. Церна, Г. М. Проблема митця і влади в поезії неокласиків [Електронний ресурс] / Г. М. Церна. – Режим доступу: http://web.znu.edu.ua/herald/issues/archive/articles/2792.pdf.

Наталля Лобань

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка

КАНТЭКСТ І ЯГО РОЛЯ Ў РЭАЛІЗАЦЫІ КАНАТАЦЫЙНЫХ ЗНАЧЭННЯЎ СЛОВА

Неабходнай умовай функцыянавання і разумення слова ў мастацкім тэксце з'яўляецца **кантэкст** – фон, які не толькі выдзяляе, праяўляе лексічнае значэнне слова, а і змяняе яго эмацыянальна-экспрэсіўна-ацэначнае і сэнсавае гучанне, абумоўлівае ўзнікненне аказіянальных канатацый.

Кантэкст (лац. contextus – сувязь, злучэнне) – фрагмент тэксту, закончаны ў сэнсавых адносінах і дастатковы для дакладнага вызначэння семантыкі асобнага слова. Кантэкстам таксама называюць

само акружэнне, «атачэнне» лексічнай адзінкі, пад уплывам якога яна больш выразна праяўляе сваю сутнасць.

Семантыка слова, яго ўзуальныя і аказіянальныя канатацыйныя значэнні раскрываюцца ў кантэксце розных тыпаў, вылучэнне якіх звычайна адбываецца на аснове аб'ёму кантэксту. Выдзяляюцца наступныя тыпы стылістычнага кантэксту:

– мінімальны або вузкі кантэкст (мікракантэкст);

– максімальны або шырокі кантэкст (макракантэкст);

– кантэкст твора;

– кантэкст творчай сістэмы аўтара.

Мікракантэкст ахоплівае аб'ём аднаго сказа, у межах якога выступае тое ці іншае слова. Напрыклад, «Лось, казалі, ішоў цераз поле. Падвечар». – «Які табе лось! Гэта ж Аўдоля барану калгасную ўкрала ды *тарабаніла* на сабе!..» (Я. Брыль. Жменя сонечных прамняў), «Іх вялікасць "Сам-Палецкі" зволілі "*ўцюрыцца*"...» (У. Караткевіч. Залаты бог), «Жонка – *загладуха* такая, у дзверы не пройдзе» (А. Кудравец. Сяструха), «Не так разумны, як *нюхлівы*» (Я. Скрыган. Беглыя запісы), «Баіцца холаду, бы якая *гараджаначка*» (А. Жук. Завулак), «*Наездзіўся* і *нашвэндаўся* адзін наш... Па гарадах, па мястэчках...» (Ф. Янкоўскі. Дымі) і інш.

З прапанаваных ілюстрацый бачна, што вылучаныя лексічныя адзінкі характарызуюцца генетычна ўласцівымі ім і ўстойліва замацаванымі за імі канатацыйнымі значэннямі, для праяўлення якіх дастаткова мінімальнага кантэксту. Нават узятыя адасоблена, паза кантэкстам, яны не страчваюць сваіх эмацыянальна-экспрэсіўна-ацэначных якасцей, таму кантэкст для іх выяўлення не абавязковы. Як выключэнне выступаюць лексічныя адзінкі, канатаваныя ў адным са сваіх значэнняў. Гэта словы з сінтаксічна абумоўленым, пераносным значэннем: «Кожны, калі не герой, то атлёт, *арол*!» (П. Місько. Сітус інверсус), «Сусед па койцы – зусім *зялёны* яшчэ лейтэнант» (М. Лужанін. З вайсковай дарогі), «Казну спрадвеку *даілі*, дык вось і ён... *прысмактаўся*...» (Я. Брыль. Прывал), «*Шкарпэтка*, а не мужчына...» (Я. Брыль. Ракета) і інш.

Назіранні сведчаць, што канатацыі эмацыянальна-экспрэсіўна-ацэначнага і сэнсавага характару на ўзроўні мінімальнага кантэксту часам могуць узнікаць і ў слоў з намінатыўным, прамым, значэннем. Так, канатацыйна значымым аказваецца ўжыванне прыметніка *жоўты* ('які мае афарбоўку аднаго з сямі асноўных колераў спектра –

сярэдняга паміж аранжавым і зялёным; колеру яечнага жаўтка, золата') у мікракантэксце «Вялікі палец яе (Аксенінай. – Н. Л.) рукі, зашчэплены за край місы, – каравы, з *жоўтым* ногцем, – увесь быў у засіўленай зацірцы» (Я. Брыль. Праведнікі і зладзеі). Асноўнае значэнне слова не выяўляе кантэкстуальных зрухаў, але разам з тым яно ўзбагачаецца эмацыянальнымі і сэнсавымі канатацыямі: *жоўты* – 'непрыемны, такі, які выклікае агіднасць'. Гэта маленькая, пэўным чынам асэнсаваная пісьменнікам падрабязнасць, якую называюць мастацкай дэталлю, мастацкім бачаннем свету, дапамагае раскрыць асноўную думку твора: фізічны і духоўны бруд Грыбавага «гнязда», яго чарвівую і ядавітую філасофію жыцця.

Як вядома, у мастацкім тэксце антрапонімы таксама актыўна ўключаюцца пісьменнікамі ў працэс перадачы шматлікіх ацэнак і характарыстык. Так, напрыклад, як стылістычны ключ да выяўлення канатацыйнага значэння прозвішча *Жук* можна разглядаць мікракантэкст: «Малады *Жук* – булава, ды стары хадовы чалавек, з якім без суда не абыдзешся» (Я. Брыль. Марыля). Пісьменнік характарызуе старога Жука як хадовага чалавека. Размоўны прыметнік *хадовы* – ацэнка 'пранырлівага, які свайго заўсёды даб'ецца' [ТСБМ, т. 5, с. 168]. Паралельна з *хадовы* ў мове функцыянуе назоўнік *жук* – перан. разм. 'пра хітрага, пранырлівага чалавека' [ТСБМ, т. 2, с. 259]. Такім чынам, на аснове асэнсавання прыметніка *хадовы*, які ў прыведзеным мікракантэксце неабходна разглядаць як дублет слова-этымона *жук*, адбываецца раскрыццё ўнутранай формы прозвішча *Жук* і матывацыя яго канатацыйнага значэння.

Макракантэкст у адрозненне ад мікракантэксту вызначае канатацыі слова ў межах цэлай фразы, адпаведным чынам арганізаванай групе слоў і сказаў (абзац, раздзел), якія ўскладняюць эмацыянальна-семантычнае пераасэнсаванне слова і яго ўжыванне. Канатацыйныя значэнні слова ствараюцца і актыўна падтрымліваюцца кантэкстуальным акружэннем, нягледзячы на тое, што прамое значэнне слова захоўваецца, не падвяргаецца семантычным зрухам і разам з тым выступае ўзбагачаным. Названы тып кантэксту дапамагае выявіць канатацыі аказіянальнага характару.

З пэўнай аўтарскай заяўкай на эмацыянальнасць і экспрэсіўнасць выкарыстоўваецца прыметнік *мышасты* – 'такога колеру, як поўсць мышы; шэры' (М. Лужанін. Дзівадла). З яго дапамогай пісьменнік стварае адмоўна-абагульнены вобраз чыноўніка-прайдзісвета: «…Да фан-

танчыка падышоў танклявы чалавек, нейкага *мышастага* колеру ад валасоў да чаравікаў». У макракантэксце прыметнік *мышасты* набывае дадатковыя эмацыянальна-сэнсавыя значэнні – 'шэры, непрыкметны знешне' і 'мізэрны, унутрана нецікавы, нікчэмны'. У кантэксце яго канатацыйная значымасць замацоўваецца граматычна: азначэнне-характарыстыка перарастае ў пастаянную прыкмету-найменне: «Узяць бы за каўнер… гэтага *мышастага* ды скалануць, ды патрэсці…».

Прыметнік *рыжы* – 'чырвона-жоўты (пра колер валасоў, шэрсць)' – становіцца асноўнай колеравай прыметай у партрэтным апісанні аднаго з персанажаў аповесці «Субота» М. Лужаніна. З яго дапамогай апісваецца вобраз знешне непрывабнага здаравілы («*рыжаваты* рослы байбус», «*рыжы* байбус»). Сапраўднае імя персанажа аўтарам ні разу не называецца, яго цалкам замяняе прыметнік *рыжы*, які, неаднаразова паўтараючыся ў тэксце, субстантывуецца («*рыжы* зірнуў на Глашу», «*рыжы* з напарнікам разгубіліся», «робленая жартаўлівасць і цынічны тон *рыжага* наводзілі на падазрэнні»). Захоўваючы сваё колеравае значэнне слова набывае здольнасць перадаваць канатацыі негатыўнага характару – 'праціўны, агідны, мярзотны'. Думаецца, што выбар пісьменнікам прыметніка *рыжы*, за знешняй нейтральнасцю якога хаваецца пэўная ацэнка, невыпадковы. Паводле легендаў, адзін з прыслужнікаў Сатаны быў рыжым (у фальклоры чэрці звычайна маюць рыжы колер шэрсці). Негатыўныя адносіны да рыжага адлюстраваліся ў розных жанрах вуснай народнай творчасці (параўн.: А я хіба *рыжы* ці цялё ўкраў!). З актуалізацыяй негатыўных дадатковых значэнняў прыметніка *рыжы* сустракаемся ў творах іншых пісьменнікаў: Я. Брыля (Галя), М. Горкага (Жизнь Клима Самгина), А. Купрына (Молох), У. Маякоўскага (Флейта-позвоночник) і інш.

Аказіянальныя канатацыі слова могуць выяўляцца і ў сэнсавай перспектыве мастацкага цэлага, у **кантэксце** асобна ўзятага **мастацкага твора.** Калі вырваць такое слова з кантэксту твора, сэнс і ўсе эмоцыі і ацэнкі, закладзеныя ў ім, згубяць сваю індывідуальнасць і стануць незразумелымі. Неаднойчы паўтараючыся з адным і тым жа мастацка-стылістычным і эстэтычным прызначэннем, яны замацоўваюцца ў сваёй ролі на працягу ўсяго твора і ўспрымаюцца, разумеюцца чытачом без асаблівай цяжкасці. Так, прыметнік *чорны* ў апавяданні «Пагарэльцы» В. Адамчыка стварае эмацыянальны тон трагічнасці, звязаны са смерцю хлопчыка, забітага паліцыянтам. Колер жалобы і смутку засцілае вочы маці: «Ёда быў у *чорным*,

калі застрэліў хлопчыка». Зло і смерць нясе чалавек у *чорным*. Забіўшы дзіця, ён падняў руку і на яго маці. Яна «…ледзьве помніць, што каля таго крайняга з мястэчка склада… нехта хадзіў у *чорным*. Ён, мусіць, страляў адтуль…» Менавіта таму бачацца ёй такія *чорныя* сляды на маладым сняжку, сляды здрадніка, забойцы, менавіта таму стаіць у вачах такая *чорная*, яшчэ не замеценая снегам, лужына. Прыметнік са значэннем колеру *чорны* паслужыў асновай для развіцця іншых, больш багатых значэнняў. Асноўнае значэнне 'апрануты ў адзенне чорнага колеру' ў макракантэксце адыходзіць на другі план, уступае месца дадатковаму адмоўна-ацэначнаму: 'негатыўны, варожы, які нясе небяспеку, зло, насілле, смерць'.

Выкарыстанне В. Адамчыкам прыметніка *чорны* ('апрануты ў чорнае') – прыём не новы і не адзінкавы. Гэтым прыёмам умела карыстаюцца іншыя беларускія пісьменнікі, напрыклад, Я. Скрыган (У тэатры), У. Дамашэвіч (Заклінаю ад кулі), П. Місько (Дзямід Варакса) і інш. У М. Горкага гэты прыём быў адным з самых улюбёных. Сустракаемся з ім і ў творах Л. Талстога, І. Ільфа і Я. Пятрова.

Як сведчыць прааналізаваны матэрыял, актуалізацыя канатацыйных значэнняў слова адбываецца ў моцных кампазіцыйных пазіцыях, якія найчасцей суправаджаюцца вынясеннем моўнага элемента ў загаловак твора, які ў сваю чаргу ўспрымаецца як важны кампанент тэксту, яго кампазіцыйнай і сэнсавай структуры. Прыгадаем адзін з самых шчырых аўтабіяграфічных твораў Ф. Янкоўскага – апавяданне «Полымя». Уключаючы слова *полымя* ў інтэнсіўны працэс «аўтарызацыі», пісьменнік творча пераасэнсоўвае яго ў адпаведнасці са сваімі эстэтычнымі прынцыпамі, семантычна і эмацыйна трансфармуе і выкарыстоўвае вельмі своеасабліва, у выніку чаго яно становіцца індывідуальнай прыметай стылістычнай сістэмы аўтара.

Мастацкая актыўнасць слова *полымя* ў сістэме вобразных сродкаў пісьменніка пацвярджаецца высокай частотнасцю яго выкарыстання ў тэксце. Дзякуючы аказіянальным дадатковым значэнням эмацыянальна-экспрэсіўна-ацэначнага і сэнсавага характару яно аказваецца ў моцнай пазіцыі. Назва апавядання «Полымя» рыхтуе чытача да ўспрымання яго зместу і ідэі. У Ф. Янкоўскага загаловак – сэнсавая і эмацыянальна-экспрэсіўная дамінанта твора.

Сам тэкст апавядання падзяляецца на 11 частак, мініяцюр. Усе часткі звязаны паміж сабой адным словам – *полымя* – цэнтральным

сэнсавым і ідэйным ядром твора. У кантэксце твора слова атрымлівае ўсё новыя і новыя сузначэнні і ў выніку набывае ў межах тэксту сімвалічныя значэнні.

Слова *полымя* паступова разгортваецца як мнагазначная мастацкая ідэя. Першапачаткова яно выкарыстоўваецца з прамым, намінатыўным значэннем, але непрыкметна з'яўляюцца другасныя адценні значэння. Неаднаразова ўжываючыся ў кантэксце са словамі і словазлучэннямі тыпу *бацька, бацькава хата, бацькаўшчына* слова *полымя* змяняе сваё эмацыянальнае гучанне. Гэта ўжо тое жывое, нязгаснае святло, якое ачышчае і абуджае чалавечую душу, напаўняе яе жаданнем жыць і працаваць дзеля людзей, дзеля роднай Бацькаўшчыны: «…Я стаяў перад бацькавым *полымем*. Свяці ж і свяціся, полымя! Як трэба яно, гэта святло! Сваё і на сваёй бацькаўшчыне. Дзеля самой Бацькаўшчыны!» У прыведзеных радках – аўтарава разуменне, асэнсаванне слова *полымя*, вакол якога выразна абазначыўся своеасаблівы эмацыянальны арэол. Ад старонкі да старонкі гэты арэол становіцца ўсё ярчэйшы і ярчэйшы, ён суправаджае слова на працягу ўсяго апавядання. Намінатыўнае значэнне губляе сваю вядучую ролю, яно – толькі неабходны фон, аснова для актуалізацыі іншых канатацыйных значэнняў.

Станоўчыя канатацыі, выкліканыя ключавым словам у першых частках апавядання, змяняюцца канатацыямі адмоўнага характару ў залежнасці ад таго, пра што ідзе размова ў тэксце. У кантэксце твора слова *полымя* сэнсава збліжаецца са словамі *пажар, пожар, дым*. Адмоўныя канатацыйныя значэнні ўзмацняюцца за кошт эмацыянальна-негатыўных слоў і выразаў: *знішчэнне, бязлітасныя пажары, нелюдзі-чужынцы, гарэла зямля, гінулі людскія набыткі, нішчыліся лясы, насілася чужая конніца, чужое, руйнаваць, выпальваць*… Прыносіла бяду і смерць *полымя* вайны. Гэта *полымя* не грэла і не саграваладо, яно забівала, прыносіла гора: «…Не было такіх сутак, каб людзі не бачылі ў вайну на Міншчыне *полымя*… і не казалі: «Зноў недзе гарыць… Зноў паліцца…»

У адпаведным моўным акружэнні (*цеплыня, ласка, рух да попелу, не сунімацца, варушыцца і спяшацца, імклівы ручаёк, паратунак)* слова *полымя* набывае новы сэнс: *полымя* – 'абуджэнне сіл, вяртанне да жыцця, жыццё'.

У мініяцюры «Агеньчык» важную ролю ў выяўленні семантычнага зруху выконваюць разнастайныя асацыятыўныя сувязі. Кан-

тэкстуальныя сінонімы і перыфразы (*агеньчык, кветка цеплыні і радасці жыцця, знак памяці, знак патрэбы*), эпітэты (*святы-свяшчэнны, вечны*) ствараюць вобраз полымя-памяці: «Штодзень не раз бачыў помнік, пры ім неапісальнае *полымя*. …Бачыў знак памяці… Ён, агеньчык, святы-свяшчэнны… Свяціся, агеньчык, свяціся ты, Вечны». Вечны агонь – сімвал людской памяці, сімвал вечнага, святога, бессмяротнага.

Слова *полымя* часта ўзаемадзейнічае ў мастацкім кантэксце з лексічнымі адзінкамі пэўнага асацыятыўна-сэнсавага раду. У мініяцюры «У дарозе» прыкметная сувязь апорнага слова з назоўнікамі *навальніца, гром, пярун, бліскавіца-маланка*, што выклікае прадчуванне трывогі, нялёгкіх дарог у жыцці. У мініяцюры «У сядле пад паветкаю», наадварот, з паняццямі навальніцы, грому, перуна звязаны зусім іншыя асацыяцыі. Тут *полымя* – сімвал чысціні, абнаўлення, жыццяздольнасці: «Даўно-даўно жахнулі мяне пярун і *полымя* над хатаю. Але не прынеслі перапалоху. …З імі – чысціня ў прыродзе і яе ажыўленне, асвятленне».

Шматразовае канатацыйнае напаўненне ключавога слова, узмацненне яго сімвалічных значэнняў асабліва ярка праяўляецца ў апошняй мініяцюры «Ты свяці мне, полымя!». *Полымя* – гэта сімвал духоўнага ўздыму, творчага пачатку, чалавечага генія: «Яшчэ і яшчэ ўспомніцца, загаворыць простымі, непрыдуманымі – і толькі шчырымі – словамі перажытае, убачанае, незабыўнае, непрыдуманае. Будзе і пра даўняе *полымя* на вуголлі ў горне маленькай вясковай кузні. І пра тое *полымя*, якому стагоддзямі засцілі, якое тушылі, якому гнюсілі чужынцы. І пра *полымя* Кастусёва і Францішкава, пра *полымя* Купалава і Коласава. І пра тое вялікае, усёмагутнае – дзеля чалавечнасці, чалавецтва, Чалавека».

У звышкантэксце слова *полымя* разрастаецца ў актыўны, самастойны вобраз. Усе асацыяцыі і ўяўленні, выкліканыя гэтым словам, знайшлі сваё ўвасабленне ў назве твора. Адбываецца глыбокі семантычны зрух: назва-сімвал выступае носьбітам аўтарскай ідэі, закладзенай у тэксце. Актуалізацыя слова *полымя* ў кантэксце мастацкага твора, яго багатыя асацыятыўныя і падтэкставыя сувязі, дадатковыя, канатацыйныя, значэнні – адлюстраванне асаблівасцей аўтарскага светаўспрымання і паказу рэчаіснасці, індывідуальнага стылю пісьменніка, яго мастацкага і жыццёвага крэда.

Часам ўлюбёныя аўтарам моўныя сродкі «вандруюць» з твора ў твор і выкарыстоўваюцца пісьменнікам для характарыстыкі пэў-

най мастацкай з'явы. У такім выпадку можна гаварыць пра творчасць пісьменніка як пра цэласную мастацка-маўленчую сістэму, арганізаваную ў адпаведнасці з асаблівасцямі яго стылю, светапогляду, аўтарскім бачаннем свету, і пра яшчэ адзін з відаў стылістычнага кантэксту – **кантэкст творчай сістэмы аўтара**. Названы тып кантэксту ў большай ступені, чым іншыя, характарызуецца элементамі суб'ектыўнага пры стварэнні, успрыманні і ўсведамленні аказіянальных канатацыйных значэнняў слова. Так, прыметнікі са значэннем колеру ў творах такіх пісьменнікаў, як У. Караткевіч, Я. Брыль, Я. Скрыган, В. Адамчык і інш., набываюць пэўнае эмацыянальна-экспрэсіўнае гучанне, а часам развіваюць абагульнена-сімвалічнае значэнне. Напрыклад, слова *сіні* ('які мае афарбоўку аднаго з асноўных колераў спектра – сярэдняга паміж блакітным і фіялетавым') у творах У. Караткевіча – не толькі сродак эмацыянальна-ацэначнай, псіхалагічнай характарыстыкі літаратурнага персанажа, а і сродак сцвярджэння ідэалаў пісьменніка. Вочы станоўчых герояў гэтага аўтара проста ўражваюць сваім сінім колерам: «вялізныя, як сподкі, *сінія* вочы», «гарэзлівае, крупельскае *сіняе* вока» (Як звяргаюцца ідалы), «*сінявокая*, ціхая, сціплая», «зграбненькая, *сінявокая*» (Кніганошы), «добрыя *сінія* вочы» (Залаты бог), «румянае, белазубае, *сінявокае* аблічча», «аблічча *сінявокае*, з празрыстым румянцам, з вішнёвымі вуснамі», «нешта залатавалосае, *сінявокае*, нешта найбольш як васемнаццаці год» (Калядная рапсодыя), «*сінія*, як неба, вочы» (Лятучы Галандзец), «вочы *сінія*, дзёрзкія» (У шалашы), «*сінія* вочы спакойна глядзелі» (Кніганошы), «чалавек з *сінімі* дабрэчымі вачыма» (Барвяны шчыт), «светлавалосы падлетак, *сінявокае*, танюткае, даўганогае жарабя», «*сінія* вочы ўразлёт» (Залаты бог), «*сінія*, дужа добрыя вочы» (Калядная рапсодыя) і інш. На аснове колеравага значэння прыметніка *сіні* ствараецца вобраз сініх вачэй, які выкарыстоўваецца пісьменнікам як сродак характарыстыкі ўнутранага свету герояў. Слова *сіні* – устойлівы знак станоўчай канатацыі: 'ясны, унутрана светлы, чысты, добры, прыгожы'.

Як бачым, канатацыйныя значэнні слова непасрэдна звязаны са спецыфічнымі ўмовамі яго выкарыстання ў кантэксце. У адрозненне ад узуальнай аказіянальная канатацыя з'яўляецца чыстым прадуктам кантэксту, які для яе ўзнікнення і выяўлення мае першаступеннае значэнне. Прааналізаваны матэрыял сведчыць пра тое,

што канатацыйныя магчымасці слова раскрываюцца ў кантэкстах розных тыпаў: мікракантэксце, макракантэксце, кантэксце твора і кантэксце творчай сістэмы аўтара. Аналіз уплыву кантэксту на механізм узнікнення аказіянальных канатацыйных значэнняў слова і іх рэалізацыю ў мастацкім тэксце – адзін з накірункаў, які патрабуе паглыбленага даследавання пры вывучэнні праблемы канатацыі.

Літаратура

1. Банникова, И. А. Об изменении смыслового объёма поэтического слова и роли стилистического контекста / И. А. Банникова // Лексикологические основы стилистики : сб. науч. работ / Ленингр. гос. пед. ин-т; ред. проф. И. В. Арнольд. – Л., 1973. – С. 23–31.

2. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка беларускай мовы : вучэб. дапам. для фак. журналістыкі. – 2-е выд., перапрац. і дап. / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 294 с.

Юлія Лук'янюк, Лілія Шасцярнёва

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

СЕМАНТЫЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў КАМП'ЮТАРНАЙ ЛЕКСІЦЫ: СПЕЦЫФІКА СІНАНІМІІ Ў КАМП'ЮТАРНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ І ЖАРГОНЕ

Семантычнае адзінства камп'ютарнай лексікі дакладна можна разгледзець у працэсе вывучэння яе семантычных працэсаў (полісеміі, аманіміі, сінаніміі, антаніміі, гіпаніміі). У сваіх працах мы ўжо разглядалі асаблівасці фарміравання лексічнага пласта камп'ютарнай падсістэмы, у якой вылучаюцца стандартная (літаратурная) і субстандартная (нелітаратурная) часткі [8; 9]. Гэтае даследаванне прысвечана пытанню спецыфікі сінаніміі ў камп'ютарнай тэрміналогіі і камп'ютарным жаргоне.

Камп'ютарная тэрміналогія як сукупнасць тэрмінаў інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі, уключае агульнакамп'ютарныя найменні, тэрміны інтэрнэта, праграмавання і інш. Да камп'ютарных тэрмінаў мы адносім простыя, вытворныя і складаныя тэрміны, тэрміналагічныя словазлучэнні і літарна-лічбавыя скарачэнні. Адносіны паміж паняццем і яго назвай павінны быць – па магчымасці – адназначнымі. Сінанімія ж перашкаджае яснай арганізацыі плана зместу і плана выражэння тэрміна. Неабходна адзначыць, што гэта

датычыцца толькі сфарміраваных тэрмінасістэм, дзе прыметамі тэрміна з'яўляюцца адназначнасць, адсутнасць сінонімаў і амонімаў. Аднак камп'ютарнай тэрмінасістэме беларускай мовы ўласцівы такія лексічныя асаблівасці ў галіне полісеміі, аманіміі [8; 9], сінаніміі, што даюць падставу лічыць яе не цалкам сфарміраванай.

Тэрміназнаўства не мае несупярэчлівай тэорыі тэрміналагічнай сінаніміі: па-рознаму вызначаецца яе прырода, ступень наяўнасці ў тэрмінасістэмах, віды сінонімаў, іх адрозненне ад варыянтаў, сутнасць дублетаў. Пад сінаніміяй мы будзем разумець з'яву, пры якой для абазначэння аднаго і таго ж паняцця выкарыстоўваецца два і больш тэрміны.

Існуюць два асноўныя дыяметральна процілеглыя падыходы да з'явы сінаніміі ў тэрмінасістэме.

1. Сінанімія – шкодная з'ява, таму што яна парушае ўзаемна-адназначную адпаведнасць паміж тэрмінам і паняццем. "Сінонімы – гэта значныя перашкоды пры ўзаемаразуменні спецыялістаў, пры перакладзе спецыяльных тэкстаў на замежныя мовы" [1, с. 130]. Такога ж пункту гледжання прытрымліваюцца і іншыя навукоўцы (Э. А. Натансон, Л. А. Капанадзе, В. П. Даніленка, В. П. Ахманава).

2. Другі падыход: сінанімія – з'ява станоўчая. Н. З. Кацялова сцвярджае, што «існаванне тэрмінаў-сінонімаў функцыянальна апраўдана, таму што яны могуць быць выкарыстаны для намінацый блізкіх паняццяў, а таксама са стылістычнай, эўфемічнай мэтай» [6, с. 122].

Зусім адмаўляе з'яву сінаніміі ў тэрміналогіі А. М. Талікіна. «Сінаніміі ў тэрміналагічных сістэмах няма, тое, што звычайна лічыцца тэрміналагічнай сінаніміяй, уяўляе сабой з'яву дублетнасці. Паміж дублетамі няма тых адносін, якія ўтвараюць сінанімічны рад, няма эмацыянальна-экспрэсіўных ці стылістычных апазіцый» [13, с. 61–62].

З пункту гледжання розных даследчыкаў на сутнасць і характар семантычных адносін паміж тэрміналагічнымі адзінкамі, суаднесенымі з адным і тым жа навуковым паняццем, можна заключыць, што тэрміназнаўства пакуль што не мае адзінай несупярэчлівай класіфікацыі. Тым не менш можна канстатаваць наступнае: большасць тэрмінолагаў схіляецца да таго, што варта размяжоўваць тэрміны-дублеты, тэрміны-сінонімы і сінанімічныя варыянты тэрмінаў. Мы падзяляем менавіта такі падыход і сярод камп'ютарных тэрмінаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы, суадносных з адным і тым жа паняццем, выдзелілі тры групы.

Да першай групы адносяцца тэрміны-дублеты, якія не маюць ніякіх семантычных адценняў у паняційным змесце. У асноўным гэта тэрміны-дублеты, прадстаўленыя беларускімі ці беларускімі і запазычанымі намінацыямі, у камп'ютарнай тэрміналогіі іх большасць: *мікрасхема – чып; blog – блог, дзённік; comment – каментар, выказванне; connection – злучэнне, падлучэнне, падключэнне; cookie – кукі, бірка; ідэнтыфікацыя – спраўджванне (асобы карыстальніка), апазнаванне; абвестка – аб'ява; інтэрнэт – сеціва; email – пошта, с-пошта («сеціўная пошта»), імэйл; дысплэй – манітор; ахоўны фільтр – ахоўны экран* [2] і інш.

Другую групу складаюць тэрміны, якія сваім унутраным зместам адлюстроўваюць розныя класіфікацыйныя прыметы аднаго і таго ж паняцця. У якасці прыкладаў можна прывесці наступныя пары (іх няшмат).

Электронны ('у 2-м значэнні = сеціўны: *электроннае* выдавецтва' [14, с. 1096]) – *сеткавы, сеціўны* (1. 'Той, што адносіцца да камп'ютарнага сеціва: *сеціўны* прынтар, *сеціўная* аперацыйная сістэма'; 2. 'які здзяйсняецца праз глабальнае камп'ютарнае сеціва; электронны ў 2-м значэнні: *сеціўны* магазін, *сеціўная* рэклама' [14, с. 909]). Тэрміны *электронны* і *сеціўны* – сінонімы, аднак тэрмін *сеціўны* валодае больш шырокім значэннем у камп'ютарнай тэрміналогіі.

Сеціва 1. Камп'ютарнае сеціва – гэта сеціва, якое звязвае камп'ютары і лакальныя вылічальныя сеціvы на вялікай адлегласці, якое прадастаўляе доступ да міжнародных інфармацыйных рэсурсаў: карыстальнік *сеціва*; 2. Разм. інтэрнэт: «актыўнае развіццё *сеціва*» [14, с. 249]) – *інтэрнэт* ('сусветнае інфармацыйнае камп'ютарнае сеціва, што аб'ядноўвае мноства некамерцыйных камп'ютарных сеціваў і камп'ютараў, якія абменьваюцца інфармацыяй адзін з адным' [14, с. 411]). Неабходна адзначыць, што інтэрнэт хоць і самае распаўсюджанае і агульнавядомае інфармацыйнае сеціва, аднак яно не адзінае. Існуюць, у прыватнасці, Агульнарасійскі тэхнічны інфармацыйны канал, сеціва «ТВ-Информ», сеціва «Инфострим» [17]. Гэта значыць, што тэрмін *сеціва* мае больш шырокае значэнне, чым тэрмін *інтэрнэт*.

Трэцяя група – сінанімічныя варыянты тэрмінаў. Характэрнай рысай працэсу станаўлення любой тэрмінасістэмы з'яўляецца пошук

найбольш аптымальнай намінацыі і, як вынік, наяўнасці варыянтных канструкцый [16, с. 12].

Словаўтваральны тып тэрміналагічнай варыянтнасці ў камп'ютарнай тэрмінасістэме прадстаўлены адзінкавымі прыкладамі: *адміністратар – адмін; адміністраванне – адміністрацыя* [2].

Што тычыцца лексічных варыянтаў, у прыватнасці поўных і кароткіх форм тэрмінаў, то такія прыклады сустракаюцца даволі часта і ў сферы фіксацыі, і ў сферы функцыянавання. Кароткія тэрміны-варыянты ўжываюцца для эканоміі моўных сродкаў. Прычым у сферы фіксацыі замацоўваецца, як правіла, толькі кароткі варыянт. Часцей назіраецца ўзнікненне варыянтаў у выніку семантычнай кампрэсіі, пры якой адно са слоў, якое ўваходзіць у словазлучэнне, убірае ў сябе значэнне словазлучэння: *адрас электроннай пошты – электронны адрас – адрас; электронная пошта – эпошта (пошта); камп'ютарнае сеціва – сеціва; вадкакрышталічны манітор (ВК-манітор, ВКМ) – манітор; вадкакрышталічны дысплэй* [2] і інш.

Такім чынам, можна адзначыць наступныя лексічныя асаблівасці сінаніміі камп'ютарнай тэрміналогіі:

1. Дублеты – тэрміны, якія не маюць ні эмацыянальна-экспрэсіўных, ні стылістычных адрозненняў.

2. Сінонімы – тэрміны, якія называюць адно і тое ж паняцце, але па розных прыметах.

3. Асноўная функцыя тэрмінаў-дублетаў і тэрмінаў-сінонімаў – функцыя замяшчэння.

4. Ад дублетаў і сінонімаў неабходна адрозніваць сінанімічныя варыянты.

5. Большасць прааналізаваных намі камп'ютарных тэрмінаў утвараюць варыянтныя сінанімічныя рады, гэта сведчыць аб тым, што камп'ютарная тэрмінасістэма знаходзіцца ў стане развіцця.

Асобнага аналізу патрабуюць сістэмныя адносіны жаргоннай камп'ютарнай лексікі. Як новая і выключна дынамічная з'ява, камп'ютарны жаргон «з'яўляецца ўнікальным матэрыялам для даследавання, у якім выяўляецца шэраг характэрных і для агульнанароднай мовы тэндэнцый і які заслугоўвае пільнай увагі лінгвістаў» [5]. Камп'ютарны жаргон дастаткова шырока прадстаўлены як у інтэрнэце, так і ў спецыялізаваных выданнях («Компьютерной газете», газеце «Компьютерра», часопісах «Хакер», «Game.EXE»), слоўніках і даведніках [4; 7; 18].

Камп'ютарны жаргон хутка папаўняецца новай лексікай, тэхніцызмамі англійскага паходжання, спецыфічнымі словамі і аказіяналізмамі. Як адзначае даследчыца А. М. Рудэнка, «подобные перлы чрезвычайно многочисленны на страницах Homenet и Интернета. Они свидетельствуют о специфическом чувстве юмора у "работников компьютера и модема". Пожалуй, из всех "технарей" именно те, кто работает в сфере информационных технологий, максимально склонны к языковому творчеству и языковой игре» [10, с. 243].

Характэрнымі рысамі камп'ютарнай лексікі, у тым ліку жаргоннай, з'яўляецца полісемія [9]: *Бліны* – 1. Кампакт-дыскі. 2. Дыскі ў вінчэстара. 3. Флопі-дыскі. 4. Любыя іншыя дыскі [11, с. 61]; унутраная і знешняя аманімія (паміж камп'ютарнымі жарганізмамі і словамі агульнанароднай мовы і іншымі сацыялектамі). Напрыклад, у крымінальным жаргоне *макрушнік* – 'чалавек, які ідзе на забойства' [15, с. 108], у камп'ютарным *макрушнік* – 'праграміст-сістэмшчык, які працуе на Макра Асэмблеры', у агульным жаргоне *мыла* – 'мыльная опера, шматсерыйны тэлевізійны серыял', у камп'ютарным – 'электронная пошта'.

Сістэмныя адносіны ў камп'ютарнай лексіцы прасочваюцца і на ўзроўні сінанімії, дзе можна вылучыць некалькі тэматычных груп:

1) назвы камп'ютарных дэталяў, прыналежнасцей: 'камп'ютар' – *комп, кампуцер, кампостар, кракадзіл, пісюк, пісюха, пісішнік*; 'камп'ютарная мышка' – *мыша, крыса, хвастатая, хома, звер*; 'клавіятура' – *клава, раяль, стукалка, кебарда, кейборда, кнопкі*; 'манітор, дысплей' – *мон, монік, моня, морда, тэлевізар, дысплюй*; 'вінчэстар' – *вінт, вінч, венік, блін, вентылятар*; 'мацярынская плата' – *мама, мамка*; 'дыванок для мышы' – *крысадром, мышадром, танцпляцоўка*; 'вентылятар працэсара' – *Карлсан, ветрадуй*;

2) назвы праграм, каманд, сімвалаў: 'электронная пошта' – *мыла, Ямеля*; сімвал @ – *сабака, сабачка, хвост, жаба, краказябла, масямба*;

3) назвы адзінак вымярэння: 'мегабайт' – *метр, тона*; 'кілабайт' – *кіло, ка*; 'гігабайт' – *гіг*;

4) назвы дзеянняў, аперацый, працэсаў: 'капіраваць інфармацыю з сервера' – *пампаваць, зліваць, скачваць*; 'архівіраваць' – *жаць, таптаць*;

5) назвы асоб: *ламер* (англ. lame 'слабы, кульгавы'), *чайнік* – 'няўмелы карыстальнік'; *хакер, кракер* (ад англ. hack) – 'чалавек, які вы-

датна валодае камп'ютарнымі тэхналогіямі і можа ўзломваць праграмы'; *юзер* – 'чалавек, які ўмее карыстацца камп'ютарам' (англ. user 'карыстальнік'); *насільнік, сіяніст* – 'праграміст, які працуе на мове С++'.

Як адзначае В. Вінагарадава, «кожная створаная адзінка павінна служыць уласна "слэнгавай" функцыі і быць сродкам зносін носьбітаў гэтага жаргону, але, з другога боку, яна выступае як прафесіяналізм. Акрамя таго, у многіх выпадках яна прэтэндуе ў перспектыве свайго выкарыстання на тое, каб стаць элементам лексічнай сістэмы агульналітаратурнай мовы. Сёння некаторыя з такіх адзінак успрымаюцца як неалагізмы, а не жарганізмы, паколькі літаратурная мова не мае сінонімаў для абазначэння адпаведных рэалій, валодаючы толькі іх дэскрыптыўнымі характарыстыкамі» [3, с. 204]. Так, дзеясловы *віснуць*, *завісаць*, *глючыць* у сувязі з камп'ютарызацыяй грамадскага мыслення хутка трапілі ў СМІ, у прыватнасці, на старонкі газет: *Удавалось ли еще «зависать» в Минске на день-два после концерта?* (СБ. 09.02.2011). *Электронные весы могут «глючить», когда, например, садятся батарейки* (СБ. 19.02.2011).

Асноўныя крыніцы папаўнення сінанімічных радоў:

– семантычная дэрывацыя, калі працэс намінацыі адбываецца шляхам скажэння ці іранічнага пераасэнсавання свайго слова па сугучнасці з чужым або па семантычнай блізкасці з чужым, якое адносіцца да камп'ютарных тэхналогій (*клава* 'клавіятура', *батоны* 'кнопкі', *Айбаліт* 'антывірусная праграма', *лапша* 'мноства кам'ютарных правадоў');

– запазычанні: *юзер* англ. user, *друкер* ням. Drucker;

– каламбурная транслітарацыя англійскіх тэрмінаў, звязаная з ужо існуючымі моўнымі адзінкамі (*Ямеля* ад англ. e-mail, *філе* ад англ. file);

– метафарычны ці метанімічны перанос, калі агульнаўжывальныя словы ў маўленні камп'ютаршчыкаў ужываюцца ў незвычайным кантэксце: інфармацыю *качаюць (скачваюць),* камп'ютар *завісае, задумваецца*. Як адзначаюць вучоныя, многім прафесійным жаргонам, у тым ліку і камп'ютарнаму, уласцівы антрапамарфізм. Так, многія назоўнікі ці дзеясловы, якія называюць органы, дзеянні чалавека, у жаргоне праграмістаў выкарыстоўваюцца адносна камп'ютара: *кішкі* – 'ўнутранае ўстройства аперацыйнай сістэмы', *мазгі* – 'аператыўная памяць', *морда* – 'манітор';

– словаўтварэнне: напрыклад, усячэнне асновы – *комп, вінт, гіг*. Характэрна з’ява сінанімічнай атракцыі на аснове адносін гіпанімії і гіперанімії (‘мышка’ – *жук, блыха, клоп*).

Такім чынам, камп’ютарная лексіка з’яўляецца выключна дынамічнай сістэмай. Гэта вызначаецца як экстралінгвістычнымі, так і ўнутрымоўнымі фактарамі. Таму бесперапынна ўзнікаюць новыя намінацыі (у тым ліку і жаргонныя), афармляюцца новыя сінанімічныя рады. Прадметна-тэматычнае размежаванне абумоўлена перавагай назоўнікавых і дзеяслоўных сінанімічных радоў.

Супастаўленне кадыфікаванай і некадыфікаванай лексікі выяўляе таксама адрозненні паміж кадыфікаванай і некадыфікаванай падсістэмамі, у прыватнасці, большая разнастайнасць спосабаў семантычнага пераносу прадстаўлена ў некадыфікаванай частцы камп’ютарнай падсістэмы. Так, метафарычнае пераасэнсаванне, каламбур, запазычанне, фанетычныя скажэнні – асноўныя спосабы ўзнікнення сінонімаў у камп’ютарным жаргоне.

Што датычыцца камп’ютарнай тэрміналогіі, то такія прыметы, як кароткасць, адсутнасць сінаніміі, прысутнічаюць не ва ўсіх тэрмінах. Большасць камп’ютарных тэрмінаў утвараюць варыянтныя сінанімічныя рады. Гэта сведчыць пра тое, што вывучаемая тэрмінасістэма знаходзіцца ў стане актыўнага развіцця.

Літаратура

1. Arntz, R. Einführung in die Terminologiearbeit / R. Arntz, H. Picht. – Hildesheim u.a. : Olms, 1995. – 347 s.

2. Беларускі камп’ютэрны слоўнік. Нататкі перакладчыкам [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://kamputerm.org/index.php, свабодны.

3. Виноградова, В. Компьютерный сленг и литературный язык / В. Виноградова // Исследования по славянским языкам. – Сеул, 2001. – № 6. – С. 203–216.

4. Голованов, Н. А. Современный англо-русский словарь компьютерных технологий / Н. А. Голованов. – М. : Просвещение, 2005. – 276 с.

5. Ермакова, О. И. Особенности компьютерного жаргона как специфической подсистемы языка / О. И. Ермакова. – Режим доступа: http: //www. dialog-21.ru, свободный.

6. Котелова, Н. З. К вопросу о специфике термина / Н. З. Котелова // Лингвистические проблемы научно-технической терминологии. – М. : Наука, 1970. – С. 122–138.

7. Левикова, С. И. Большой словарь молодежного сленга / С. И. Левикова. – М. : Гранд. Фаир-пресс, 2003. – 923 с.

8. Лук'янюк, Ю. М. Асаблівасці фарміравання лексічнага пласта камп'ютэрнай падсістэмы (на матэрыяле кадыфікаванай і некадыфікаванай лексікі) / Ю. М. Лук'янюк, Л. Г. Шасцярнёва // Слова ў кантэксце часу: зб. навук. прац Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 80-годдзю д-ра філал. навук, праф. Аркадзя Іосіфавіча Наркевіча, Мінск, 10 сакавіка 2009 г. / пад агул. рэд. В. І. Іўчанкава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – С. 252–263.

9. Лук'янюк, Ю. М. Полісемія і аманімія ў лексіцы камп'ютэрнай падсістэмы / Ю. М. Лук'янюк, Л. Г. Шасцярнёва // Журналістыка-2009: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 11-й Міжнар. навук.-практ. канф. / рэдкал. С. В. Дубовік [і інш.]. – Вып. 11. – Мінск : БДУ, 2009. – С. 283–286.

10. Руденко, Е. Н. Вот вам и драг с дропом, или Компьютерный жаргон глазами лингвиста / Е. Н. Руденко // Славянский мир на пороге III тысячелетия: материалы Междунар. науч. конф., Гомель, 15–16 мая 2001 г. / Бел. гос. ун-т транспорта, Гомел. обл. обществ. об-ние “О-во Кирилла Туровского”; редкол. : В. И. Коваль [и др.]. – Гомель, 2001. – С. 241–243.

11. Словарь молодежного и интернет-сленга. Толкование более 10 000 слов и выражений / автор-сост. Н. В. Белов. – Минск : Харвест, 2007. – 256 с.

12. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – Мінск, 1996. – 784 с.

13. Толикина Е. Н. Некоторые лингвистические проблемы изучения термина / Е. Н. Толикина // Лингвистические проблемы научно-технической терминологии. – М. : Наука, 1970. – С. 53–67.

14. Толковый словарь русского языка начала XXI века. Актуальная лексика / под ред. Г. Н. Скляревской. – М. : Эксмо, 2008. – 1136 с.

15. Толковый словарь уголовных жаргонов / под ред. Ю. П. Дубягина и А. Г. Бронникова. – М., 1991. – 721 с.

16. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Г. У. Арашонкава [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – 175 с.

17. www.gramota.ru.

18. www.slanger.ru.

Александра Макарова
Московский институт иностранных языков (Россия)

ЛЕКСИЧЕСКАЯ СУБСТИТУЦИЯ КАК ИНДИВИДУАЛЬНО-АВТОРСКОЕ ИСПОЛЬЗОВАНИЕ КРЫЛАТЫХ ЕДИНИЦ В ГАЗЕТНЫХ ЗАГОЛОВКАХ (на материале французской прессы 2011–2012 гг.)

Основными функциями языка газеты, как и публицистического стиля в целом, являются информативная, воздействующая, коммуникативная, аргументативная и убеждающая. Каждый функциональный стиль – это совокупность определенных жанров. Публицистический стиль не является исключением и представлен большим количеством жанров, принятых в данной сфере речевого употребления.

Публицистический стиль французских средств массовой информации обладает одновременно консервативностью и подвижностью. С одной стороны, есть тенденция к стандарту, то есть стремление к строгости и информативности, чем объясняется большое количество штампов. Однако не всегда усредненность языка французской газеты связана со штампами или речевыми клише. Не менее часто за этим употреблением скрывается осторожность в выражении мнений и оценок, порой недосказанность. Как и художественная литература, французская публицистика обладает значительной силой воздействия, используя широкий арсенал выразительных средств. Французские публицисты прибегают к самым разнообразным стилистическим средствам.

Итак, публицистическому стилю свойственна выразительность и информативная емкость передаваемых сообщений. Известный французский лингвист Г. Гийом писал об обращении речевой деятельности к двум видам средств: «к поздним средствам, принадлежащим импровизационному плану речи, и к ранним, принадлежащим устоявшемуся плану языка» [2, с. 54]. Исходя из этого положения, можно предположить, что язык газетно-публицистического стиля больше стремится к использованию средств экспрессивности, жертвуя средствами экспрессии. Этот феномен особенно ярко проявляется в использовании крылатых выражений в заголовках французских периодических изданий, что обусловлено их апеллятивно-аттрактивной и информативной функциями.

З'ява існуючага руска-беларускага білінгвізму, характэрная для нашых рэалій, праламляецца ва ўспрыманні большасці філолагаў-беларусаведаў у сапраўдную маральна-этычную ці нават ідэалагічную праблему, што паўстае з-за псіхалагічнага дыскамфорту ў штодзённай практыцы пераключэння з рускай мовы на беларускую і наадварот у дынамічна зменлівых маўленчых сітуацыях. Маркіраванне патэнцыяльнага суразмоўцы як «свайго» або «чужога» прадвызначае і выбар мовы зносін. Бываюць, аднак, у педагагічнай і дыдактычнай практыцы і такія рэдкія сітуацыі, калі з'ява білінгвізму адыгрывае сапраўды станоўчую ролю. Гэта адбываецца, напрыклад, пры выкладанні студэнтам-філолагам якой-небудзь сучаснай славянскай мовы (чэшскай, балгарскай і г. д. (мы спынімся на польскай)), прычым збольшага вялікай розніцы няма: студэнтам-русістам або беларусістам. Назапашаныя ў школьныя гады ў больш-менш аднолькавым аб'ёме веды па беларускай мове дазваляюць і тым, і гэтым арыентавацца ў значэннях агульнаславянскіх лексем, шырэй глядзець на з'явы міжмоўнай аманіміі, суадносіць гучанне і напісанне польскай словаформы з адпаведнай рускай ці беларускай.

Як заўважаў у свой час рускі філолаг, заснавальнік славяназнаўства ў Расіі Віктар Іванавіч Грыгаровіч (1815–1876), «рано поставленный между Ляхами… народ белорусский сохранил в своем языке и некоторые свойства языка соседних с ним племен: поэтому неудивительно будет, если мы найдем в нем свойства и великорусского языка, и польского, и малорусского» [1, с. 129]. Беларускія студэнты аказваюцца з гэтага гледзішча ў больш выгадным становішчы ў параўнанні з этнічнымі расіянамі, якім неабходна запомніць значна больш слоў, агульных паводле значэння і гучання для беларускай і польскай моў, напрыклад: *kanapa (канапа), siekiera (сякера), koszula (кашуля), zgoda (згода), kobieta (кабета), cnota (цнота), mowa (мова), smaczny (смачны), błazen (блазнюк), dowcip (доціп), litość (літасць), listopad (лістапад* – назва месяца*), ofiara (ахвяра), cudowny (цудоўны), odpoczywać (адпачываць), polować*

(паляваць), budować (будаваць), ciekawy (цікавы) і інш. У гэтых адносінах да студэнта-беларуса польская мова стаіць на паўкрока бліжэй, бо многія словы ён ведае, прынамсі, з пачатковай школы. Тое ж і з адпаведнай рускай лексікай, што ўзыходзіць да агульнаславянскай: *widzieć (видеть), znać (знать), pomagać (помогать), gdzie (где), chleb (хлеб), trawa (трава), woda (вода), ubogi (убогий), jeśli (если), jeżeli (ежели), objaśniać (объяснять)* і інш. Як паказала шматгадовая практыка выкладання польскай мовы, вельмі зручнымі ў працэсе знаёмства з польскай фанетыкай, лексікай і граматыкай аказваюцца тлумачэнні і рэмаркі выкладчыка і на беларускай, і на рускай мовах.

Пры знаёмстве з польскім алфавітам і вымаўленнем асобных зычных гукаў выкладчык заўсёды звяртае ўвагу навучэнцаў на асаблівасці польскай афрыкатызацыі мяккіх [т´] і [д´], або т. зв. цеканне і дзеканне. У сувязі з гэтым студэнтам прапануецца паспрабаваць вымавіць па-руску слова *цёця*. Як правіла, адразу з гэтага нічога не атрымліваецца: беларусы цекаюць і нават не заўважаюць, што вымаўляюць не [т´от´а], а [ц´оц´а]. Польскае ж цеканне яшчэ больш «шыпячае»: у рускамоўных падручніках па польскай мове для перадачы гукавога значэння літары ***ć*** выкарыстоўваецца афрыката [**ч´**], хаця гэта не зусім дакладна. Для правільнага адчування гукавой якасці польскай афрыкаты студэнтам неабходна спачатку вымавіць гэтае слова нармальна па-беларуску – [ц´оц´а] і так, як прапануе рускі падручнік: [ч´оч´а], пасля чаго зрабіць выснову, што і тое, і другое вымаўленні не адлюстроўваюць тыпова польскага цекання. Ісціна тут будзе якраз пасярэдзіне, а менавіта:

Беларуская афрыката [ц´]	Польская афрыката [ć]	Руская афрыката [ч´]
[ц´] ≤ [ć] < [ч´]		

Тое ж самае тычыцца і высвятлення гукавой якасці іншых мяккіх польскіх гукаў, напрыклад:

Беларускі мяккі гук (афрыката)	Польскі мяккі гук (афрыката)	Рускі мяккі гук (афрыката)
[с´] ≤	[ś]	< [ш´]
[з´] ≤	[ź]	< [ж´]
[дз´] ≤	[dź]	< [дж´]

У галіне беларускага і польскага кансанантызму аднолькавымі акустычнымі характарыстыкамі валодае афрыката [тш], што на пісьме абазначаецца літарай **ч** і дыграфам **cz** адпаведна. Гэты гук у абедзвюх мовах зацвярдзелы, у адрозненне ад мовы рускай. Аднак не сакрэт, што пад уплывам шырокага выкарыстання рускай мовы ў штодзённых зносінах наш зацвярдзелы **ч** у выкананні асобных носьбітаў насуперак арфаэпічнай норме адчувальна памякчаецца, і гэтая загана, бывае, больш-менш потым выпраўляецца дзякуючы трэніроўцы ў вымаўленні польскіх лексем тыпу ***cz**as (час),* ***cz**ęsto (часта),* ***cz**emu (чаму),* ***cz**ysty (чысты),* ***cz**łowiek (чалавек),* ***cz**ynsz (плата),* ***cz**oło(лоб),* ***cz**ekać (чакаць)* і інш. Каб вымавіць гэтыя словы правільна па-польску, неабходна проста забыць пра тое, што [ч] дзесьці можа быць мяккі. Таму бяры, чалавеча, што называецца, прыклад з палякаў і не саромейся свайго беларускага цвёрдага [ч]!

Таксама на адных з першых заняткаў студэнты знаёмяцца з двоякім фанетычным афармленнем займеннікаў 3-й ас. мн. л. *oni* і *one (‘яны’)*, абумоўленым існаваннем у польскай мове мужчынска-асабовай катэгорыі, якая праяўляецца ва ўсіх самастойных часцінах мовы, акрамя прыслоўя. Тут вельмі карысным з’явіцца параўнанне форм *oni* і *one* адпаведна з рускай формай *они* і беларускай *яны*. Няцяжка заўважыць, што ў рускай мове гістарычна ўмацавалася старажытная мужчынска-асабовая форма, з мяккай асновай, а ў беларускай – жаноча-рэчыўная, з цвёрдай.

Пры вывучэнні тэмы «Граматычны род назоўнікаў» звяртаем увагу на неадпаведнасць родавай прыналежнасці пэўнай групы назоўнікаў у польскай, беларускай і рускай мовах. Такія назоўнікі, напрыклад, як *podpis (подпіс), napis (надпіс), step (стэп), medal (медаль),* у польскай і беларускай мовах належаць да м. р., у рускай – да ж. р. Назоўнік *twarz (твар)* у польскай мове хаця і ж. р., але сама яго агаласоўка вельмі блізкая да беларускага адпаведніка *твар*, і для студэнтаў-беларусаў гэтае слова не новае.

Знаёмячыся з польскімі прыметнікамі, студэнты-беларусы аказваюцца «падрыхтаванымі» да ўспрымання гістарычна сцягнутых форм м. р. адз. л., у якіх адсутнічае канцавы [й] тыпу: *wysoki (высокі), głęboki (глыбокі), długi (доўгі), bogaty (багаты), rozumny (разумны)* і да т. п. (у рускай мове адпаведна: *высокий, глубокий, длинный (долгий), богатый, разумный).*

Пры вывучэнні тэмы «Спражэнне дзеясловаў» перад навучэнцамі паўстае пытанне размежавання названай часціны мовы на тыпы

спражэння (typy koniugacyjne), бо ў польскай мове іх існуе аж тры, у адрозненне ад моў беларускай і рускай, дзе дзеяслоў змяняецца (за выключэннем рознаспрагальных) па двух узорах. Адкуль бярэцца польскае трэцяе спражэнне? Для тлумачэння гэтай з'явы студэнтам прапануецца звярнуць увагу на форму дзеяслова цяперашняга часу 3-й ас. адз. л. *czyta (чытае)*. У беларускай і рускай мовах дзеслоў *чытае (читает)* належыць да І спр.: гэтую яго прыналежнась вызначае галосны *-е*, што ўваходзіць у склад асабовых канчаткаў *(чыта**еш**, чыта**ем**, чыта**е**)*. У польскай жа мове дзеяслоў *czytać* адносіцца да ІІІ спр. Якая галосная канчатка прадвызначае гэта? Для нагляднага тлумачэння такой «метамарфозы» выкарыстоўваецца наступная схема, якая паказвае, як пры «перамяшчэнні з Усходу на Захад» гэты дзеяслоў паступова «сціраецца», пераходзячы з прывычнага першага (беларускага і рускага) спражэння ў трэцяе польскае:

<table>
<tr><td colspan="2">Захад</td><td colspan="2">Усход</td></tr>
<tr><td>Польшча</td><td colspan="2">Беларусь</td><td>Расія</td></tr>
<tr><td colspan="4">чым далей «ідзём» на Захад, тым карацейшым становіцца слова
(форма 3-й ас. адз. л. цяп. часу дзеяслова чытаць – читать – czytać):</td></tr>
<tr><td>(on, ona) czyta</td><td colspan="2">← (ён, яна) чытае</td><td>← (он, она) читает</td></tr>
</table>

Вось якраз з гэтых дзеясловаў І спр. на *-ает* (бел. *-ае*) і паўстае польскае ІІІ спр. на *-а*: *слуш**ает*** – *слух**ае*** – *słuch**a**, отдых**ает*** – *адпачыв**ае*** – *odpoczyw**a**, разговарив**ает*** – *размаўл**яе*** – *rozmawi**a**, кив**ает*** – *ків**ае*** – *kiw**a**, осматрив**ает*** – *аглядае* – *ogląd**a**, помог**ает*** – *дапамаг**ае*** – *pomag**a*** і мн. інш., у якіх галосны ***-а*** асновы цяперашняга часу (з нашага гледзішча) бесперашкодна пераўтвараецца ў канчатак 3-й ас. адз. ліку. Характэрна, што іншыя дзеясловы беларускага і рускага І спр. (за выключэннем тых, што на *-ае, -ает*) супадаюць з І жа польскім: *малю**ет*** – *малю**е*** – *maluj**e***, *рису**ет*** – *rysuj**e***, *палю**е*** – *poluj**e***, *нервиру**ет*** – *нерву**е*** – *denerwuj**e***, *пиш**ет*** – *pisz**e**, ед**ет*** – *едз**е*** – *jedzi**e**, буду**е*** – *buduj**e**, хоч**ет*** – *chc**e**, вста**ёт*** – *ста**е*** – *wstaj**e*** і мн. інш.

Немагчыма абысціся без рускамоўных адпаведнікаў пры знаёмстве з польскімі дзеепрыметнікамі і дзеепрыслоўямі (imiesłowami odmiennymi i nieodmiennymi). Вядома, што формы дзеепрыметнікаў цяперашняга часу незалежнага стану ў беларускай мове з-за доўгатэрміновай адсутнасці пісьмовай практыкі (XVII–XVIII стст.) ці

па нейкіх іншых прычынах не развіліся і не замацаваліся ў такой ступені, як у мовах польскай ці рускай, і таму ўступаюць у аманімічныя адносіны з адпаведнымі дзеепрыслоўямі. Утварэнне польскіх дзеепрыметнікаў і іх значэнне па-іншаму наглядна і не растлумачыш, як толькі звярнуўшыся да адпаведнікаў рускіх. Напрыклад, польскае дзеепрыслоўе *pisząc* мы можам перакласці на беларускую мову адпаведнікам-дзеепрыслоўем *пішучы*. А вось да дзеепрыметніка м. р. адз. л. *piszący* мэтазгодна прапанаваць рускую форму *пишущий*, і так у многіх іншых выпадках, напрыклад:

Дзеепрыслоўі незак. трывання (што робячы?)			Дзеепрыметнікі незалежнага стану цяп. часу м. р. адз. л. (які?)		
польскія	**рускія**	**беларускія**	**беларускія**	**рускія**	**польскія**
idąc	*идя*	ідучы́ / іду̀чы		*идущий*	*idący*
czytając	*читая*	чытаючы		*читающий*	*czytający*
myśląc	*думая*	думаючы		*думающий*	*myślący*

і г. д.

Што тычыцца асаблівасцей засваення польскай лексікі і знаёмства са спецыфікай сінтаксісу, гэта адбываецца натуральна і нязмушана ў тых выпадках, калі выкладчык пачынае выкладаць польскую мову па-польску, робячы неабходны сінхронны пераклад тых слоў і фраз, аб значэнні якіх навучэнцы наўрад ці здагадаюцца. Пры гэтым большасць рэплік, як аказваецца, усе разумеюць без цяжкасцей. Напрыклад, увайшоўшы ў аўдыторыю і сказаўшы: «*Dzień dobry państwu. Od dzisiaj zaczynamy się uczyć języka polskiego*», можна не сумнявацца, што сэнс сказанага дойдзе да кожнага ў сваёй непахіснай адназначнасці.

Для дасягнення пастаўленай мэты – навучыць разумець польскую мову, размаўляць на ёй і перакладаць разнастайныя тэксты – прыдатнымі будуць любыя моўныя паралелі: і рускія, і беларускія, і стараславянскія, і англійскія, і нямецкія. Перад дапытлівым розумам заўсёды адкрыецца чароўная карціна дзіўнага і непрадказальнага лёсу спрадвечнага славянскага слова…

Літаратура

1. Цыт. па кн. : Карский, Е. Ф. Белорусы : в 3 т. / Е. Ф. Карский. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя. – Т. 1. – 2006. – 653 с.

Людміла Сінькова
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

«EGO-ESSAI» Л. ДРАНЬКО-МАЙСЮКА: ВОБРАЗ АЎТАРА

Вобраз аўтара ў мастацкім тэксце выразна і непасрэдна выяўляецца ў жанры эсэ. Гэты жанр робіцца ўсё больш запатрабаваным – як у мастацкай літаратуры, так і ў журналістыцы. Сучаснае грамадства ўсведамляе сябе не толькі праз «мы», якое ў былым лічылася найважнейшым. На першы план выходзіць «я», і значнасць такога пазіцыявання робіцца відавочнай ва ўсіх дыскурсах. Разам з гэтым крытэрыі для вызначэння эсэ доўгі час заставаліся няпэўнымі, так што ў актуальным ужытку сам тэрмін і адпаведныя тэксты вельмі часта страчвалі і страчваюць выразныя абрысы [1, с. 83–93]. У свой час Б. В. Стральцоў, вызначаючы новыя тэндэнцыі ў журналістыцы на мяжы 80–90-х гг. XX ст., уважліва прааналізаваў «гісторыю пытання» і прыйшоў да высновы: «Essai» (лексема і назва кнігі Мішэля Мантэня) разглядаецца і як самастойны жанр, і як разнавіднасць нарыса [8, с. 49], але ва ўсякім разе гэты жанр мае вялікія перспектывы. Час пацвердзіў такі прагноз. Традыцыйна эсэ развіваецца ў рэчышчы дакументальна-мастацкай, аўтабіяграфічнай прозы. Характэрнае менавіта для беларускай літаратуры эсэ захоўвае выразныя сувязі з нарысам (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі), з літаратуразнаўчым (М. Стральцоў. Загадка Багдановіча) або публіцыстычным (В. Казько. Паміж цюленем і акрабатам) артыкулам. Ёсць у нашай літаратуры і апавяданні-эсэ (М. Гарэцкі. Патаемнае; Я. Брыль. Гуртавое), аповесці-эсэ (В. Карамазаў. Глядзіце ў вочы лемуру), раманы-эсэ (А. Лойка. Як агонь, як вада…). Узмоцненая суб’ектыўнасць, выразны пафас і сюжэтна-кампазіцыйная адвольнасць характэрныя таксама для прозы Л. Дранько-Майсюка (апавяданне-эсэ «Анёлак і я» і інш.). Некаторыя свае тэксты Л. Дранько-Майсюк вызначыў (у падзагалоўках) як «ego-essai», або нават «прозапаэзія» [3, с. 198; 2, с. 169]. Такое вызначэнне стасуецца з наступнай выразнай тэндэнцыяй у сучаснай прозе: асоба аўтара настолькі вылучаецца сучаснымі пісьменнікамі, што даследчыкі і творцы ў сваіх дыскусіях гавораць пра «эгаістычны эсэізм» (С. П. Залыгін) як пісьменніцкую жанравую скіраванасць [6, с. 19].

З пункту гледжання тэорыі «я» ў эсэ («ego-essai») «пазбягае вызначэння і не задаецца выразна ў якасці прадмета апісання; <…> “Я” не

з'яўляецца тэмай, падобнай усім астатнім, яно можа быць ахоплена як цэлае менавіта таму, што яно само ўсё атачае і далучае да сябе...» [9, с. 124]. Такім чынам, жанр эсэ вызначаецца праз наступны крытэрый: «...аўтарскае "я" ў эсэістычнай прозе з'яўляецца суб'ектам мастацкага разгляду» [7, с. 23]. Ва ўсіх астатніх аўтабіяграфічных літаратурных формах (а гэта мемуары, дзённікі, аўтабіяграфія, эпісталярый, нататкі, запіскі, запісныя кніжкі) аўтарскае «я» «адначасова выконвае ролю як суб'екта, так і аб'екта» [7, с. 23].

Апавяданні-эсэ Л. Дранько-Майсюка пад адной вокладкай з'явіліся ў другой палове 1980-х гг., у кнізе «Тут» (1990). Змешчаныя ў гэтым зборніку (разам з вершамі) лірычныя замалёўкі, звязаныя з Давыд-Гарадком, і падарожныя нататкі – па Бельгіі, Польшчы, Славакіі, Заходнім Берліне – ужо тады вызначаліся своеасаблівасцю аўтарскага «я». Апавядальнік, вельмі блізкі да рэальнага аўтара, наладжваў адмысловае сумоўе з чытачом. Яно адбывалася ў тэкстах: «У Тваім гарадку» (з прысвячэннем бацьку), «У Варшаве» (з прысвячэннем М. Ф. Дубянецкаму), «Паэт і вандроўныя акцёры», «На радзіме Ціля Уленшпігеля», «Вандроўка ў Татры і дзве постаці спевака», у аўтабіяграфічных апавяданнях-эсэ «Анёл згоды», «Адзін радок Гётэ». Ва ўсіх названых вышэй творах у большай ці меншай ступені выявілася схільнасць Л. Дранько-Майсюка да эсэ як жанру.

«Анёл згоды» – першы з твораў пра Давыд-Гарадок (у 2009 г. з'явіўся «Горад Боны і Давыда»). Пракаветнае, перажытае і за польскім, і за савецкім часам, побыт і душа мястэчка, яго рака і царква, свята і будзень – усё спазнанае, што будзе як тэма развівацца ў пазнейшай прозе, пазначана ўжо тут. «Ідзеш па вуліцы Камунальнай, а сэрца падказвае, што ідзеш ты па "Осэліцы", павернеш на Свярдлова і адразу ўспамінаеш, што гэта "Радзічы"» [3, с. 180]. «І чым больш мною авалодвала жаданне пісаць, тым болей назапашвалася прага ўвайсці ў мінулае, як у сад, хоць бы ў тое, недалёкае мінулае, якое хавалася ў магічным выразе – "за польскім часам"» [3, с. 182].

Апавяданне ў «Анёле згоды» вядзецца пераважна ад першай асобы, і гэта найбольш непасрэдная аўтарская пазіцыя (а не роля, якая б магла выразна адрозніваца ад аўтара). Узнёслае пісьмо дамінуе, але апавядальнік не адрываецца ад свету рэальных рэчаў, з'яў, падзей. Так, ён прызнаецца: «Мусіць, шкодзіць мне трохі ідэалізацыя даўняга, бо абрысы мінулага ўяўляюцца серабрыста-воблачнымі і трохі пахіленымі долу, як сівая галава майго бацькі...» [3, с. 185].

Увогуле ў прозе з кнігі «Тут» аўтарскае «я» спакваля па-эсэісцку размывалася. Яно траціла сваю аб'ектнасць на карысць іншых элементаў тэксту. Аўтар вельмі часта прамаўляў да свайго героя на «Ты», або да чытача – на «Ты», «Мы», «Вы» ў значэнні «я».

«Нас цікавіць паэт, ягоная адпаведнасць прыродзе, гісторыі, і цікавяць разумовыя вытокі мастацкага мыслення» [3, с. 115]. «Паверым слову паэта…» [3, с. 117]. «Наведаўшы Бельгію, Вы зразумелі – гэта краіна, якая не экзатычна здзіўляе, а проста запамінаецца» [3, с. 127]. «У сне Вы ўбачыце самыя нечаканыя спалучэнні шагалаўскіх фарбаў» [3, с. 136]. «Ты выйшаў з музея на Лансштрасэ. Цябе нібыта вынялі з вялізнага бяздоннага куфра» [3, с. 199]. «Табе драпежна ўсміхаліся рытуальныя маскі жыхароў Акіяніі… З рускай парцаляны на саксонскую грацыёзным ланцужком пераляталі японскія журавы – жывыя іерогліфы прыроды, несучы на тонкіх крылах спрадвеку далікатныя вішнёвыя пялёсткі. Журавы праляцелі праз цябе, як праз воблака, і ты нават не варухнуўся» [3, с. 199–200].

У кнізе «Тут» Л. Дранько-Майсюк так бачыў сваю стылёвую задачу: «Мэтаімкнёны стасунак фантазіі да ўласнага на паперы слова і ёсць мастацкае мысленне» [3, с. 118]. У гэтым плане, напрыклад, цалкам лагічнай з'яўляецца паэтыка апавядання-эсэ «На радзіме Ціля Уленшпігеля» (1986). У ім акцэнт быў зроблены на маляўнічасці, кідкасці ўражанняў з падарожжа аўтабіяграфічнага героя па Бельгіі, а таксама на супастаўленні чужога і свайго праз асацыяцыі і рэфлексію. (Як аддалены кантэкст тут можна прыгадаць падобныя падарожныя нарысы-справаздачы, – канешне, больш публіцыстычныя, – савецкіх часоў, што пісаліся беларускімі літаратарамі пасля наведванняў замежжа.) Чытачу прапанаваны своеасаблівы калейдаскоп з хуткай зменай яскравых малюнкаў. Тут ёсць усё: «Сляпыя» Метэрлінка, Шарль дэ Кастэр, Ціль Уленшпігель, Нэле, Ламэ Гудзак, карціна Пітэра Брэйгеля-Сялянскага «Перапіс у Віфлееме», навела Яраслава Івашкевіча «Ікар», Ян Ван Эйк, Рубенс, палотны Марка Шагала, фавісты, Маціс, Апалінэр, акадэмік Ліхачоў, Андрэ Маруа, Астэндэ – радзіма Джэймса Энсара, Дзінан – радзіма Адольфа Сакса, які ў 1845 г. вынайшаў саксафон, цытаты з Ахматавай, Ясеніна і Верхарна, гарады Турнэ і Бурге, Гент, Фландрыя, франкамоўная Валонія, Антверпен, Брусэль, Каралеўскі пляц, вуліца Рэгентаў, царква святога Аўгусціна і святая Капэла, Намюр, Турнэ, Льеж, вуліца дэ Маршэ – месца «чырвоных ліхтароў»,

Кутаісі, «арабскае пытанне», Лівія, Кадафі, пасольства ЗША ў Брусэлі, зброя для асабістага карыстання, Ватэрлоа, Напалеон Банапарт, НАТО, Ватыкан, таварыства «СССР – Бельгія», Гамбрынус – казачны фламандскі кароль і вынаходнік піва, 600 франкаў за брусэльскія карункі для кішэннай хустачкі, Sint Joris, што па-беларуску будзе значыць «Святы Юр'я», і шмат іншага. Усе гэтыя і падобныя рэаліі існуюць цалкам адвольна, так што апавядальніцкая кропка, якая пазначае заканчэнне твора, магла быць пастаўлена ў любым месцы.

Але ў традыцыйна-лірычным вершы, напісаным пра тое ж падарожжа, лірычны герой аказаўся і больш пазнавальным, і бліжэйшым чытачу:

«У гэтай цемрадзі густой, / У гэтай цемрадзі дажджлівай / І мне патрэбны – крэсла, стол / І куфаль сонечнага піва. // У гэтых вулках і дварах, / У горадзе фламандскім гэтым / І мне патрэбен цёплы дах / І ўтульны водар цыгарэты. // <…> Я нібы птушка, для якой / І ў цемры шлях ляжыць дадому, / Якая ў далечы чужой / Шукае на гняздо салому» [3, с. 158].

Карацейшая дыстанцыя паміж лірычным героем і чытачом тут невыпадковая. Паэтыка гэтага верша засяроджана якраз на аўтаравым «я», і сваёй аб'ектнасцю яно кантрастуе з суб'ектнасцю ў апавяданні-эсэ «На радзіме Ціля Уленшпігеля».

Заключнае з апавяданняў у кнізе «Тут» – эсэ «Адзін радок Гётэ». Якраз яно было ўпершыню пазначана аўтарскім падзагалоўкам «ego-essai». Сапраўды, сабраныя пад гэтай назвай кароткія занатоўкі і абразкі фіксуюць выключна адвольныя, у вялікай ступені выпадковыя ўражанні, адчуванні, рэфлексіі суб'екта, чыё «я» таксама плыткае: «Не, гэта не зусім ты. Гэта ў табе разважае нехта пабочны, магчыма, твой двайнік…» [3, с. 198]. «І ўсё ж у нейкія шчаслівыя моманты ты забываеш свайго двайніка, пакідаеш спрачацца і проста думаеш» [3, с. 202].

У 90-я гг. XX ст. Л. Дранько-Майсюк напісаў цэлы шэраг апавяданняў, у якіх з'явіўся выразны наратар. Яны былі аб'яднаныя ў кніжку «Пра тое, як я…» (1992) з падзагалоўкам «13 несур'ёзных апавяданняў». Пазней колькасць гэтых апавяданняў вырасла: у 1995 г., напрыклад, з'явіліся творы «Пра тое, як я пасля рэферэндуму на шпацыр выйшаў», «Пра тое, як я на Дом без балконаў паглядзець захацеў» і інш. Сказавым героем-апавядальнікам тут зрабіўся

сучасны «дзядзька ў Вільні», дзівакаваты жыхар Мінска, пісьменнік, за чыімі ўяўна-прастадушнымі развагамі чытаюцца аўтарская іронія і сарказм. Маўленне наратара, напрыклад, у апавяданні «Пра тое, як я на Дом без балконаў паглядзець захацеў» цалкам супрацьлеглае ўстойліваму індывідуальнаму стылю Л. Дранько-Майсюка. «Дзіўнага тут нічога нямашака, што раніцы аднае мне на Дом без балконаў паглядзець захацелася…» [5, с. 39]. Але натхненне да наратара-пісьменніка не прыйшло, таму, апавядае ён, «мусіў я хлопчыка з гусаком аднаго ў фантане пакінуць і на вуліцу спадара Карлы выбірацца». Тут ля будынка бібліятэкі захацелася яму звярнуць на сябе ўвагу дзяўчыны-студэнткі: «Падступаю па-балетнаму, кампліму́гу з сябе выштурхоўваць пачынаю, а студэнтка на ўсе мае штукі фліртовыя раптам прамаўляе заклапочана: “У вас на задзе штаны ці то ў ваксе, ці то ў сажы!”» [5, с. 39]. Урэшце «прыгоды» персанажа заканчваюцца расчараваннем, бо і студэнтка, і сімпатычная пісьменніку жанчына-«бальзакаўка» аказваюцца «вайсковаабавязанымі» і, відавочна, мастацтвам не цікавяцца. Гэтая спроба Л. Дранько-Майсюка пісаць у сказавай манеры зразумелая, аднак умоўнасць нескладаных сюжэтаў, наўмысна інверсійная, аднатыпная па сінтаксісе мастацкая мова аўтара зніжае вартасці «несур’ёзных апавяданняў».

У тыя ж 90-я гг. XX ст. з’явілася і традыцыйная для Л. Дранько-Майсюка проза. Гэта былі ўзоры «эгаістычнага эсэізму» ў кнізе «Акропаль» (1994) – «Ратаванне Грэцыяй» і «Стомленасць Парыжам».

У анатацыі да «Акропаля» падкрэслівалася, што ў гэтай кнізе Л. Дранько-Майсюка мы маем справу з паэтавымі «ўражаннямі, эмацыянальнымі фантазіямі, навеянымі вандроўкамі ў Грэцыю і Францыю», з пэўным «культам еўрапейскага мастацтва». Гэта сапраўды так. Паэт піша: «Як малое лашчыцца да маці, шукае абароны і цеплыні, так будзённая Еўропа – гэтае звышцывілізаванае дзіця – туліцца да святочнай Грэцыі, да яе прыцягальнай даўніны, ратуючыся ад духоўнай пагібелі» [2, с. 7].

Апавяданне-эсэ «Ратаванне Грэцыяй» мае свой лірычны сюжэт са скразным матывам закаханасці: паэт і дзяўчына ляцяць у Грэцыю, «каб увайсці ў гэтую краіну, як у чыстую ваду…» [2, с. 11]. Тут, верыць паэт, дзяўчына забудзецца на свой паслячарнобыльскі страх кахаць, нараджаць; тут, у Афінах, Дэльфах, Пірэі, ля Кастальскай крыніцы – валадарства Апалона на Парнасе, – ад іх сплывуць папярэднія

«бяссонныя ночы і галаваскрутныя дні». Ім згадаецца наш «вясёлы палясоўшчык Тарас», на беразе Карынфскага заліва яны пабудзяць кучаравага Эрота, а ля вечназялёных міжземнаморскіх лаўраў паэт працытуе радкі Уладзіміра Дубоўкі пра «поўдзень, у лаўры спавіты…» [2, с. 16].

Менавіта ў гэтым эсэ Л. Дранько-Майсюк выразна акрэсліў адзін з вытокаў свайго таленту: «Тысячы феерычных слоў нараджаюцца ўва мне, тысячы неверагодных вобразаў. І ўсё гэта адначасова. Я разгублены, я згубіў іхнія таленавітыя пачаткі і геніяльныя завяршэнні. Як у неахопнай гісторыі Старажытнай Грэцыі вельмі цяжка адрозніць міф ад праўды, а праўду ад легенды <…>, так зараз і ў маёй душы зусім немагчыма сапраўднае аддзяліць ад прыдуманага, вымаўленае ад напісанага. Немагчыма!» [2, с. 9]. Аналагічнай паэтыкай вызначаецца і аўтабіяграфічная аповесць-эсэ, «ego-essai» «Стомленасць Парыжам». Яна складаецца з кампазіцыйна вылучаных 16 раздзелаў, што, аднак, не вельмі істотна падзяляе феерычную вобразную плынь цэлага аповеду.

У аповесці-эсэ пад назваю «У Вільні і больш нідзе» (2009–2011) Л. Дранько-Майсюк расказаў пра віленскую беларушчыну ў самых розных яе праявах. Гэта гісторыя храмаў, могілкаў, вуліц, будынкаў, установ, гісторыя ў жыццях віленчукоў, у сучасных імпрэзах і архіўных дакументах, звязаных з Беларуссю. Тэкст падзяляецца на раздзелы з аналагічнай кампазіцыяй; кожны пачынаецца вершам у гонар выдатных асоб: М. Танка, І. Луцкевіча, А. Луцкевіча, Б. Тарашкевіча, К. Дуж-Душэўскага (дарэчы, яшчэ раз падкрэслім, што чаргаванне паэтычнай і празаічнай мовы ўвогуле ўласцівае для эсэ). Тэкст падаецца як дзённік з самымі рознымі запісамі. На першым плане засталася цалкам вольная плынь аўтарскіх уражанняў і роздумаў, але пры гэтым адкрываюцца і дакументальныя, архіўныя вытокі разваг аўтара. Ён не толькі чытае Вільню як адкрытую кнігу. Цяпер былая калейдаскапічнасць у адлюстраванні свету моцна звязаная з новым пафасам і новым падыходам да адбору матэрыялаў: апавядальнік знаходзіць, адкрывае, любіць найперш сваё, беларускае, і найперш значнае, фатальна-неабходнае. «Мы селі за стол ля вялікага акна, і наплыло-набегла чытанае ў Лявона Луцкевіча, што менавіта пра гэтую званіцу Максім Багдановіч сказаў: “…І на вежы, як круглае вока савы, Цыферблат – пільны сведка мінулых учынкаў…”. Я любаваўся званіцай і радкамі Багдановіча…» [4, с. 8].

Такім чынам, у прозе Л. Дранько-Майсюка, відавочна аўтабіяграфічнай, апавядальнік застаецца блізкім да рэальнага аўтара, напрыклад у апавяданнях-эсэ «Паэт і вандроўныя акцёры», «На радзіме Ціля Уленшпігеля», «Вандроўка ў Татры і дзве постаці спевака», «Анёл згоды», «Анёлак і я», «Хлопчык і яго бацькі», у аповесці-эсэ «У Вільні і больш нідзе» і інш. Аўтарскае «я» ў гэтых творах з'яўляецца суб'ектам мастацкага разгляду, што і вызначае іх менавіта як прозу-эсэ. У цыкле апавяданняў «Пра тое, як я…» Л. Дранько-Майсюк звярнуўся да традыцый сказавай прозы, узоры якой у 1920-я гг. у беларускай літаратуры стварыў Лукаш Калюга. Роля наратара, якую выканаў аўтар, атрымалася адметнай, але ў цэлым апавяданні «Пра тое, як я…» з'яўляюцца менш значнымі ў творчасці Л. Дранько-Майсюка. Яго індывідуальнасць рэалізуецца найперш у паэзіі, а таксама ў эсэістычнай прозе, дзе могуць спалучацца асобныя рысы аўтабіяграфіі, нарыса, дзённіка, споведзі, але самай важнай застаецца свабода творчага «я», скіраваная да аб'ектаў адлюстравання. Найбольш паслядоўна такая скіраванасць выяўлена ў «ego-essai» «Адзін радок Гётэ», «Ратаванне Грэцыяй», «Стомленасць Парыжам».

Літаратура

1. Акудовіч, В. Разбурыць Парыж / В. Акудовіч. – Мінск : Логвінаў, 2004. – 298 с.

2. Дранько-Майсюк, Л. Акропаль : паэзія. Эсэ / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 190 с.

3. Дранько-Майсюк, Л. Тут : вершы, паэмы, эсэ / Л. Дранько-Майсюк.– Мінск : Маст. літ., 1990. – 214 с.

4. Дранько-Майсюк, Л. У Вільні і больш нідзе / Л. Дранько-Майсюк // Дзеяслоў. – 2011. – № 3. – С. 5–33.

5. Дранько-Майсюк, Л. Апавяданні / Л. Дранько-Майсюк // Крыніца. – 1995. – № 10. – С. 36–42.

6. Литература последнего десятилетия – тенденции и перспективы. Материалы «круглого стола» // Вопросы литературы. – 1998. – Март – апрель. – С. 3–82.

7. Стральцова, В. М. Шлях да сябе: сучас. аўтабіягр. проза як маст. сістэма / В. М. Стральцова. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 112 с.

8. Стральцоў, Б. В. Эсэ: ад жанру да метаду / Б. В. Стральцоў // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4. – Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 1993. – № 2. – С. 49–51.

9. Эпштейн, М. Законы свободного жанра / М. Эпштейн // Вопросы литературы. – 1987. – № 7. – С. 120–136.

Алег Слука
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ЭСТЭТЫКА ПУБЛІЦЫСТЫЧНАГА СЛОВА

Такое вобразнае азначэнне каштоўнасці публіцыстычнай творчасці належыць прафесару М. Я. Цікоцкаму, 90-гадовы юбілей якога мы з гонарам адзначаем. У аснову ідэалогіі эстэтыкі публіцыстычнага слова прафесар М. Цікоцкі паклаў аб’ектыўныя фактары выкарыстання журналістамі і пісьменнікамі хараства беларускай і рускай моў, выкарыстання ў творчасці народнай вобразнасці, логікі стылю і думкі, этычных правіл фармулявання і абмежавання вульгарнай лексікі не толькі ў пісьмовай, але і ў бытавой гутарцы.

Эстэтыка прафесара М. Цікоцкага стала адкрыццём новага своеасаблівага перыяду ў развіцці публіцыстычнай творчасці, калі пачыналася дэмакратычная перабудова нацыянальных адносін. Гэта быў перыяд 60–70-х гадоў мінулага стагоддзя, калі ў беларускай публіцыстыцы і літаратуры праявіліся яркія таленты Васіля Быкава, Андрэя Макаёнка, Уладзіміра Караткевіча, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Барыса Сачанкі, Івана Чыгрынава і іншых таленавітых майстроў мастацтва. У творчасці беларускіх публіцыстаў складаўся збіральны вобраз пасляваеннай эпохі, былі адкрыты новыя і незвычайныя факты і падзеі Вялікай Айчыннай вайны, набіраў моц вобраз чалавека працы, грамадзяніна – стваральніка духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей.

Разам з прызнанымі майстрамі публіцыстычнага слова фарміравалася кагорта публіцыстаў ужо новага перабудовачнага і адраджэнскага часу: рэдактар «Народнай газеты» Міхаіл Шыманскі, рэдактар «Беларускай думкі» Уладзімір Вялічка, галоўныя рэдактары: клімавіцкай раённай газеты – Пятро Пабока, бярозаўскай – Фёдар Калеснiковіч, крычаўскай – Пятро Грынькоў; «Чырвонай змены» – Уладзімір Касько і інш., якія стваралі сучасную нацыянальную школу журналістыкі.

Гэтыя праблемы росту публіцыстычнага майстэрства і інтэграцыі творчага вопыту розных пакаленняў беларускіх публіцыстаў, а таксама працэс выхаду беларускай журналістыкі на сучасны еўрапейскі ўзровень функцыянавання адлюстраваны ў вучэбных кнігах М. Цікоцкага «Стылістыка публіцыстычных жанраў», «Стылістыка беларускай мовы», «Сугучнасць слоў жывых» і інш.

Падкрэслім адметную дэталь: даследаванне тэхналагічнага функцыянала творчага майстэрства М. Цікоцкім падсумоўвала пачатковую працу філасофскага асэнсавання нацыянальнага творчага працэсу, якая закладвалася раней у тэарэтычных вышуках Кузьмы Чорнага, Янкі Купалы, Кандрата Крапівы, Аркадзя Куляшова і іншых беларускіх мастакоў старэйшага пакалення.

Такое паглыбленне ў тэхналогію творчага працэсу дало вызначальны плён і моцна паўплывала на эфектыўнасць практыкі адлюстравання савецкай рэчаіснасці і пошуку ў супярэчлівым жыцці найбольш каштоўных прыкладаў яе пераўтварэння. Можна нагадаць, што якраз у апошнюю чвэрць мінулага стагоддзя нацыянальная публіцыстыка стала важным і моцным інстытутам сацыяльнага кіравання і абнаўлення дэмакратычнай свядомасці беларускіх грамадзян. Ужо тады рыхтавалася глеба для глабальных палітычных змен і стварэння свабоднай і незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Майстэрства беларускіх публіцыстаў набывала новыя рысы актыўнага ўздзеяння на грамадска-палітычнае жыццё краіны. Гэта было заўважана і адзначана грамадствам і дзяржавай. Значная колькасць беларускіх публіцыстаў розных выданняў атрымала высокія дзяржаўныя ўзнагароды БССР і Савецкага Саюза. Можна ўзгадаць, што карэспандэнты «Сельской газеты» Віктар Захарчук і Рыгор Кадзет за серыю нарысаў і фотанарысаў «Людзі, людзі – высокія зоркі» сталі лаўрэатамі прэміі Саюза журналістаў СССР.

Яшчэ раз падкрэслім, што даследаванне эстэтыкі публіцыстычнага майстэрства было своечасовым і супала з аб'ектыўнай неабходнасцю выхаду нацыянальнай журналістыкі на новы ўзровень камунікацыйных працэсаў. Аднак час змяніўся, наступіла эпоха самастойнага і свабоднага развіцця суверэннай краіны Рэспублікі Беларусь. Сродкі камунікацыі Беларусі з падсістэмы ў СССР сталі самастойнай інфармацыйнай прасторай у міжнароднай камунікацыйнай сістэме. Змяніліся і прыярытэты развіцця беларускага дэмакратычнага грамадства.

Сучасная сістэма камунікацыі будуецца на прынцыпах свабоды слова і дэмакратычных законаў развіцця грамадства. Таму заканамернасці функцый публіцыстыкі яшчэ больш актуалізаваліся. Новая рэальнасць патрабуе і новага сістэмнага аналізу інавацыйных форм і метадаў развіцця. У інфармацыйным грамадстве сродкі камунікацыі сталі фактычна галоўным інстытутам арганізацыі і кіравання

не толькі грамадскімі, але і вытворча-арганізацыйнымі працэсамі. Камунікацыя, як сцвярджаюць філосафы, ёсць грамадства, а грамадства – ёсць камунікацыя.

Інфармацыйны спектр сувязі з аўдыторыяй у Беларусі пашырыўся настолькі, што выйшаў на ўзровень еўрапейскіх краін. Газет, часопісаў, радыё- і тэлепрыёмнікаў у насельніцтва стала больш, чым у савецкі час, амаль утрая. Кожная сям'я выпісвае і чытае ў сярэднім дзве газеты, адзін часопіс, мае два-тры радыёпрыёмнікі, два тэлевізары, кожны другі чалавек у дзяржаве карыстаецца інтэрнэтам, шэсць мільёнаў жыхароў Беларусі карыстаюцца мабільнымі тэлефонамі.

Такая глабальная сетка інфармацыі патрабуе грунтоўнай прафесійнай эвалюцыі канкрэтных журналістаў, галоўных суб'ектаў працэсу фарміравання і афармлення інфармацыі для сучаснага высокаінтэлектуальнага грамадства. Задача гэта складаная і, як паказвае аналіз публіцыстычнай практыкі, не заўсёды выканальная. Імклівы час, складаныя выклікі XXI стагоддзя часта абганяюць інфармацыйны аналіз важнейшых праблем сучаснасці.

Напрыклад, у нашай краіне ідзе абмеркаванне і выкананне «Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця на 2011–2015 гг.», а ў 2007–2010 гг. рэалізоўвалася першая інавацыйная праграма. Аднак гэтыя важнейшыя працэсы ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі і выхад нашай краіны з крызісу не сталі прадметам глыбокага даследавання ў публіцыстыцы. Таму выкарыстанне інавацыйных форм і метадаў арганізацыі вытворчасці, фарміраванне інавацыйнай свядомасці, пераход грамадства ў новую культурную прастору не толькі ідуць марудна, але і не даюць чакаемага вызначальнага плёну ў рэальным жыцці.

Інавацыйныя формы і метады рэканструкцыі рэчаіснасці не сталі свядомасцю журналістаў, а таму на інфармацыйным полі з'яўляюцца рэдкія павевы новых падыходаў да стварэння ўмоў для развіцця дзяржавы і грамадства. Нават дэкларацыі аб інавацыйных праграмах, якія прапануюцца на розных пасяджэннях дзяржаўных структур, у СМІ адбіваюцца ў большай ступені інфармацыйна. На жаль, грамадская думка не атрымала дагэтуль сфарміраванага вобраза працэсу інавацыйнага развіцця, а значыць, і свядомага дзеяння грамадзян па яго рэалізацыі.

Аднак праблема інавацыйнай недасведчанасці камунікацыйнай сферы праяўляе яшчэ больш складаную з'яву ў працэсе развіцця

нашай дзяржавы. Палітычныя і духоўна-свядомасныя арыенціры беларускага грамадства ў новых умовах не атрымалі ўстойлівага замацавання і грамадзянскага вызначэння. Чаму, напрыклад, у літаратуры і мастацтве да гэтага часу не складваецца яркі, прыкладны, духоўны, руплівы, стваральны, патрыятычны, ахвярны, гуманны, верацярпімы, талерантны, інтэлектуальны і г. д. вобраз сучасніка?

Час патрабуе такі вобраз сучаснага беларускага чалавека, які, з аднаго боку, адпавядае хрысціянскім запаветам і каштоўнасцям, а з другога – збірае адзін з самых адметных у Еўропе каравяаў хлеба, працуе на канкурэнтных прадпрыемствах і ў парках высокіх тэхналогій, вобразна кажучы, стварае велічную гісторыю маладой самастойнай дзяржавы і старажытнай высокакультурнай нацыі. Вобраз сучасніка свабоднай дзяржавы, Радзімы-Беларусі, гучыць не ў поўны голас у медыя.

Замест гэтага на інфармацыйным полі часта галоўную дудку грае штучны фетыш, ілюзія высакароднасці за завесай эгаістычных памкненняў. Тэлевізійныя праграмы захоплены забаўляльнымі перадачамі, надуманай зоркавасцю і запоўнены нейкімі дакучлівымі кланамі сямейных дынастый. Дзесяцігоддзямі (гэта ж колькі пакаленняў пераварваюць танную макулатуру?) на экранах спяваюць «пад фанеру», жартуюць да брыдкай агіднасці, крывяцца ў самых вульгарных позах купкі людзей, якія не ведаюць, хто чый муж ці жонка, чые ў каго дзеці, хто з кім ажаніўся зноў.

А калі гэта не зразумела ім самім, тады ўключыцца, напрыклад, праграма «Няхай гавораць», і гледачам прапануюць бясконцыя сальныя сагі зноў жа надуманых «звёздных страданий». Глядзець сорамна. А тады на самым высокім чыноўніцкім узроўні гледачам скажуць: «А ты пераключы праграму!» І аўдыторыя пераключае, а там зноў тыя самыя «героі» і ў той жа самай ролі. На Расію ківаць не вельмі прыстойна, хаця там непрыстойнасцей на тэлебачанні процьма. Падобнае становішча і на беларускім экране...

Бракуе якасці камунікацыі і зніжае інтэлектуальны зварот да аўдыторыі анлайнавы метад інтэрпрэтацыі інфармацыі. Факты і падзеі, што падаюцца без падрыхтоўкі, «з полымя, з жару», губляюць вастрыню ўздзеяння на аўдыторыю, хаця яны і адносяцца да вельмі важных. Асабліва гэта тычыцца перадач радыё і тэлебачання. Дыялог вядучых на тэлебачанні, акрамя інфармацыйных апра-

цаваных перадач, не вытрымлівае крытыкі. У аналітычных перадачах пытанні, якія задаюць журналісты сваім суразмоўцам, часта выходзяць за межы тэмы, тычацца дэталей, прыдуманых пасажаў, на якія гледачы ўжо наперад ведаюць адказы.

На навуковым семінары па інфармацыйных тэхналогіях у Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы Беларусі яго ўдзельнікі сцвярджалі, што грамадска-палітычныя перадачы беларускага тэлебачання не карыстаюцца попытам гледачоў. Узнікла пытанне: чаму? Адказ не здзівіў. На беларускім тэлебачанні з году ў год, з перадачы ў перадачу ніяк не могуць знайсці аўтарытэтных аналітыкаў, палітычных аглядальнікаў, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, якія глыбока ведаюць сутнасць развіцця грамадска-палітычных, эканамічных і маральна-этычных праблем грамадства, валодаюць жывым словам.

Названыя вышэй і многія іншыя праблемы функцыянавання нацыянальнай камунікацыі не дазваляюць беларускай журналістыцы пераадолець комплекс перыферыйнасці і, прабачце, пасрэднасці. Па гэтай прычыне, напрыклад, тэлебачанне застаецца без большасці сваіх гледачоў, якія плацяць падаткі на беларускае тэлебачанне, а глядзяць расійскае, еўрапейскае і масава выкарыстоўваюць інтэрнэт.

Аднак, як кажуць, не ўсё так змрочна, тым больш што ў беларускіх СМІ – на радыё, тэлебачанні і ў газетах – у апошні час з'явілася новая генерацыя таленавітых публіцыстаў і рэдактараў, якія прыходзяць на змену старэйшаму пакаленню. Большасць з іх таксама вучыліся майстэрству ў эстэтычнай школе прафесара М. Цікоцкага. Іх эстэтыка публіцыстычнай творчасці звязана з разуменнем асаблівай каштоўнасці нацыянальнай дзяржаўнасці, гісторыі і культуры, а разам і духоўнай каштоўнасці газетнай і экраннай плошчы.

І гэтыя каштоўнасці ўвасабляюцца ў іх творчасці па знітаванні ўсёй моцы грамадства на праблемах выхаду краіны са складанага сацыяльна-эканамічнага становішча. Заслугоўвае грамадскага прызнання публіцыстычная праца намесніка галоўнага рэдактара «Народнай газеты» Людмілы Перасыпкінай, карэспандэнта тэлебачання Святланы Кнутавай, галоўнага рэдактара радыёстанцыі «Беларусь» Навума Гальпяровіча, галоўных рэдактараў ляхавіцкай раённай газеты «Ляхавіцкі веснік» Вольгі Барадзіной, часопіса «Беларуская думка» Вадзіма Гігіна, газеты «Аргументы и факты в Беларуси» Ігара Сакалова, намесніка галоўнага рэдактара газеты

«СБ. Беларусь сегодня» Галіны Тарапецкай і карэспандэнта гэтага ж выдання Аэліты Сюльжыной, намесніка галоўнага рэдактара «Настаўніцкай газеты» Веранікі Саламевіч і інш.

У творчасці названых журналістаў і тысяч іншых калег з рэгіянальных і рэспубліканскіх СМІ выкрышталізоўваецца сучасная высакародная эстэтыка новай журналістыкі, якая ўвасабляе ў сабе свабоднае дэмакратычнае грамадства сучаснай Беларусі і прапануе чалавеку духоўныя ідэалы свабоды, незалежнасці і справядлівасці, заснаваныя на моцнай веры ў нашу Нацыянальную ідэю, якая прыводзіць кожнага грамадзяніна да сапраўднай веры ў свае сілы, духоўную чысціню і не зманлівае, а рэальнае сучаснае і яшчэ больш змястоўнае будучае жыццё.

Ідэалізаваць публіцыстыку як адзін з самых распаўсюджаных і аўтарытэтных відаў грамадска-палітычнай літаратуры няма патрэбы. Гэта моцны механізм рэгуляцыі жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы. Вывад пралетарскага паэта У. Маякоўскага, што «газетой с республики грязь скребёте», застаецца дзейсным і сёння. Публіцысты, на думку Д. І. Пісарава, у складаныя часы павінны «ўмець даць павучальны ўрок грамадству». Гэта неабходная і вельмі адказная грамадская функцыя сучаснай беларускай публіцыстыкі.

У заключэнне сфармулюем і падкрэслім важную і актуальную думку: ад высокага ўзроўню публіцыстычнага майстэрства журналістаў і сучаснага поўнага забеспячэння грамадства запатрабаванай інфармацыяй напрамую залежаць інтэлектуальны і культурны ўзровень беларускага народа, інтэнсіўная і эфектыўная рэалізацыя інавацыйных праграм на аснове сучасных інфармацыйных тэхналогій, а таксама сістэма бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Григорий Солганик
Московский государственный университет имени М. В. Ломоносова (Россия)

ЯЗЫК ИНФОРМАЦИИ И СИНОНИМИЯ

Одна из характерных черт языка СМИ – жажда, поиск экспрессии. Эта черта проявляется практически во всех жанрах и даже в таком, казалось бы, «бесстрастном», как газетная информационная заметка. Рассмотрим с этой точки зрения явление синонимии в данном жанре.

Наиболее распространенная и характерная функция синонимов в речи – функция замещения. Пишущий (говорящий) использует синоним, чтобы избежать повторения слова, которое может свидетельствовать о бедности словарного запаса, монотонности, однообразии речи, эстетической ущербности. В газетной заметке использование синонимов в функции замещения имеет регулярный характер. Можно говорить даже о тенденции, закономерности, свойственной информационным жанрам газеты. И хотя функция замещения распространена в любой кодифицированной речи, рассчитанной на воздействие, в языке газетной информации ее действие имеет существенные отличия. При этом следует принимать во внимание как особенности самого жанра, так и специфику синонимии. Рассмотрим пример.

«75-летний Василий Аксенов почти трое суток находился в коме, и врачи уже не надеялись на улучшение. По мнению эскулапов, в его возрасте после приступа и операции очень сложно вернуть пациента к полноценной жизни» («Московский комсомолец», далее – МК, 19.01.2008).

Во втором предложении слово *врачи*, чтобы избежать повторения, заменено словом *эскулапы*. Но оно стилистически отмечено, не нейтрально. Так, словарь Д. Н. Ушакова (СУ) дает пометы *книжн. шутл.,* Л. П. Крысин (Толковый словарь иноязычных слов) – *устар. шутл.,* Большой толковый словарь (БТС) – *ирон.* и раскрывает значение: «Неумелый, плохой врач».

Такое употребление, если придерживаться традиционного подхода, можно было бы счесть стилистической ошибкой: журналист не учитывает стилистическую окраску слова, ведь *эскулап* – это не просто врач, но плохой врач. В тексте же иронический, шутливый оттенки отсутствуют. Не учитывается и архаичность слова. Оно используется как полная и адекватная нейтральная замена слову *врач*.

И всё же было бы поспешным и неправомерным считать подобное употребление ошибочным. Оно не носит единичного характера[1].

---

[1] Ср.: «После обследования медики поставили танцору неутешительный диагноз – паховая грыжа. Именитого пациента поместили в отделение хирургии, где в ближайшее время ему сделают операцию.

Этот диагноз для спортсменов и танцоров достаточно распространенный. Эскулапы уверены, что все закончится благополучно» (МК, 15.01.2008).

Регулярное же использование такого рода синонимов позволяет видеть в данном процессе определенную тенденцию. И это касается не только слова *эскулапы*. Вот еще несколько аналогичных примеров.

«Искусственную новогоднюю ель пришлось тушить в новогоднюю ночь пожарным у метро "Ясенево". <…> К прибытию брандмейстеров огнем была объята макушка искусственной ели. Пламя бушевало на высоте 10 метров над землей. Брандмейстерам удалось быстро справиться с необычным пожаром» (МК, 15.01.2008).

«Девушка уговорила его подельника выпустить ее из квартиры. И сразу же направилась в ближайший околоток» (МК, 02.07.2008).

«В пять тысяч рублей оценили сорокаминутное содержание в столичном околотке служители Фемиды» (МК, 02.07.2008).

«Изредка родственники кладут в домовину предметы гигиены и даже средства контрацепции» (МК, 10.07.2008).

«В том же 2008 году – после убийства первой жертвы – пресс-службой Пограничного управления ФСБ России по Белгородской и Воронежской областям было распространено заявление, где пограницы жаловались на тяжелую ситуацию с контрабандой на участке российско-украинской границы» (МК, 27.11.2009).

Во всех приведенных примерах синонимы, призванные заменять нейтральные слова-обозначения, стилистически отмечены и полностью не равны семантически, не эквивалентны заменяемому слову. Так, *брандмейстер* все толковые словари отмечают как устаревшее. Однако оно отличается от *пожарного* не только устарелостью, но и неполным совпадением значения: брандмейстер не просто пожарный, но «начальник пожарной команды» (СУ). Но это различие не смущает журналистов. Контекст как бы снимает несовпадающие компоненты значения, стилистические оттенки. Читателю ясно, что речь идет именно о пожарных. Фактически слово *брандмейстер* не только возвращается к активному употреблению, но и приобретает новое, несколько измененное значение.

Околоток в одном из значений (по СУ) – «подразделение полицейского городского участка (дореволюц.)». С современной точки зрения это историзм. Используется вместо номинаций *отделение милиции, милицейский участок, участок*. По-видимому, *околоток* привлекает журналистов тем, что это однословное обозначение, обладающее известной выразительностью и оценочностью, уместной

в данном случае, по мнению пишущих, хотя оно и не совсем точно семантически.

К слову *домовина,* употребляемому вместо *гроб,* СУ дает пометы *обл. устар.*

Слова *погранец, погранцы* толковые словари, в том числе словарь В. И. Даля, не отмечают. Они, судя по опросам, тоже областные.

Как видим, во всех случаях в качестве эквивалентных используются далеко не полные синонимы, приходящие из разных источников: из пассивного словарного запаса, из диалектов и др. Можно полагать, что для языкового сознания журналистов стремление разнообразить речь (не повторять одно и то же слово) оказывается сильнее задачи точно обозначать понятия, реалии, хотя при таком словоупотреблении размываются, исчезают различительные оттенки синонимов.

Отмеченная тенденция лежит в русле газетной стилистики (языка СМИ), составляет одну из характерных особенностей информационных жанров, насущная задача которых заключается в необходимости регулярно обозначать повторяющиеся факты, события, реалии. При этом выразительность текста во многом обусловлена разнообразием речи. Как известно, информационные жанры не очень предрасположены к использованию выразительных средств. В этих условиях разнообразие речи – один из важнейших источников (средств) экспрессивности.

Тенденция к разнообразию речи получает поддержку в явлении синонимии, которая заключает в себе возможность нивелирования в речи оттенков синонимов, особенно в контекстах, в которых синонимы употребляются в непосредственной близости в функции замещения. В этой позиции происходит нейтрализация смысловых, стилистических оттенков, так как на первый план выступает выражение, обозначение одного и того же понятия, т. е. близость значения, а не различительные нюансы синонимов.

Охарактеризованная выше тенденция нивелирования оценочно-смысловых оттенков синонимов в определенных контекстных позициях важна и в общеязыковом (общеречевом) плане. Привлечение синонимов из разных стилевых сфер способствует освоению литературным языком разнообразных отмеченных средств, некоторой нейтрализации их в газетной речи и благодаря этому расширению лексикона, обогащению литературного языка. Одни средства, счита-

ющиеся устаревшими, возвращаются в литературный язык в новом качестве, другие, имевшие ограниченное употребление (диалекты, жаргоны, просторечие), обретают свойства литературности, расширяя экспрессивный потенциал литературного языка. Эти процессы показывают несомненно оправданное, но до некоторой степени условное разделение литературного (и национального) языка на стилистические сферы словоупотребления. Для языкового сознания носителей языка, особенно наделенных творческой способностью, все эти сферы оказываются живыми, действующими источниками лексических ресурсов, и их единицы легко переходят из пассивного запаса в активное употребление. Так совершается, в частности, развитие литературного языка, и значительная роль в этом принадлежит языку газеты (шире – СМИ).

Очень важна в этом процессе, как уже отмечалось, роль синонимии. Ряды синонимов представлены в словарях синонимов перечнями слов с семантически застывшими, неподвижными значениями. В речи же синонимы весьма подвижны, активно взаимодействуют, причем особая роль в этих процессах принадлежит различительным оттенкам. Если ядро значения слова-синонима, как правило, стабильно и меньше подвержено изменениям, то периферия (стилистические оттенки) – это наиболее гибкая и подвижная часть семантики слова. Стабильность ядра значения обеспечивает возможность употребления синонимов в функции замещения. Периферия обусловливает возможность изменения, развития значения. Можно полагать, что развитие значения слова начинается именно с периферии.

рус. *переварить* – «переработать, усвоить в процессе пищеварения» → перен. «воспринять, творчески усвоить»: *Вы, Мерцалов, видно, читали по этому вопросу, к сожалению, только совершенно не переварили того, что прочли.* Вересаев, В юные годы [МАС: т. III, с. 50] / бел. *пераварыць* – «перапрацаваць, засвоіць у працэсе стрававання» → перан. разг. «успрыняць, засвоіць, перапрацаваць»: *Унутры столькі незразумелых слоў не пераварыць да самай смерці.* Асіпенка [ТСБЯ: т. IV, с. 165];

рус. *раскусить* – «кусая, разделить на куски» → перен. разг. «разобраться в ком-, чем-л., хорошо узнать, понять кого-, что-л.»: *Мы еще не раскусили, но дельный, дельный человек.* Тургенев, Новь [МАС: т. III, с. 649] / бел. *раскусіць* – «кусаючы, раздзяліць на часткі» → перан. разм. «распазнаць, добра ўведаць»: *Косця раскусіў іх* [*фашыстаў*] *каварную задуму і адмовіўся прымаць лякарства.* Пятніцкі [ТСБЯ: т. IV, с. 656].

Таким образом, на основе проанализированного материала можно сделать следующие выводы:

1. Ментальные глаголы в русском и белорусском языках характеризуются высокой степенью схожести с точки зрения количественного состава и семантического объема лексических значений. Это обусловлено генетической близостью языков и общими путями формирования их лексических составов. Несмотря на это, рассматриваемые лексические единицы в русском и белорусском языках имеют определенные отличия, касающиеся наличия / отсутствия соответствующего значения или коннотативной окраски какого-либо лексико-семантического варианта (ЛСВ) в одном из сравниваемых языков. Следует уточнить, что несовпадение объемов ЛСВ наблюдается при переводе с одного языка на другой. Так, с русского на белорусский язык глагол рус. *судить* переводится тремя отдельными лексическими единица-

ми (как правило, синонимическими), каждая из которых закреплена в узусе белорусского языка: бел. *меркаваць* — «развaжаць, рабіць вывад». Выявленные различия указывают на национально-культурную специфику лексического корпуса исследуемых единиц.

2. Между глаголами разных ЛСГ, в семантической структуре которых ментальное значение используется как основное, наблюдается большая семантическая общность. Это объясняется наличием неразрывной связи между процессами, относящимися к психической деятельности человека, его сознанию, памяти, мыслительным процессам.

3. Основу ЛСГ русских и белорусских глаголов со значением ментальной деятельности во вторичном употреблении составляют общеупотребительные слова, в семантической структуре которых выявляются переносные значения.

Дальнейшее исследование ментальных глаголов в русском и белорусском языках будет способствовать более углубленным знаниям о процессах, связанных с образованием лексики ментальной сферы.

Литература

1. Булыгина, Т. В. Ментальные предикаты в аспекте аспектологии // Языковая концептуализация мира (на материале русской грамматики) / Т. В. Булыгина, А. Д. Шмелев. – М. : Школа «Языки русской культуры», 1997. – С. 151–166.

2. Выготский, Л. С. Мышление и речь / Л. С. Выготский. – М. : Лабиринт, 1999. – 5-е изд., испр. – 352 с.

3. Касевич, В. Б. Язык и знание / В. Б. Касевич // Язык и структура знания. – М., 1990. – С. 8–25.

4. Колесов, В. В. Логический анализ языка. Ментальные действия / В. В. Колесов. – М. : Наука, 1993. – 326 с.

5. Петровский, А. В. Краткий психологический словарь / А. В. Петровский, М. Г. Ярошевский, – М. : Изд-во политич. лит-ры, 1985. – 435 с.

6. Храковский, В. С. Истоки вербоцентрической концепции предложения в русском языкознании / В. С. Храковский // ВЯ. – 1983. – № 3. – С. 110–117.

7. Шмелев, Д. Н. Современный русский язык. Лексика : учеб. пособие для вузов / Д. Н. Шмелев. – М. : Просвещение, 1977. – 335 с.

Лексикографические источники

1. *МАС*: Словарь русского языка : в 4 т. / гл. ред. А. П. Евгеньева. – М. : Русский язык, 1981–1984.

2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / пад. рэд. К. К. Атраховіча. Мінск : Выд-ва «Бел. сав. энц-ыя», 1977–1984.

Галіна Тычко
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

КАМУНІКАТЫЎНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Дыскусійны артыкул «Дзевяць прычынаў не любіць беларускую літаратуру» М. Аляшкевіч, які з'явіўся нядаўна на інтэрнэт-сайтах, не называе прычыны дзясятай, бадай самай істотнай, – **не ведаць яе**. Гісторыя беларускай літаратуры дагэтуль уяўляе сабой неспазнаны мацярык, своеасаблівую халодную Антарктыду з таямнічым ландшафтам, занесеным снегам забыцця. Нам невядомыя не толькі скарбы старажытнай літаратуры, сховы якіх прыадчыняе крыху герменеўтычная драматургія С. Кавалёва, але не ўсё мы ведаем і пра больш блізкі нашаніўскі перыяд – складаны, крэатыўны, напоўнены інтэнсіўнымі эстэтычнымі пошукамі, трагічны.

Узаемадзеянне чытача і тэксту, інакш кажучы мастацкая камунікацыя, пачынаецца з таго, што мастацкі твор, паводле Г. Гадамера, «для таго, хто ўспрымае, з'яўляецца як быццам гульнёвай пляцоўкай, на якую ён павінен выйсці» [3, с. 292]. Разуменне, як асноўны тэрмін герменеўтыкі, мае на ўвазе працэс пазнання ўнутранага зместу, расшыфроўкі гістарычнага тэксту дзеля ўсведамлення непарыўнасці духоўнага і культурнага вопыту чалавецтва.

Заключным этапам разумення выступае інтэрпрэтацыя, якая заўжды застаецца суб'ектыўнай і ўяўляе сабой дыялог аўтара і чытача і адначасова дыялог кожнага з іх з папярэдняй і сучаснай культурай (І. Арнольд). Інтэрпрэтацыя тэксту, асоба аўтара даследуюцца ў рамках біяграфічнага і псіхалагічнага метадаў, якія займалі вядучае месца ў літаратуразнаўстве мінулых стагоддзяў.

Біяграфічны метад, распрацаваны французскім пісьменнікам Ш. О. Сент-Бёвам, як вядома, заснаваны на дакументальных фактах з жыцця аўтара, звестках пра яго сваякоў, інфармацыі, знойдзенай у рукапісах, дзённіках, лістах, водгуках сучаснікаў і інш. Гэты падыход паказвае, як і ў якой ступені аўтарская біяграфія адлюстравалася ў мастацкім творы.

Псіхалагічная інтэрпрэтацыя дапамагае чытачу засяродзіцца на ўнутраным свеце аўтара, а культурна-гістарычны, параўнальны і сацыялагічны метады дазваляюць узнавіць кантэкст узнікнення твора. Разам з тым ніводзін з названых і з тых, што не пералічаны тут, сучасных літаратуразнаўчых метадаў не можа даць поўнае, вычарпальнае ўяўленне пра мастацкі тэкст. Па гэтай прычыне канец XX і пачатак XXI ст. звязаны з пошукам сістэмных падыходаў да інтэрпрэтацыі мастацкіх тэкстаў, якія ўлічвалі б прынцыпы вывучэння твора ў сінтэзе структурна-функцыянальных і генетычных уяўленняў пра аб'ект (В. Зінчанка, В. Зусман, З. Кірнозе) [4].

Тым не менш выкарыстанне існуючых метадаў і падыходаў дазваляе ўзбагаціць мастацкую камунікацыю чытача і аўтара, усвядоміць мастацкі тэкст ці з'яву не толькі ў звязку з нацыянальнай гісторыяй і традыцыямі, але і ў складаных повязях з сусветным мастацкім кантэкстам, у якасці аднаго са складнікаў сусветнай культурна-мастацкай сістэмы.

У 1916 г., за год да смерці, Максім Багдановіч напісаў незвычайны, як быццам не характэрны і тэматычна далёкі ад яго інтарэсаў верш «Ўсплывае грамада сіфанафора», які пры жыцці паэта не друкаваўся. Упершыню ён быў апублікаваны ў «Творах» 1927 г. з аўтографа. Змешчаны ў цыкле «Прырода. Малюнкі і настроі».

Сіфанафоры, пра якія гаворыцца ў вершы, – марскія жывёлы, што жывуць калоніямі і вылучаюцца незвычайнай прыгажосцю колераў і разнастайнасцю формаў. Знешне нагадваюць гірлянды кветак. Яны знаходзяцца ў свабодным плаванні, і кожная сіфанафора на працягу ўсяго жыцця выконвае ў калоніі сваю спецыфічную функцыю, у выніку ўсе сіфанафоры адрозніваюцца паміж сабой сваім выглядам. Спосаб жыцця сіфанафораў стаў для Максіма Багдановіча нагодай для роздуму над сэнсам жыцця асобнага індывідуума і спосабам уладкавання чалавечага грамадства. Запраграмаванасць сіфанафораў на выкананне пэўнай функцыі выступае для паэта алегорыяй духоўнага калецтва і смерці чалавечай індывідуальнасці: «жывых асоб жывучая труна», а ў выніку – бессэнсоўнасці існавання: «І ўсе жывуць без шчасця і без гора…».

Напісаны гэты твор пад уплывам вывучэння навуковай спадчыны біёлага і сацыёлага М. Д. Ножына (1841–1866). Да пяцідзесяцігоддзя з дня яго смерці М. Багдановіч апублікаваў артыкул «М. Д. Ножин» у «Ежемесячном журнале» (Петроград, 1916). М. Ножын быў звяза-

ны з рэвалюцыйнымі коламі і ў сацыялогіі выступаў прадстаўніком субъектыўнага метаду. Аднак у біялогіі ён прызнаваў дарвінізм, які, паводле яго меркавання, нельга прымяніць да сацыялогіі.

Увага М. Багдановіча да спадчыны і поглядаў М. Ножына тлумачыцца абвастрэннем зацікаўленасці сацыяльнай праблематыкай у тагачасным студэнцкім асяроддзі, да якога належаў паэт, а таксама тым, што М. Ножын быў блізкім сябрам і паплечнікам вядомага рускага пісьменніка М. К. Міхайлоўскага, сацыёлага і выдатнага публіцыста, народніка. Вывучаць спадчыну М. К. Міхайлоўскага рэкамендаваў М. Багдановічу бацька – Адам Ягоравіч. Неардынарная ж асоба М. Ножына магла захапіць Максіма яшчэ і па прычыне незвычайнай адоранасці гэтага чалавека і яго трагічна заўчаснай смерці, пад знакам якой жыў і сам невылечна хворы паэт.

Зацікаўленасць М. Багдановіча рускай літаратурай, маральна-філасофскімі, сацыяльнымі праблемамі таго часу тлумачыцца як расійскім асяроддзем, у якім паэт жыў, так і псіхалагічнымі фактарамі яго душэўнага стану, скіраванага на роздум і медытацыю. Блізкае сваяцтва сям'і М. Багдановіча з сям'ёй выдатнага рускага пісьменніка Максіма Горкага (у 1899 г. Адам Ягоравіч Багдановіч ажаніўся з Аляксандрай Паўлаўнай Волжынай, роднай сястрой жонкі М. Горкага) уплывала на фарміраванне творчай індывідуальнасці маладога паэта, кола яго літаратурнага чытання, інтэлектуальна-філасофскія пошукі, эстэтычныя погляды [1]. Аднак думаецца, што не толькі вялікі пралетарскі пісьменнік уплываў на маладога паэта, прадстаўніка новай, мала каму тады вядомай беларускай літаратуры, у жыццяздольнасці якой сумняваліся ў той час многія з высокаадукаваных беларусаў. Пэўны ўплыў на асобу Максіма Горкага, след у яго свядомасці пакінуў і Максім, яго паэзія і апантаная любоў да Беларусі.

Пацвярджэннем таму з'яўляецца нейкі асаблівы, шчыры і, можна нават сказаць, чуйны і пастаянны інтарэс М. Горкага да беларускай літаратуры. Летам 1910 г. падчас адпачынку пісьменніка ў Італіі на востраве Капры сярод людзей, якія яго наведвалі, аказаўся і мала каму вядомы Андрэй Фёдаравіч Посах (1884–1945). Гэты чалавек зацікавіў М. Горкага не толькі тым, што быў з Беларусі, але і тым, што нядрэнна арыентаваўся ў беларускай літаратуры. А. Посах добра ведаў Янку Купалу, з якім разам працаваў у 1906 г. на бровары ў Яхімаўшчыне. І хоць А. Посах захапляўся дакладнымі навукамі і пазней стаў кандыдатам фізіка-матэматычных навук і

дацэнтам БДУ, можа, дзякуючы Купалу ён на працягу ўсяго жыцця любіў паэзію. Знамянальна і невыпадкова, што М. Горкі пачынае распытваць А. Посаха пра беларускую літаратуру, просіць пачытаць беларускія творы. У верасні таго ж 1910 г. пад уражаннем гэтай сустрэчы М. Горкі піша ліст у рэдакцыю «Нашай нівы» з просьбай даслаць тэкст купалаўскага верша «А хто там ідзе?» і ноты да песні, якую на аснове твора напісаў кампазітар Л. Рагоўскі [5].

Зацікаўленасць М. Горкага беларускай літаратурай, несумненна, мела вытокі ў яго сваяцка-сяброўскіх повязях з сям'ёй Багдановічаў. Маючы вельмі прыязныя адносіны з Адамам Ягоравічам, М. Горкі не мог не ведаць пра захопленасць Максіма беларускай літаратурай, пра яго публікацыі ў першай легальнай беларускамоўнай газеце «Наша ніва». Асаблівае стаўленне М. Горкага да беларускай літаратуры засведчана ў многіх агульнавядомых выказваннях і ў факце перакладу ім «А хто там ідзе?» на рускую мову.

Пасля ўтварэння БССР М. Горкі, які быў ініцыятарам заснавання Саюза савецкіх пісьменнікаў, таксама ніколі не забываў пра Беларусь. У чэрвені 1934 г. у Мінску адбыўся І з'езд савецкіх пісьменнікаў Беларусі. Яму папярэднічалі масавыя арышты нацыянальнай творчай інтэлігенцыі летам 1930 г., спроба самагубства Янкі Купалы на глебе палітычнага ганення ў лістападзе таго ж года і першы масавы расстрэл беларускіх літаратараў, праведзены ў ноч з 17 на 18 мая 1934 г. Тады беларуская культура страціла адразу 15 чалавек. У Саюзе пісьменнікаў Беларусі на той час было 69 сяброў і 26 кандыдатаў.

Апальныя паэты – Янка Купала і Якуб Колас – напачатку на з'езд не былі запрошаны. Толькі спецыяльныя захады М. Горкага і рэдактара газеты «Известия» І. Гронскага, скіраваныя, відаць, дзеля ўратавання беларускіх класікаў ад рэпрэсій, зрабілі магчымым іх удзел у рабоце з'езда. У выніку яны выбіраюцца членамі праўлення і дэлегатамі з правам рашаючага голасу на І з'езд СПП СССР, дзе Беларусь прадстаўлялі 26 літаратараў. На гэтым з'ездзе вызначылася сутнасць сацыялістычнага рэалізму, які быў абвешчаны асноўным творчым метадам савецкай мастацкай літаратуры. Між тым старшыня праўлення савецкіх пісьменнікаў Беларусі Міхась Клімковіч у прамове на з'ездзе абвясціў, што «беларускі нацыяналізм застаецца галоўнай небяспекай для беларускай літаратуры, як і наогул для КП(б)Б і БССР».

У атмасферы недаверу і падазронасці праходзіў і III пленум праўлення Саюза пісьменнікаў СССР, які адбыўся ў Мінску ў 1936 г. Выбар Мінска як месца правядзення форуму таксама быў звязаны з ініцыятывай М. Горкага. Пленум прысвячаўся савецкай паэзіі, але адным з асноўных яго пытанняў быў стан беларускай літаратуры. Глыбокі творчы крызіс, які яна перажывала, быў выкліканы барацьбой з тым самым «беларускім нацыяналізмам», якая ў пасляз’ездаўскі час яшчэ больш абвастрылася. У працы пленума ўдзельнічалі многія вядомыя рускія пісьменнікі, такія як К. Федзін, В. Інбер, М. Асееў, А. Фадзееў, Б. Пастарнак, А. Твардоўскі, А. Суркоў і інш. Сам М. Горкі з-за хваробы на пленуме не прысутнічаў, але ён уважліва азнаёміўся з тэзісамі даклада М. Клімковіча «Літаратура Савецкай Беларусі», зрабіў свае заўвагі [2].

На пленуме выступілі таксама Аляксей Суркоў з дакладам «Аб савецкай паэзіі» і Афзал Тагіраў з дакладам «Башкірская савецкая літаратура». Ідэя адзінства і разнастайнасці шматнацыянальнай савецкай літаратуры, якая гучала ў дакладах, знаходзіла свой працяг і ў пісьменніцкіх выступленнях, у прыватнасці ў прамовах народнага паэта Беларусі Якуба Коласа і яркага прадстаўніка тагачаснай пралетарскай паэзіі Андрэя Александровіча. Вынікі работы пленума падводзіў першы сакратар ЦК КП(б)Б Мікалай Гікала, які актыўна ўдзельнічаў у разгортванні масавых рэпрэсій на Беларусі. Літаральна праз некалькі гадоў – у 1938 г. – ён і сам стане ахвярай сталінскай таталітарнай сістэмы, як і А. Тагіраў, і А. Александровіч, і многія іншыя з тых, хто знаходзіўся ў гэтай зале.

29 кастрычніка 1937 г., у дзень ленінскага камсамола, у Мінску за адну ноч расстралялі 20 беларускіх пісьменнікаў. Паводле звестак, якія прыводзяцца ў 5-м томе «Гісторыі Беларусі», «у савецкай дзяржаве ў тыя гады было рэпрэсіравана 2000 літаратараў, з якіх 500 прыпадае на Беларусь».

Літаратура

1. Беларускія пісьменнікі. Біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / рэд. : А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя, 1992–1995. – Т. 1. – 1992. – 542 с.

2. Беларускія пісьменнікі. Біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / рэд. : А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя, 1992–1995. – Т. 3. – 1992. – 585 с.

3. Гадамер, Г. Г. Истина и метод / Г. Г. Гадамер; пер. с нем.; общ. ред. и вступ. ст. Б. Н. Бессонова. – М. : Прогресс, 1988. – 704 с.
4. Зинченко В. Г. Межкультурная коммуникация. От системного подхода к синергетической парадигме / В. Г. Зинченко, В. Г. Зусман, З. И. Кирнозе. – 2-е изд. – 2008. – 224 с.
5. Купала Янка : энцыкл. давед. – Мінск : БелСЭ, 1986. – 727 с.

Альбіна Хромчанка
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

НА ШЛЯХУ ДА МОЎНАЙ НОРМЫ

У выдавецтве «Народная асвета» ў 2009 годзе выйшаў з друку «Слоўнік сучаснай беларускай мовы» пад агульнай рэдакцыяй магістра тэалогіі У. М. Завальнюка і прафесара М. Р. Прыгодзіча. У прадмове гаворыцца, што слоўнік падрыхтаваны з улікам новай рэдакцыі правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі і што ў ім «…упершыню шырока прадстаўлена міжканфесійная лексіка» [2, с. 3].

Сапраўды, у адным невялікім выданні зафіксавана найбольш ужывальная лексіка сучаснай беларускай літаратурнай мовы, улучна прафесійная, тэрміналагічная і інш., адлюстраваны магчымыя акцэнталагічныя варыянты, дадзены стылістычныя і граматычныя паметы, а напрыканцы – дадаткі з уласнымі імёнамі, якія згадваюцца ў Новым Запавеце, і словамі – зваротамі ветлівасці. Слоўнік забяспечаны дапаможным апаратам, нават змешчаны беларускі алфавіт. Усё гэта дазваляе меркаваць, што ў працы выкарыстаны новыя паказчыкі інфармацыі і ён арыентаваны на розныя катэгорыі чытацкай аўдыторыі.

Аўтары «Слоўніка сучаснай беларускай мовы» адзначаюць таксама, што за апошнія дзесяцігоддзі «…ў развіцці беларускай літаратурнай мовы адбыліся істотныя зрухі ў яе лексічным складзе і сістэме слова- і формаўтварэння, выкліканыя пераўтварэннямі ў грамадскім ладзе жыцця, з'яўленнем новых тэхналогій, зменай культурна-вартасных арыенціраў у працэсе развіцця міжнародных зносін і інш.» [2, с. 3]. Як жа гэтыя змены адлюстраваны ў слоўніку?

З трох сацыяльных слоўнікавых функцый – інфармацыйнай, камунікатыўнай і нарматыўнай – у нашым выпадку найбольшую цікавасць мае апошняя. Літаратурныя нормы беларускай мовы вы-

магаюць сёння асаблівай навуковай увагі і грамадскага абмеркавання.

Сярод агульнаўжывальнай лексікі, якая прадстаўлена ў названай вышэй працы, пэўная колькасць слоў, на нашу думку, – калькі і паўкалькі з рускай мовы, якім у беларускай мове ёсць адпаведнікі. Напрыклад: ***абед*** – ***абедаць***– ***абедзенны*** (полудзень – палуднаваць – полуднік) (ТСБМ, т. 3, с. 640; т. 4, с. 290).

У ланцужку слоў ***абмярцвелы – амярцвелы*** – ***абмярцвець*** [2, с. 16] прыстаўкі *аб-*, *а-* не выконваюць сваёй семантычнай функцыі – «дасягнення выніку дзеяннння, стану» [ТСБМ, т. 1, с. 29]. Гэтае значэнне ў названых словах мае прыстаўка *з-: змярцвець – змярцвелы*. У ТСБМ дзеясловы *абмярцвець* і *змярцвець* фіксуюцца як раўназначныя варыянты.

Слова ***адварны*** [2, с. 20], змешчанае ў Слоўніку (параўн.: руск. *отварной*), ТСБМ не фіксуе, адзначае толькі дзеепрыметнік *адвараны* ад дзеяслова *адварыць* [ТСБМ, т. 1, с. 120].

Бясцэнны і бясцэннасць [2, с. 56] (параўн.: руск. *бесценный, бесценность*) суадносяцца са словамі *без цаны*, *без кошту*, г. зн. «які не мае цаны, кошту». Значэнне «вялікай каштоўнасці, вартасці» ў беларускай мове перадаецца з дапамогай прыставак *не-* і *а-: неацэнны*. Такое ж лексічнае значэнне прыставак *не-* і *а-* мае шэраг слоў, утвораных па аналагічнай словаўтваральнай мадэлі: *неаглядны, неадольны, неаслабны, неаспрэчны, неахопны* і інш. [1, с. 359–360]. У Слоўніку пададзены дзве раўназначныя лексічныя адзінкі: *неацэнны / бясцэнны*.

Імкненне да варыянтнасці, найчасцей руска-беларускіх дублетаў, характарызуе гэтае выданне на словаўтваральным і акцэнталагічным узроўнях: *абмярцве́лы – амярцве́лы, адніма́нне – адыма́нне, асмя**я**ны і асме́яны – абсм**я**яны – абсме́яны, ва́пенны – ва́пнавы, ве́руючы – ве́рнік, выгна́нніца – выгна́нка, грузапад’**ё**мнік – грузападыма́льнік, дабрата́ – дабрыня, вынахо́дства – вынахо́дніцтва, дапо́латы – дапо́ланы, даўж**э**нны – даўж**э**зны, двайн**я**ты – дво́йня, дзевяціразо́вы – дзевяцікра́тны, злапа́мятны – злапа́мятлівы; адлама́ны – адло́маны, адчыта́ны – адч**ы**таны, апераза́ны – апяра́заны, апо́ўдні – апаўдн**і**, апо́ўначы – апаўно́чы, ахвяро́ваны – ахвярава́ны, ацынкава́ны – ацынко́ваны, ашліфава́ны – ашліфо́ваны, аштрафава́ны – аштрафо́ваны, брако́ваны – бракава́ны, ве́нчаны – вянча́ны, вяро́вачны – вераўча́ны, гне́ды – гняд**ы**, да-*

жава́ны – дажо́ваны, далама́ны – дало́маны, дале́жаць – даляжа́ць, дарысава́ны – дарысо́ваны, дораны – дароны, закітаваны – закітованы, заламаны – заломаны, зачасаны – зачэсаны, збудава́ны – збудо́ваны, згу́шчаны – згушчо́ны і інш. Некаторыя словы з адзначаных вышэй пар у ТСБМ не фіксуюцца, як, напрыклад, ацынкованы, асмеяны – абсмеяны.

Наяўнасць разнастайных варыянтаў, лексічных, словаўтваральных, фанетычных, акцэнталагічных, стварае цяжкасці пры канкрэтнай лексічнай ацэнцы. Назіраюцца спробы, з аднаго боку, вярнуць мове страчаныя каштоўнасці, а з іншага – замацаваць новае, звязанае з развіццём грамадства і тэхналогій.

Новыя тэндэнцыі, у прыватнасці пашырэнне рэлігійнага друку і літаратуры на беларускай мове, якраз і знайшлі адлюстраванне ў «Слоўніку сучаснай беларускай мовы». У адрозненне ад іншых лексікаграфічных прац у ім змешчана вялікая колькасць рэлігійнай лексікі: *аблачэнне, абраз, агнец і ягнец, адвент, айцец, ангел і анёл, амэн і амінь, антыхрыст, аплатка, архібіскуп, архіепіскап, архікатэдра, архідыякан, асанна, Багародзіца, бажаство, бежмаванне, біблейскі і біблейны, благачынны, блаславенне, вавекі, веруючы і вернік, высокапраасвяшчэнства, вянчаны і венчаны, духавенства, жагнаць, ікона, Ісус Хрыстос, уваскрасаць, уваскрашаць, уваскрашэнне, уваскрэсенне, уваскрэслы, уваскрэшаны* і інш. Методыка падачы тая ж самая, што і ў выпадку з агульнаўжывальнымі словамі – наяўнасць варыянтаў ці канфесіянальна маркіраваных пар. Адметнасць толькі ў тым, што эквівалентам да ўласна беларускага слова фіксуюцца не русізмы, а царкоўнаславянізмы (што гістарычна не было характэрна для беларускай мовы) або паланізмы. Значны лік лацінізмаў ці грэцызмаў у тэрміналагічнай рэлігійнай сістэме беларускай мовы – гэта з’ява заканамерная і пацверджаная старажытнымі пісьмовымі крыніцамі.

Кожнае з прыведзеных вышэй слоў можа быць аб’ектам асобнага даследавання, як, напрыклад, ***блаславенне*** ад руск. ***благословение***. Першая частка ***блага / благо*** – міжмоўны амонім, што ў беларускай мове мае значэнне «дрэнна». З гэтай нагоды Янка Станкевіч піша: «…ня Бога славім, але выказуем добрыя словы, зычэньні… найлепшае сваё слова “дабраславіць”, што ўжывалася даўней у нашай мове» [4, с. 45]. У сучасным вусным і пісьмовым рэлігійным маўленні ***дабраслаўленне*** выкарыстоўваецца нерэгулярна.

Слова ***Бажаство***, на нашу думку, беспадстаўна фіксаваць як адзіную норму, паколькі ў рэлігійнай публіцыстыцы, мастацкай літаратуры, у тэкстах літургій ужываецца таксама варыянт ***Боства***. А. Мусорын адзначае, што Бажаство – гэта запазычанне з царкоўнаславянскай мовы, а Боства – з польскай. «Хоць лексема *Бажаство / Боства* па сваім паходжанні звязана менавіта з хрысціянскай рэлігіяй, з цягам часу яна (на жаль, мы не можам сказаць, калі менавіта) набыла здольнасць абазначаць таксама і паганскіх багоў…» [3, с. 345]. У падобных выпадках, а іх нямала, калі дзве формы суіснуюць як раўнапраўныя канфесіянальна маркіраваныя лексічныя адзінкі, думаецца, неабходна рабіць выбар на карысць адной з іх.

Варыянтнасць норм, шырока прадстаўленая ў Слоўніку, сведчыць пра стыхійны характар функцыянавання мовы ў перыяд пошуку і станаўлення. Выбар нормы – гэта выбар кірунку яе далейшага шляху: да праўдзівых уласных каранёў ці да штучных асіміляваных формаў. У агульным кантэксце нарматыўнасці варта было б разглядаць і беларускую рэлігійную лексіку, якая апошнім часам значна ўзбагаціла лексічны фонд літаратурнай мовы.

Вялікая каштоўнасць «Слоўніка сучаснай беларускай мовы» ў тым, што ўпершыню ў беларускай навуцы ёсць рэальнае супрацоўніцтва свецкіх і духоўных асоб, зроблены крок да дыялогу, канцавой мэтай якога бачыцца выпрацоўка адзінай моўнай нормы для міжканфесіянальнага і богаслужэбнага ўжытку. Аднак, думаецца, такі дыялог мусіць адбыцца перадусім паміж хрысціянскімі Цэрквамі — дыялог у духу ўзаемаразумення дзеля супольнай працы на карысць Беларусі.

Літаратура

1. Бардовіч, А. М. Марфемны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч, Л. М. Шакун. — 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Вышэйшая школа, 1989. – 718 с.

2. Завальнюк, У. М. Слоўнік сучаснай беларускай мовы / У. М. Завальнюк, М. Р. Прыгодзіч, В. К. Раманцэвіч; пад агул. рэд. М. Р. Прыгодзіча, У. М. Завальнюка. – Мінск : Нар. асвета, 2009. – 399 с.

3. Мусорын, А. Ю. Хрысціянская тэанімічная лексіка беларускай мовы праваслаўнага і каталіцкага ўжывання / А. Ю. Мусорын // Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: зборнік да 75-годдзя прафесара Адама Мальдзіса / пад рэд. С. Запрудскага, А. Фядуты, З. Шыбекі. – Мінск : Лімарыус, 2007. – 444 с.

4. Станкевіч, Ян. Збор твораў у двух тамах // Ян Станкевіч. – Мінск : Выд-ва «Энцыклапедыкс», 2002. – Т. 2.– 586 с.

Скарачэнні

ТСБМ – Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / пад рэд. К. К. Атраховіча. – Мінск, 1977–1984.

Аляксандр Цікоцкі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

КАМУНІКАТЫЎНЫ І ЭТЫЧНЫ АСПЕКТЫ ЎЖЫВАННЯ СЛОВА Ў МОВЕ СУЧАСНЫХ СМІ

Змены, якія адбыліся апошнім часам у мове айчынных СМІ, звязаны з грамадска-палітычнымі пераўтварэннямі ў нашай краіне. З аднаго боку, гэта прывяло да значна большай жанрава-стылёвай разнастайнасці медыятэкстаў, іх максімальнай набліжанасці да жывога гутарковага маўлення. З іншага, усё больш відавочнымі становяцца хібы, адмоўныя бакі сучасных СМІ і рэкламы з пункта гледжання як зместу, так і формы, мовы і стылю.

Сюды трэба аднесці найперш рознага кшталту парушэнні моўных норм – граматычных, стылістычных, арфаграфічных. Назіраецца не заўсёды апраўданае ўжыванне ў сучасных СМІ і рэкламе стылістычна зніжанай, асабліва жаргоннай лексікі, якую выкарыстоўваюць некаторыя аўтары, арыентуючыся на своеасаблівыя густы пэўнай катэгорыі чытачоў. Пры гэтым яны не ўлічваюць, што кожнае выкарыстанне такіх моўных адзінак павінна быць мэтазгодным, апраўданым кантэкстам і сітуацыяй маўлення.

Але ў шэрагу выпадкаў асобныя словы і выказванні ў тэкстах сучасных СМІ выклікаюць пытанні не толькі лінгвістычнага, але і этычнага характару.

Вядома, што культура маўлення грунтуецца на трох пачатках – нарматыўна-моўным, камунікатыўным і этычным. Прычым калі першыя два ўжо дастаткова добра даследаваны, то пра этычную аснову культуры маўлення пачалі гаварыць параўнальна нядаўна. Між тым пытанне этыкі, этычнасці ў асвятленні пэўных падзей, апісанні фактаў, характары моўных сродкаў, якія пры гэтым ужываюцца, і г. д. стаіць зараз даволі востра. Гэта звязана са значнай дэмакратызацыяй мовы СМІ, з высокай ступенню сва-

боды, якую атрымалі за апошнія дзесяцігоддзі журналісты. Але, як вядома, свабодай гэтай яны далёка не заўсёды правільна карыстаюцца, нярэдка злоўжываюць ёй. Гэта праяўляецца перадусім у шырокім ужыванні стылістычна зніжанай лексікі. Больш за тое, у некаторых выданнях у шэрагу медыятэкстаў сустракаецца лексіка грубая, часта непрыстойная (абсцэнная), ужыванне якой, зразумела, ні ў якім разе не можа быць апраўдана.

Этычныя патрабаванні культуры маўлення ў мове СМІ і рэкламы парушаюцца і тады, калі ў ёрніцкай манеры абыгрываюцца вядомыя фразы, назвы літаратурна-мастацкіх твораў і г. д.

Абсалютна немэтазгодным трэба лічыць таксама ўжыванне ў СМІ і рэкламе ўрачыста-ўзнёслай лексікі ў дачыненні да звычайных прадметаў і з'яў. Асабліва гэта характэрна для спартыўных і рэкламных выданняў.

Мікола Цімошык
Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі (Украіна)

ДА ПРАБЛЕМЫ АБ ЗМЯСТОЎНЫМ НАПАЎНЕННІ ПАНЯЦЦЯЎ «РЭДАГАВАННЕ» І «ЛІТАРАТУРНАЕ РЭДАГАВАННЕ»

Рэдагаванне як цэласны творча-арганізацыйны працэс складаецца з сукупнасці накіраваных на падрыхтоўку і выпуск канкрэтнага выдання разнастайных і паслядоўных дзеянняў аўтара або спецыяльна падрыхтаваных прафесіяналаў.

Тэарэтыкі выдавецкай справы здаўна вылучылі ў гэтым працэсе тры галоўныя аспекты: палітычны (або ідэалагічны); навуковы; літаратурны (або літаратурна-стылістычны).

Называючы такі падзел умоўным, М. Сікорскі, напрыклад, падкрэслівае: «Рэдактарскую працу над зместам рукапісу можна назваць палітычным і навуковым рэдагаваннем, а працу над формай рукапісу (яе кампазіцыяй, мовай і стылем) – літаратурным рэдагаваннем» [11, с. 253].

Навуковае абгрунтаванне літаратурнага рэдагавання «як неразрыўнай часткі цэласнага і складанага працэсу рэдагавання» ўпершыню ў савецкай тэорыі выдавецкай справы і рэдагавання прадставіў маскоўскі даследчык К. Былінскі, з імем якога звязана распрацоўка моўна-стылёвага аспекту тэорыі і практыкі рэдагавання

[1, 2]. Галоўнымі задачамі літаратурнага рэдагавання аўтар лічыць паляпшэнне мовы, стылю і кампазіцыі твора.

М. Сенкевіч таксама звязвае літаратурнае рэдагаванне з «формай моўнай дзейнасці» і да паляпшэння мовы, стылю і кампазіцыі дадае «ўсю структуру рукапісу» [10, с. 21].

З такіх жа пазіцый разглядаюць літаратурнае рэдагаванне і аўтары выдадзенага ў Маскве ў 1987 г. аднайменнага дапаможніка пад рэдакцыяй Н. Валгінай [5, с. 82]. У дапаможніку адлюстраваны тры аспекты гэтага віду рэдагавання: павышэнне інфарматыўнасці моўных адзінак; узмацненне стылістычных якасцей тэксту; выпраўленне моўных памылак і недакладнасцей.

Да гэтай групы вучоных мы можам справядліва аднесці і беларускага даследчыка тэорыі і практыкі літаратурнага рэдагавання М. Цікоцкага [14].

Больш поўна, на нашу думку, змест літаратурнага рэдагавання вызначыў А. Мільчын: «Літаратурнае рэдагаванне – рэдактарскі аналіз, ацэнка і ўдасканаленне сумесна з аўтарам літаратурнай формы твора, састаўная частка рэдагавання, якая вылучаецца ва ўмовах, калі навуковы ці спецыяльны рэдактар займаецца аналізам і ацэнкай зместу выдання выключна з боку навуковай ці спецыяльнай, у той час як аўтар мае патрэбу ў дапамозе і літаратурнай» [6, с. 194]. Канцэптуальны падыход да тлумачэння паняцця «літаратурнае рэдагаванне» расійскага калегі цалкам падзяляе ў сваім слоўніку львоўская даследчыца Э. Огар [7].

Сярод тых украінскіх вучоных, якія першымі ўсебакова даследавалі тэарэтычныя асновы работы рэдактара над літаратурнай формай твора ці літаратурную апрацоўку тэксту, трэба вылучыць Н. Зялінскую. Асноўным зместам навуковай і вучэбнай дысцыпліны «Літаратурнае рэдагаванне», на думку даследчыцы, з’яўляецца «менавіта літаратурная апрацоўка твора» [3, с. 5]. Звяртаючы ўвагу на тое, што ў літаратурны аспект рэдагавання даследчыкі часам укладаюць розны змест, Н. Зялінская адназначна не падзяляе спробы некаторых з іх тлумачыць гэтае паняцце «занадта шырока». Менавіта такім яна лічыць азначэнне літаратурнага рэдагавання В. Церахавай, якое варта разгледзець асобна. «Літаратурнае рэдагаванне – гэта сфера грамадска-палітычнай і ідэалагічнай работы, якая ўключае ў сябе ўсе бакі працы над рукапісам, гэта значыць адзіны творчы працэс, у які ўваходзіць ацэнка тэмы, праверка і выпраўленне вы-

кладу з пунктаў гледжання ідэалагічнага і фактычнага (навуковага, тэхнічнага, спецыяльнага), выпраўленне распрацоўкі тэмы і, нарэшце, літаратурная апрацоўка тэксту» (В. Церахава) [12, с. 3–4].

Уважлівае супастаўленне ўзятага ў двукоссе фрагмента тэксту В. Церахавай з вызначэннем паняцця рэдагавання К. Былінскім лёгка прыводзіць да высновы, што ў дадзеным выпадку гаворка ідзе аб простай падмене: да тэрміна «рэдагаванне» В. Церахава дадае «літаратурнае». Тым самым было падменена змястоўнае напаўненне двух абсалютна розных паняццяў – «рэдагаванне» і «літаратурнае рэдагаванне».

«Занадта шырока» трактуе паняцце «літаратурнае рэдагаванне» і ўкраінскі даследчык У. Рызун у сваім падручніку: «Літаратурнае рэдагаванне – гэта від грамадска-культурнай дзейнасці, звязанай з рэгуляваннем інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў у грамадстве праз сродкі масавай інфармацыі і накіраванай на падрыхтоўку журналісцкага матэрыялу да друку ці выхаду ў эфір. Як від дзейнасці, літрэдагаванне з'яўляецца сістэмай прафесійных дзеянняў, накіраваных на выкананне вытворчых функцый, якія фарміруюцца ў выніку рэдактарскага аналізу журналісцкага матэрыялу пад уплывам рэальнай вытворчай сітуацыі» [9, с. 73].

Азначэнне У. Рызуна, з аднаго боку, развівае і дапаўняе падыходы папярэдніх даследчыкаў гэтай праблемы, а з іншага – не можа быць прынята безагаворачна, паколькі мае патрэбу ў адным прынцыповым удакладненні: усю складаную сістэму прафесійных дзеянняў, увесь гэты від грамадска-культурнай дзейнасці, звязаны з падрыхтоўкай тэксту да друку, вучоны называе не *рэдагаваннем*, а *літаратурным рэдагаваннем*.

Азначэнне літаратурнага рэдагавання як такога, якое поўнасцю накладаецца на паняцце рэдагаванне, супярэчыць прынятым у навуковай і вучэбнай літаратуры ўяўленням пра літаратурнае рэдагаванне як адзін з відаў рэдагавання ўвогуле, як састаўную яго частку, «якая вылучаецца толькі пры падзеле працы, калі навуковы ці спецыяльны рэдактар займаецца аналізам і ацэнкай зместу твора, што рыхтуецца да выдання, выключна з боку навуковай ці пазнавальнай, у той час як аўтар мае патрэбу ў дапамозе літаратурнай» [6, с. 194].

Аднак менавіта на адмаўленні такой трактоўкі літаратурнага рэдагавання і будуе свае аргументы аўтар украінскага падручніка

«Літаратурнае рэдагаванне». Так, ён крытыкуе пазіцыю Д. Грыгараша, які адводзіў літаратурнаму рэдагаванню толькі лінгвістычную ролю [9].

Можна прыводзіць і іншыя аргументы аўтара гэтай канцэпцыі на карысць пераймянавання складанага працэсу рэдагавання ў літаратурнае рэдагаванне, а тэорыю і практыку рэдагавання – у «навуку аб літаратурным рэдагаванні». Але звернемся да рэакцыі навуковай думкі на гэтае новаўвядзенне. Натуральна, што яно спачатку не магло не мець апанентаў.

Першым з вучоных, які не падтрымаў такую шырокую трактоўку літаратурнага рэдагавання, быў З. Партыка. Ён дакладна выказаў сваю пазіцыю: «Тэрмін “літаратурнае рэдагаванне”, які апошнім часам таксама выкарыстоўваецца для называння цэлай дысцыпліны, наўрад ці трэба ўжываць, паколькі ён ахоплівае не ўсе, а толькі некаторыя аспекты рэдагавання – кампазіцыйны, інфармацыйны, лінгвістычны, псіхалінгвістычны і лагічны» [8, с. 28].

Пераканаўча паспрабаваў унесці яснасць у занадта расшыраную трактоўку У. Рызуном паняццяў «літаратурнае рэдагаванне», «літаратурны аспект рэдагавання», «літаратурны рэдактар» А. Капялюшны. Не згаджаючыся з такім падыходам, ён прапануе просты адказ на гэтае пытанне: «Ніштo не перашкаджае тут замест “літаратурнае рэдагаванне”, “літрэдактар” ужываць тэрміны “рэдагаванне”, “рэдактар”. І тады захаваецца поўнасцю змест усіх аспектаў рэдагавання – палітычнага, навуковага, літаратурнага. Толькі ўсе тры віды рэдагавання будзе выконваць адзін чалавек – рэдактар» [4, с. 9].

Мы цалкам падтрымліваем такую пазіцыю і для яе ўзмацнення прывядзём некалькі сваіх аргументаў.

Першы. Спроба абсалютызаваць адзін з аспектаў рэдагавання пры дапамозе механічнага накладання больш вузкага паняцця на больш шырокае ці замяніць сэнс першага паняцця другім супярэчыць прынятым правілам тэрмінаўтварэння. Тэрмін *літаратурнае рэдагаванне* з’яўляецца словазлучэннем, у якім галоўнае слова – назоўнік (рэдагаванне), а залежнае – прыметнік (літаратурнае). Аналагічна: *рэцэнзія – знешняя, унутраная; часопіс – навуковы, дзіцячы; выданне – кніжнае, газетнае; паказальнік – імянны, прадметны* і да д. п. Такім чынам, і *рэдагаванне – літаратурнае, навуковае, тэхнічнае, мастацкае.* Гэты рад можна доўжыць. Знешняя рэцэнзія не можа поўнасцю замяніць паняцця «рэцэнзія», газетнае

выданне не «перакрывае» ўсе іншыя віды выданняў. Таксама як і літаратурнае рэдагаванне не можа азначаць тое ж, што і рэдагаванне ў цэлым, або асобныя яго аспекты. Парушэнне лагічнасці і мэтазгоднасці тэрміналагічнай намінацыі адным словам ці словазлучэннем можа прывесці да паняційнага хаосу [13].

Другі. У журналісцкай практыцы на савецкай і постсавецкай прасторы здаўна разам з творчымі пасадамі рэдактараў у штатным раскладзе абавязкова вызначаліся пасады літаратурных рэдактараў. Іх галоўнай задачай якраз і было выпраўленне, удасканаленне мовы і стылю тэкстаў, а таксама моўнай культуры ўдзельнікаў радыё- і тэлеперадач або выканаўцаў роляў у кіно. На жаль, сёння, калі стыхія яшчэ не сфарміраванага рынку непасрэдна ўмяшалася і ў рэдакцыйны працэс, многія з заснавальнікаў друкаваных і электронных сродкаў інфармацыі з мэтай эканоміі сродкаў паўсюль пачалі скарачаць пасады літаратурных рэдактараў. Гэта адразу прыкметна знізіла ў першую чаргу моўную культуру такіх друкаваных выданняў, радыё- і тэлеперадач і фільмаў.

Трэці. У выдавецкай практыцы літаратурнае рэдагаванне ніколі не было самастойным этапам рэдакцыйна-выдавецкага працэсу. Рэдактар, які адказвае за канкрэтнае выданне, працуе адначасова над многімі аспектамі шматграннага працэсу рэдагавання, у тым ліку і над удасканаленнем літаратурнай формы аўтарскага арыгінала. У залежнасці ад складанасці выдання нярэдка ўзнікае неабходнасць размеркавання працы выдавецкіх работнікаў. Гэта бывае звычайна ў выпадках, калі аўтар не з'яўляецца спецыялістам-філолагам. Тады прыцягнуты для гэтага літаратурны рэдактар даводзіць аўтарскі арыгінал да кандыцыі перш за ўсё з літаратурнага боку.

Чацвёрты. Нашы погляды на літаратурнае рэдагаванне як на толькі адзін з відаў, ці, больш дакладна, аспектаў рэдагавання, які канцэнтруецца перш за ўсё ў моўнай і кампазіцыйнай плоскасцях выдання, цалкам супадаюць з поглядамі заходніх тэарэтыкаў і практыкаў рэдагавання. У працах даследчыкаў, напрыклад, з Вялікабрытаніі, ЗША, Канады, Польшчы цяжка знайсці паняцце «літаратурнае рэдагаванне». Не фіксуецца гэты тэрмін, у прыватнасці, у руска-англійскім і англа-рускім «Гласарыі выдавецкіх і паліграфічных тэрмінаў», падрыхтаваным Асацыяцыяй выдаўцоў Вялікабрытаніі (Лондан, 1997) [15]. Тэрмін *copy editor*, напрыклад, перакладаецца ў гэтым слоўніку як «рэдактар, які рыхтуе кні-

гу ў друк» (а не *літрэдактар*, як гэта перакладзена ў падручніку У. Рызуна). Трактоўка *копіэдытара* як «супрацоўніка, работа якога складаецца з праўкі і падрыхтоўкі тэксту да друку» падаецца і ў оксфардскім выданні слоўніка «Oxford Advanced Dearner's Dictionary. International Student's Edition» [16]. Менавіта пра розныя аспекты рэдагавання (сэнсавы, палітычны, моўны, стылістычны, тэхнічны, мастацкі і інш.) ідзе гаворка ў працах амерыканскіх аўтараў Вільяма Когіна і Лінет Портэр «Рэдагаванне для тэхнічных прафесій» (Editing for the Technical Professions) [17], Флойда Баскета, Джака Сісата і Браяна Брукса «Мастацтва рэдагавання» (The Art of Editing) [18], англічаніна Д. Доўбтфіра «Крэатыўнае пісанне» (Creative writing) [19], паляка Я. Тржынадлоўскага «Рэдагаванне. Тэкст. Мова. Апрацоўка» (Edytorstvo. Tekst, jezyk, opracowanie) [20].

Пяты. Усе гады на тэрыторыі СССР дысцыпліну, якую выкладалі будучым журналістам і рэдактарам-выдаўцам, называлі «Літаратурнае рэдагаванне» (у заходніх універсітэтах такі курс звычайна называюць «Рэдагаванне», «Рэдагаванне для…» (журналістаў, тэхнічных, гуманітарных спецыяльнасцей) або проста «Мастацтва рэдагавання»). Тлумачэнне гэтаму сапраўды савецкаму феномену А. Капялюшны дае так: «Паколькі вучэбныя планы і праграмы прысылалі з Масквы, там не маглі дазволіць, каб у яго (рэдагавання – *М. Ц.*) склад уваходзілі тэмы, якія ўзнімаюць іншыя, акрамя літаратурнага, аспекты рэдагавання» [4, с. 9]. Ва ўмовах, калі такія планы не мяняліся дзесяцігоддзямі, выдаць дапаможнік па гэтай праблематыцы з іншай назвай было немагчыма. Відавочна, толькі гэтым можна растлумачыць той факт, што ў першым вучэбным дапаможніку ўкраінскага аўтара Р. Іванчанкі пад назвай «Літературне редагування» няма сэнсу шукаць асобнага азначэння паняцця *літаратурнае рэдагаванне*: яго там няма. Кніжка прафесара Іванчанкі прысвечана проста рэдагаванню. Не палемізуючы ні з кім, Р. Іванчанка, як і іншы заснавальнік украінскай школы рэдагавання Д. Грыгараш, пісала ў сваіх тэкстах «рэдагаванне», «змест рэдагавання», «аб'ём работы рэдактара», не звужаючы шырокае кола рэдактарскіх абавязкаў азначэннем «літаратурнае». Такі падыход, дарэчы, выкарыстоўвалі і вядучыя расійскія даследчыкі гэтай праблемы М. Сікорскі, К. Накаракава, В. Свінцоў, А. Мільчын. Укладаючы ў працэс рэдагавання шырокі творчы або творча-арганізацыйны змест, яны мелі на ўвазе рэдагаванне, а не літаратурнае рэдагаванне.

Такім чынам, наша вызначэнне паняццяў *рэдагаванне* і *літаратурнае рэдагаванне* будзе такім.

Рэдагаванне – гэта від прафесійнай дзейнасці, які прадугледжвае паслядоўнае выкананне спецыяльна падрыхтаваным работнікам шэрагу абумоўленых вынікамі рэдактарскага аналізу творчых і арганізацыйна-тэхнічных функцый на розных этапах падрыхтоўкі і выпуску канкрэтнага выдавецкага, журналісцкага, газетна-часопіснага або кінапрадукту і які накіраваны на ўдасканаленне зместу і формы такога прадукту з мэтай выніковага ўспрымання яго карыстальнікам.

Літаратурнае рэдагаванне – гэта разнавіднасць рэдагавання, якая прадугледжвае паслядоўнае выкананне спецыяльна падрыхтаваным работнікам шэрагу творчых функцый, накіраваных на ўдасканаленне мовы, стылю, кампазіцыі, структуры канкрэтнага выдавецкага, журналісцкага, газетна-часопіснага або кінапрадукту.

На наш погляд, такі падыход да рашэння праблемы можа садзейнічаць збліжэнню, а не раз’ядналанню розных пунктаў гледжання даследчыкаў на прадмет, змест і састаўныя часткі рэдагавання – аднаго з асноватворных паняццяў у тэорыі і практыцы выдавецкай справы і рэдагавання.

Літаратура

1. Былинский, К. И. Литературное редактирование газеты / К. И. Былинский. – М. : Гослитиздат, 1953. – 64 с.

2. Былинский, К. И. Литературное редактирование / К. И. Былинский, Д. Э. Розенталь. – 2-е изд. – М. : Искусство, 1961. – С. 15.

3. Зелінська, Н. В. Теоретичні засади роботи редактора над літературною формою твору (літературне опрацювання тексту) / Н. В. Зелінська. – К., 1989. – С. 5.

4. Капелюшний, А. Редагування в засобах масової інформації : Навч. посібник / А. Капелюшний. – Львів : ПАІС, 2005. – 432 с.

5. Литературное редактирование : учеб. пособие / под ред. Н. С. Валгиной. – М. : Московский полиграф. ин-т, 1987. – 88 с.

6. Мильчин, А. Э. Издательский словарь-справочник / А. Э. Мильчин. – М. : Юристъ, 1998. – 470 с.

7. Огар, Е. І. Українсько-російський та російсько-український словник-довідник з видавничої справи / Е. І. Огар. – Львів : Палітра друку, 2002. – 264 с.

8. Партико, З. Загальне редагування: нормативні основи : навч. посібник / З. Партико. – Львів : Афіша, 2001. – 412 с. – С. 28.

9. Різун, В. В. Літературне редагування : підручник / В. Різун. – К. : Либідь, 1996. – С. 73.

10. Сенкевич, М. П. Стилистика научной речи и литературное редактирование научных произведений / М. П. Сенкевич. – 2-е изд. – М. : Высшая школа, 1984. – С. 21.

11. Сикорский, Н. М. Теория и практика редактирования : учебник / Н. М. Сикорский. – 2-е изд. – М. : Высшая школа, 1980. – 368 с.

12. Терехова, В. Литературное редактирование / В. Терехова. – Л. : Изд-во Ленинградского ун-та, 1975. – С. 3–4.

13. «Термін», «Термінологія», «Словосполучення» в: Українська мова : енциклопедія. – 2-ге вид. – К. : Вид-во «Укр. Енцикл.» ім. М. Бажана, 2004; Літературознавча енциклопедія : у 2 т. / авт-уклад. Ю. І. Ковалів. – К. : ВЦ «Академія», 2007.

14. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка публіцыстычных жанраў / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Вышэйшая школа, 1971. – 288 с.

15. Glossary of Publishing Terminology / The Publishers Association UK, 1997 [Electronic resource]. – Mode of access : http:www.osi.hu/cpd/resources/paglossaryRUS.htm/.

16. Oxford Advanced Dearner's Dictionary. International Student's Edition. – P. 325.

17. Coggin, W. Editing for the Technical Professions / W. Coggin, L. Porter. –Toronto, 1993. – 254 p.

18. Baskette, F. The Art of Editing / F. Baskette, J. Sissors, B. Bruks. – New York – London, 1982.

19. Doubtfire, D. Creative writing / D. Doubtfire. – London, 1999. – 148 p.

20. Trzynadlowski, J. Edytorstvo. Tekst, jezyk, opracowanie / J. Trzynadlowski. – Warszawa, 1978. – 174 s.

Маргарита Цыбульская

Белорусский государственный университет

ДИНАМИЧЕСКИЕ ПРОЦЕССЫ В ЯЗЫКЕ ГАЗЕТЫ: ДИСКУРСНЫЕ СТРАТЕГИИ «СБ. БЕЛАРУСЬ СЕГОДНЯ»

Журналистский текст в своем модификационном разнообразии отражает характер изменений в обществе, оперативно реализует парадигматические возможности языка, диагнозирует эволюционные изменения в речи. В условиях нарастающих IT-тенденций общественное сознание и речевое поведение носителей языка выражается в текстах современных СМИ особенно ярко. В каждом журналист-

ском тексте исследователь может обнаружить след, отпечаток «действительности, в которой и ради которой создавался текст, некий автопортрет автора и созданную автором “модель” читателя, следы преобладающих в обществе образцов речевого поведения и текстовых формулировок» [7, с. 100]. В связи с этим анализ языка белорусских СМИ с точки зрения присущей ему оперативности в трансформации любых речемыслительных процессов представляется актуальным. Эти вопросы своевременны, так как позволяют переосмыслить журналистский текст, выявить его типологические модификации. Любой способ взаимодействия принято рассматривать с двух сторон: в нашем случае уместно говорить об использовании языкового инструментария в качестве средства воздействия на общественное сознание и о проявлении речемыслительных процессов в языке газеты.

Наши представления об окружающей действительности складываются из готовых моделей, которые не всегда являются результатом индивидуального опыта, а иногда представляют собой диалог адресанта – адресата, где в роли адресанта выступают средства массовой информации, влияющие на общественное сознание и достигающие / не достигающие согласия с адресатом (реципиентом). В этом инструментарии особое место занимают речевые стратегии, хорошо освоенные современными СМИ. К ним относят идентификационные формулы, слова-эпистемики, представление субъективного мнения в виде объективного факта или истины, выражение уверенности говорящего в согласии адресата, риторический вопрос, «стратегию мобилизации» и «стратегию демобилизации» общественного мнения и др. [3]. Наиболее распространенным приемом является употребление слов-эпистемиков типа «нет сомнения», «не секрет», «мы знаем», «совершенно очевидно»: *«Ни для кого не секрет, что правящий в современной Чечне клан Кадыровых во время первой чеченской войны воевал против федеральных войск»* (20.11.2008).

На газетной полосе активно используется стратегия представления субъективного мнения в виде объективного факта, не требующего доказательства, что подается в форме категорического утверждения популярного политика или общественного деятеля: *«Мы знаем, что ваше законодательство в сфере экономики постоянно совершенствуется. Поэтому уверен, после этой встречи будет заключено много взаимовыгодных соглашений»* (19.11.2008). Данный пример показывает, как в рамках двух предложений осуществляется форми-

рование двух информационных моделей: «экономика совершенствуется» и «заключение взаимовыгодных соглашений», причем доказательства не обязательны. С помощью идентификационных формул можно расширить либо сузить эпизодические представления: *«Кризис на Кавказе показал Европейскому союзу, что стабильность на его восточных границах играет важную роль для стабильности на всем нашем континенте. В ближайшие месяцы мы будем думать, как укрепить сотрудничество со странами региона – Беларусью, Молдовой, Украиной»* (15.11.2008). Речь идет о положительном для Беларуси стратегическом решении, которое озвучил уполномоченный МИД Германии Дитер Лукас. Однако сигнификативное наполнение высказывания в сознании белорусского читателя может интерпретироваться как резкое разграничение территориальных и политических интересов: континент, Европейский союз, Кавказ, регион Беларуси, Молдовы, Украины.

Подобного рода стратегии инициированы адресантом и являются имплицитным фоном установления диалогических отношений между газетой и читателем, социально обусловлены и вызваны нарастающим использованием манипулятивных технологий в СМИ.

димую информацию со всего света, входить в архивные хранилища в поисках нужного документа. Используют и новинки фототехники: цифровые фотокамеры, средства оперативной передачи визуальной информации на практически любые расстояния, широкие возможности компьютерных программ для обработки полученных изображений. Одно осталось неизменным в нашей профессии с момента ее появления – развитое мышление, организаторские способности, духовные и физические силы.

Литература

1. Іўчанкаў, В. І. Медыярыторыка: рытарычныя асновы журналістыкі, лінгвістыка публіцыстычнага тэксту, дыскурсны аналіз сродкаў масавай інфармацыі : курс лекцый / В. І. Іўчанкаў. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – 280 с.

2. Коваленко, Г. Я. Фотоискусство и жизнь / Г. Я. Коваленко. – М. : Искусство, 1987. – 112 с.

3. Эйзенштейн, С. М. Избр. статьи / С. М. Эйзенштейн. – М. : Искусство, 1956.

Ірына Шкраба
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

СЕМАНТЫЗАЦЫЯ ЯК КРЫНІЦА КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ ВЕДАЎ

Прыхільнікі аспектавага падыходу да структурнага апісання семантыкі слова вылучаюць розныя бакі яе асэнсавання: сігніфікатыўны, дэнататыўны, канатацыйны, эмацыянальны, сінтагматычны, культурна-гістарычны, лінгвакультуразнаўчы і інш. Этнаграфічны кампанент разглядаецца ў межах канатацыі, аднак яго спецыфіка выяўляецца ў тым, што, у адрозненне ад класічнага канатацыйнага мікракампанента з яго выяўленымі адносінамі моўцы ў форме эмоцыі або ацэнкі да прадмета намінацыі, ён характарызуе не сам дэнатат, а сацыяльна-культурныя, нацыянальна адметныя ўмовы ўзнікнення наймення. У працах мовазнаўцаў яго сутнасць абазначаецца рознымі тэрмінамі: геаграфічная або рэгіянальная канатацыя, стратыфікацыйна маркіраваны тып «індыкатарнай» канатацыі, канатацыя дыялектнасці.

З трох фундаментальных працэсаў, якія арганізуюць маўленчую дзейнасць чалавека, – намінацыі, прэдыкацыі і ацэнкі, этнаграфічны

кампанент найбольш цесна пераплятаецца з намінацыяй (хоць і ацэнка часам выяўляе пэўныя кагнітыўныя асаблівасці мыслення народа). Тлумачальныя і перакладныя слоўнікі, маючы за мэту задачу поўнага апісання сэнсавай структуры моўных адзінак, не могуць з дапамогай толькі традыцыйнага і самага тыповага спосабу раскрыцця семантыкі слова – праз паняцце – адкрыць чытачу культуралагічныя веды. На гэтай падставе можна сцвярджаць, што семантычны змест, які выяўляе культурна-этнаграфічную пазначанасць, у лексікалагічным апісанні бывае пададзены фрагментава або ўвогуле адсутнічае. Ён часцей зводзіцца да ўказання на тэрытарыяльнае бытаванне або лакальнае асэнсаванне семантыкі. Нацыянальна-культурная ж своеасаблівасць моўных адзінак выяўляецца ў тым, што інвентар пэўных паняццяў, што называюць з’явы, прыродныя катаклізмы, аб’екты, якасці, падзеі, фізічныя дзеянні, знакі колераабазначэння і інш., надзелены этнічнай своеасаблівасцю, характарызуецца ментальна-доследнай абумоўленасцю жыццёвай практыкі носьбіта мовы, пазначаны вехамі таго гістарычнага і культурнага шляху, які пройдзены ім як асобай пэўнай этнічнай супольнасці са сваім індывідуальным лёсам. Пацвярджэннем таму – заўвага В. Гумбальта, які адзначаў, што «мова, якой бы формы яна ні прымала, заўсёды ёсць духоўнае ўвасабленне індывідуальнага жыцця нацыі» [1, с.72].

Адметнасць вылучэння семантычнага кампанента менавіта этнічнай абумоўленасці можна акрэсліць з наступнага.

Па-першае, пры этымалагічным разглядзе этнаграфічных намінацый выключаецца антыгістарычнасць і адвольнасць навуковых вытлумачэнняў, таму што ўтваральная база вызначаецца дакладна і касуецца неабходнасць рэканструкцыі і ўзнаўлення таго значэння, што гістарычна папярэднічала аб’екту даследавання, якая звычайна выступае як абавязковая ў выпадку выяўлення неадназначнай сувязі значэння з пазамоўнай рэаліяй. Як вынік – на першым плане не сам назіральнік і не яго суб’ектыўнае меркаванне, якое пры этымалагічных пошуках часта выступае як спрэчнае, дапушчальнае, непрымальнае, альтэрнатыўнае, часам ненавуковае і да т. п.

Па-другое, гэты кампанент значэння не можа быць вылучаны метадам семантычных паралеляў, таму што ў мове адсутнічае прэцэдэнт аналагічнага развіцця семантыкі з-за ўнікальнасці назвы. Немалаважна і тое, што этнаграфічны кампанент спрыяе паглыбленню сацыяльнага аспекту этымалагічных даследаванняў, таму

што ён выяўляе сувязь і абумоўленасць паходжання слова і гісторыі соцыуму, яго матэрыяльнай, духоўнай і этнічнай культуры.

Калі звярнуцца да тыпалогіі значэнняў слова, то ў рубрыкацыі традыцыйных бінарных апазіцый (шырокае/вузкае, агульнае/спецыяльнае, прамое/пераноснае, лагічнае/экспрэсіўнае, эмацыянальна нейтральнае/эмацыянальна афарбаванае, свабоднае/фразеалагічна звязанае) не знаходзім гэтага кампанента значэння з-за адсутнасці ў яго, з аднаго боку, статусу сталага складніка семантыкі для пераважнай большасці слоў, а таксама з-за няпростай задачы яго вылучэння і адмежавання ўнутры агульнага экспрэсіўна-сэнсавага комплексу. Заканамерна, што месца гэтага тыпу значэння – у абсягу канатацый, якія выклікаюць заўсёдную цікавасць семасіёлагаў і этналінгвістаў як з'ява адметная і культуралагічна важкая.

«Мова захоўвае ў нас нешта, што можна было б назваць інтэлектуальна-духоўнымі генамі, якія пераходзяць ад пакалення да пакалення», – сцвярджае У. В. Колесаў [2, с. 137]. Інтэлектуальныя гены абумоўліваюць тую пазачасавую моўную рэальнасць, што сэнсавая структура слова, якая ўключае ўніверсальныя семантычныя элементы гістарычна адметнай падзейнай або прадметнай сітуацыі, са сталай пераемнасцю замацоўваецца ў свядомасці носьбітаў мовы не толькі псіхалагічна (мнеманічна), але і лексічна на працягу пэўнага часу існавання канкрэтнага моўнага калектыву, тым самым дэманструючы здольнасць чалавека да сінтэзаванага абагульненага сучаснага ўсведамлення досведу мінулых пакаленняў праз іх лексікон. Ён перадаецца ад старэйшага пакалення да маладзейшага, захоўвае нацыянальна-спецыфічныя характарыстыкі семантычнай прасторы слоўніка роднай мовы і праз такое пасрэдніцтва дазваляе адчуваць сябе часцінкай свайго этнасу. Дарэчы згадаць максіму Сенекі: наш розум павінен захоўваць у сабе многія каштоўнасці, многія веды – досвед ранейшых стагоддзяў.

Пры засваенні семантычнага зместу не гамагенных, а іншамоўных слоў, пранікненне ў сутнасць суадносін жывога значэння са спрадвечнымі кодамі культуры і гісторыі, аб'ектыўна вядомымі моўцу – носьбіту гэтай мовы – і невядомымі іншамоўнаму чалавеку, выклікае цікавасць, але і пэўныя цяжкасці. Можна зазначыць, што адметнасць семантычнай структуры мовы, а таксама ацэнкавых арыенціраў і аксіялагічных узораў, якія склаліся ў культурнай традыцыі пэўнага народа, таксама абапіраецца на лексічнае выяўленне – праз значэнне слова. На шляху дачынення да глабальнага агульначала-

вечага досведу «праяўляецца прыватны нацыянальны лінгвістычны досвед, які з прычыны канкрэтных умоў узнікнення і развіцця можа пэўным чынам пашырацца ў некаторых сваіх частках і ў выніку гэтага мець розны аб'ём у розных мовах» [3, с. 326]. Так, культурна-нацыянальны досвед француза без цяжкасці раскрые сэнс паняцця «*тры слаўныя дні*» – 28, 29 і 30 ліпеня, дні Ліпеньскай рэвалюцыі 1830 года, якая паклала канец панаванню манархіі Бурбонаў. Для славяніна гэта французская слоўная формула ў большасці сітуацый застанецца ў абсягу звестак, якія патрабуюць расшыфравання.

У беларускамоўнага чалавека пры ўспрыманні, напрыклад, англамоўнай назвы «*Азёрная школа*» не ўзнікае навукова адэкватнай асацыяцыі з яго этымалагічным прататыпам з той прычыны, што беларус не валодае гістарычна-этымалагічнай базай, даступнай жыхару Альбіёна. Прадстаўнікі Азёрнай школы, або «лейкісты» (ад англ. *lake* – возера), атрымалі сваю назву ад групоўкі англійскіх паэтаў-рамантыкаў канца XVIII – пачатку XIX ст., якія жылі ў так званым «азёрным краі» на поўначы Англіі.

Ілжэдзмітрый II у гісторыі Расійскай дзяржавы вядомы як «*Тушынскі злодзей*», матывацыя расіяніну зразумела, калі ўлічыць гістарычную акалічнасць – у Тушыне стаяў лагер самазванца.

Слова *архаравец,* рускамоўнага паходжання, утворана ад уласнага імя Н. П. Архарава, обер-паліцмайстара і губернатара ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. Цікавы той факт, што ў працэсе развіцця назвы вызначальную ролю адыграла не этнасема, а сема экстэнсіянала. Сучаснае значэнне слова «падманшчык, буян, свавольнік, прайдзісвет» узнікла ў выніку супрацьлеглага пераасэнсавання асацыяцыйнага паняцця «паліцэйскі як ахоўнік парадку» → «правапарушальнік», якое і паслужыла падставай адмоўнай канатацыі. Гэта рэдкі выпадак энантыясеміі.

Пры другаснай намінацыі і магчымасці дваістай семантычнай суаднесенасці прыярытэт заўсёды за першасным значэннем. Так, пры зададзенасці паняцця «*Арлеанская дзева*» ўзнікае асацыяцыя з гераіняй Стогадовай вайны Францыі і Англіі Жаннай д'Арк, а не аднайменнай назвай драмы Ф. Шылера.

Не толькі паняцці, але і словы выступаюць значнымі для вывучэння культуры і гісторыі народа. Менавіта лінгвістычны вопыт асэнсавання слова *бактрыян* (двухгорбавы вярблюд) для жыхароў Бактрыі (> Бактрыяна) абумоўлены жыццёвымі акалічнасцямі іх

бытавання, ён дазваляе атаясамліваць гэты гукавы комплекс з вядомай ім першаснай матывавальнай асновай. Натуральна, сувязь «назва» < «тэрыторыя» сукрыта для семантызацыі носьбітам якой-небудзь іншай мовы, тэрытарыяльна аддаленай ад Бактрыі.

Для славянскамоўнага чытача нязвыкла гучыць фраза «*Жыццёвыя прыпасы персаў складаліся з шасці яек і некалькіх л і с т о ў х л е б а*», якую мы сустракаем у рамане Джэймса Морыера «Прыгоды Хаджы Бабы з Ісфагана». *Ліст* са значэннем «адна штука печанага хлеба» (бел. *буханка/баханка*) невядомы беларускай мове, бо ў гісторыі славянскага пякарства хлеб ніколі не выпякаўся такім тонкім пластом, што меў выгляд ліста, як гэта звычайна практыкавалася ў народаў Усходу.

Расшыфроўка сэнсу назвы ўкраінскай вуліцы *Хрещатик*, дзякуючы традыцыйнай пераемнасці ў свядомасці пакаленняў, дазваляе звязаць яе і канкрэтную гістарычную падзею. Некалі ў старажытнасці свяшчэнная для Кіева вуліца Храшчацік атрымала такую назву таму, што была закладзена ўздоўж ручая, у якім хрысціліся сыны князя Уладзіміра.

Беларуская лексіка таксама мае гістарычную матывавальную базу. Некаторыя найменні мясцін складаюць нават сакральны комплекс. Да прыкладу, слова *валатоўка* аднаўляецца праз зварот да звестак этнакультурнага характару. *Валатоўка* < волат, паводле народных уяўленняў, – курган, у якім пахаваныя легендарныя волаты-асілкі. Такая матывацыя не суадносіцца з фонавымі ведамі аб гэтай рэаліі іншаславянскамоўнага чалавека.

З цягам часу этнаграфічны кампанент «цьмянее», ствараюцца ўмовы для сцірання яго лакальнай прымацаванасці. Тут дарэчы прыгадаць словы, якія ў сучасным семантычным прачытанні страцілі сінхранічную сувязь з этымонам. *Сібарыт* – жыхар старажытнагрэчаскай калоніі Сібарыс у Паўднёвай Італіі, які праславіўся памкненнем да багацця і раскошы; *маўзалей* – грабніца карыйскага цара Маўзола ў горадзе Галікарнасе; *артэзіянскі* (калодзеж) паводле назвы Артуа (< Артэзія), дзе капалі такія калодзежы. Відавочна, што сувязь з імёнамі ўласнымі разарвалася і значэнні змяніліся, пашырыліся, адсунуўшы ў аналы гісторыі першавобразныя: *сібарыт* – аматар багацця і раскошы не толькі ў Сібарысе, але і ў іншых краінах; *маўзалей* – цяпер манументальная надмагільная пабудова над грабніцай увогуле; *артэзіянскі* – калодзеж не толькі ў

Артуа, але і ў іншых мясцовасцях, і па-за Італіяй. Адбылася часавая дэактуалізацыя гэтага кампанента без разбурэння намінацыйнай функцыі слова (семемы).

Этымалагічныя росшукі дазваляюць пашырыць шэраг слоў, якія страцілі семантычную прымацаванасць да матывавальнага слова – лакальнага этнаграфізму, у выніку чаго набылі больш шырокае значэнне: *лаканізм* (старажытная Лаконія), *фларыдын* (востраў Флорыда), *сальфатары* (вулкан Сальфатар), *партландцэмент* (востраў Портланд), *альпеншток* (горы Альпы), *Ватыкан* (холм на правым беразе Тыбра), *Бедлам* (*Bedlam* – псіхіятрычная бальніца ў Лондане), *адэкалон* (горад Кёльн), *кракавяк* (горад Кракаў), *фазан* – фазійская птушка (< Phasis – рака на Каўказе, цяперашняя яе назва Рыён).

Этнаграфічны кампанент семантыкі можа быць актуалізаваны канкрэтнай падзеяй: *лудыты* (разбурэнне вязальнага станка Лудам), *адысея* (падарожжа Адысея), *алімпіяда* (спартыўныя гульні ў Алімпіі), *цалавальнікі* (цалаванне крыжа пры заступленні на пасаду ў Расіі канца XV–XVIII ст.), а таксама характарыстычнай уласцівасцю: *арабескі* («складаныя, адмысловыя», першасна – такія, як кампанент арабскага арнаменту), *санкюлоты* («апранутыя ў доўгія штаны»), *сіфіліс* («хворы», пры першым упамінанні – дзейная асоба паэмы італьянскага лекара Фракастары, якая мела такое імя), *банатка* («якасная», такая, якую вырошчвалі ў Банаце (вобласць у Румыніі), *вандалы* («жорсткія», як воіны старажытнагерманскага племені), *вулкан* («агнявы», як бог агню і кавальскай справы Вулкан), *цыцэр* («малы = 4,5 мм», памерам такі, якім былі надрукаваныя «Лісты Цыцэрона»).

Варта зазначыць, што семантычны аналіз слова як знакавай структуры не ва ўсіх выпадках удаецца зрабіць з дакладнасцю дастатковай ступені, гэта асабліва тычыцца намінацый асабовых імёнаў. Змест імёнаў уласных, у адрозненне ад імёнаў агульных, не выяўляе абагульненага адлюстравання рэчаіснасці, ён звязаны з канкрэтнай асобай і ў выніку гэтага адпавядае асобным канкрэтным элементам намінацыйнай сітуацыі, якія хутчэй, чым абагульненыя, знікаюць і адыходзяць у сферу забытай моўнай разумовай рэальнасці. Менавіта на забытай жыццёвай сітуацыі, звязанай з якойсьці рэальнай асобай, пабудаваны многія ўстойлівыя выразы: *выскачыў, як Пiлiп з канапель; усяго нажывеш і Кузьму бацькам назавеш; зарабіў, як Заблоцкі на мыле.*

Рэтраспекцыйны аналіз не дазваляе сучасным этымолагам з бясспрэчнай доляй верагоднасці расшыфраваць, напрыклад, асобу француржанкі Катарыны, з імем якой звязаны выраз *coiffer sainte Catherine* (літаральна «упрыгожваць галаву святой Катарыны»), або асобу цяпер невядомага Мартэна (Мартына) > франц. *Martin* – назва дзіцячай цацкі «мішка», або кагосьці Бена (Біг-Бен, англ. *Big Ben*), якія, відавочна, меў дачыненне да цяперашняй назвы звона на гадзінніку вежы *Clock Tower* у Лондане.

Аналіз этнасем каштоўны тым, што дае цікавы матэрыял для вывучэння адметнасці лексікону пэўнага соцыуму ў каардынатах «прастора – час» макрасвету, а ў дыдактычным плане спрыяе выхаванню лінгвістычна высокакваліфікаванай двухмоўнай асобы, прасякнутай духам светаразумення не толькі роднай лінгвакультурнай супольнасці, але і чужой. Лінгвакраіназнаўчыя слоўнікі, якія непазбежна звяртаюцца да культурных феноменаў пры тлумачэнні этнасем, выступаюць як своеасаблівыя энцыклапедыі, якія знаёмяць карыстальнікаў з гісторыяй і культурай пэўнага народа і забяспечваюць пераемнасць і ўстойлівасць этнічнага менталітэту.

Літаратура

1. Гумбольдт, В. Избранные труды по языкознанию / В. Гумбольдт. – М. : Прогресс, 2000. – 400 с.

2. Колесов, В. В. Тезисы о русской ментальности / В. В. Колесов // Жизнь происходит от слова. – СПб. : Златоуст, 1999. – 368 с.

3. Степанов, Г. В. Национальный язык / Г. В. Степанов // Лингвистический энциклопедический словарь. – М. : Советская энциклопедия, 1990. – 685 с.

Міхась Яніцкі, Ада Яніцкая

Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна (Беларусь)

РОЛЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ КАРЭЛЯЦЫІ «АЎТАР – РЭЦЫПІЕНТ» У АРГАНІЗАЦЫІ ЗМЕСТАВАГА І ФАРМАЛЬНАГА ЎЗРОЎНЯЎ ЛІТАРАТУРНАЙ ПАРОДЫІ

Пародыя найперш мастацкая з’ява, а таму ёй уласціва глыбіня аўтарскай задумы, зместавая невычарпальнасць, якую імкнецца асэнсаваць дапытлівы і інтэлектуальны чытач. Сапраўды, гэта жанр даволі элітарны: ён патрабуе ад чытача не толькі разумення непа-

срэдна тэксту пародыі, але і ведання яе аб’екта – камічнага вобраза першаснага твора, стылю, жанру і г. д. Як і большасць мастацкіх жанраў, пародыя ў розныя гістарычныя эпохі набывала не толькі характэрныя для свайго часу ідэйна-тэматычныя вектары развіцця, але і адметныя жанравыя мадыфікацыі. Калі, напрыклад, у ХІХ стагоддзі пародыя служыла сродкам інтэлектуальна-іранічных ацэнак мастацкіх кірункаў, плыняў, індывідуальна-аўтарскіх стыляў і абслугоўвала выключна вузкае кола літаратурнага асяродку (у травесційнай, бурлескнай, алюзійнай і іншых формах), то цяпер пародыя, дзякуючы сучасным тэхналогіям СМІ, стала масавай з’явай культурнага жыцця грамадства. Яна даўно выйшла за межы непасрэдна літаратурнага жанру, выяўляючы сябе ў розных відах мастацтва і ў розных родава-жанравых мадыфікацыях: у тэатральных капусніках, эстрадных шоу і шматлікіх тэлевізійных праектах, накшталт КВЗ, «Крывое люстэрка», «Вялікая розніца», «Камедзі Клаб» і інш. Сучасныя медыя, валодаючы вялікімі магчымасцямі ўплыву на спажыўца, актыўна выцясняюць пісьмовыя пародыі са сферы выключна літаратурнага жанру, інтэлектуальнага дыялогу *пісьменнік – рэцыпіент*.

Пародыя – функцыянальная літаратурная з’ява, і таму яна, як любы жывы арганізм, прыстасоўваецца да акаляючых аб’ектыўных і суб’ектыўных абставін. У аспекце эвалюцыі жанру вызначальную ролю ў фарміраванні зместавага і фармальнага вобліку пародыі набываюць карэлятыўныя працэсы ўзаемін *аўтар – рэцыпіент*. Патэнцыяльны чытач, спажывец літаратурнай прадукцыі, выхаваны на эстэтычных густах масавай культуры, якую актыўна навязваюць аўдыторыі большасць сучасных СМІ, не гатовы ўспрымаць пісьмовыя жанры прынцыпова іншага маральна-этычнага і эстэтычнага «фармату». Аўтару пародыі нічога не застаецца, як толькі задавальняць згаданыя патрэбы, густы чытацкай аўдыторыі, якія ў значнай ступені абумоўлены спецыфікай радыё, тэлебачання і інтэрнэту. Зместавыя і фармальныя адметнасці тэлевізійных сатырычна-гумарыстычных праграм (самых рэйтынгавых у сучаснай медыяпрасторы) ва ўмовах дэфіцыту эфірнага часу накіраваны на дасягненне хуткай і бяспройгрышнай эфектыўнасці ўздзеяння на гледачоў. Яны выяўляюцца найперш у прымітыўных, а то і абразлівых жартах «ніжэй поясу», у варыятыўных мадыфікацыях здзеклівай, часам паблажлівай, пародыі – іроніі з «тыповых» славянскіх ці то заганаў,

ці то слабасцей: п’янства, ляноты, невуцтва, самадурства, здрады ў шлюбе і г. д.

Сучасная літаратурная пародыя таксама актыўна карэлюе са зместам сатырычных мастацка-публіцыстычных жанраў, і яе часта можна ўбачыць на старонках не толькі спецыялізаваных перыядычных выданняў, такіх як «Полымя», «Маладосць», «ЛіМ» і інш., але і многіх рэгіянальных газет. У 2001 г. зроблена спроба стварэння «Анталогіі беларускай пародыі», у якую ўвайшлі вершаваныя і празаічныя творы.

Наяўнасць якаснай вострай шматтэмнай пародыі – сведчанне паўнавартаснага літаратурнага працэсу, карэляцыі мастацкай творчасці і крытыкі. Па сваёй інтэртэкстуальнай зместавасці, насычанасці іранічным пафасам яна адрасавана калі не надта спрактыкаваным і дасведчаным чытачам, то чалавеку, які любіць і разумее мастацкае слова, чалавеку эрудыраванаму. Эстэтычная асалода, якую адчувае чытач удалай, па-сапраўднаму таленавітай літаратурнай пародыі, абавязкова ўключае ў сябе радасць пазнавання «тэксту ў тэксце». Вядомы даследчык генезісу гэтага жанру У. Новікаў дакладна вызначыў сутнасць працэсу чытацкага спасціжэння: «Каб зразумець пародыю, трэба ўступіць з гэтым жанрам ва ўмоўную згоду, трэба выпрацаваць навык *двайнога зроку*» [1, с. 8].

Пародыя па сваёй прыродзе жанр другасны: у аспекце інтэртэкстуальнасці, адной з вядучых катэгорый герменеўтыкі, парадыйны твор успрымаецца як пэўная мастацкая рэфлексія на ўжо наяўныя творы, што выкарыстоўваюцца ў якасці элементаў структуры новых тэкстаў. Пры літаратуразнаўчым і лінгвістычным аналізах пародыі важна ўлічваць яшчэ адну ўласцівасць інтэртэкстуальнасці – наяўнасць у творы як мінімум двух тэкстаў, светапоглядаў, дзвюх свядомасцяў, якія ўступаюць паміж сабой у дыялог.

У дачыненні да жанру пародыі мы можам сцвярджаць, што ў дыялог актыўна ўмешваецца і свядомасць, літаратурны вопыт чытача. Аўтар, уводзячы ў тэкст пародыі цытаты з тэксту арыгінала, разлічвае на тое, што яны будуць пазнаныя і асэнсаваныя чытачом і створаць ілюзію агульнай памяці аўтара і чытача, што дапаможа апошняму ўспрыняць твор у адпаведнасці з аўтарскай задумай.

Найбольш часта ў беларускай літаратуры пародыя выкарыстоўваецца ў адносінах да вершаваных лірычных жанраў. Парадысты пры дапамозе самых разнастайных стылістычных і мастацка-

вобразных прыёмаў, амаль без істотных змяненняў выкарыстоўваючы архітэктоніку і кампазіцыю тэкстаў-арыгіналаў, крытыкуюць як прадстаўленыя ў іх эстэтычныя, палітычныя і сацыяльныя тэмы, так і светапоглядную пазіцыю пэўнага аўтара, яго інтарэсы. Усё, што робіць аўтар пародыі, – гэта перабольшанне, пераважна ў бок зніжэння пафасу, у бок карыкатуры і травесціі. Без гіпербалы і літоты немагчыма ні стварэнне пародыі, ні яе ўспрыманне. Мова гэтага іранічнага жанру наскрозь гіпербалічная, *гіпертэкстуальная*.

Пашыраныя ў беларускай паэзіі пародыі, у якіх іронія скіравана на мастацкую недасканаласць твора, а значыць, і на абмежаванасць літаратурнай адукацыі, густу аўтараў. У такім выпадку парадыст іранізуе не толькі з аб'екта, прадмета сатырычнага асмяяння, але і з пэўных заганаў суб'екта, аўтара першаснага тэксту. Міхась Стрыгалёў меў мастацкую неасцярожнасць адрасаваць свае палкія пачуцці не каму-небудзь, а гераіні шчырых вершаваных прызнанняў Пушкіна Ганне Керн:

Блукаць па ліпавай алеі,
каб зноў сустрэць вас,
Анна Керн, –
Вы разумееце няўцерп,
з якім чакаю і хмялею… [1, с. 314].

М. Скобла, выкарыстоўваючы прыём *паратэкстуальнасці,* ужо ў назве пародыі «Захмялелы паэт» выявіў свае адносіны да незразумелых і неадэкватных праяўленняў пачуццяў лірычнага героя вышэйзгаданага верша. Ён наўмысна зніжае тэматыку лексікі арыгінальнага верша, набліжаючы яе да гутарковага стылю. Даводзячы да абсурду і недарэчнасці аўтарскія памкненні, парадыст дабіваецца камічнай стылізацыі першаснага тэксту, прычым ён выразна прыніжае і дыскрэдытуе стылізуемы аб'ект. На лексічным узроўні ўсе сродкі працуюць на стварэнне эфекту парадыйнага зніжэння вобразаў галоўных персанажаў: аўтара, Керн і Пушкіна – праз іх учынкі, пачуцці і мову. Выкарыстоўваючы іншастылёвыя словы і выразы, відавочна, фамільярнага ўжытку, накшталт *на ветры сіберным калею, вачмі пасу, якую ён каханку меў!..,* М. Скобла іранічна развівае аўтарскую думку, свядома ўступаючы з ёю ў палеміку. У пародыі адсутнічае адкрытая мараль ці нават сатыра у адрас паэта, але гратэскавая сіла твора настолькі моцная і выразная, што вобраз лірычнага героя-аўтара паўстае перад інтэлектуальна

падрыхтаваным чытачом не проста ў камічным абліччы. Парадыст крытыкуе творцу ў адсутнасці эстэтычнага густу, няўменні знайсці натуральную гармонію паміж плоцкім і рамантычным, узвышаным, паміж мінулым і рэчаіснасцю:

Паэту Пушкіну зайздрошчу –
Якую ён каханку меў!
Я й сам з ахвотай, каб прыймеў,
Дзяліў бы з ёй сваю жылплошчу [2, с. 314].

Улічваючы кан'юнктурны «густ» сучаснага чытача, парадысты нярэдка, звяртаючыся да самых далікатных матываў паэтычнага светаўспрымання, выкарыстоўваюць у другасных тэкстах брутальную лексіку, а то і брыдкаслоўе. Кантраст паміж узвышаным і прыземленым, бытавым ці фізіялагічным – улюбёны мастацкі прыём парадыстаў. Пра гэта сведчаць і назвы пародый, якія «чапляюць» чытача не горш за арыгінальныя інтэртэкстуальныя загалоўкі друкаваных СМІ: «Каханне на стозе», «Жанкі з паэтамі не спяць…», «Праваронены каханы», «“Мендэльсон” хай танчыць трэці», «Пра арган, аргазм і паэзію», «Гаючую дам табе бусю» і інш. Варта заўважыць, што і самі прадстаўнікі вытанчанага мастацтва правакуюць парадыстаў, як, напрыклад, В. Стрыжак сваімі «арыгінальнымі» разважаннямі эратычнага зместу: *А грудзі пахнуць грушамі І повяззю грахоў.* Зразумела, што фантазія аўтара пародыі «Платаядны водар» А. Кудласевіча стварыла яшчэ больш смелыя «прызнанні» інтымнага характару, накшталт: *Твой водар ажно хрумстаю І п'ю яго нагбом… Бяру цябе, закусваю Грудзьмі, як каўбасой* [2, с. 315].

Прыкмеціўшы ў творы неабгрунтаваныя параўнанні супрацьлеглых эстэтычных катэгорый, парадысты пры дапамозе гратэску і адпаведнай лексікі ствараюць непаўторны камічны эфект, абсурдную сітуацыю. Так, Анатоль Зэкаў, іранізуючы з празмерна шчырага жадання Т. Гаўрусёвай *аддацца вершу*, у пародыі «Верш-спакуснік» наўмысна прыніжае, матэрыялізуе на фізіялагічным узроўні абстрактныя літаратуразнаўчыя тэрміны. Натуральна, што прызнанні ў каханні да верша як жывой істоты ідуць ад паэткі, таму камізм пародыі ўзмацняецца:

Ён так падміргваў мне спакусна
І, не губляючы надзей,
Цягнуўся дактылем да вуснаў
І лез харэем да грудзей [2, с. 120].

Часта сатыра пародый скіравана на будзённасць тэматыкі вершаваных твораў, адсутнасць у іх сапраўднай мастацкай вартасці, крызіс аўтарскага паэтычнага мыслення. Так, у пародыі М. Мятліцкага «Запозненае прызнанне» аб'ектам іроніі стала паэтызацыя Л. Дранько-Майсюком звычайнай пустой пляшкі, з якой выпілі, а потым *кінулі пад плот*. Парадыст па-мастацку з'едліва і саркастычна патлумачыў прычыну банальнай бытавой замалёўкі. На яго думку, аўтар мае непасрэднае дачыненне да шклатары: *Замачыў тут першы зборнік Л. Дранько-Майсюк*.

Параўнанне як адметны мастацкі прыём у плане аўтарскага самавыяўлення найчасцей становіцца аб'ектам парадыйнага асмяяння. Апошнім часам у «лёгкай» паэзіі, асабліва ў інтымнай і песеннай лірыцы, можна заўважыць самае разнастайнае сэнсавае нагрувашчванне параўнанняў, як, напрыклад, у адным з вершаў паэта Р. Тармолы-Мірскага:

Я – твае дзверы… Пастукай
У неразумны мой лоб.
Клямкі вось дзве, а не рукі…
Час цеплыню з іх саскроб [2, с. 329].

Калі разглядаць пародыю І. Мальца («Ванна з капрызам») на гэтыя радкі ў святле тэарэтычных разважанняў А. Марозава, які прапанаваў уласную класіфікацыю даследуемых жанравых мадыфікацый, то яна, бясспрэчна, адносіцца да сатырычнай: «займае крытычную пазіцыю ў адносінах да арыгінала, вылучаецца выразнай накіраванасцю супраць аб'екта пародыі» [1, с. 101]. Пачатак другаснага тэксту ўтрымлівае нейтральную пазіцыю ў адносінах да арыгінала, тут яшчэ не адчуваецца выразнага імкнення дыскрэдытаваць аўтара: *Я – твая ванна… Дык мыйся! Вуха круці, гэта – кран.* А вось заключныя радкі пародыі, акрамя эпіграматычнага камізму, калі адбываецца грубае «зняцце масак», напоўненыя здзеклівай інтанацыяй; сатырык відавочна кпіць са стылю Р. Тармолы-Мірскага:

І не круці так старанна
Ты мой падношаны кран,
Хоць я чыгунная ванна,
Як забаліць – я Раман! [2, с. 329].

Рускі даследчык літаратуры У. Новікаў слушна заўважыў, што «пародыя – царства разумнага смеху» [1, с. 87]. У той жа час літа-

ратуразнаўца папярэджвае, што жанр існуе не ў ізаляванай прасторы: ён часта падвяргаецца агрэсіі з боку аўтараў, што не ў поўнай ступені разумеюць сур'ёзнасць і значнасць пародыі, спакушаючыся на ўяўную лёгкаць у авалодванні гэтым жанрам. Не лепшую паслугу ў стварэнні высокамастацкай пародыі апошнім часам адыгрываюць і карэлятыўныя працэсы паміж аўтарамі і чытацкай аўдыторыяй. Часта парадысты свядома ідуць па шляху кан'юнктуры, патураючы патрэбам сучаснай масавай культуры.

Разнастайнасць мастацкага «аблічча» сучаснай беларускай пародыі відавочная, але хацелася б пажадаць аўтарам творчых знаходак і паэтычнага майстэрства ў выкарыстанні яе жанравых і моўных магчымасцей.

Літаратура

1. Новиков, В. И. Книга о пародии / В. И. Новиков – М. : Советский писатель, 1989. – 544 с.

2. Анталогія беларускай пародыі : у 2 ч. / уклад. і прадм. А. Кудласевіча. – Мінск : Ураджай, 2001. – Ч. 1. Вершы. – 415 с.

ЗВЕСТКІ ПРА АЎТАРАЎ

Абакумава Вольга Барысаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры англійскай філалогіі Арлоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта (Расія)

Анковіч Арцём Дзмітрыевіч – кандыдат педагагічных навук, выкладчык кафедры выдавецкай справы і рэдагавання Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі (Украіна)

Анковіч Ганна Уладзіміраўна – доктар педагагічных навук, кандыдат філалагічных навук, прафесар кафедры выдавецкай справы і рэдагавання Нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Украіны «КПІ» (г. Кіеў, Украіна)

Аўчароў Дзмітрый Вячаслававіч – рэдактар ДП «Выдавецтва “Пачатковая школа”», магістр філалагічных навук, аспірант Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Бардзіян Вольга Дзмітрыеўна – старшы выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Барысевіч Аксана Адамаўна – аспірантка Акадэміі паслядыпломнай адукацыі (г. Мінск, Беларусь)

Басава Ганна Іванаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Берднік Сяргей Канстанцінавіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Бязлепкіна Аксана Пятроўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Валькоўскі Міхаіл Аляксандравіч – дацэнт кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Рэспубліка»

Венідзіктаў Сяргей Віктаравіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Магілёўскага вышэйшага каледжа Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь

Выскварка Таццяна Аляксандраўна – магістрантка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

Галай Вольга Максімаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры нямецкай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Гваздовіч Галіна Аляксандраўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Говін Сцяпан Васільевіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Горбач Вольга Аляксандраўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Градзюшка Аляксандр Аляксандравіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Губкіна Алена Васільеўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Губская Вольга Мікалаеўна – выкладчык кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Дарашчонак Пётр Леанідавіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Дасаева Таццяна Мікалаеўна – доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Дзесюкевіч Вольга Іванаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Дзяменцьева Ксенія Уладзіміраўна – выкладчык кафедры сучаснай журналістыкі і грамадскай думкі Мардоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. П. Агарова (г. Саранск, Расія)

Дзятко Дзмітрый Васільевіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

Драздоў Дзмітрый Мікалаевіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Дубовік Сяргей Валянцінавіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі, дырэктар Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Дуброўскі Аляксандр Уладзіміравіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Дускаева Лілія Рашыдаўна – доктар філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры моўнай камунікацыі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта (Расія)

Жаўняровіч Пётр Пятровіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Жызнеўская Вольга Мікалаеўна – аспірантка кафедры прыкладной лінгвістыкі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта

Залескі Барыс Леанідавіч – дацэнт кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда»

Зелянко Сяргей Віктаравіч – старшы выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, вядучы рэдактар ДП «Выдавецтва "Пачатковая школа"»

Іўчанкава Лізавета Віктараўна – магістр філалагічных навук, аспірантка Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Іўчанкаў Віктар Іванавіч – доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Кавалеўскі Арцём Мікалаевіч – старшы выкладчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Калініна Марына Анатольеўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры псіхалогіі і лінгвістыкі Разанскага інстытута (філіяла) Маскоўскага дзяржаўнага адкрытага ўніверсітэта (Расія)

Канцавая Галіна Міхайлаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рускай і беларускай моў з методыкай выкладання Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (Беларусь)

Канцавой Міхаіл Пятровіч – старшы выкладчык кафедры інфарматыкі і прыкладной матэматыкі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (Беларусь)

Канюшкевіч Марыя Іосіфаўна – доктар філалагічных навук, прафесар кафедры журналістыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (Беларусь)

Канюшкевіч Таццяна Вітальеўна – старшы выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Карповіч Марыя Пятроўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Карчагіна Аксана Уладзіміраўна – кандыдат навук па сацыяльных камунікацыях, асістэнт кафедры журналістыкі і выдавецкай справы Луганскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі (Украіна)

Касько Уладзімір Канстанцінавіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры перыядычнага друку Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Кашкарова Наталля Мікалаеўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры міжнародных камунікацый Паўднёва-Уральскага дзяржаўнага ўніверсітэта (г. Чалябінск, Расія)

Клушына Наталля Іванаўна – доктар філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры стылістыкі рускай мовы факультэта журналістыкі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава (Расія)

Конанава Алена Іванаўна – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Красоўская Алена Вітальеўна – суіскальнік кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Кудрашоў Глеб Аляксеевіч – старшы выкладчык кафедры журналістыкі Палтаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя В. Г. Караленкі (Украіна)

Кулеш Ганна Іванаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Куляс Ігар Паўлавіч – аспірант Інстытута вышэйшай адукацыі Нацыянальнай акадэміі педагагічных навук Украіны

Куцэўская Вольга Станіславаўна – кандыдат навук па сацыяльных камунікацыях, асістэнт кафедры журналістыкі і выдавецкай справы Луганскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі (Украіна)

Лобань Наталля Пятроўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

Лук'янюк Юлія Мікалаеўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Макарава Аляксандра Стэфанаўна – загадчык кафедры французскай мовы Маскоўскага інстытута замежных моў (Расія)

Малыса Аксана – кандыдат філалагічных навук, ад'юнкт Сілезскага ўніверсітэта (г. Катавіца, Польшча)

Мельнікава Людміла Іванаўна – дацэнт кафедры тэлебачання і радыёвяшчання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Назаранка Юлія Віктараўна – кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры сучаснай беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Паўлавец Дзмітрый Дзмітрыевіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай культуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны

Пахомава Юлія Мікалаеўна – старшы выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Пераход Вольга Барысаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры агульнага і рускага мовазнаўства Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (Беларусь)

Пісарук Галіна Васільеўна – кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры агульнага і рускага мовазнаўства Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (Беларусь)

Радчанка Юлія Аляксандраўна – магістрантка Луганскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі (Украіна)

Сакалова Яна Міланаўна – кандыдат філалагічных навук, прафесар Універсітэта імя Канстанціна Філосафа ў Нітры (Славакія)

Салганік Рыгор Якаўлевіч – доктар філалагічных навук, прафесар факультэта журналістыкі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава (Расія)

Самусевіч Вольга Міхайлаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, намеснік дырэктара Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Сачанка Ларыса Аляксандраўна – дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Саянкова Людміла Пятроўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Селязнёва Ларыса Васільеўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рускай мовы і літаратуры Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага ўніверсітэта (г. Масква, Расія)

Серыкаў Рыгор Уладзіміравіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, намеснік дэкана завочнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны (Беларусь)

Сінькова Людміла Дзмітрыеўна – доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Слука Алег Георгіевіч – доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Солапава Вольга Аляксандраўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры агульнай лінгвістыкі Паўднёва-Уральскага дзяржаўнага ўніверсітэта (г. Чалябінск, Расія)

Старасценка Таццяна Яўгенаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

Сянкевіч Васіль Іванавіч – доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры рускай і беларускай моў з методыкай выкладання Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (Беларусь)

Трайкоўская Валянціна Піліпаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Трухан Юлія Мікалаеўна – магістр філалагічных навук, аспірантка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

Трыгук Марына Алегаўна – магістрантка Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (Беларусь)

Тычко Галіна Казіміраўна – доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Фральцова Ніна Ціханаўна – доктар філалагічных навук, прафесар кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Хромчанка Альбіна Рышардаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Цветава Наталля Сяргееўна – доктар філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры моўнай камунікацыі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта (Расія)

Цікоцкі Аляксандр Міхайлавіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Цікоцкі Міхась Яўгенавіч – доктар філалагічных навук, прафесар кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Цімошык Мікола Сцяпанавіч – доктар філалагічных навук, прафесар кафедры выдавецкай справы і рэдагавання Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі (Украіна)

Цыбульская Маргарыта Пятроўна – старшы выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Чэкуць Алена Рычардаўна – выкладчык кафедры лінгвістыкі і міжкультурнай камунікацыі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (Беларусь)

Шасцярнёва Лілія Георгіеўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Шкраба Ірына Рыгораўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Шыбут Ірына Пятроўна – старшы выкладчык кафедры тэхналогій камунікацыі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Шымолін Віктар Іванавіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Яніцкая Ада Юр'еўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры агульнага і рускага мовазнаўства Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (Беларусь)

Яніцкі Міхаіл Іванавіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (Беларусь)

З М Е С Т

Навуковае выданне

ЖЫЦЦЁМ І СЛОВАМ ПРЫСЯГАЮЧЫ…

Да 90-годдзя заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь,
доктара філалагічных навук, прафесара
МІХАСЯ ЯЎГЕНАВІЧА ЦІКОЦКАГА

Зборнік навуковых прац

Рэдактары *С. К. Бердзік, Г. А. Гваздовіч, В. І. Дзесюкевіч, А. Р. Хромчанка*
Мастак вокладкі *К. К. Шастоўскі*
Тэхнічны рэдактар *Н. А. Гулейчык*
Камп’ютарная вёрстка *Г. А. Гурковай, І. В. Дашкевіч,*
В. Ю. Лагун, Н. М. Хаманеевай, А. П. Шацілы
Карэктары *Т. У. Данілава, Г. І. Кашэўнікава,*
Т. М. Ракіцкая, Л. В. Суцягіна

Падпісана ў друк 13.02.2012. Фармат 60 × 90 $^1/_{16}$.
Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 38,0. Ул.-выд. арк. 36,2. Тыраж 165 экз. Заказ № 027.

РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”».
ЛИ № 02330/0552540 ад 10.04.2007.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”».
ЛП № 02330/327 ад 19.01.2012.
Вул. Захарава, 59, 220088, г. Мінск.